International Accountability Platform for Belarus

# ШЛЯХІ ПРЫЦЯГНЕННЯ ДА АДКАЗНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

## Механізмы рэагавання на парушэнні правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права



Верасень 2025

DIGNITY
THE INTERNATIONAL COMMITTEE FOR INVESTIGATION OF TORTURE IN BELARUS
REDRESS Ending torture, seeking justice for survivors
VIASNA human rights center

# Падзякі

Выказваем шчырую падзяку аўтарам – Кацярыне Равінскай (REDRESS), Бэнджы Алену Акіна (REDRESS) і Андрэа Хубэр (Платформа IAPB) – за іх глыбокую і поўную адданасць у падрыхтоўцы гэтага даклада.

Акрамя таго, мы глыбока ўдзячныя за неацэнны ўнёсак наступных экспертаў (у алфавітным парадку): Вольфганга Бенедэка, Андрэя Васільева, Марыі Жарылоўскай, Ганны Каршуновай, Аляксандры Лейбавай, Ірыны Марчук, Лайры Найтынгейл, Бланаід Ні Чэрняй і Уладзіміра Ракачэвіча. Яны дапамаглі ўзмацніць якасць і глыбіню нашай працы, падзяліўшыся сваімі ведамі і падтрымкай у працэсе падрыхтоўкі дакумента. Таксама выказваем падзяку Эве Санчыс з REDRESS за яе працу па забеспячэнні прафесійнага дызайну і вонкавага выгляду даклада.

Галоўнае, мы хацелі б выказаць глыбокую ўдзячнасць краінам і структурам, якія падтрымлівалі Міжнародную платформу па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB) у яе місіі па дакументаванні парушэнняў правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права. Іх унёсак меў вырашальнае значэнне для падрыхтоўкі гэтай публікацыі.

З гэтай мэтай мы асабліва ўдзячныя за неацэнную падтрымку з боку наступных дзяржаў (пералічваем у алфавітным парадку): Аўстрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Злучаныя Штаты Амерыкі, Ірландыя, Ісландыя, Канада, Латвія, Літва, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Нідэрланды, Польшча, Румынія, Славакія, Фінляндыя, Чэхія, Швейцарыя, Эстонія, а таксама Еўрапейскі Саюз. Таксама з удзячнасцю адзначаем істотную падтрымку з боку Еўрапейскага фонду за дэмакратыю.

# Змест


**ПАДЗЯКІ** 2

**АБРЭВІЯТУРЫ** 4

**I. КАРОТКІ ЗМЕСТ І РЭКАМЕНДАЦЫІ** 7

- A. Кароткі змест 7
- B. Рэкамендацыі дзяржавам 21
- C. Як Платформа IAPB падтрымлівае механізмы прыцягнення да адказнасці для Беларусі? 24

**II. ІМКНЕННЕ ДА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ АДКАЗНАСЦІ: КАНТЭКСТ, ШЛЯХІ І ВЫКЛІКІ** 28

- A. Агульны кантэкст 28
- B. Розныя механізмы з адметнымі мэтамі і вынікамі 31
- C. Што мы маем на ўвазе пад забеспячэннем адказнасці? 33
- D. Чаму прыцягненне да адказнасці мае важнае значэнне? 34
- E. Выклікі ў забеспячэнні адказнасці ў Беларусі 35

**III. ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ** 38

- A. Міжнародны крымінальны суд (МКС) 38
- B. Беларусь і расследаванне МКС сітуацыі ва Украіне 52
- C. Універсальная юрысдыкцыя 55
- D. Юрысдыкцыя на падставе прынцыпу актыўнай або пасіўнай правасуб’ектнасці 64
- E. Нацыянальныя суды Беларусі 67
- F. Спецыяльны трыбунал Савета Еўропы па злачынстве агрэсіі супраць Украіны 68

**IV. АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ** 73

- A. Міжнародны суд ААН (ICJ) 74
- B. Міжнародная арганізацыя працы 81

**V. МЕХАНІЗМЫ ПАДТРЫМКІ НАМАГАННЯЎ ПА ПРЫЦЯГНЕННІ ДА АДКАЗНАСЦІ** 89

- A. Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 89
- B. Дагаворныя органы ААН 95
- C. Спецыяльныя працэдуры ААН 102
- D. Маскоўскі механізм АБСЕ 108

**VI. НОВЫЯ МЕХАНІЗМЫ, ЯКІЯ МОЖНА БЫЛО Б РАЗГЛЕДЗЕЦЬ** 115

- A. Стварэнне Рэестра страт 115
- B. Міжнародны (спецыяльны) трыбунал для Беларусі 118

# Абрэвіятуры

| | | | |
|---|---|---|---|
| **BKDP** | Belarusian Congress of Democratic Trade Unions | **БКДП** | Беларуская канфедэрацыя дэмакратычных прафсаюзаў |
| **CAT** | Convention against Torture and Other Cruel, Inhuman or Degrading Treatment or Punishment / Committee Against Torture | **КСП** | Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, нечалавечых або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання / Камітэт супраць катаванняў |
| **CED** | Committee on Enforced Disappearances | **КГЗ** | Камітэт па гвалтоўных знікненнях |
| **CEDAW** | Convention on the Elimination of All Forms of Discrimination Against Women / Committee on the Elimination of Discrimination against Women | **КЛДЖ** | Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын / Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын |
| **CERD** | Convention on the Elimination of All Forms of Racial Discrimination | **КЛРД** | Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі |
| **CESCR** | Committee on Economic, Social and Cultural Rights | **КЭСКП** | Камітэт па эканамічных, сацыяльных і культурных правах |
| **CoE** | Council of Europe | **СЕ** | Савет Еўропы |
| **CPED** | International Convention for the Protection of All Persons from Enforced Disappearance | **МКГЗ** | Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў |
| **CRC** | Convention on the Rights of the Child / Committee on the Rights of the Child | **КПД** | Канвенцыя аб правах дзіцяці / Камітэт па правах дзіцяці |
| **CRPD** | Convention on the Rights of Persons with Disabilities / Committee on the Rights of Persons with Disabilities | **КПІ** | Канвенцыя аб правах інвалідаў / Камітэт па правах інвалідаў |
| **CSO** | Civil Society Organisation | **АГС** | Арганізацыя грамадзянскай супольнасці |
| **ECtHR** | European Court of Human Rights | **ЕСПЧ** | Еўрапейскі суд па правах чалавека |
| **ECCC** | Extraordinary Chambers in the Courts of Cambodia | **НПСК** | Надзвычайныя палаты ў судах Камбоджы |
| **EU** | European Union | **ЕС** | Еўрапейскі Саюз |
| **GIEB** | Group of Independent Experts on the human rights situation in Belarus | **ГНЭБ** | Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі |
| **HRC** | Human Rights Committee | **КПЧ** | Камітэт па правах чалавека |
| **IAPB** | International Accountability Platform for Belarus | **Платформа IAPB** | Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **ICC** | International Criminal Court | **МКС** | Міжнародны крымінальны суд |
| **ICCPR** | International Covenant on Civil and Political Rights | **МПГПП** | Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах |
| **ICESCR** | International Covenant on Economic, Social and Cultural Rights | **МПЭСКП** | Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах |
| **ICERD** | International Convention on the Elimination of All Forms of Racial Discrimination | **МКЛРД** | Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі |
| **ICIT** | International Committee for the Investigation of Torture in Belarus | **МК** | Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі |
| **ICJ** | International Court of Justice | **МС** | Міжнародны суд ААН |
| **ICMW** | International Convention on the Protection of the Rights of All Migrant Workers and Members of Their Families | **МКПМ** | Міжнародная канвенцыя аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў |
| **ICTR** | International Criminal Tribunal for Rwanda | **МКТР** | Міжнародны крымінальны трыбунал па Руандзе |
| **ICTY** | International Criminal Tribunal for the former Yugoslavia | **МКТЮ** | Міжнародны крымінальны трыбунал па былой Югаславіі |
| **ILO** | International Labour Organization | **МАП** | Міжнародная арганізацыя працы, МАП |
| **ITUC** | International Trade Union Confederation | **МКП** | Міжнародная канфедэрацыя прафсаюзаў |
| **KSC** | Kosovo Specialist Chambers | **ССПК** | Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве |
| **NGO** | Non-Governmental Organisation | **НУА** | Няўрадавая арганізацыя |
| **ODIHR** | OSCE Office for Democratic Institutions and Human Rights | **БДІПЧ АБСЕ** | Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека |
| **OEB** | OHCHR Examination of the human rights situation in Belarus | **Экспертыза УВКПЧ** | Экспертыза УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі |
| **OHCHR** | Office of the United Nations High Commissioner for Human Rights | **УВКПЧ** | Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека |
| **OSCE** | Organization for Security and Co-operation in Europe | **АБСЕ** | Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе |
| **OTP** | Office of the Prosecutor | **КП** | Канцылярыя Пракурора |
| **PACE** | Parliamentary Assembly of the Council of Europe | **ПАСЕ** | Парламенцкая асамблея Савета Еўропы |
| **PGA** | Prosecutor General of Ukraine | **ГП Украіны** | Генеральны Пракурор Украіны |
| **RD4U** | Register of Damage for Ukraine | **RD4U** | Рэестр шкоды для Украіны |
| **SCSL** | Special Court for Sierra Leone | **SCSL** | Спецыяльны суд па Сьера-Леонэ |
| **SCC** | Special Criminal Court in the Central African Republic | **SCC** | Спецыяльны крымінальны суд у Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **SJAC** | Syria Justice and Accountability Centre | **SJAC** | Сірыйскі цэнтр правасуддзя і забеспячэння адказнасці |
| **STL** | Special Tribunal for Lebanon | **STL** | Спецыяльны трыбунал па Ліване |
| **TFV** | Trust Fund for Victims | **ТФП** | Траставы фонд для пацярпелых |
| **UN** | United Nations | **ААН** | Арганізацыя Аб’яднаных Нацый |
| **UNCCP** | United Nations Conciliation Commission for Palestine | **UNCCP** | Камісія ААН па прымірэнні ў пытанні Палесціны |
| **UNGA** | United Nations General Assembly | **ГА ААН** | Генеральная Асамблея ААН |
| **UNMIK** | United Nations Interim Administration Mission in Kosovo | **МААНК** | Місія ААН па часовай адміністрацыі ў Косаве |
| **UNOV** | United Nations Office at Vienna | **UNOV** | Аддзяленне ААН у Вене |
| **UNRoD** | United Nations Register of Damage Caused by the Construction of the Wall in the Occupied Palestinian Territory | **UNRoD** | Рэестр страт, нанесеных будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі |
| **UPR** | Universal Periodic Review | **УПА** | Універсальны перыядычны агляд |
| **Viasna** | Human Rights Center Viasna | **«Вясна»** | Праваабарончы цэнтр «Вясна» |
| **WGAD** | Working Group on Arbitrary Detention | **ПГАЗ** | Працоўная група па адвольных затрыманнях |
| **WGEID** | Working Group on Enforced or Involuntary Disappearances | **ПГПМЗ** | Працоўная група па прымусовых або мімавольных знікненнях |

# I. КАРОТКІ ЗМЕСТ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

## A. Кароткі змест

### Пра даклад

Гэты даклад прапануе ўсебаковы агляд механізмаў па забеспячэнні адказнасці, даступных для рэагавання на сур’ёзныя парушэнні правоў чалавека і парушэнні міжнароднага крымінальнага права ў Беларусі пасля значнага пагаршэння і без таго крытычнай сітуацыі з правамі чалавека напярэдадні спрэчных прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года і ў наступныя гады.

Даклад апісвае механізмы, накіраваныя на прыцягненне да адказнасці дзяржавы, механізмы, засяроджаныя на забеспячэнні індывідуальнай крымінальнай адказнасці, а таксама механізмы, якія спрыяюць абодвум кірункам. Акрамя таго, ён апісвае, якім чынам сітуацыя ў Беларусі разглядалася дагэтуль, вызначае наяўныя прабелы і прапануе дадатковыя дзеянні і механізмы, якія можна было б выкарыстаць для іх пераадолення.

Падкрэсліваючы важнасць правасуддзя для пацярпелых, даклад засяроджвае ўвагу на іх удзеле, а таксама на магчымых ролях арганізацый грамадзянскай супольнасці ў межах кожнага механізма, і аналізуе, як кожны падыход да забеспячэння адказнасці спрыяе задавальненню патрэб у правасуддзі, арыентаваным на пацярпелых.

Выразна акрэсліваючы даступныя варыянты, даклад мае на мэце дапамагчы дзяржавам у вызначэнні адпаведных механізмаў забеспячэння адказнасці, падрабязна апісвае неабходныя крокі для далучэння, а таксама разглядае магчымыя вынікі і дадатковую вартасць кожнага з варыянтаў.

Разгортванне кожнага з такіх механізмаў скіравана на барацьбу з беспакаранасцю за парушэнні правоў чалавека, якая з’яўляецца адной з асноўных перашкод на шляху дасягнення справядлівасці і рэпарацый для пацярпелых, а таксама ключавым фактарам далейшых парушэнняў правоў чалавека. І наадварот, умацаванне забеспячэння адказнасці дзейнічае як стрымальны фактар для будучых злоўжыванняў, падкрэслівае недапушчальнасць такіх дзеянняў і гарантуе, што яны будуць мець наступствы.

## Агульны кантэкст

Пасля спрэчных прэзідэнцкіх выбараў жніўня 2020 года Беларусь сутыкнулася з адным з найцяжэйшых крызісаў у галіне правоў чалавека ў Еўропе за апошнія дзесяцігоддзі. Мірныя пратэсты супраць фальсіфікацыі выбараў сутыкнуліся з бязлітаснай кампаніяй пераследу і рэпрэсій, у тым ліку масавымі адвольнымі затрыманнямі, катаваннямі і жорсткім абыходжаннем, фіктыўнымі судовымі працэсамі, знішчэннем незалежных СМІ і грамадзянскай супольнасці, а таксама пазбаўленнем волі больш за 1200 палітычных апанентаў і праваабаронцаў. Гэтыя парушэнні з'яўляюцца часткай свядомай дзяржаўнай палітыкі па задушэнні іншадумства, і, на думку экспертаў ААН, іх шырокі і сістэматычны характар можа дасягаць узроўню злачынстваў супраць чалавечнасці.

З улікам знішчэння прасторы для грамадзянскай актыўнасці, адсутнасці забеспячэння адказнасці, а таксама немагчымасці незалежнага і непрадузятага расследавання з боку ўладаў Беларусі, пацярпелыя засталіся без доступу да правасуддзя. Гэта робіць жыццёва неабходным выкарыстанне механізмаў, разгледжаных у гэтым дакладзе, якія разам з'яўляюцца адзінымі рэальнымі шляхамі да ісціны, аднаўлення і забеспячэння адказнасці для народа Беларусі.

## Механізмы ўстанаўлення індывідуальнай крымінальнай адказнасці

Міжнародны крымінальны суд (ICC, МКС) прапануе асабліва заўважны і аўтарытэтны адказ на масавыя цяжкія злачынствы. Здольнасць МКС прыцягваць да адказнасці тых, хто нясе найбольшую адказнасць за ваенныя злачынствы, злачынствы супраць чалавечнасці і генацыд, робіць яго інстытуцыяй сусветнага юрыдычнага і сімвалічнага значэння. Працэдуры МКС забяспечваюць таксама ўдзел пацярпелых у працэсе ў выпадках, калі закранаюцца іх асабістыя інтарэсы, і магчымасць прызначэння ім рэпарацый у выпадку вынясення абвінаваўчага прысуду. Хоць Беларусь не з'яўляецца дзяржавай – удзельніцай Рымскага статута, у верасні 2024 года Літва накіравала ў МКС зварот пра злачынствы супраць чалавечнасці, у тым ліку пра дэпартацыю, пераслед і іншыя бесчалавечныя акты, здзейсненыя дзяржаўнымі службоўцамі Беларусі як мінімум з траўня 2020 года, падкрэсліваючы, што элементы гэтых злачынстваў мелі месца на тэрыторыі Літвы і іншых дзяржаў – удзельніц МКС.

Шэраг нацыянальных юрысдыкцый распачалі расследаванні злачынстваў, здзейсненых у Беларусі, у першую чаргу ў выпадках, якія закранаюць іх уласных грамадзян. Гэтыя працэсы, заснаваныя на прынцыпе пасіўнай правасуб'ектнасці, сведчаць пра важнае прызнанне цяжару парушэнняў і неабходнасць іх разгляду па-за межамі Беларусі. Нягледзячы на тое, што гэтыя намаганні заслугоўваюць прызнання, дзяржавы не ў поўнай меры выкарыстоўваюць магчымасці ўніверсальнай юрысдыкцыі, якая дазваляе прыцягваць да адказнасці за сур'ёзныя міжнародныя злачынствы незалежна ад грамадзянства злачынцы або месца здзяйснення злачынства. Захоўваецца нявыкарыстаны патэнцыял для больш актыўнага задзейнічання гэтага механізма. Пашырэнне такіх намаганняў прадэманстравала б калектыўную прыхільнасць забеспячэнню правасуддзя для ўсіх ахвяр міжнародных злачынстваў.

Правасуддзе ўнутры Беларусі мае прынцыповае значэнне для многіх пацярпелых, якія ўспрымаюць яго як найбольш сапраўдную форму забеспячэння адказнасці – пра што сведчыць даклад *«Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне»*, падрыхтаваны Праваабарончым цэнтрам «Вясна» і Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў. Аднак пры цяперашнім рэжыме, які праводзіць арганізаваную кампанію рэпрэсій, і яго скампраметаванай судовай сістэме, такое правасуддзе недасяжнае. Зрэшты, нацыянальная сістэма крымінальнага правасуддзя, умацаваная дэмакратычнымі рэформамі і працэдурамі праверкі добранадзейнасці, зможа зрабіць свой унёсак у намаганні, скіраваныя на ўнутраны разгляд мінулых злачынстваў і аднаўленне даверу грамадства ў пасляпераходны перыяд.

**Дадзеныя і цытаты пацярпелых з даклада *«Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне»*, які даследуе ўспрыманне справядлівасці сярод ахвяр катаванняў і жорсткага абыходжання ў Беларусі.**




“…на кожную прапанову, якую я атрымліваў, напрыклад, як ад “Вясны” для дакументацыі,.. ад прадстаўнікоў ААН… нехта там пісаў кнігу… Я так ну адразу згаджаўся на гэта. Бо гэта мой такі асабісты ўнёсак у тое, каб хаця б задакументаваць гэтую несправядлівасць, якая адбывалася і адбываецца. Ну і спадзявацца, што нешта калі-небудзь можа змяніцца і, можа, тыя людзі, хто ўсё гэта зрабілі, нейкую адказнасць некалі панясуць”.

“…выплата кампенсацыі, яна больш такая, прыватная, што тычыцца толькі мяне. А пакаранне – гэта нясе ўжо больш такую грамадскую, выконвае ролю зацвярджэння грамадскай справядлівасці або страхоўкі таго, што больш такога не будзе паўтарацца”.

“Патрэбен нейкі канкрэтны прыклад, каб будучым пакаленням засталося гэта ў памяці – разуменне, што так дакладна не варта рабіць, што трэба мець сваё разуменне і не падпісвацца на ўсялякія зверствы”.

Дзяржавы абмяркоўвалі стварэнне Спецыяльнага трыбунала найперш для разгляду злачынства агрэсіі супраць Украіны, у той час як Беларусь разглядалася пераважна ў кантэксце яе саўдзелу ў гэтым злачынстве. Хоць беларусы, такія як кіраўнік дзяржавы, кіраўнік урада і міністр замежных спраў, могуць стаць аб'ектам расследавання і пераследу ў рамках Спецыяльнага трыбунала па Украіне, гэта мае абмежаваную значнасць для пацярпелых ад парушэнняў, здзейсненых непасрэдна ў Беларусі. Масавыя і сістэматычныя злоўжыванні, якія зазналі беларускія грамадзяне, стаяць па-за рамкамі гэтага механізма. Галасы пацярпелых наўрад ці будуць пачуты, калі яны не лічацца «асабліва закранутымі» дзеяннямі, што складаюць аснову абвінавачання ў сувязі з агрэсіяй, і яны наўрад ці змогуць атрымаць доступ да адпаведнай сістэмы кампенсацыі, калі толькі не жылі ва Украіне. Акрамя таго, тыя ж самыя меркаваныя злачынцы могуць таксама знаходзіцца пад расследаваннем МКС, які мае юрысдыкцыйны прыярытэт перад Спецыяльным трыбуналам у выпадку іх затрымання.

Бягучае расследаванне МКС у справе Украіны мае падобныя абмежаванні з пункту гледжання беларускіх пацярпелых ад цяжкіх парушэнняў правоў чалавека. Гэтае расследаванне ахоплівае ваенныя злачынствы і злачынствы супраць чалавечнасці, здзейсненыя ва Украіне. Высокапастаўленыя беларускія дзяржслужбоўцы згадваюцца толькі ў сувязі з саўдзелам Беларусі ў гэтых злачынствах, такім як дазвол на запуск ракет з яе тэрыторыі або ўдзел у меркаваным прымусовым перамяшчэнні і дэпартацыі дзяцей з Украіны. Паколькі расследаванне пераважна накіравана на парушэнні міжнароднага гуманітарнага і крымінальнага права, якія закранулі насельніцтва Украіны на тэрыторыі Украіны, яно не забяспечвае механізма прыцягнення да адказнасці або кампенсацыі для беларускіх пацярпелых ад міжнародных злачынстваў у Беларусі.

## Механізмы ўстанаўлення адказнасці дзяржавы

Акрамя крымінальнай адказнасці, важна таксама дамагацца прыцягнення Рэспублікі Беларусь да адказнасці за парушэнні міжнароднага права. Міжнародны суд ААН (ICJ), які разглядае юрыдычныя спрэчкі паміж дзяржавамі, гэта пляцоўка, дзе іншыя дзяржавы могуць аспрэчыць практыку Беларусі паводле дагавораў, якія ратыфікавалі абодва бакі без агаворак адносна юрысдыкцыі Міжнароднага суда да ўзнікнення спрэчкі. Патэнцыйныя справы могуць датычыцца парушэнняў Канвенцыі супраць катаванняў, улічваючы, што шырокія і сістэматычныя выпадкі злоўжыванняў ужо былі засведчаны ў папярэдніх высновах дагаворных органаў. Поспех у Міжнародным судзе можа прывесці да абавязковага для выканання рашэння, якое запатрабуе ад Беларусі спыніць парушэнні, правесці прававыя і інстытуцыйныя рэформы і забяспечыць пакрыццё шкоды, якое ў далейшым можа быць размеркаванае паміж пацярпелымі.

Іншыя дагаворныя органы таксама спрыяюць устанаўленню адказнасці дзяржавы, напрыклад, Міжнародная арганізацыя працы (МАП), якая з'яўляецца трохбаковым механізмам і ўключае прадстаўнікоў урадаў, працадаўцаў і працаўнікоў. Як у межах сваёй звычайнай нагляднай сістэмы, так і праз спецыяльныя працэдуры МАП разглядзела выкананне Беларуссю канвенцый МАП і прыйшла да высновы пра сур'ёзныя і пастаянныя парушэнні, асабліва ў рэпрэсіях супраць незалежных прафсаюзаў і ў пераследзе працаўнікоў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах. Хаця МАП не з'яўляецца судовым органам, яе наглядныя механізмы робяць аўтарытэтныя заключэнні, якія могуць прывесці да міжнароднага ціску і забяспечыць бачнасць гэтых парушэнняў, зрабіўшы іх прадметам шматбаковай увагі і кантролю.

## Іншыя механізмы

Група незалежных экспертаў ААН па Беларусі (GIEB) робіць адметны і істотны ўнёсак у бягучыя намаганні па прыцягненні да адказнасці. Як цалкам незалежны следчы орган з мандатам ААН, Група фармулюе аўтарытэтныя прававыя і фактычныя высновы на падставе ўласных расследаванняў і рэкамендацый. Яе мандат ахоплівае ўвесь спектр правоў чалавека – грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя.

У адрозненне ад механізма Экспертызы УВКПЧ, які папярэднічаў стварэнню Групы, гэты орган можа расследаваць экстратэрытарыяльныя парушэнні, звязаныя з беларускім кантэкстам, напрыклад, у дачыненні да беларусаў у выгнанні. Група таксама аналізуе ролю трэціх дзяржаў, прыватных суб’ектаў і структурныя прычыны, пашыраючы сферу адказнасці па-за межы самой дзяржавы. Пры выяўленні заканамернасцяў парушэнняў і патэнцыйных вінаватых Група карыстаецца нормамі міжнароднага права правоў чалавека і стандартам «існавання разумных падстаў меркаваць». Акрамя таго, яе падыход, што ўлічвае гендарныя і ўзроставыя асаблівасці, дазваляе дакументаваць канкрэтнае ўздзеянне на пацярпелых у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Дапаўняюць гэтыя механізмы дагаворныя органы ААН, якія адсочваюць выкананне дзяржавамі міжнародных праваабарончых інструментаў. Праз перыядычныя агляды, індывідуальныя паведамленні і расследаванні гэтыя органы даюць аўтарытэтныя тлумачэнні прававых абавязацельстваў і забяспечваюць публічнае дакументаванне дзяржаўных практык. У цяперашні час для Беларусі даступная толькі працэдура індывідуальных зваротаў паводле Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW). Да таго ж, толькі Камітэт супраць катаванняў (CAT) і Камітэт CEDAW маюць паўнамоцтвы распачаць краінавае расследаванне. Для пацярпелых гэтыя органы з’яўляюцца сродкам прызнання і магчымасцю для адвакацыі, асабліва ва ўмовах адсутнасці нацыянальных сродкаў прававой абароны.

Яшчэ адным істотным інструментам сістэмы ААН у галіне правоў чалавека з’яўляюцца Спецыяльныя працэдуры. Іх мандатарыі, такія як Спецыяльны дакладчык па Беларусі і тэматычныя эксперты па пытаннях катаванняў, адвольных затрыманняў і гвалтоўных знікненняў, адыгралі ключавую ролю ў дакументаванні парушэнняў і прыцягненні ўвагі да голасу пацярпелых. Іх тэрміновыя паведамленні і публічныя даклады забяспечваюць увагу да злоўжыванняў у рэальным часе і афіцыйна апавяшчаюць улады Беларусі. У выніку гэтыя працэдуры даюць пацярпелым і арганізацыям грамадзянскай супольнасці пляцоўку для інфармавання, выкліку міжнароднай рэакцыі і афіцыйнай фіксацыі выпадкаў парушэнняў. Дакладчыкі, якія дакументавалі заканамернасці парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі ў факталагічных дакладах, таксама ўдзельнічалі ў працы Маскоўскага механізма АБСЕ, на падставе інфармацыі ад пацярпелых і грамадзянскай супольнасці.

Магчымымі дадатковымі кірункамі могуць стаць стварэнне Спецыяльнага трыбунала па Беларусі або механізма, накіраванага на падрыхтоўку да рэпарацый, на ўзор рэестра страт, створанага для Украіны. Такая ініцыятыва магла б рабіць сістэматычнае і верыфікаванае дакументаванне шкоды, нанесенай пацярпелым, і забяспечыць збор доказаў у якасці трывалай асновы для інфраструктуры будучых кампенсацый і рэабілітацыі. Хаця такія механізмы не гарантуюць неадкладных выплат, рэестры таксама робяць свой унёсак у высвятленне

ісціны і забяспечваюць афіцыйнае прызнанне шкоды, нанесенай сем’ям і супольнасцям, пацвярджаючы важнае значэнне досведу пацярпелых.

## Заключэнне

Усе разам механізмы прыцягнення да адказнасці, разгледжаныя ў гэтым дакладзе, утвараюць усебаковы і ўзаемадапаўняльны набор інструментаў для дзяржаў, якія імкнуцца прасоўваць забеспячэнне адказнасці за сур’ёзныя парушэнні правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права, што адбываюцца ў Беларусі і ў дачыненні да беларускай супольнасці ў выгнанні.

Кожны механізм робіць адметны ўнёсак у тое, да чаго паслядоўна імкнуцца пацярпелыя: прызнанне праўды, адказнасць як асобных вінаватых, так і дзяржавы, доступ да рэпарацый і гарантыі непаўтарэння.

Эфектыўнасць гэтых механізмаў залежыць не толькі ад выканання іх асобных мандатаў, але і ад іх узаемадзеяння і ўзаемнага ўзмацнення з цягам часу. Важна падкрэсліць, што большасць гэтых шляхоў патрабуе актыўнага ўдзелу дзяржаў, якія застаюцца галоўнымі гарантамі міжнароднага правасуддзя.

Дасягненне справядлівасці для Беларусі патрабуе працяглых, адданых і скаардынаваных дзеянняў у межах некалькіх механізмаў, у цэнтры ўвагі якіх знаходзяцца пацярпелыя. Толькі з дапамогай інклюзіўнага і арыентаванага на пацярпелых падыходу міжнародная супольнасць можа гарантаваць, што ісціна, забеспячэнне адказнасці і пакрыццё шкоды не стануць прымяняцца выбарачна, а будуць паслядоўна ўспрымацца як універсальныя прынцыпы.

Ніжэй у табліцы пададзены асноўныя механізмы рэагавання на парушэнні правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права ў Беларусі.

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Міжнародны крымінальны суд**<br><br>**(Індывідуальная)** | Пастаянны міжнародны суд, які расследуе і прыцягвае да адказнасці фізічных асоб за злачынствы супраць чалавечнасці, ваенныя злачынствы, генацыд і злачынства агрэсіі. | МКС можа распачаць расследаванне праз зварот ад дзяржавы-ўдзельніцы, праз зварот Савета Бяспекі ААН або з уласнай ініцыятывы Пракурора (*proprio motu*), пры ўмове выканання патрабаванняў юрысдыкцыі і допушчальнасці справы да разгляду паводле прынцыпу камплементарнасці.<br><br>Беларусь не з'яўляецца дзяржавай – удзельніцай Рымскага статута, аднак імі з'яўляюцца дзяржавы (напрыклад, Літва), у якія ўцяклі беларусы.<br><br>Пасля звароту Літвы наконт сітуацыі ў Беларусі ў 2024 годзе Пракурор мусіць вызначыць, ці існуюць разумныя падставы для пачатку расследавання на падставе ацэнкі юрысдыкцыі і допушчальнасці справы. | Асуджэнне і вынясенне прысудаў асобным злачынцам, калі іх віна будзе прызнана.<br><br>МКС можа прызначыць ахвярам рэпарацыі, у тым ліку рэстытуцыю, кампенсацыю, рэабілітацыю і меры сатысфакцыі. | Вызначэнне індывідуальнай крымінальнай адказнасці, у тым ліку для кіраўнікоў дзяржаў, якія ў іншым выпадку карысталіся б імунітэтам.<br><br>Рэпарацыі могуць прысуджацца пацярпелым толькі ў выпадку асуджальнага прысуду. | Пацярпелыя могуць удзельнічаць на ўсіх этапах разбору, калі закранаюцца іх асабістыя інтарэсы.<br><br>Пацярпелыя таксама могуць даваць паказанні ў якасці сведак.<br><br>Арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць перадаваць інфармацыю Пракурору на падставе артыкула 15 Рымскага статута. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Нацыянальныя суды: універсальная юрысдыкцыя або экстратэрытары-яльная юрысдыкцыя на падставе прынцыпу актыўнай ці пасіўнай правасуб'ектнасці**<br><br>**(Індывідуальная)** | Пераслед міжнародных злачынстваў у нацыянальных судах незалежна ад месца здзяйснення злачынства, грамадзянства злачынцы або ахвяры.<br><br>На падставе прынцыпу актыўнай або пасіўнай правасуб'ектнасці злачынца або ахвяра мусяць быць грамадзянамі дзяржавы, у якой будзе прымяняцца экстратэрытары-яльная рысдыкцыя. | Дзяржавы мусяць прыняць спецыяльнае заканадаўства аб універсальнай юрысдыкцыі (УЮ) у рамках сваіх нацыянальных прававых сістэм.<br><br>Некаторыя дзяржавы ўводзяць абмежаванні на ўжыванне ўніверсальнай юрысдыкцыі, патрабуючы сувязі з грамадзянствам ці рэзідэнцтвам ахвяры ці меркаванага злачынцы, фізічнай прысутнасці падазраванага або абмяжоўваючы яе паводле прынцыпу падвойнай крымінальнай адказнасці.<br><br>Для эфектыўнай рэалізацыі неабходная ўстойлівая палітычная воля. | Крымінальныя прысуды асобным злачынцам і рэпарацыі ахвярам. | УЮ дазваляе пераслед там, дзе ні дзяржава, на тэрыторыі якой адбылося злачынства, ні дзяржава грамадзянства не гатовыя або не здольныя дзейнічаць, і забяспечвае ахвярам доступ да правасуддзя, ліквідуючы прабел у забеспячэнні адказнасці.<br><br>Працэсы ў рамках УЮ часта засяроджваюцца на праследзе злачынцаў ніжэйшага рангу, дапаўняючы расследаванні МКС, накіраваныя на асоб, якія нясуць найвышэйшую адказнасць за міжнародныя злачынствы. | У залежнасці ад юрысдыкцыі, ахвяры, іх юрыдычныя прадстаўнікі або арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падаваць скаргі ці перадаваць інфармацыю ў органы крымінальнага правасуддзя.<br><br>У некаторых юрысдыкцыях ахвяры могуць удзельнічаць у якасці бакоў у працэсе. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Спецыяльны трыбунал СЕ па злачынстве агрэсіі супраць Украіны**<br><br>**(Індывідуальная)** | Міжнародны трыбунал, створаны ў рамках сістэмы Савета Еўропы, для расследавання і прыцягнення да адказнасці палітычных і вайсковых лідараў, якія планавалі, рыхтавалі, ініцыявалі, здзяйснялі або спрабавалі здзейсніць злачынства агрэсіі супраць Украіны.<br><br>Скіраваны на высокапастаўленых палітычных і вайсковых лідараў, Трыбунал можа расследаваць датычнасць кіраўніцтва Беларусі да злачынства агрэсіі супраць Украіны. | Генеральны пракурор Украіны перадае справы і расследаванні Пракурору Трыбунала пасля ацэнкі, ці трэба выстаўляць абвінавачанне супраць асобы ў здзяйсненні злачынства агрэсіі.<br><br>МКС мае юрысдыкцыйны прыярытэт над Спецыяльным трыбуналам у выпадку затрымання адпаведнага высокапастаўленага злачынцы(-аў). | Асуджэнне і вынясенне прысуду палітычным і вайсковым дзеячам, прызнаным вінаватым у злачынстве агрэсіі супраць Украіны.<br><br>Хаця трыбунал можа разглядаць пытанні датычнасці кіраўніцтва Беларусі да злачынства агрэсіі, ён не дае магчымасці праваой абароны для пацярпелых ад шырокіх і сістэматычных парушэнняў правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права ў самой Беларусі. | Запаўняе юрысдыкцыйны прагал, пакінуты МКС, які не можа пераследаваць за злачынства агрэсіі, бо Расійская Федэрацыя не ратыфікавала Рымскі статут і Кампальскія папраўкі.<br><br>Выключэнне з функцыйнага імунітэту.<br><br>Палажэнне аб *завочных* судовых працэсах пры ўмове працэсуальных гарантый. | Удзел ахвяр вызначаны вельмі вузка і абмежаваны асобамі, якія былі «асабліва закрануты» злачынствам.<br><br>Грамадзяне Беларусі наўрад ці змогуць скарыстацца гэтай магчымасцю, калі толькі яны не пражывалі ва Украіне. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Міжнародны суд ААН**<br><br>**(Дзяржаўная)** | Галоўны судовы орган ААН, Міжнародны суд ААН (ICJ) разглядае прававыя спрэчкі паміж дзяржавамі, якія датычаць палажэнняў міжнародных дагавораў («спрэчныя справы»). Ён таксама дае кансультацыйныя заключэнні на запыт органаў і спецыялізаваных установ ААН.<br><br>Міжнародны суд разглядае адказнасць дзяржавы, а не індывідуальную адказнасць, зыходзячы з таго, што ў рамках абавязацельстваў *erga omnes* абарона правоў чалавека належыць усёй міжнароднай супольнасці. | Разгляд спрэчных спраў можа быць ініцыяваны дзяржавай, якая з'яўляецца бокам дагавора, і можа датычыць выключна вырашэння пытанняў, наўпрост прадугледжаных адпаведным дагаворам.<br><br>Міжнародны суд можа быць інструментам прыцягнення Беларусі да адказнасці за парушэнні паводле такіх дагавораў, як Канвенцыя супраць катаванняў і КЛДЖ (CEDAW).<br><br>Патрабуе добрасумленнай спробы перамоў і арбітражу, а таксама канчатковай беспаспяховасці ў вырашэнні спрэчкі. | Рашэнні могуць пацвердзіць невыкананне або парушэнне канкрэтных міжнародных прававых стандартаў дзяржавай.<br><br>Няздольнасць дзяржавы імплементаваць рашэнне можа заахвоціць іншы бок падняць пытанне аб невыкананні перад Саветам Бяспекі ААН, які можа рэкамендаваць меры па прывядзенні рашэння да выканання (хоць гэтае паўнамоцтва пакуль яшчэ ні разу не выкарыстоўвалася).<br><br>Кансультацыйныя заключэнні па прававых пытаннях не з'яўляюцца абавязковымі да выканання, але даюць рэкамендацыі адносна тлумачэння і прымянення права (правоў чалавека). | Забяспечвае аўтарытэтныя рэкамендацыі адносна тлумачэння і прымянення міжнароднага права, у тым ліку міжнароднага права правоў чалавека.<br><br>Суд можа прызначаць часовыя меры, такія як прадухіленне катаванняў або садзейнічанне гуманітарнай дапамозе. | Арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць заклікаць дзяржаву ці групу дзяржаў ініцыяваць працэсы ў Судзе і забяспечваць прадметную і доказную падтрымку дзяржавам падчас разгляду.<br><br>Улічваючы міждзяржаўны характар спрэчак Міжнароднага суда, пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці не маюць права выступаць бокам працэсу ў Судзе. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Міжнародная арганізацыя працы**<br><br>**(Дзяржаўная)** | Спецыялізаваная ўстанова ААН з мандатам у сферы індывідуальных і калектыўных працоўных правоў і трохбаковай структурай, якая ўключае прадстаўнікоў урадаў, працадаўцаў і працаўнікоў.<br><br>МАП устанаўлівае міжнародныя працоўныя стандарты і кантралюе выкананне іх дзяржавамі праз рэгулярны наглядны механізм і спецыяльныя працэдуры. | МАП рэгулярна наглядае за выкананнем дзяржавамі-ўдзельніцамі ратыфікаваных імі Канвенцый праз перыядычныя даклады.<br><br>Спецыяльная працэдура дазваляе падаваць скаргі на дзяржаву-ўдзельніцу за невыкананне абавязацельстваў з магчымасцю стварэння Камісіі па расследаванні і прымянення артыкула 33, калі рэкамендацыі не імплементуюцца.<br><br>Спецыяльныя працэдуры таксама разглядаюць парушэнні свабоды асацыяцыі і дазваляюць прадстаўнікам арганізацый працадаўцаў або працаўнікоў падаваць прадстаўленні адносна невыканання ратыфікаваных Канвенцый МАП. | Фіксацыя парушэнняў Канвенцый МАП; рэкамендацыі дзяржавам адносна ліквідацыі парушэнняў; прынясце мер у адказ на невыкананне дзяржавай рэкамендацый.<br><br>Кіраўнічы орган можа разгледзець магчымасць часовых мер у рамках працэдуры абскарджання.<br><br>Рэгулярныя і спецыяльныя наглядныя працэдуры МАП узаемазвязаныя: рэгулярныя працэсы часта становяцца штуршком для ініцыявання спецыяльных мер. | Хаця мандат МАП абмяжоўваецца працоўнымі правамі, яе працэдуры могуць быць карысным інструментам забеспячэння адказнасці ў кантэксце працяглых рэпрэсій супраць незалежных прафсаюзаў і пераследу працаўнікоў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах.<br><br>МАП забяспечвае трохбаковую структуру, якая ўключае ў сябе ўрады, прадстаўнікоў працадаўцаў і працаўнікоў, а таксама дазваляе трохбаковае ўзаемадзеянне па-за межамі фармальных працэдур МАП. | Механізмы МАП не дазваляюць пацярпелым або АГС (акрамя прафсаюзаў) падаваць скаргі, удзельнічаць у расследаванні фактаў або атрымліваць акрэдытацыю для ўдзелу.<br><br>Тым не менш, з гэтым механізмам можна ўзаемадзейнічаць праз адвакацыю дзеянняў дзяржавы і прадастаўленне інфармацыі і вынікаў дакументавання пра парушэнні працоўных правоў суб’ектам МАП. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (GIEB)**<br><br>**(Іншае)** | Група з трох незалежных экспертаў з мандатам на расследаванне, дакументаванне і аналіз парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, здзейсненых з 1 траўня 2020 года.<br><br>Група працягвае працу былой Экспертызы УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (сакавік 2021 – сакавік 2024). | Каб група магла працягваць сваю дзейнасць, яе мандат мусіць штогод абнаўляцца. | Падае справаздачы ў Савет ААН па правах чалавека; дакументуе і захоўвае доказы; павышае інфармаванасць праз прэс-рэлізы і публічныя заявы. | Група працуе аўтаномна, праводзіць уласныя расследаванні, фармулюе фактычныя і прававыя высновы і рэкамендацыі.<br><br>У яе мандат уваходзіць расследаванне і ўстанаўленне фактаў усіх меркаваных парушэнняў правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі з 1 траўня 2020 года, збор, захаванне і аналіз адпаведных доказаў, а таксама выпрацоўка рэкамендацый з мэтай спынення беспакаранасці.<br><br>Група можа расследаваць экстратэрытарыяльныя парушэнні, звязаныя з беларускім кантэкстам (напрыклад, у дачыненні да беларусаў у выгнанні) і аналізаваць ролю трэціх дзяржаў, прыватных суб'ектаў і структурныя прычыны парушэнняў. | Прыватныя асобы, групы і арганізацыі могуць даваць Групе інфармацыю.<br><br>Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама маюць магчымасць узаемадзейнічаць з Групай падчас кансультацый, якія праводзяцца яе экспертамі. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Дагаворныя органы ААН**<br><br>**(Іншае)** | Камітэты экспертаў ААН, якія адсочваюць выкананне дзяржавамі асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека.<br><br>Беларусь з’яўляецца ўдзельніцай ICCPR (Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах), ICESCR (Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах), ICERD (Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі), CEDAW (Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын), CAT (Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, нечалавечых або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання), CRC (Канвенцыя аб правах дзіцяці) і CRPD (Канвенцыя аб правах асоб з інваліднасцю). | Перыядычныя агляды запланаваны раз на 4-5 гадоў.<br><br>У цяперашні час для Беларусі даступная толькі працэдура індывідуальных скаргаў паводле Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW).<br><br>Толькі Камітэт супраць катаванняў (CAT) і Камітэт CEDAW маюць кампетэнцыю распачаць краінавае расследаванне. | Заключныя заўвагі па выніках перыядычных аглядаў; рашэнні па індывідуальных скаргах; рэзюмэ (канфідэнцыйных) краінавых расследаванняў; прэс-рэлізы і публічныя заявы. | Аўтарытэтная і публічная фіксацыя парушэнняў, а таксама прыцягненне ўвагі да парушэнняў правоў чалавека. | Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падаваць інфармацыю пра правы чалавека на розных этапах працэсу справаздачнасці ў межах перыядычных аглядаў, а таксама заахвочваць дагаворныя органы ініцыяваць краінавае расследаванне.<br><br>Пацярпелыя могуць падаваць індывідуальныя скаргі адносна парушэнняў іх правоў. |

| Механізм (Тып адказнасці) | Што гэта? | Якія перадумовы? | Якія магчымыя вынікі? | Якая дадатковая вартасць? | Як могуць удзельнічаць ахвяры або АГС? |
|---|---|---|---|---|---|
| **Спецыяльныя працэдуры ААН**<br>**(Іншае)** | Незалежныя эксперты ў галіне правоў чалавека, якім даручана расследаванне, падрыхтоўка дакладаў і фармуляванне рэкамендацый адносна тэматычных або краінавых пытанняў у сферы правоў чалавека.<br>Мандат Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі быў створаны ў ліпені 2012 года.<br>Тэматычныя мандаты па катаваннях, адвольных затрыманнях, пазасудовых, без належнага судовага разбору і адвольных пакараннях смерцю, а таксама па гвалтоўных знікненнях маюць асаблівую актуальнасць для Беларусі. | Мандаты падлягаюць перыядычнаму абнаўленню.<br>Тэматычныя мандаты могуць расследаваць, рыхтаваць даклады і весці дзейнасць па пытаннях правоў чалавека ў любой дзяржаве – удзельніцы ААН, незалежна ад яе дагаворных абавязацельстваў. | За выключэннем краінавых візітаў, магчымасці працы Спецыяльных працэдур не залежаць ад згоды, ратыфікацыі або прызнання з боку дзяржавы. | Штогадовыя даклады ў Савет ААН па правах чалавека; камунікацыі ў форме лістоў са сцверджаннямі або тэрміновых зваротаў; магчымасць падачы меркавання *amicus curiae* ў нацыянальных і міжнародных судовых працэсах; краінавыя візіты для ацэнкі сітуацыі з правамі чалавека.<br>Спецыяльныя працэдуры застаюцца жыццёва важным механізмам пры адсутнасці сапраўднага супрацоўніцтва з боку ўладаў Беларусі. | Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падаваць інфармацыю аб меркаваных парушэннях, звычайна праз анлайн-форму. |
| **Маскоўскі механізм АБСЕ**<br>**(Іншае)** | Механізм АБСЕ, які дазваляе дзяржавам – удзельніцам АБСЕ ствараць адмысловыя місіі незалежных экспертаў для расследавання сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека. | Маскоўскі механізм можа быць ініцыяваны самой дзяржавай-удзельніцай, а таксама адной або некалькімі дзяржавамі за згоды дзяржавы, падлеглай разгляду, або любой дзяржавай-удзельніцай пры падтрымцы як мінімум пяці іншых дзяржаў, незалежна ад згоды дзяржавы, падлеглай разгляду. | Устанаўленне фактаў і падрыхтоўка дакладаў; фармуляванне рэкамендацый, скіраваных як разгляданай дзяржаве, так і іншым дзяржавам – удзельніцам АБСЕ і міжнароднай супольнасці. | Зноў ініцыяваны Маскоўскі механізм мог бы засяродзіцца на ацэнцы ў кантэксце міжнароднага крымінальнага права (у параўнанні з папярэднімі, якія былі засяроджаны на праве правоў чалавека). Ён мог бы таксама даследаваць транснацыянальныя рэпрэсіі супраць беларускай супольнасці ў выгнанні. | Хоць пацярпелыя не маюць фармальнай ролі, яны і арганізацыі грамадзянскай супольнасці робяць значны ўнёсак праз сведчанні і дакументаванне, удзел у інтэрв'ю і інфармаванне дакладчыкаў. |

# В. Рэкамендацыі дзяржавам

## На нацыянальным узроўні

**Забеспячэнне прававых рамак для эфектыўнага расследавання і пераследу парушэнняў міжнароднага крымінальнага права:**

- Дзяржавы мусяць забяспечыць поўнае ўключэнне злачынстваў супраць чалавечнасці ў нацыянальнае заканадаўства, у тым ліку ўсе асноўныя акты злачынстваў, калі яны здзяйсняюцца ў рамках шырокамаштабнага або сістэматычнага нападу на грамадзянскае насельніцтва. Адначасова дзяржавы мусяць крыміналізаваць катаванні, вымушаныя знікненні, сексуальны і гендарна абумоўлены гвалт як асобныя злачынствы ў нацыянальным праве. У абодвух выпадках нацыянальнае заканадаўства мусіць утрымліваць выразныя палажэнні аб формах адказнасці, якія адпавядаюць міжнародным стандартам (у тым ліку непасрэдны ўдзел, механізмы сумеснай злачыннай дзейнасці і камандную адказнасць). Дзяржавы мусяць забяспечыць, каб гэтыя злачынствы мелі адпаведныя пакаранні, якія адлюстроўваюць іх цяжкасць.

- Дзяржавы мусяць замацаваць у сваім нацыянальным заканадаўстве палажэнні аб універсальнай юрысдыкцыі ў адпаведнасці са сваімі міжнародна-прававымі абавязацельствамі і забяспечыць адпаведнасць азначэнняў міжнародных злачынстваў міжнароднаму праву.

- Дзяржавы мусяць скасаваць любыя імунітэты і часавыя абмежаванні, якія могуць перашкаджаць расследаванню міжнародных злачынстваў і пераследу дзяржаўных службоўцаў.

- Дзяржавы мусяць ліквідаваць любыя патрабаванні адносна грамадзянства або месца жыхарства ў справах у рамках універсальнай юрысдыкцыі, каб расследаванні маглі пачынацца нават у тым выпадку, калі злачынца або ахвяра не з'яўляюцца грамадзянамі дадзенай дзяржавы.

- Дзяржавы мусяць даць магчымасць нацыянальным крымінальна-прававым органам распачынаць структурныя расследаванні асноўных міжнародных злачынстваў без неабходнасці прысутнасці злачынцы на тэрыторыі дзяржавы, якая вядзе расследаванне.

**Стварэнне спецыялізаваных структур і вылучэнне дастатковых рэсурсаў для расследавання і пераследу парушэнняў міжнароднага крымінальнага права:**

- Дзяржавы мусяць стварыць спецыялізаваныя падраздзяленні ў складзе паліцыі і пракуратуры, адказныя за расследаванне і пераслед міжнародных злачынстваў.

- Дзяржавы мусяць забяспечыць вылучэнне дастатковых фінансавых і чалавечых рэсурсаў для расследавання і пераследу міжнародных злачынстваў у рамках экстратэрытарыяльнай і ўніверсальнай юрысдыкцыі.

- Дзяржавы мусяць інвеставаць у неабходную тэхнічную экспертызу, у тым ліку ў судова-медыцынскія, лічбавыя, фінансавыя і гендарна адчувальныя кампетэнцыі, каб паспяхова ажыццяўляць комплекснае расследаванне і пераслед міжнародных злачынстваў.

- Дзяржавы мусяць забяспечыць эфектыўную каардынацыю і абмен інфармацыяй паміж адпаведнымі нацыянальнымі органамі для садзейнічання пераследу ў рамках экстратэрытарыяльнай і універсальнай юрысдыкцыі.

## На міжнародным узроўні

**Узмацненне супрацоўніцтва ў сферы пераследу ў рамках экстратэрытарыяльнай і ўніверсальнай юрысдыкцыі за злачынствы, здзейсненыя рэжымам Беларусі:**

- Дзяржавы мусяць супрацоўнічаць у расследаваннях супраць меркаваных беларускіх злачынцаў праз узаемную прававую дапамогу і праз Аналітычны праект Еўрапола па асноўных міжнародных злачынствах (AP CIC).

- Дзяржавы мусяць разгледзець стварэнне Сумеснай следчай групы пад каардынацыяй Еўраюста для паляпшэння міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў экстратэрытарыяльных расследаваннях і пераследзе злачынстваў, здзейсненых беларускімі службовымі асобамі.

- Дзяржавы мусяць умацоўваць супрацоўніцтва на міжнародным узроўні ў галіне пераследу міжнародных злачынстваў праз падпісанне, ратыфікацыю і прымяненне адпаведных дагавораў, такіх як Люблянска-Гаагская канвенцыя.

**Падтрымка папярэдняга вывучэння сітуацыі Літва/Беларусь Пракурорам МКС:**

- Дзяржавы мусяць далучыцца да звароту Літвы адносна сітуацыі Літва/Беларусь у Міжнародны крымінальны суд (МКС) і выказаць падтрымку працы Суда ў прыцягненні да адказнасці за парушэнні міжнароднага крымінальнага права, здзейсненыя хоць бы часткова на тэрыторыі Літвы і іншых дзяржаў – удзельніц Рымскага статута.

- Дзяржавы мусяць забяспечыць дастатковыя рэсурсы для МКС і яго здольнасць правесці магчымыя расследаванні адносна сітуацыі Літва/Беларусь.

**Ініцыяванне механізмаў для ліквідацыі прабелаў у забеспячэнні адказнасці, узмацнення механізмаў рэпарацый і прадухілення будучых парушэнняў правоў чалавека:**

- Дзяржавы мусяць падтрымліваць працэсы, якія забяспечваюць рэстытуцыю, кампенсацыю, рэабілітацыю, меры сатысфакцыі і гарантыі непаўтарэння для беларускіх пацярпелых ад парушэнняў правоў чалавека.

- Дзяржавы мусяць ініцыяваць справу супраць Беларусі ў Міжнародным судзе ААН па спрэчцы, звязанай з Канвенцыяй супраць катаванняў або Канвенцыяй аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын.

- Дзяржавы мусяць паўторна прымяніць Маскоўскі механізм АБСЕ і прызначыць дакладчыка для ацэнкі працяглых сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека ў кантэксце міжнароднага крымінальнага права і для дакументавання транснацыянальных рэпрэсій супраць беларускай супольнасці ў выгнанні.

- Дзяржавы мусяць працягваць выкарыстоўваць звычайныя і спецыяльныя наглядныя працэдуры Міжнароднай арганізацыі працы для рэагавання на рэпрэсіі супраць незалежных прафсаюзаў і на пераслед працаўнікоў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах.

**Працяг мандатаў механізмаў ААН, адказных за маніторынг і расследаванне парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі:**

- Дзяржавы мусяць падтрымаць працяг мандата Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (GIEB), якая расследуе парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, здзейсненыя з 1 траўня 2020 года, збірае, кансалідуе, захоўвае і аналізуе доказы гэтых парушэнняў.

- Дзяржавы мусяць падтрымаць працяг мандата Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, які ажыццяўляе маніторынг і падае даклады аб сітуацыі ў Беларусі.

**Падтрымка беларускіх праваабарончых арганізацый, незалежных адвакатаў, журналістаў і ініцыятыў па прыцягненні да адказнасці:**

- Дзяржавы мусяць падтрымліваць беларускія праваабарончыя арганізацыі, незалежных адвакатаў і журналістаў.

- Дзяржавы мусяць супрацоўнічаць з пацярпелымі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, асабліва з тымі, якія збіраюць доказы парушэнняў міжнароднага права правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права.

- Дзяржавы мусяць падтрымліваць незалежныя ініцыятывы па прыцягненні да адказнасці, накіраваныя на збор, захаванне і аналіз доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія складаюць злачынствы паводле міжнароднага права, меркавана здзейсненыя ўладамі Беларусі.

# C. Як Платформа IAPB падтрымлівае механізмы прыцягнення да адказнасці для Беларусі?

Дакументаванне парушэнняў правоў чалавека і міжнародных злачынстваў арганізацыямі грамадзянскай супольнасці мае ключавое значэнне для падтрымкі механізмаў забеспячэння адказнасці ў дачыненні да Беларусі. Праз абмежаваны доступ да пацярпелых і на тэрыторыю краіны арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС) часта становяцца першымі, хто дапамагае пацярпелым пры катаваннях і іншых сур'ёзных парушэннях правоў чалавека, а таксама збірае доказы гэтых злачынстваў, пакуль іх яшчэ можна захаваць. Без іх намаганняў жыццёва важныя доказы цяжкіх злачынстваў могуць быць забыты, знішчаны, знікнуць або згубіцца і ніколі не трапіць у працэсы прыцягнення да адказнасці. Як вядомыя і аўтарытэтныя арганізацыі, АГС часта маюць давер пацярпелых супольнасцяў і могуць атрымаць доступ да асоб і груп, з якімі цяжка ўстанавіць кантакт і якія, у выніку, рызыкуюць быць недастаткова прадстаўленымі ў працэсах прыцягнення да адказнасці.

Практыка рэагавання на злачынствы ў іншых кантэкстах, дзе расследаванні на нацыянальным узроўні і праца пракуратуры падтрымліваліся дакументаваннем АГС, як, напрыклад, у Сірыі ці Украіне, паказвае важнасць супрацоўніцтва паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і органамі пракуратуры. Як зазначаюць Еўраюст і Міжнародны крымінальны суд (МКС), грамадзянская супольнасць напрацавала велізарны досвед і інструменты для збору і захавання доказаў, праверкі і аналізу інфармацыі, а таксама падтрымкі расследаванняў, якія праводзяцца нацыянальнымі крымінальна-прававымі органамі і міжнароднымі механізмамі прыцягнення да адказнасці, такімі як МКС, Камісіі ААН па расследаванні і іншыя следчыя механізмы ААН[1].

Акрамя дакументавання, АГС адыгрываюць ключавую ролю ў адсочванні перамяшчэння падазраваных у міжнародных злачынствах, выкарыстоўваючы метады расследавання па адкрытых крыніцах, а таксама ў зборы сведчанняў, доказаў датычнасці і іншай інфармацыі, атрыманай ад ахвяр і пацярпелых супольнасцяў. Гэтая інфармацыя можа перадавацца органам пракуратуры і стаць вырашальнай для затрымання падазраваных у міжнародных злачынствах. Такія формы супрацоўніцтва з'яўляюцца важным элементам эфектыўных намаганняў па забеспячэнні адказнасці і патрабуюць далейшага развіцця для ўзмацнення адказнасці за злачынствы ў Беларусі.

## Чым займаецца Платформа IAPB?

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB) – гэта незалежная, няўрадавая ініцыятыва, якая збірае, верыфікуе, кансалідуе, захоўвае і аналізуе доказы сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека, што могуць складаць злачынствы паводле міжнароднага права і, меркавана, былі здзейсненыя ўладамі Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і ў наступныя гады.

1 Еўраюст, Дакументаванне міжнародных злачынстваў і парушэнняў правоў чалавека у мэтах крымінальнай адказнасці: Дапаможнік для арганізацый грамадзянскай супольнасці.

Платформа IAPB дакументуе гэтыя злачынствы ў рамках крымінальнага права і індывідуальнай крымінальнай адказнасці, забяспечвае допушчальнасць сабраных доказаў у працэдурах крымінальнага правасуддзя і іх адпаведнасць стандартам у галіне правоў чалавека. Платформа аказвае дапамогу органам крымінальнага правасуддзя і міжнародным механізмам забеспячэння адказнасці ў расследаванні і пераследзе меркаваных злачынцаў праз перадачу якасных доказаў і прававога аналізу.

## Як Платформа IAPB падтрымлівае пракурораў і механізмы забеспячэння адказнасці?

Платформа IAPB на запыт дае доказы і інфармацыю для падтрымкі расследаванняў злачынстваў паводле міжнароднага права, якія праводзяцца пракуратурамі і міжнароднымі механізмамі забеспячэння адказнасці (з захаваннем інфармаванай згоды пацярпелых/сведак адносна іх паказанняў):

- **Нацыянальны пераслед у рамках нацыянальных прававых сістэм**
- **Справы ў рамках універсальнай юрысдыкцыі**
- **Міжнародны крымінальны суд**
- **Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі**
- **Маскоўскі механізм АБСЕ**
- **Адвакаты і арганізацыі грамадзянскай супольнасці**

**Усе ўзаемадзеянні з'яўляюцца канфідэнцыйнымі, адпавядаюць прававым нормам па абароне дадзеных, а таксама найлепшым практыкам міжнародных крымінальных расследаванняў.** Індывідуальна забяспечаныя інфармацыйныя прасторы дазваляюць падабраць і бяспечна перадаць адпаведныя доказы адпаведнаму следчаму органу.

## Якія віды доказаў збірае Платформа IAPB?

Платформа IAPB збірае і захоўвае шырокі спектр доказных матэрыялаў, забяспечваючы іх адпаведнасць крымінальна-працэсуальным стандартам. Усе матэрыялы сістэматычна маркіруюцца для палягчэння пошуку ў закрытай базе дадзеных.

**Інтэрв'ю і дакументацыя з закрытых крыніц:**

- **Інтэрв'ю з пацярпелымі і сведкамі**: пабудаваныя ў адпаведнасці з прававымі нормамі, заснаваныя на мадэлі PEACE, з улікам траўматычнага досведу, запісваюцца з інфармаванай згоды апытанага.
- **Дакументы**: юрыдычныя матэрыялы, пастановы аб затрыманні, судовыя рашэнні і афіцыйныя пастановы.
- **Медыцынскія заключэнні**: судова-медыцынскія доказы, што пацвярджаюць факты катавання і жорсткага абыходжання.

- **Аўдыявізуальныя матэрыялы**: відэа, фотаздымкі і аўдыязапісы, звязаныя з адпаведнымі інцыдэнтамі.
- **Кароткі пераказ паказанняў сведак** для палягчэння аналізу матэрыялаў, перададзеных знешнім органам правасуддзя.

**Расследаванне па адкрытых крыніцах:**

- Выкарыстанне прафесійнага **сховішча адкрытых крыніц** з больш чым **1,5 мільёна запісаў**.
- **Верыфікацыя адабраных аўдыявізуальных і іншых лічбавых доказаў**, для забеспячэння іх надзейнасці ў судовых працэсах.
- **Праактыўнае адсочванне адпаведнай інфармацыі** ў адказ на запыты органаў пракуратуры, для забеспячэння адпаведнасці пабудовы спраў зменлівым патрэбам следства.

**Аналітычныя прадукты:**

- Каманда юрыстаў і следчых Платформы IAPB рыхтуе высокаспецыялізаваныя аналітычныя прадукты **ў адказ на запыты**.
- Платформа робіць **структураваную ацэнку** дзяржаўнай палітыкі, рыхтуе аналіз датычнасці меркаваных злачынцаў і дзяржаўных структур.
- Можа быць выкананы паглыблены прававы і факталагічны аналіз **канкрэтных злачынстваў або тэматычных кірункаў**.
- Выяўленыя Платформай IAPB заканамернасці могуць дапамагчы ва ўстанаўленні факту **масавых і сістэматычных дзяржаўных практык**.

**Прынцыпы збору доказаў**

- **Стандарты крымінальнага правасуддзя**. Сабраныя доказы адпавядаюць патрабаванням для выкарыстання ў судовых працэсах.
- **Строгі, дакументаваны і правяральны ланцужок захоўвання**. Поўная дакументацыя працэсу атрымання, захоўвання і захавання доказаў.
- **Падыход, арыентаваны на пацярпелых**. Прыярытэтнасць бяспекі, годнасці і дабрабыту пацярпелых.
- **Інфармаваная згода**. Забеспячэнне добраахвотнага і дакументаванага ўдзелу сведак.
- **Абарона дадзеных (згодна з GDPR)**. Бяспечнае захоўванне і кантраляваны доступ да адчувальнай інфармацыі**.**
- **Верыфікацыя і пацвярджэнне.** Скрыжаваная праверка розных крыніц для пацвярджэння сапраўднасці, забеспячэння надзейнасці і павышэння доказнай вартасці інфармацыі і матэрыялаў.
- **Гендарна адчувальны падыход.** Прызнанне і дакументаванне выпадкаў гендарнага гвалту і дыскрымінацыі.

## Як пабудавана Платформа IAPB?

Асноўнай перавагай Платформы з'яўляецца спалучэнне нацыянальнай і міжнароднай экспертызы. Беларускія партнёры Платформы – Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі – карыстаюцца даверам пацярпелых і сведак, што спрыяе збору інфармацыі. Дзве міжнародныя арганізацыі, DIGNITY і REDRESS, забяспечваюць спецыялізаваныя веды ў сферы міжнароднага крымінальнага права, якія датычацца доказных і аналітычных прадуктаў, а таксама доступ да шырокай міжнароднай сеткі.

Дзейнасць Платформы IAPB таксама атрымлівае падтрымку праз **Кансультацыйную раду** IAPB, у склад якой уваходзяць беларускія арганізацыі (не пералічаныя з меркаванняў бяспекі), Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR), Міжнародная федэрацыя за правы чалавека (FIDH), Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяр катаванняў (IRCT), Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, Лекары за правы чалавека (PHR), Рэпарцёры без межаў (RSF) і Сусветная арганізацыя супраць катаванняў (OMCT).

## Вынікі працы Платформы IAPB

Па стане на 31 жніўня 2025 года IAPB атрымала і апрацавала шэраг запытаў аб падтрымцы, у тым ліку:

- **9 афіцыйных запытаў ад 5 дзяржаў** аб доказнай падтрымцы ў бягучых расследаваннях.
- **5 запытаў ад органаў ААН па забеспячэнні адказнасці** (Экспертыза УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і Група Незалежных Экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі).
- **1 запыт ад дакладчыка Маскоўскага механізма АБСЕ**.
- **Звароты ад адвакатаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці,** якія займаюцца сітуацыяй у Беларусі**.**

# II. ІМКНЕННЕ ДА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ АДКАЗНАСЦІ: КАНТЭКСТ, ШЛЯХІ І ВЫКЛІКІ

## A. Агульны кантэкст

З траўня 2020 года ў Беларусі назіраецца значнае пагаршэнне і без таго трывожнай сітуацыі з правамі чалавека, звязанае са спрэчнымі прэзідэнцкімі выбарамі ў жніўні 2020 года і наступнай арганізаванай кампаніяй рэпрэсій супраць рэальных або меркаваных крытыкаў рэжыму Лукашэнкі[2].

Сур'ёзныя парушэнні былі дакументаваны праваабарончымі арганізацыямі, у першую чаргу, Праваабарончым цэнтрам «Вясна» («Вясна»), Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі (МК), Міжнароднай платформай па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB), шэрагам беларускіх і міжнародных праваабарончых арганізацый, а таксама міжнароднымі структурамі – Упраўленнем Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ), Групай незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (ГНЭБ), Спецыяльным дакладчыкам ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і дакладчыкам Маскоўскага механізма АБСЕ. Гэтыя парушэнні былі адлюстраваны ў шэрагу заяў і рэзалюцый, прынятых Еўрапейскім парламентам і Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы (ПАСЕ).

Сярод зафіксаваных парушэнняў (пададзены ніжэй пералік не з'яўляецца вычарпальным):

- **Шырокамаштабныя адвольныя затрыманні і парушэнні правоў на належны судовы разбор.** Асобы, якія выступаюць супраць улады або ўспрымаюцца як яе апаненты, падвяргаліся незаконным затрыманням, утрыманню пад вартай і судовым разборам з «папярэдне вызначаным вынікам, у ходзе якіх парушаліся гарантыі належнай працэдуры і справядлівага суда»[3]. Такія працэсы часта праводзяцца без удзелу адвакатаў, у закрытым рэжыме, з выкарыстаннем фальшывых сведак і/або прымусовых прызнанняў[4]. Па стане на красавік 2025 г. пад вартай заставаліся больш за 1200 палітычных зняволеных, у тым ліку такія вядомыя дзеячы, як Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч, Марыя Калеснікава, Уладзімір Лабковіч, Андрэй Чапюк, Наста Лойка[5]. Акрамя таго, улады распачалі рэпрэсіўную кампанію супраць адвакатаў, пазбаўляючы права на адвакацкую дзейнасць, арыштоўваючы і змушаючы да эміграцыі адвакатаў, якія прадстаўлялі інтарэсы пратэстоўцаў, праваабаронцаў і незалежных журналістаў[6].

---

2 ААН, Беларусь: Парушэнні застаюцца «шырокамаштабнымі і сістэматычнымі», заявіла група незалежных экспертаў, 14 лютага 2025 г.

3 Савет ААН па правах чалавека, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, UN Doc. A/HRC/58/68, пункты 32–41, 7 лютага 2025 г.

4 Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, Трансляцыя «прызнанняў» – яшчэ адзін прыклад масавых парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, заявіў кіраўнік бюро АБСЕ па правах чалавека, 4 чэрвеня 2021 г.

5 «Вясна», Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, сакавік 2025 г., 8 красавіка 2025 г. Гл. таксама: Amnesty International, Беларусь: Прысуд праваабаронцам – «абуральная помста» за іх працу, 3 сакавіка 2023 г.

6 УВКПЧ, Даклад Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/55/61, пункт 21, 15 сакавіка 2024 г.

- **Магчымыя незаконныя забойствы.** Выпадкі магчымых незаконных забойстваў меркавана мелі месца падчас пратэстаў і ў кантэксце смерці ў зняволенні. Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі зафіксаваў некалькі смерцяў палітычных вязняў у зняволенні або неўзабаве пасля вызвалення за апошнія некалькі гадоў[7]. Як мінімум адзін чалавек загінуў падчас пратэстаў адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года[8].

- **Катаванні і жорсткае абыходжанне падчас пратэстаў, затрыманняў, утрымання пад вартай, транспарціроўкі і ператрусаў.** У справаздачах падрабязна апісваюцца выпадкі катаванняў і іншых відаў жорсткага, бесчалавечнага або прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання, у тым ліку празмернае і неразборлівае прымяненне сілы і менш смяротнай зброі (напрыклад, немэтазгоднае і/або непрапарцыйнае выкарыстанне электрашокераў, светлашумавых гранат, гумовых куляў і слезацечнага газу, выкарыстанне электрашокераў супраць адчувальных частак цела, падчас транспарціроўкі, допыту і/або ўтрымання пад вартай), з мэтай задушэння іншадумства[9].

- **Псіхалагічныя катаванні і жорсткае абыходжанне.** Падчас затрыманняў, транспарціроўкі і знаходжання пад вартай фіксаваліся пагрозы ў дачыненні да саміх затрыманых (напрыклад, пагрозы застрэліць, спаліць, збіць або згвалціць), пагрозы ў дачыненні да іх блізкіх (у тым ліку пагрозы згвалтавання жонкі, адабрання дзяцей або «візітаў» да сваякоў), прымус да запісу відэа з прызнаннем віны, а таксама славесныя абразы і прыніжэнне.

- **Сексуальны і гендарны гвалт.** Гэта ўключала згвалтаванне, пагрозы згвалтавання, выкарыстанне дыскрымінацыйнай або прыніжальнай лексікі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў і затрыманых. Затрыманыя жанчыны таксама сутыкаліся з пагрозамі разлучэння з дзецьмі[10].

- Бесчалавечныя ўмовы ўтрымання. Шматлікія сведчанні ўказваюць на сур'ёзную перапоўненасць камер, неналежны доступ да ежы і вады, экстрэмальныя тэмпературы ўнутры камер, працяглае выкарыстанне адзіночнага зняволення, адмову ў медыцынскай дапамозе і адвольнае падаўжэнне прысуду паводле артыкула 411 Крымінальнага кодэкса[11]. Асобы, затрыманыя ў кантэксце выказвання палітычнага іншадумства, утрымліваюцца ў значна больш жорсткіх умовах, чым пазбаўленыя волі не з палітычных прычын[12].

- **Выкарыстанне экстрэмісцкага заканадаўства як інструмента рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ**. На канец 2021 года ўсе незалежныя СМІ ў Беларусі былі абвешчаны экстрэмісцкімі фарміраваннямі, многія журналісты былі затрыманы і асуджаны[13]. Па стане на 31 кастрычніка 2024 года

---

7 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Беларусь: Эксперты ААН заклікаюць да расследавання смерцяў у зняволенні, 16 ліпеня 2025 г.
8 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека Бачэлет асуджае гвалтоўны адказ Беларусі на паслявыбарчыя пратэсты, 12 жніўня 2020 г.
9 ААН, Беларусь: Парушэнні застаюцца «шырокамаштабнымі і сістэматычнымі», заявіла група незалежных экспертаў, пункты 42–57, 14 лютага 2025 г.
10 Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB), Восьмая справаздача аб ходзе працы, 1 кастрычніка 2024 г. – 31 сакавіка 2025 г.
11 УВКПЧ, Беларусь: Трывожнае жорсткае абыходжанне з жанчынамі-зняволенымі і небяспечны для жыцця стан Вікторыі Кульшы, кажуць эксперты ААН, 26 сакавіка 2025 г.
12 УВКПЧ, Беларусь мусіць вызваліць усіх затрыманых па палітычных матывах і абараніць іх правы: эксперты ААН, 30 траўня 2023 г.
13 Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ), Рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў у 2024 годзе, спіс затрыманых, 5 лістапада 2024 г.

1161 НДА была ліквідавана або знаходзілася ў працэсе ліквідацыі[14]. На люты 2024 года таксама былі ліквідаваны ўсе незалежныя прафсаюзы[15].

- **Прымусовае перамяшчэнне і выгнанне.** Паводле розных крыніц, рэжым прымусіў сотні тысяч беларусаў да выгнання[16]. Паводле даклада УВКПЧ за сакавік 2024 года, з 2020 года з краіны вымушана выехалі да 300 000 чалавек у выніку мэтанакіраванай кампаніі задушэння крытыкі[17]. Гэта азначае, што кожны трыццаты жыхар краіны цяпер жыве ў выгнанні[18]. Паводле некаторых крыніц, на люты 2025 года гэты лік мог павялічыцца ўдвая – да 600 000 чалавек[19].

- **Транснацыянальныя рэпрэсіі.** Нават у выгнанні беларусы працягваюць сутыкацца з пераследам, у тым ліку з завочнымі палітычна матываванымі судовымі працэсамі, запалохваннем сваякоў, якія засталіся ў Беларусі, канфіскацыяй маёмасці, а таксама з абмежаваннямі на атрыманне пашпартоў і іншых дакументаў праз дыпламатычныя прадстаўніцтвы, што фактычна вымушае беларусаў вяртацца ў краіну для абнаўлення дакументаў[20]. Акрамя таго, улады Беларусі ўнеслі змены ў закон аб грамадзянстве, што дазваляюць пазбаўляць беларусаў, якія знаходзяцца за мяжой, грамадзянства ў выпадку асуджэння за так званы ўдзел у масавых беспарадках і на падставе іншых палітычна матываваных абвінавачанняў[21].

- **Шырокамаштабны і сістэматычны характар парушэнняў.** Арганізаваны і сістэматычны характар гэтых парушэнняў сведчыць пра наўмысную палітыку рэпрэсій, а не адзінкавыя інцыдэнты[22]. УВКПЧ адзначыла, што шэраг гэтых дзеянняў можа кваліфікавацца як злачынствы супраць чалавечнасці, з улікам іх шырокамаштабнага і сістэматычнага характару, а таксама накіраванасці супраць канкрэтнай групы грамадзянскага насельніцтва[23]. У 2025 г. Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі ў Беларусі прыйшла да высновы, што злачынствы, звязаныя з пазбаўленнем волі і пераследам, былі здзейснены ў дачыненні да значнай часткі насельніцтва – на падставе іх рэальных або меркаваных палітычных поглядаў[24].

---

14 Lawtrend, Маніторынг сітуацыі са свабодай асацыяцый і станам арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь, кастрычнік 2024 г.
15 УВКПЧ, Свабода асацыяцый знішчана ў Беларусі: Спецыяльны дакладчык, 3 ліпеня 2024 г.
16 Савет ААН па правах чалавека, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, UN Doc. A/HRC/58/68, пункт 58, 7 лютага 2025 г.
17 УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/55/61 (Папярэдняя неадрэдагаваная версія), пункт 47, 15 сакавіка 2024 г.
18 The Irish Times, Свежыя доказы могуць прывесці да поўнага расследавання МКС у дачыненні да рэжыму Беларусі, паводле інфармацыі FIDH, 30 сакавіка 2025 г.
19 Савет ААН па правах чалавека, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, UN Doc. A/HRC/58/68, пункт 58, 7 лютага 2025 г., са спасылкай на https://newideas.center/dyk-kolki-belarusa-z-ehala (на беларускай мове).
20 Даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі Нілса Муйжніекса, Даклад аб правах чалавека ў Беларусі, A/HRC/59/59, пункты 42, 45, 54–55, 22 красавіка 2025 г.; Human Rights Watch, Беларусь: Указ ставіць грамадзян у выгнанні пад пагрозу, 8 верасня 2023 г.; УВКПЧ, Беларусь: Эксперты ААН занепакоены шырокімі завочнымі судамі, 22 студзеня 2025 г.
21 Human Rights Watch, «Мы вас знойдзем»: глабальны погляд на тое, як урады рэпрэсуюць грамадзян за мяжой, 2024 г.
22 УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/55/61, пункт 51, 25 сакавіка 2024 г.
23 УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/55/61 (Папярэдняя неадрэдагаваная версія), пункт 52, 15 сакавіка 2024 г.; УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/52/68, пункт 54, 3 лютага 2023 г. Гл. таксама: «Вясна», «Улады Беларусі пераследуюць групу асоб, якіх яны лічаць нядобранадзейнымі». Юрыстка «Вясны» – на канферэнцыі АБСЕ, 11 кастрычніка 2024 г.; Прадстаўленне Article 19, Human Constanta, Access Now і Сусветнай арганізацыі супраць катаванняў (ОМСТ) Спецыяльнаму дакладчыку па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, 6 чэрвеня 2023 г.; Claire Mills, Беларусь: Праз год пасля спрэчных прэзідэнцкіх выбараў, с. 9–10, 5 кастрычніка 2021 г.
24 УВКПЧ, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, 7 лютага 2025 г.

# B. Розныя механізмы з адметнымі мэтамі і вынікамі

На нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях створаны розныя механізмы для выканання асобных функцый, звязаных з рэалізацыяй і выкананнем міжнароднага права і прававых нормаў у галіне правоў чалавека, кожны з якіх мае свае перавагі і абмежаванні. Некаторыя механізмы спрыяюць забеспячэнню прыцягнення да адказнасці, іншыя ж накіраваны на аказанне палітычнага ціску на ўлады, прадухіленне парушэнняў правоў чалавека або ўстанаўленне фактычных дадзеных.

Хаця гэты дакумент у першую чаргу засяроджваецца на механізмах, скіраваных на забеспячэнне адказнасці[25], існуюць наступныя магчымыя інструменты:

- **Палітычныя і дыпламатычныя меры**. Ціск можа ажыццяўляцца па палітычных і дыпламатычных каналах, у тым ліку праз палітычныя заявы высокага ўзроўню або рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН, якія сігналізуюць пра міжнароднае асуджэнне і/або накіраваны на ізаляванне злачынцаў.

- **Санкцыйныя рэжымы.** Санкцыі сталі шырока ўжываным геапалітычным інструментам прымусовай дыпламатыі ў адказе міжнароднай супольнасці на грубыя парушэнні міжнароднага права, у тым ліку права правоў чалавека. Звычайна яны ўключаюць забарону на паездкі, замарожванне актываў, абмежаванні на фінансавыя аперацыі і могуць аказаць неадкладны рэпутацыйны ўплыў на асоб, якія знаходзяцца пад санкцыямі. У кантэксце Беларусі Еўрапейскі Саюз, ЗША, Вялікабрытанія і Канада ўвялі санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў, суддзяў, супрацоўнікаў сілавых структур і звязаных з дзяржавай арганізацый, якія маюць дачыненне да рэпрэсій і фальсіфікацыі выбараў[26]. Сектаральныя санкцыі былі ўведзены таксама ў дачыненні да нафтавай, калійнай і фінансавай галін Беларусі з мэтай абмежавання крыніц даходаў рэжыму[27].

  Санкцыі выконваюць функцыю стрымлівання (каб прадухіліць далейшыя злоўжыванні), функцыю асуджэння (праз публічнае выкрыццё і ганьбу парушальнікаў), прэвентыўную функцыю (абмяжоўваючы і парушаючы здольнасць рэжыму фінансаваць і падтрымліваць рэпрэсіі[28]) і карную функцыю (праз дыпламатычную ізаляцыю і абмежаванне доступу да жыццёва неабходных рэсурсаў або тэхналогій). Аднак санкцыі таксама нясуць пэўныя выклікі[29]. Іх уплыў можа быць абмежаваным у выпадку адсутнасці шырокай каардынацыі; яны могуць мець нежаданыя наступствы для насельніцтва, а таксама перашкаджаць

---

25 У галіне міжнароднага права правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права паняцце «прыцягненне да адказнасці» адносіцца да працэсаў і механізмаў, праз якія асобы, адказныя за сур'ёзныя парушэнні, выяўляюцца і прыцягваюцца да адказнасці. Гэтыя працэсы мусяць забяспечваць адпаведнае пакаранне для вінаватых, магчымасць рэабілітацыі і кампенсацыі для пацярпелых, пацвярджаць іх годнасць і спрыяць недапушчэнню такіх дзеянняў у будучыні.

26 Прэс-група Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў (EEAS): Сумесная заява ЕС, ЗША, Канады і Вялікабрытаніі з нагоды 4-й гадавіны сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў, 9 жніўня 2024 г. Гл. таксама: Timeline – санкцыі ЕС супраць Беларусі, Еўрапейскага савета і Савета Еўрапейскага Саюза; Дэпартамент фінансаў ЗША, Дэпартамент нацэлены на беларускія дзяржаўныя прадпрыемствы, дзяржаўных чыноўнікаў і самалёты Лукашэнкі, 24 сакавіка 2023 г.

27 Гл., напрыклад: Савет ЕС, 9 сакавіка 2022 г., Вайсковая агрэсія Расіі супраць Украіны: ЕС узгадняе новыя сектаральныя меры, накіраваныя супраць Беларусі і Расіі; Урад Вялікабрытаніі, Рэспубліка Беларусь (санкцыі) (выхад з ЕС) Палажэнні 2019, Тлумачальны мемарандум.

28 Антон Маісеенка, Злачынствы і санкцыі: па-за санкцыямі як інструментам знешняй палітыкі, с. 23, 2024 г.

29 REDRESS, Human Rights First, OSF, Raoul Wallenberg Centre for Human Rights і PADF, Ацэнка мэтавых санкцый: гнуткая структура для аналізу ўздзеяння, лістапад 2023 г.

падарожжам і, адпаведна, затрыманню вінаватых з мэтай іх прыцягнення да адказнасці за мяжой. Акрамя таго, санкцыі выклікаюць заклапочанасць у сувязі з пытаннямі належнай прававой працэдуры, празрыстасці, магчымасцю для фізічных і юрыдычных асоб аспрэчваць уключэнне ў санкцыйныя спісы, а таксама ў сувязі з правамі на справядлівы разгляд справы і эфектыўныя сродкі прававой абароны[30].

- **Ініцыятывы па ўстанаўленні ісціны**. Гэтыя механізмы накіраваны на стварэнне аўтарытэтнага дакументальнага сведчання пра парушэнні, тым самым спрыяючы рэабілітацыі пацярпелых супольнасцяў, а таксама прызнанню правапарушэнняў і пакут ахвяр і пацярпелых. Сярод такіх механізмаў – камісіі па ўстанаўленні ісціны і грамадскія расследаванні[31].

- **Крымінальны пераслед**. Найбольш прамая форма прыцягнення да адказнасці – гэта расследаванне і пераслед асоб, абвінавачваных у цяжкіх міжнародных злачынствах, з мэтай пакарання вінаватых і стрымлівання будучых парушэнняў правоў чалавека. Сярод магчымых інструментаў – Міжнародны крымінальны суд (МКС), гібрыдныя трыбуналы (такія як Спецыяльны суд па Сьера-Леонэ) і нацыянальныя суды, якія прыцягваюць абвінавачваных да адказнасці у рамках нацыянальнай або ўніверсальнай юрысдыкцыі[32].

- **Міждзяржаўныя справы ў Міжнародным судзе ААН (ICJ).** Міждзяржаўныя скаргі ў Міжнародны суд ААН забяспечваюць фармальны механізм, які дазваляе адной дзяржаве аспрэчваць інтэрпрэтацыю дагавора іншай дзяржавай, у тым ліку дагавораў у галіне правоў чалавека, якія бакі ратыфікавалі без агаворак адносна юрысдыкцыі Міжнароднага суда да ўзнікнення спрэчкі. Грунтуючыся на прынцыпе, што абарона правоў чалавека належыць усёй міжнароднай супольнасці (абавязацельствы *erga omnes*), гэты працэс накіраваны на забеспячэнне выканання і прымусу да выканання абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, спрыяючы забеспячэнню адказнасці і дыялогу паміж дзяржавамі.

- **Індывідуальныя скаргі ў дагаворныя органы ААН па правах чалавека**. Ахвяры парушэнняў правоў чалавека таксама могуць падаваць індывідуальныя скаргі ў дагаворныя органы ААН у галіне правоў чалавека, пры ўмове, што адпаведная дзяржава прызнала кампетэнцыю адпаведных Камітэтаў праз Факультатыўны пратакол або дэкларацыю[33]. Высновы гэтых органаў, так званыя «меркаванні», не з'яўляюцца юрыдычна абавязковымі, але ўтрымліваюць аўтарытэтную ацэнку таго, ці парушыла дзяржава-ўдзельніца палажэнні дагавора. Яны таксама вызначаюць крокі, якія дзяржава мусіць прыняць для ліквідацыі парушэнняў, хоць гэтыя меры і не падлягаюць прымусоваму выкананню.

- **Рэпарацыйныя і аднаўленчыя працэсы**. Часта адбываючыся паралельна з іншымі механізмамі, гэтыя працэсы засяроджваюцца на патрэбах і правах пацярпелых: яны ўключаюць пакрыццё шкоды, ушанаванне

30 Адсутнасць адэкватных сродкаў прававой абароны і недастатковыя працэсуальныя гарантыі для асоб пад санкцыямі ААН, што прывяло да парушэнняў асноўных правоў, прывяло да адмены санкцый у такіх выпадках, як Кадзі і іншыя супраць Савета ЕС, у адпаведнасці з рашэннем Суда першай інстанцыі ад 11 ліпеня 2007 г. Al-Bashir Mohammed Al-Faqih і іншыя супраць Савета ЕС, Рашэнне Генеральнага суда (Другая палата) ад 29 верасня 2010 г., T-135/06 да T-138/06.

31 Міжнародны цэнтр правасуддзя пераходнага перыяду (ICTJ), Ініцыятывы па пошуку праўды пад кіраўніцтвам грамадзянскай супольнасці: пашырэнне магчымасцяў для прызнання і кампенсацыі шкоды, красавік 2022 г.

32 Human Rights Watch, Узмацненне міжнароднага кантролю за злачынствамі ў Беларусі, 22 кастрычніка 2024 г.

33 Гл.: раздзел IV. B.

памяці, рэабілітацыю і інстытуцыйныя рэформы[34]. Іх мэта – выправіць шкоду і падтрымаць рэінтэграцыю пацярпелых у грамадства. Яны могуць рэалізоўвацца ў розных фарматах, такіх як адміністрацыйныя праграмы пакрыцця шкоды, рэестры нанесеных страт і спецыяльныя камісіі для разгляду прэтэнзій.

# C. Што мы маем на ўвазе пад забеспячэннем адказнасці?

У галіне міжнароднага права правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права паняцце «прыцягненне да адказнасці» адносіцца да працэсаў і механізмаў, праз якія асобы, адказныя за сур'ёзныя парушэнні, выяўляюцца і прыцягваюцца да адказнасці. Гэтыя працэсы мусяць забяспечваць адпаведнае пакаранне для вінаватых, магчымасць рэабілітацыі і кампенсацыі для пацярпелых, пацвярджаць іх годнасць і спрыяць недапушчэнню такіх дзеянняў у будучыні[35]. Забеспячэнне адказнасці можа ажыццяўляцца на двух узроўнях: **адказнасць дзяржавы** і **індывідуальная крымінальная адказнасць**. Яны функцыянуюць у межах розных прававых рамак і маюць розныя, хоць і ўзаемадапаўняльныя, мэты:

- **Адказнасць дзяржавы.** На дзяржаўным узроўні міжнароднае права прызнае адказнасць дзяржаў за супрацьпраўныя дзеянні іх службовых асоб, прадстаўнікоў або іншых асоб, што дзейнічаюць ад імя дзяржавы, у тым ліку за парушэнні міжнароднага права ў галіне правоў чалавека, крымінальнага і гуманітарнага права[36]. Дзяржава можа быць прызнана адказнай за палітыку або сістэмныя практыкі, якія парушаюць яе міжнародныя абавязацельствы, такія як забарона катаванняў, гвалтоўных знікненняў або задушэння іншадумства[37]. Сродкі прававой абароны могуць уключаць пакрыццё шкоды пацярпелым або грамадству ў цэлым, публічнае прызнанне супрацьпраўных дзеянняў, інстытуцыйныя рэформы і гарантыі непаўтарэння[38]. Адказнасць дзяржавы, як правіла, вырашаецца ў рамках міждзяржаўных судовых працэсаў у рэгіянальных ці міжнародных судах, такіх як Міжнародны суд ААН (ICJ)[39].

- **Індывідуальная крымінальная адказнасць**. На індывідуальным узроўні прыцягненне да адказнасці адлюстроўваецца ў прынцыпе індывідуальнай крымінальнай адказнасці, які ахоплівае як асоб, што непасрэдна здзейснілі міжнародныя злачынствы, так і тых, хто нясе адказнасць як ускосныя выканаўцы ці саўдзельнікі або нясе другасную адказнасць за падбухторванне, садзейнічанне або непрыняцце мер па недапушчэнні і пакаранні такіх злачынстваў у якасці камандзіраў ці кіраўнікоў. Індывідуальная крымінальная адказнасць скіравана на прымяненне пакарання ў дачыненні да вінаватых. Яна ўмацоўвае прынцып таго, што ніхто не можа быць вышэйшым за закон. Прынцып індывідуальнай крымінальнай адказнасці забяспечваецца праз судовыя механізмы, такія як Міжнародны крымінальны суд,

34 Гл. агулам: Інструкцыя Генеральнага сакратара ААН: Падыход ААН да правасуддзя пераходнага перыяду, сакавік 2010 г.
35 УВКПЧ, Асноўныя прынцыпы і кіраўнічыя палажэнні ААН адносна права на сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды для ахвяр грубых парушэнняў міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і сур'ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права, арт. 2, I, 2, 16 снежня 2025 г.
36 Камісія міжнароднага права ААН, Адказнасць дзяржаў за міжнародны супрацьпраўны акт, 2001 г.
37 Камісія міжнароднага права ААН, Праекты артыкулаў аб адказнасці дзяржаў за міжнародна супрацьпраўныя дзеянні, з каментарыямі, 2001 г.
38 Савет ААН па правах чалавека, Даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытаннях прасоўвання ісціны, правасуддзя, рэпарацый і гарантый непаўтарэння, UN Doc. A/HRC/30/42 пункт 20 (c), 7 верасня 2015 г.
39 Яўгенія Андраюк і неназваны аўтар, Міжнародныя механізмы прыцягнення да адказнасці за парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, с. 2, студзень 2022 г.

нацыянальныя суды, якія прымяняюць нацыянальнае крымінальнае права, у тым ліку ўніверсальную юрысдыкцыю або юрысдыкцыі на падставе прынцыпу актыўнай або пасіўнай правасуб’ектнасці, або спецыяльныя трыбуналы, міжнародныя, нацыянальныя або гібрыдныя.

# D. Чаму прыцягненне да адказнасці мае важнае значэнне?

Беспакаранасць з’яўляецца найбольшай перашкодай для дасягнення справядлівасці і кампенсацыі для ахвяр і пацярпелых, а таксама спрыяе паўтарэнню парушэнняў правоў чалавека. І наадварот, забеспячэнне адказнасці гарантуе, што вінаватыя будуць асуджаны і панясуць адпаведнае пакаранне, што можа служыць магутным стрымальным фактарам супраць будучых злоўжыванняў.

Калі дзяржаўныя службовыя асобы і палітычныя лідары прыцягваюцца да адказнасці за сур’ёзныя парушэнні, гэта пасылае выразны сігнал, што такія дзеянні з’яўляюцца недапушчальнымі і не застануцца без наступстваў. Гэта таксама мае вырашальнае значэнне для пакрыцця шкоды, рэабілітацыі і аднаўлення пацярпелых. Акрамя таго, эфектыўныя меры прыцягнення да адказнасці адыгрываюць ключавую ролю ў (ад)будове грамадскага даверу і маральных падмуркаў грамадства. Праз адкрытыя судовыя працэсы, механізмы ўстанаўлення ісціны і пакрыццё шкоды можна аднавіць давер і сувязь паміж чалавекам і дзяржавай, што спрыяе шырэйшаму прымірэнню і дэмакратычнаму адраджэнню.

## Успрыманне справядлівасці пацярпелымі

Нядаўнія даследаванні, праведзеныя Праваабарончым цэнтрам «Вясна» і Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі (МК), даюць важнае разуменне таго, як беларусы, якія перажылі гвалт з боку дзяржавы, уяўляюць сабе справядлівасць і прыцягненне да адказнасці[40]. Вынікі паказваюць, што для пацярпелых справядлівасць выходзіць за межы проста пакарання вінаватых.

Для многіх справядлівасць уключае ў сябе публічнае прызнанне нанесенай шкоды, афіцыйнае прызнанне парушэнняў з боку дзяржаўных інстытутаў[41], кампенсацыю матэрыяльнай і маральнай шкоды, а таксама доступ да медычнай і псіхалагічнай рэабілітацыі[42]. Пацярпелыя таксама разглядаюць справядлівасць як калектыўны сацыяльны працэс, які звязвае індывідуальны досвед перажытага гвалту з больш шырокімі намаганнямі па дэмантажы рэпрэсіўных структур, што спрыялі такім парушэнням[43]. Гэтыя высновы сведчаць пра важнасць механізмаў пераходнага правасуддзя для ахвяр злачынстваў, здзейсненых дзяржавай, і даюць уяўленне аб ролі намаганняў па прыцягненні да крымінальнай адказнасці як важнай часткі поўнага і рэпарацыйнага правасуддзя.

40 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 20, 2024 г.
41 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 8, 2024 г.
42 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 31, 2024 г.
43 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 24, 2024 г.

## Прыцягненне да адказнасці і права на пакрыццё шкоды

Міжнароднае права паслядоўна звязвае прыцягненне да адказнасці з правам на пакрыццё шкоды і падкрэслівае абавязак дзяржаў забяспечваць пакрыццё шкоды як неад'емную частку механізмаў прыцягнення да адказнасці[44]. Рэгіянальныя і міжнародныя суды часта выносяць рашэнні аб пакрыцці шкоды як складніка прызнання адказнасці дзяржавы. Гэтак жа і нацыянальныя суды або трыбуналы прызначаюць пакрыццё шкоды пацярпелым у межах сваіх рашэнняў[45].

Асноўныя прынцыпы і кіраўнічыя палажэнні ААН адносна права на сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды для ахвяр грубых парушэнняў міжнароднага права ў галіне правоў чалавека называюць пяць формаў пакрыцця шкоды: рэстытуцыя, кампенсацыя, рэабілітацыя, сатысфакцыя і гарантыі непаўтарэння[46]. Гэтыя меры прызначаны не толькі для таго, каб кампенсаваць матэрыяльныя страты, але і для таго, каб вярнуць пацярпелым пачуццё чалавечай годнасці і даць ім належнае месца ў грамадстве[47].

У беларускім кантэксце пацярпелыя выразна падтрымліваюць уключэнне пакрыцця шкоды як неад'емнага элемента ўсіх намаганняў па забеспячэнні адказнасці. Больш за 75 % удзельнікаў даследавання адзначылі пакрыццё матэрыяльнай і маральнай шкоды, псіхалагічную дапамогу і публічнае аднаўленне рэпутацыі ахвяр як ключавыя фактары правасуддзя[48]. Акрамя таго, большасць заклікала да судовага перагляду палітычных спраў і рэабілітацыі ўсіх, хто быў несправядліва асуджаны за ажыццяўленне сваіх канстытуцыйных правоў[49].

# E. Выклікі ў забяспячэнні адказнасці ў Беларусі

Нягледзячы на пастаянныя намаганні нацыянальных і міжнародных суб'ектаў закласці асновы для правасуддзя, забяспячэнне значнай адказнасці за міжнародныя злачынствы, здзейсненыя ў Беларусі, па-ранейшаму сутыкаецца з палітычнымі, прававымі і практычнымі выклікамі:

- **Прыцягненне міжнароднай увагі і палітычнай волі.** На міжнародным узроўні сітуацыя ў сферы правоў чалавека з 2020 года істотна змянілася: палітычную, юрыдычную і медыйную ўвагу прыцягваюць міжнародныя ўзброеныя канфлікты ва Украіне і Газе. Гэта паспрыяла зніжэнню міжнароднай увагі да рэпрэсій, якія працягваюцца ў Беларусі[50].

44 УВКПЧ, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, прынятая 10 снежня 1984 г. рэзалюцыяй 39/46 Генеральнай Асамблеі ААН. Гл. далей: Канвенцыя супраць катаванняў, Заўвага агульнага парадку № 3 (2012) аб рэалізацыі артыкула 14 дзяржавамі-ўдзельніцамі, UN Doc. CAT/C/GC/3, 13 снежня 2012 г. Гл. таксама, напрыклад: Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, арт. 8; Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, арт. 2; Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, арт. 6; Міжнародная канвенцыя для абароны ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў, арт. 24; Канвенцыя (IV) аб законах і звычаях сухапутнай вайны, арт. 3; Звычайныя нормы міжнароднага гуманітарнага права Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, правіла 150.

45 МКС, Рымскі статут, арт. 75–79.

46 Генеральная Асамблея ААН, Асноўныя прынцыпы і кіраўнічыя палажэнні ААН адносна права на сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды для ахвяр грубых парушэнняў міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і сур'ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права, 16 снежня 2025 г., UN Doc. A/RES/60/147, 21 сакавіка 2006 г.

47 Гл. агулам: REDRESS, Практычная нататка 10: Кампенсацыя для пацярпелых ад катаванняў, люты 2024 г.

48 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 31, 2024 г.

49 Вясна і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 30, 2024 г.

50 Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB), Сёмая справаздача аб ходзе працы з 1 красавіка 2024 г. па 30 верасня 2024 г., с. 14, 2024 г.

- **Юрысдыкцыйныя абмежаванні міжнародных механізмаў.** Адзін з галоўных выклікаў у забеспячэнні крымінальнай адказнасці – гэта абмежаваная юрысдыкцыя міжнародных судоў. Беларусь не з'яўляецца дзяржавай – удзельніцай Рымскага статута, што выключае магчымасць прамой юрысдыкцыі МКС без накіравання справы з боку Савета Бяспекі ААН. Аднак у верасні 2024 года Літва падала зварот у МКС для ацэнкі юрысдыкцыі ў дачыненні да злачынстваў супраць чалавечнасці, у тым ліку злачынстваў дэпартацыі, пераследу і іншых бесчалавечных дзеянняў, здзейсненых беларускімі службовымі асобамі як мінімум з траўня 2020 года. Літва аргументавала, што асобныя аспекты гэтых злачынстваў мелі месца на тэрыторыі дзяржаў – удзельніц МКС, спасылаючыся на прэцэдэнт з сітуацыяй М'янмы і Бангладэша[51]. Хоць сам зварот з'яўляецца істотным крокам, нават у выпадку яго прыняцця ён ахоплівае толькі частку злачынстваў, якія меркавана былі здзейсненыя ў Беларусі[52].

- **Ідэнтыфікацыя і датычнасць злачынцаў.** Адзін з найбольш тэхнічна складаных аспектаў прыцягнення да адказнасці за сур'ёзныя міжнародныя злачынствы – гэта ідэнтыфікацыя вінаватых і ўстанаўленне іх датычнасці да канкрэтных **злачынстваў.** Каб выправіць сітуацыю, Платформа ІАРВ узмацніла працу па зборы і аналізе доказаў датычнасці[53].

- **Адсутнасць заканадаўства аб універсальнай юрысдыкцыі.** У некаторых дзяржавах адсутнічае заканадаўства аб універсальнай юрысдыкцыі. Без адпаведнага заканадаўства нацыянальныя суды не могуць расследаваць або пераследаваць злачынствы, здзейсненыя за мяжой, калі няма прамой сувязі з іх тэрыторыяй або грамадзянамі. Паводле Цэнтра справядлівасці і забеспячэння адказнасці, сорак дзяржаў яшчэ не ўвялі крымінальнай адказнасці за ніводнае асноўнае міжнароднае злачынства, такое як генацыд, злачынствы супраць чалавечнасці або ваенныя злачынствы, і не прызналі ніякай формы юрысдыкцыі адносна такіх злачынстваў, здзейсненых па-за межамі іх тэрыторый. Гэты прававы прабел абмяжоўвае колькасць юрысдыкцый, даступных для дасягнення правасуддзя, калі міжнародныя механізмы недаступныя або неэфектыўныя[54].

- **Інстытуцыйныя ваганні і прававая нявызначанасць.** Хаця шэраг еўрапейскіх дзяржаў распачалі разгляд спраў на падставе прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі, прагрэс застаецца павольным і некалькі юрысдыкцый, якія маюць доступ да пацярпелых і валодаюць дзеючымі прававымі механізмамі, усё яшчэ вагаюцца, ці распачынаць расследаванні. Такое ваганне можа вынікаць з недахопу рэсурсаў, палітычнай складанасці сітуацыі або неадназначнасці ў прававым вызначэнні характару здзейсненых злачынстваў[55]. Каб адказаць на гэтую праблему, Платформа ІАРВ аказвае падтрымку нацыянальным органам пракуратуры, імкнучыся скараціць недахоп інстытуцыйных і рэсурсных магчымасцяў[56].

---

51 МКС, Ліст, накіраваны Міністрам юстыцыі Літоўскай Рэспублікі ў МКС у сувязі з прадстаўленнем сітуацыі ў Беларусі, 30 верасня 2024 г.
52 Платформа ІАРВ, У Беларусі працягваюцца шырокамаштабныя рэпрэсіі, але адкрываюцца новыя магчымасці для прыцягнення вінаватых да адказнасці,7 лістапада 2024 г.
53 Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (ІАРВ), Сёмая справаздача аб ходзе працы з 1 красавіка 2024 г. па 30 верасня 2024 г., с. 11, 2024 г.
54 Clooney Foundation for Justice, Правасуддзе без межаў.
55 Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (ІАРВ), Сёмая справаздача аб ходзе працы з 1 красавіка 2024 г. па 30 верасня 2024 г., с. 14, 2024 г.
56 Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (ІАРВ), Восьмая справаздача аб ходзе працы, с. 4, 1 кастрычніка 2024 г. – 31 сакавіка 2025 г., 2025 г.

- **Адсутнасць або недафінансаванне падраздзяленняў па расследаванні жорсткіх злачынстваў.** Яшчэ адной істотнай перашкодай для забеспячэння адказнасці праз універсальную юрысдыкцыю з'яўляецца абмежаваны патэнцыял нацыянальных сістэм правасуддзя. Вельмі невялікая колькасць краін стварылі спецыялізаваныя падраздзяленні па ваенных злачынствах, і нават калі яны існуюць, яны часта вельмі малыя – часам усяго адзін-два супрацоўнікі, а таксама звычайна маюць недахоп фінансавання, кадраў і належнай падрыхтоўкі, што асабліва праблематычна з улікам складанасці такіх спраў[57].

- **Неналежная абарона сведак або яе адсутнасць.** Яшчэ адным выклікам для забеспячэння адказнасці ў межах універсальнай юрысдыкцыі з'яўляецца адсутнасць эфектыўных сістэм абароны сведак. Сацыяльныя сеткі, моўныя бар'еры і культурныя адрозненні могуць ускладняць намаганні ў іх абароне, а працэдуры перасялення часта цягнуцца доўга, дорага каштуюць і псіхалагічна складаныя для сведак і іх сем'яў. Вырашэнне гэтых праблем патрабуе скаардынаваных дзеянняў паміж дзяржавамі, распрацоўкі адмысловых нацыянальных праграм абароны і практычных мер, такіх як выдача падарожных дакументаў сведкам, якія нясуць высокія рызыкі[58].

- **Забарона на паездкі ў якасці санкцыі.** Затрыманні ў межах універсальнай юрысдыкцыі і Міжнародным крымінальным судом часта маюць выпадковы характар і адбываюцца тады, калі меркаваныя злачынцы выязджаюць за мяжу на адпачынак, канферэнцыі або іншыя прыватныя візіты. Такія сітуацыі ствараюць магчымасці для ўладаў тых дзяржаў, што маюць палітычную волю для іх затрымання. Аднак калі ў межах санкцый уводзіцца забарона на паездкі, імавернасць таго, што злачынцы паедуць у такія юрысдыкцыі, змяншаецца, што змяншае шанцы на іх затрыманне і прыцягненне да адказнасці.

- **Умацаванне палітычнай сістэмы і рэпрэсіўная дзяржаўная інфраструктура.** На нацыянальным узроўні адной з самых устойлівых перашкод з'яўляецца далейшае ўмацаванне аўтарытарнага кіравання з боку ўладаў Беларусі. Пасля непрызнаных прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ўлады праводзяць сістэматычную кампанію рэпрэсій, якая характарызуецца шырокамаштабнымі катаваннямі, палітычна матываваным пераследам і задушэннем грамадзянскай супольнасці[59], у тым ліку тых, хто займаецца дакументаваннем парушэнняў і працай па прыцягненні да адказнасці[60].

57 Trial International, ЕС: Умацаванне намаганняў у галіне правасуддзя ва ўсім свеце, 23 траўня 2022 г.
58 Eurojust, Высновы 35-га пасяджэння Сеткі па расследаванні і судовым пераследзе генацыду, злачынстваў супраць чалавечнасці і ваенных злачынстваў, 16–17 красавіка 2024 г.
59 Amnesty International, Беларусь: Улады праводзяць прэзідэнцкія выбары ва ўмовах татальнага страху і рэпрэсій, 24 студзеня 2025 г.
60 «Вясна»: У 2024 годзе прызналі 89 «экстрэмісцкіх фарміраванняў», сярод іх – медыя, тэатральная трупа і грамадскія арганізацыі, 10 студзеня 2025 г.

# III. ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

## A. Міжнародны крымінальны суд (МКС)

### Што такое Міжнародны крымінальны суд?

Міжнародны крымінальны суд (МКС, ICC) – гэта незалежны міжнародны суд, які расследуе і прыцягвае да адказнасці асоб за найбольш сур’ёзныя міжнародныя злачынствы, што выклікаюць занепакоенасць міжнароднай супольнасці: ваенныя злачынствы, злачынствы супраць чалавечнасці, генацыд і злачынства агрэсіі[61]. Гэтыя злачынствы вызначаны ў Рымскім статуце – міжнародным дагаворы, якім быў заснаваны Суд. МКС прыцягвае да адказнасці фізічных асоб, а не дзяржавы. Міжнародны крымінальны суд дзейнічае на прынцыпе камплементарнасці, гэта значыць, што ён можа распачаць разгляд справы толькі тады, калі дзяржава-ўдзельніца[62] не жадае або не здольная сапраўды расследаваць і пераследаваць адпаведныя злачынствы[63].

Сітуацыя ў Беларусі была перададзена на разгляд МКС урадам Літвы ў верасні 2024 года (Зварот). Гэты зварот утрымліваў просьбу да Канцылярыі Пракурора МКС расследаваць злачынствы супраць чалавечнасці, у тым ліку дэпартацыю, пераслед і іншыя бесчалавечныя дзеянні, здзейсненыя паводле загаду высокапастаўленых беларускіх службовых асоб як мінімум з 1 траўня 2020 года[64].

Хоць Беларусь не з’яўляецца дзяржавай – удзельніцай Рымскага статута, Літва як дзяржава – удзельніца МКС сцвярджала, што асобныя аспекты злачынстваў мелі месца на яе тэрыторыі, а таксама, магчыма, на тэрыторыі іншых дзяржаў-удзельніц, што дазваляе ўстанавіць тэрытарыяльную юрысдыкцыю паводле артыкула 12 (2) (a) Статута[65]. Канцылярыя Пракурора распачала папярэднюю праверку з мэтай вызначыць, ці ёсць разумныя падставы для пачатку расследавання[66]. Такім чынам, сітуацыя са справай Літоўская Рэспубліка / Рэспубліка Беларусь (Літва/Беларусь) на дадзены момант знаходзіцца на стадыі папярэдняга разгляду ў МКС[67].

Іншыя дзяржавы – удзельніцы МКС могуць прыняць рашэнне афіцыйна далучыцца да звароту Літвы, тым самым узмацняючы заклік да прыцягнення да адказнасці. Хоць сумесныя звароты не карыстаюцца асаблівымі перавагамі ў рамках прававога рэжыму або практыкі МКС, групавы зварот у справе Літва/Беларусь умацаваў

61 Рымскі статут МКС, арт. 1.

62 Дзяржавы-ўдзельніцы – гэта краіны, якія ратыфікавалі Рымскі статут Міжнароднага крымінальнага суда або далучыліся да яго, тым самым прызнаўшы юрысдыкцыю Суда. Па стане на ліпень 2025 года налічваецца 125 дзяржаў-удзельніц.

63 Рымскі статут МКС, арт. 17 (1) (a).

64 МКС: Ліст, накіраваны Міністрам юстыцыі Літоўскай Рэспублікі ў МКС у сувязі з прадстаўленнем сітуацыі ў Беларусі, 30 верасня 2024 г.

65 МКС: Ліст, накіраваны Міністрам юстыцыі Літоўскай Рэспублікі ў МКС у сувязі з прадстаўленнем сітуацыі ў Беларусі, 30 верасня 2024 г.

66 МКС: Заява Пракурора МКС Карыма А. А. Хана аб атрыманні звароту Літоўскай Рэспублікі, 30 верасня 2024 г.

67 МКС: Папярэдняе расследаванне: Літоўская Рэспубліка / Рэспубліка Беларусь.

бы падтрымку запыту на расследаванне меркаваных міжнародных злачынстваў, здзейсненых уладамі Беларусі. Гэта можа яшчэ раз даць сігнал Пракурору, што зварот грунтуецца не на палітычных меркаваннях адной дзяржавы, а на інтарэсах правасуддзя, якія падзяляюць некалькі дзяржаў. Акрамя таго, гэта падкрэсліла б унікальную ролю МКС у сістэме міжнароднага правасуддзя – забяспечваць правасуддзе ў выпадках масавых злачынстваў[68], у тым ліку весці абвінавачанне супраць высокапастаўленых службовых асоб, бо артыкул 27 Рымскага статута не прадугледжвае імунітэту.

Далучэнне да звароту таксама дасць магчымасць дзяржавам паказаць сваю гатоўнасць супрацоўнічаць з МКС, перадаючы інфармацыю або паказанні сведак, хоць іх удзел не залежыць ад наяўнасці такіх матэрыялаў. Нарэшце, такі крок стаў бы моцным сігналам салідарнасці з ахвярамі і беларускімі праваабаронцамі і пацвердзіў бы міжнародную падтрымку іх імкнення да справядлівасці.

**Інфармацыйны агляд Платформы ІАРВ аб перадачы сітуацыі ў Беларусі ў МКС**

Падрабязная інфармацыя пра тое, якім чынам могуць быць устаноўлены крытэрыі юрысдыкцыі, прымальнасці і правасуддзя ў справе Літва/Беларусь, утрымліваецца ў інфармацыйным аглядзе Платформы ІАРВ, прысвечаным перадачы Літвой сітуацыі ў Беларусі на разгляд Міжнароднага крымінальнага суда. Дакумент мае назву: «*Міжнародны крымінальны суд і Беларусь: разуменне звароту Літвы і чаму дзяржавы – удзельніцы МКС мусяць дзейнічаць дзеля правасуддзя для пацярпелых у Беларусі».* Дакумент дае таксама рэкамендацыі дзяржавам адносна таго, як яны могуць падтрымаць зварот і працягваць расследаванне і судовы пераслед злачынстваў, здзейсненых у Беларусі, у рамках універсальнай юрысдыкцыі.

## Як працуе МКС?

МКС складаецца з чатырох асноўных органаў:

- У склад **Прэзідыума** ўваходзяць Старшыня і два Віцэ-старшыні (усе яны – суддзі). Ён адказны за агульнае кіраўніцтва дзейнасцю Суда і прадстаўляе яго ў знешніх сувязях. Ён забяспечвае таксама выкананне прысудаў і бесперабойную каардынацыю судовых пытанняў.

- **Канцылярыя Пракурора** дзейнічае незалежна ад астатніх органаў Суда. Яна адказвае за атрыманне і ацэнку інфармацыі аб меркаваных злачынствах, правядзенне расследаванняў і судовы пераслед. Канцылярыя Пракурора можа атрымліваць звароты ад дзяржаў, Савета Бяспекі ААН або дзейнічаць з уласнай ініцыятывы (*proprio motu*) і абавязана дзейнічаць бесстаронна, незалежна ад палітычнага ціску.

68 Платформа ІАРВ: «Міжнародны крымінальны суд і Беларусь: Разуменне звароту Літвы і чаму дзяржавы – удзельніцы МКС мусяць дзейнічаць дзеля забеспячэння справядлівасці ў дачыненні да беларускіх ахвяр», с. 13, люты 2025 г.

- **Суддзі** падзяляюцца на тры **Палаты**:
    - **Дасудовая палата** (Pre-Trial Chamber) ажыццяўляе нагляд за пачатковымі этапамі разбору, у тым ліку прымае рашэнні аб выдачы ордэраў на арышт і вызначае, ці дастаткова доказаў для накіравання справы на судовы разгляд.
    - **Судовае аддзяленне**(Trial Division) праводзіць судовыя працэсы, забяспечваючы правасуддзе, належную працэдуру і правы як абвінавачваных, так і пацярпелых.
    - **Апеляцыйная палата** (Appeals Chamber) разглядае апеляцыі бакоў або пацярпелых на ключавыя судовыя рашэнні і выносіць канчатковыя прысуды.

- **Сакратарыят** (Registry) аказвае падтрымку ўсім астатнім органам і забяспечвае справядлівае і эфектыўнае вядзенне працэсу. Сакратарыят адказвае за арганізацыю судовых паслуг, лагістыку, бяспеку, бюджэт і знешнюю камунікацыю. Што найважнейшае для пацярпелых – Сакратарыят выконвае ключавую ролю ў падтрымцы іх удзелу ў судовым працэсе і ў гарантаванні іх бяспекі. Іншыя бюро, якія з’яўляюцца часткай Сакратарыята, гэта:
    - **Секцыя ўдзелу пацярпелых і рэпарацый** (Victims Participation and Reparations Section) інфармуе пацярпелых пра іх правы, дапамагае падаць заяўкі на ўдзел у судовым працэсе або на атрыманне рэпарацый, а таксама забяспечвае іх юрыдычнае прадстаўніцтва. Яна забяспечвае таксама абарону персанальных дадзеных пацярпелых, калі гэта неабходна.
    - **Група па аказанню дапамогі пацярпелым і сведкам** (Victims and Witnesses Unit) забяспечвае абарону і псіхалагічную падтрымку сведкам, пацярпелым, якія даюць паказанні, і іх сем’ям, асабліва ў сітуацыях высокай рызыкі.
    - **Бюро грамадскага адваката пацярпелых** (Office of Public Counsel for Victims) прапануе юрыдычную падтрымку пацярпелым і можа прадстаўляць іх непасрэдна ў працэсе пры прызначэнні.
    - **Бюро грамадскага адваката па абароне** (Office of Public Counsel for the Defence) аказвае юрыдычную дапамогу камандам абароны і абараняе правы абвінавачваных.

## Якія этапы мае працэдура ў Міжнародным крымінальным судзе?

### Ініцыяванне сітуацыі ў Міжнародным крымінальным судзе

Паводле Рымскага статута, разгляд сітуацыі можа быць ініцыяваны трыма спосабамі:

- **На падставе звароту дзяржавы-ўдзельніцы.** У адпаведнасці з артыкулам 14 Рымскага статута любая дзяржава-ўдзельніца можа звярнуцца да Пракурора з сітуацыяй, звязанай са злачынствамі, якія падпадаюць пад юрысдыкцыю Суда. Зварот не абавязкова мусіць утрымліваць імёны канкрэтных падазраваных, але мусіць вызначаць агульны характар і часавыя рамкі меркаваных злачынстваў; устанаўліваць тэрытарыяльную або персанальную сувязь з дзяржавай-ўдзельніцай; а таксама ўключаць даступныя дакументы або фактычныя звесткі.

- **На падставе звароту Савета Бяспекі ААН.** Згодна з артыкулам 13 (b), МКС можа ажыццяўляць юрысдыкцыю ў дачыненні да любога злачынства з пералічаных у артыкуле 5, калі адносна сітуацыі, якая ўключае адно або некалькі такіх злачынстваў, да Пракурора звяртаецца Савет Бяспекі ААН, што дзейнічае паводле Раздзела VII Статута ААН, незалежна ад таго, ці з'яўляецца адпаведная дзяржава ўдзельніцай Рымскага статута.

- **З уласнай ініцыятывы Пракурора.** У адпаведнасці з артыкулам 15 Пракурор можа распачаць расследаванне *proprio motu* на падставе атрыманай інфармацыі аб злачынствах, якія ўваходзяць у юрысдыкцыю Суда.

## Папярэдняя праверка

У адпаведнасці з артыкулам 53 (1) Рымскага статута пасля атрымання звароту Пракурор праводзіць папярэднюю праверку, каб вызначыць, ці ёсць разумныя падставы для правядзення афіцыйнага расследавання. Этап папярэдняй праверкі не з'яўляецца судовым, а носіць следчы характар і часта цягнецца доўгі час, бо ўключае аналіз шырокага спектру прававой, фактычнай і кантэкстуальнай інфармацыі. Ён уключае ў сябе ацэнку:

- **Юрысдыкцыі** (што прадугледжвае ўстанаўленне тэрытарыяльнай, асабістай, часавай і прадметнай юрысдыкцыі).
- **Прымальнасці** (камплементарнасць і ступень сур'ёзнасці злачынства).
- **Ці будзе расследаванне служыць інтарэсам правасуддзя**.

Папярэдняя праверка не абмежавана ніякім вызначаным тэрмінам. На практыцы працягласць гэтай стадыі вагаецца – ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў. Напрыклад, адна з такіх папярэдніх праверак была распачата ў 2004 годзе і завершана толькі ў 2021-м, праз 17 гадоў, пасля падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве з урадам Калумбіі[69]. У іншым выпадку Канцылярыя пракурора праводзіла папярэднюю праверку з 2014 да 2020 года, перш чым прыйсці да высновы, што існуюць разумныя падставы, каб распачаць расследаванне злачынстваў у Крыме і на ўсходзе Украіны[70].

## Юрысдыкцыя

Юрысдыкцыйныя патрабаванні Рымскага статута прадугледжваюць, што меркаваныя злачынствы, якія разглядаюцца Канцылярыяй пракурора на этапе папярэдняй праверкі, мусяць падпадаць пад яе часавую, тэрытарыяльную, прадметную і асабістую юрысдыкцыю:

- **Часавая юрысдыкцыя.** Канцылярыя Пракурора можа расследаваць толькі тыя злачынствы, што падпадаюць пад юрысдыкцыю Суда, гэта значыць злачынствы, здзейсненыя пасля 1 ліпеня 2002 года – даты ўступлення ў сілу Рымскага статута, якім быў заснаваны Суд[71].

69 Reuters: МКС завяршае папярэднюю праверку ваенных злачынстваў у Калумбіі праз 17 гадоў, 28 кастрычніка 2021 г.
70 МКС: Заява пракурора Фату Бенсуда аб завяршэнні папярэдняй праверкі сітуацыі ва Украіне, 11 снежня 2020 г.
71 МКС: Рымскі статут, арт. 11.

- **Тэрытарыяльная юрысдыкцыя.** Канцылярыя пракурора можа ажыццяўляць свае следчыя функцыі толькі на тэрыторыі дзяржаў – удзельніц Рымскага статута (дзяржаў, што яго ратыфікавалі)[72], дзяржаў, што не з'яўляюцца ўдзельніцамі, але даюць згоду на юрысдыкцыю Суда[73], або дзяржаў, што не з'яўляюцца ўдзельніцамі, але перадаюцца на разгляд Суда рашэннем Савета Бяспекі ААН[74].

- **Прадметная юрысдыкцыя.** Канцылярыя пракурора можа расследаваць толькі ваенныя злачынствы, злачынствы супраць чалавечнасці, генацыд і злачынства агрэсіі[75].

- **Персанальная юрысдыкцыя.** Канцылярыя Пракурора можа расследаваць і прыцягваць да крымінальнай адказнасці толькі фізічных асоб, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту[76]. Яна не мае паўнамоцтваў расследаваць або пераследаваць урады, карпарацыі, палітычныя партыі або паўстанцкія рухі, але можа расследаваць дзеянні асоб, якія належаць да гэтых суб'ектаў.

У кантэксце Беларусі пытанне тэрытарыяльнай юрысдыкцыі з'яўляецца адным з ключавых выклікаў. Зварот Літвы абгрунтаваны тым, што некаторыя з меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці, у тым ліку дэпартацыя і пераслед, часткова адбыліся на тэрыторыі Літвы, а таксама, магчыма, на тэрыторыях іншых дзяржаў-удзельніц. Гэта адпавядае прававаму прэцэдэнту, устаноўленаму ў справе Бангладэш/М'янма, у якой Суд прызнаў сваю юрысдыкцыю на падставе трансгранічных элементаў дэпартацыі[77].

### Прэцэдэнт Бангладэш/М'янма

У справе Бангладэш/М'янма МКС пастанавіў, што валодае юрысдыкцыяй, нягледзячы на тое, што М'янма не з'яўляецца дзяржавай – удзельніцай Рымскага статута. Гэта адбылося таму, што элементы меркаванага злачынства, у прыватнасці трансгранічная дэпартацыя народа рахінджа, адбыліся на тэрыторыі Бангладэш, дзяржавы – удзельніцы Статута. Дасудовая палата прыняла аргумент Пракурора пра тое, што частка злачынства была здзейснена на тэрыторыі дзяржавы-ўдзельніцы, што дазволіла Суду ўпершыню прызнаць сваю юрысдыкцыю ў такой трансгранічнай сітуацыі[78].

---

72 МКС: Рымскі статут, арт. 12 (2) (a).
73 МКС: Рымскі статут, арт. 12 (3).
74 МКС: Рымскі статут, арт. 13 (b). Артыкул 12 з'яўляецца ключавой юрыдычнай асновай для вызначэння тэрытарыяльнай юрысдыкцыі МКС (jurisdiction ratione loci), аднак гэтая юрысдыкцыя можа быць пераадолена або пашырана толькі шляхам звароту Савета Бяспекі ААН з перадачай сітуацыі на разгляд Пракурора. Гл. далей: Каментарый МКС (CLICC), арт. 12, пункт 175.
75 МКС: Рымскі статут, арт. 5.
76 МКС: Рымскі статут, арт. 25–26.
77 МКС: Дасудовая палата I, Запыт у адпаведнасці з Палажэннем 46(3) Рэгламенту Суда, Рашэнне па «Запыце абвінавачання аб пастанове пра юрысдыкцыю ў адпаведнасці з артыкулам 19 (3) Статута», Справа ICC-RoC46(3)-01/18), 6 верасня 2018 г.
78 МКС: Дасудовая палата I, Рашэнне па запыце Пракурора на падставе юрысдыкцыі ў адпаведнасці з артыкулам 19(3) Статута, справа ICC-RoC46(3)-01/18, пункт 71, 6 верасня 2018 г.; МКС, Дасудовая палата I, Запыт Пракурора на падставе юрысдыкцыі ў адпаведнасці з артыкулам 19(3) Статута, справа ICC-RoC46(3)-01/18-1, 9 красавіка 2018 г.

### Прымальнасць

Акрамя патрабаванняў, звязаных з юрысдыкцыяй, кожная справа мусіць адпавядаць крытэрыям прымальнасці ў адпаведнасці з Рымскім статутам[79]. Яны ўключаюць у сябе:

- **Камплементарнасць.** Артыкул 17 (1) (a–c) замацоўвае прынцып камплементарнасці, згодна з якім МКС дзейнічае толькі тады, калі нацыянальныя ўлады не хочуць або не могуць па-сапраўднаму расследаваць або пераследваць пэўныя дзеянні. Абавязак ацэнкі наяўнасці і дастатковасці адпаведных нацыянальных разбораў ляжыць на Пракуроры[80].

- **Сур’ёзнасць злачынстваў.** Пракурор мусіць ацаніць, ці адпавядаюць злачынствы крытэрыю сур’ёзнасці, прадугледжанаму артыкулам 17 (1) (d), прычым гэтая ацэнка мусіць адбывацца з улікам пэўных «патэнцыйных спраў», што могуць паўстаць у выніку расследавання сітуацыі[81]. Гэта прадугледжвае разгляд наступных аспектаў: (i) асобы, у дачыненні да якіх, імаверна, будзе распачата расследаванне, з’яўляюцца тымі, хто нясе найбольшую адказнасць; (ii) маштабнасць злачынстваў; (iii) асаблівая цяжкасць здзейсненых злачынстваў; (iv) сістэмны, масавы, дыскрымінацыйны і жорсткі характар іх здзяйснення; (v) наступствы меркаваных парушэнняў для пацярпелых[82].

- **Інтарэсы правасуддзя.** Артыкул 53 (1) (c) абавязвае Пракурора вызначыць, ці будзе расследаванне служыць інтарэсам правасуддзя шляхам аналізу маштабу, характару, спосабу і наступстваў меркаваных злачынстваў, з улікам пазіцыі пацярпелых і шырэйшага кантэксту.

Улічваючы, што Суд дзейнічае як сродак апошняй інстанцыі, падчас этапу папярэдняй праверкі Канцылярыя Пракурора мусіць вызначыць, ці вядуцца на нацыянальным узроўні бягучыя і сапраўдныя расследаванні – з боку ўладаў Беларусі, Літвы або любой іншай дзяржавы, якая мае юрысдыкцыю ў дачыненні да сітуацыі Літва/Беларусь, і калі так, ці перашкаджае гэта прасоўванню звароту на стадыю расследавання. Літва падкрэсліла, што злачынствы, указаныя ў звароце, дагэтуль нідзе не расследаваліся[83].

### Адкрыццё следства

Калі папярэдняя праверка пацвярджае наяўнасць разумных падстаў для далейшых дзеянняў і сітуацыя была **перададзена дзяржавай-удзельніцай** або **Саветам Бяспекі ААН**, Пракурор можа распачаць расследаванне

79 Апеляцыйная палата МУС: Сітуацыя ў Ісламскай Рэспубліцы Афганістан, Пастанова па апеляцыі на рашэнне аб дазволе расследавання сітуацыі ў Ісламскай Рэспубліцы Афганістан, справа ICC-02 / 17-138 05-03-2020 1/35 NM PT OA4, пункт 28, 5 сакавіка 2020 г.

80 Канцылярыя Пракурора: Палітычны дакумент аб камплементарнасці і супрацоўніцтве, пункт 151, красавік 2024 г. Гл. далей: Дасудовая палата II, Пракурор супраць Ухуру Муігай Кеніяты і Махамеда Хусэйна Алі, Рашэнне па заяве ўрада Кеніі, якое аспрэчвае прымальнасць справы ў адпаведнасці з артыкулам 19 (2) (b) Статута, справа ICC-01/09-02/11, пункт 39, 30 траўня 2011 г.

81 Дасудовая палата II: Сітуацыя ў Рэспубліцы Кенія, Рашэнне на падставе артыкула 15 Рымскага статута аб дазволе на пачатак расследавання сітуацыі ў Рэспубліцы Кенія, справа ICC-01/09, пункт 58, 31 сакавіка 2010 г.

82 Дасудовая палата II: Сітуацыя ў Рэспубліцы Кенія, Рашэнне на падставе артыкула 15 Рымскага статута аб дазволе на пачатак расследавання сітуацыі ў Рэспубліцы Кенія, справа ICC-01/09, пункт 52, 31 сакавіка 2010 г.

83 Выступ на сустрэчы ў Пасольстве Літвы ў Нідэрландах (Гаага) на тэму «Прававыя рэакцыі міжнароднай супольнасці на злачынствы супраць чалавечнасці, здзейсненыя цяперашнім аўтарытарным рэжымам у Беларусі» – 1 кастрычніка 2024 г.

**без атрымання судовага дазволу**[84]. Гэта распаўсюджваецца на абставіны, выкладзеныя ў звароце, што можа азначаць хутчэйшы пераход справы да этапу расследавання.

Калі Пракурор дзейнічае *proprio motu* (з уласнай ініцыятывы), гэта значыць (у беларускім кантэксце), ён прыйшоў да высновы, што існуюць разумныя падставы для правядзення расследавання па-за фактамі, выкладзенымі ў Звароце, яму спатрэбіцца атрымаць дазвол Дасудовай палаты[85]. Рашэнні па зваротах аб дазволе на правядзенне расследавання ў адпаведнасці з артыкулам 15 мусяць быць вынесены на працягу 120 дзён[86].

## Правядзенне расследавання

Пасля пачатку расследавання Канцылярыя пракурора пераходзіць да этапу расследавання, падчас якога збірае дапушчальныя доказы, вызначае падазраваных і будуе справы. Гэта можа ўключаць у сябе:

- Супрацоўніцтва з дзяржавамі-ўдзельніцамі ў галіне абароны сведак, арыштаў і доступу да інфармацыі[87];
- Запыты да арганізацый грамадзянскай супольнасці і міжнародных органаў на дакументаванне і сведчанні; а таксама судова-медыцынская экспертыза і збор лічбавых доказаў[88].

Працягласць гэтага этапу можа быць вельмі рознай. Напрыклад, расследаванне сітуацыі ў Лівіі, распачатае ў 2011 годзе, меркавана будзе завершана да канца 2025 года[89]. У выпадку Судана расследаванне пачалося ў 2005 годзе; ордары на арышт высокапастаўленых чыноўнікаў, у тым ліку былога прэзідэнта Амара аль-Башыра, былі выдадзены ў 2009 і 2010 гадах, аднак яны дагэтуль не выкананы (па стане на 2025 год)[90].

## Запыт ордараў на арышт або позваў

Пры наяўнасці дастатковых доказаў Пракурор можа зрабіць запыт, каб Дасудовая палата выдала ордар[91] на арышт або позвы на яўку перад Судом[92].

Гэтыя запыты мусяць абгрунтоўваць наяўнасць разумных падстаў лічыць, што асоба здзейсніла злачынствы, якія падпадаюць пад юрысдыкцыю Суда. Дасудовая палата таксама мусіць быць пераканана, што арышт асобы неабходны для забеспячэння яе яўкі на суд, каб меркаваны злачынца не перашкаджаў або не ствараў пагрозы для расследавання і – калі гэта прымяніма – для прадухілення далейшага здзяйснення злачынства[93]. Калі

84 МКС: Рымскі статут, арт. 53(1).
85 МКС: Рымскі статут, арт. 15(3).
86 МКС: Даведнік па практыцы Палат, 2024 г., пункт 2.
87 Гл. агулам: Асамблея дзяржаў – удзельніц МКС, Справаздача Суда па супрацоўніцтве, UN Doc. ICC-ASP/23/21, 24 кастрычнік 2024 г.
88 МКС, Дакументаванне міжнародных злачынстваў і парушэнняў правоў чалавека ў мэтах прыцягнення да адказнасці: Дапаможнік для арганізацый грамадзянскай супольнасці, верасень 2022 г.; FIDH і CICC, Грамадзянская супольнасць і Міжнародны крымінальны суд: шляхі да сумеснага і сапраўднага ўзаемадзеяння, снежань 2024 г.
89 UN News: Пракурор МКС прапануе дарожную карту для завяршэння расследавання ваенных злачынстваў у Лівіі, 14 траўня 2024 г.
90 МКС: Дарфур, Судан – Справа Аль-Башыра.
91 МКС: Рымскі статут, арт. 58.
92 МКС: Рымскі статут, арт. 58 (7).
93 МКС: Рымскі статут, арт. 58 (1) (b).

хоць адна з умоў не будзе выканана, Дасудовая палата адхіліць хадайніцтва ў поўным аб’ёме. Гэта актуальна нават у тым выпадку, калі Палата лічыць, што патрабаванне наяўнасці «разумных падстаў» выканана, але не знаходзіць падстаў лічыць арышт неабходным для забеспячэння яўкі падазраванага перад Судом[94].

Як выразна адзначыла Апеляцыйная палата ў справе *Катанга*, Дасудовая палата не мае паўнамоцтваў выдаваць позву замест ордара на арышт, калі Пракурор хадайнічаў выключна аб апошнім[95]. У выпадку з позвай Дасудовая палата мусіць толькі пераканацца, што гэтая мера з’яўляецца дастатковай для забеспячэння яўкі асобы[96].

Хоць дакладныя тэрміны не вызначаны, у мінулым для прыняцця рашэнняў на такія запыты, як правіла, патрабаваўся як мінімум месяц. Напрыклад, МКС выдаў ордары на арышт Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і Марыі Львовай-Бяловай (Упаўнаважанай Расіі па правах дзіцяці) за незаконную дэпартацыю дзяцей 17 сакавіка 2023 г., пасля таго як Пракурор накіраваў адпаведнае хадайніцтва 22 лютага 2023 г.

## Дасудовы разгляд справы

Пасля арышту падазраванага або яго добраахвотнай яўкі ў МКС першае з’яўленне перад Дасудовай палатай або адным суддзёй звычайна адбываецца на працягу 48–96 гадзін з моманту прыбыцця ў Суд. Падчас гэтага слухання Дасудовая палата пераконваецца, што абвінавачваны цалкам разумее прад’яўленыя яму абвінавачванні на мове, якую ён ведае і разумее. Абвінавачванага таксама інфармуюць пра яго права хадайнічаць аб часовым вызваленні, і Суд можа неадкладна разгледзець такую заяву. Урэшце, падчас гэтай першай яўкі суддзі прымаюць рашэнне аб тэрміне і працэдуры правядзення слухання па пацвярджэнні абвінавачанняў, ад вынікаў якога залежыць, ці будзе справа перададзена на разгляд Судовай палаты.

Наступным ключавым этапам з’яўляецца слуханне аб пацвярджэнні абвінавачанняў у адпаведнасці з артыкулам 61 Рымскага статута. На гэтым этапе Пракурор прадстаўляе доказы, каб засведчыць, што існуе дастатковая доказная база для пераходу да судовага разгляду. Затым суддзі вырашаюць, пацвердзіць, адхіліць або змяніць абвінавачанні. Калі абвінавачанні пацвярджаюцца, справа перадаецца на судовы разгляд.

Слуханне аб пацвярджэнні абвінавачанняў не з’яўляецца выключна фармальнай працэдурай. На гэтым этапе прымаюцца прынцыпова важныя рашэнні (напрыклад, у справе Бангладэш/М’янма менавіта падчас слухання аб пацвярджэнні абвінавачанняў Суд вызначыў асноўныя аспекты экстратэрытарыяльнай юрысдыкцыі). Дасудовая палата ўстанаўлівае асобу абвінавачванага, вывучае сутнасць абвінавачанняў, а таксама разглядае магчымыя працэсуальныя пярэчанні бакоў. Палата фармулюе важныя высновы як з фактычнага, так і з прававога пункту гледжання, вызначаючы, ці ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што абвінавачваны сапраўды здзейсніў згаданыя злачынствы. Сярод іншага, гэта прадугледжвае вывучэнне фактычных абставін,

94 Opinio Juris: Кароткая заўвага аб ордарах на арышт і позвы ў МКС, 24 чэрвеня 2024 г.
95 Апеляцыйная палата МКС: Пракурор супраць Жэрмэна Катанга і Мацье Нгуджола Чуі, Пастанова па апеляцыі Мацье Нгуджола Чуі ад 27 сакавіка 2008 г. супраць рашэння Дасудовай палаты I паводле заявы заяўніка аб часовым вызваленні, справа ICC-01/04-01/07 OA 4, пункт 13, 9 чэрвеня 2008 г.
96 Opinio Juris: Кароткая заўвага аб ордарах на арышт і позвы ў МКС, 24 чэрвеня 2024 г.

паводзін абвінавачванага і вызначэнне таго, ці падпадаюць яго дзеянні пад прававыя азначэнні злачынстваў, прадугледжаных Рымскім статутам. Вынік слухання вызначае, якія з абвінавачанняў будуць перададзены на судовы разгляд. Важна адзначыць, што абсяг пацверджаных абвінавачанняў уплывае і на пытанне ўдзелу пацярпелых, бо нанесеная ім шкода мусіць быць звязана з прад'яўленымі абвінавачаннямі.

Працягласць гэтага этапу можа быць рознай у залежнасці ад складанасці справы. Справы з удзелам некалькіх асоб, шырокамаштабнымі злачынствамі або значнай доказнай базай, як правіла, могуць запатрабаваць больш часу для разгляду. У гэты перыяд Суд можа разглядаць таксама пытанні, звязаныя з удзелам пацярпелых, захаваннем мер абароны для сведак або пярэчаннямі адносна юрысдыкцыі Суда.

## Судовы разгляд і вынясенне прысуду

У пачатку судовага разгляду абвінавачанні агучваюцца абвінавачванаму, якога просяць пацвердзіць, што ён разумее іх, і выказаць сваю пазіцыю адносна віны. Калі абвінавачваны прызнае віну, Судовая палата мусіць пераканацца, што прызнанне зроблена свядома, добраахвотна і падмацавана доказамі. Калі гэтыя ўмовы выкананы, Палата можа вынесці абвінаваўчы прысуд; калі не – судовы разгляд працягваецца.

У ходзе судовага разгляду Пракурор першым выкладае аргументы і прадстаўляе доказы, імкнучыся даказаць віну абвінавачванага па-за межамі разумнага сумневу з дапамогай дакументаў, паказанняў сведак і іншых матэрыялаў. Абарона можа дапытаць сведак абвінавачання і прадставіць уласныя доказы і сведак. Абвінавачваны лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не будзе даказана, і мае права аспрэчваць доказы і прадстаўляць сваю абарону на роўных умовах з бокам абвінавачання. Судовы разгляд працягваецца да таго часу, пакуль абодва бакі не выкладуць свае пазіцыі, пасля чаго суддзі радзяцца і выносяць вердыкт.

Этап судовага працэсу мае вырашальнае значэнне для пацярпелых. Калі закранаюцца іх асабістыя інтарэсы, пацярпелыя могуць выказваць свае пазіцыі і занепакоенасці перад Судом праз сваіх юрыдычных прадстаўнікоў (гл. раздзел «Як удзельнічаюць ахвяры і арганізацыі грамадзянскай супольнасці?»). Згодна з Даведнікам па практыцы Палат, пісьмовае рашэнне аб абвінавачанні або апраўданні мусіць быць вынесена на працягу 10 месяцаў з моманту заканчэння заключных выступленняў бакоў[97]. Услед за гэтым на працягу чатырох месяцаў з моманту абвяшчэння абвінаваўчага прысуду мусіць быць вынесена рашэнне аб прызначэнні пакарання[98].

## Этап рэпарацый

Па завяршэнні судовага разгляду, у выпадку вынясення абвінаваўчага прысуду, Судовая палата можа пастанавіць, каб асуджаны выплаціў рэпарацыі пацярпелым ад злачынстваў, у здзяйсненні якіх яго прызналі вінаватым. Калектыўныя і/або індывідуальныя рэпарацыі могуць уключаць у сябе[99]:

---

97 МКС: Даведнік па практыцы Палат, 2024 г., пункт 89.
98 МКС: Даведнік па практыцы Палат, 2024 г., пункт 90.
99 Гл.: Прынцыпы Лубангі, Загад аб рэпарацыях, ICC-01/04-01/06-3129-AnxA 03-03-2015 1 / 20 NM A A2 A3. Гэта былі першыя прынцыпы рэпарацый, выпрацаваныя МКС у справе Томаса Лубангі.

- **Рэстытуцыю**. Аднаўленне першапачатковага становішча ахвяры.
- **Кампенсацыю**. Грашовае пакрыццё фізічнай, эмацыйнай або матэрыяльнай шкоды.
- **Рэабілітацыю**. Аказанне медыцынскай або псіхалагічнай дапамогі і іншай падтрымкі.
- **Меры сатысфакцыі**. Сатысфакцыя – гэта меры, якія прызнаюць факт парушэння і накіраваны на захаванне годнасці пацярпелых.

Рэпарацыі могуць прысуджацца як у індывідуальнай, так і ў калектыўнай форме і падтрымліваюцца Траставым фондам для пацярпелых, які мае магчымасць рэалізоўваць кампенсацыйныя меры нават у выпадках, калі асуджаны не мае дастатковых фінансавых сродкаў[100].

### Апеляцыйны разбор

Бакі могуць абскардзіць асуджальныя, апраўдальныя прысуды[101] або рашэнні аб рэпарацыях[102], падаўшы заяву аб апеляцыі на працягу 30 дзён[103] і апеляцыйныя матэрыялы на працягу 90 дзён з моманту паведамлення аб рашэнні[104]. Суд мусіць вынесці рашэнне па апеляцыі на прысуд аб абвінавачанні, апраўданні або на рашэнне аб рэпарацыях не пазней чым праз 10 месяцаў пасля адказу на апеляцыйную скаргу[105]. Калі адбывалася вуснае слуханне, рашэнне мусіць быць вынесена на працягу 10 месяцаў з моманту яго завяршэння[106]. Апеляцыйны разбор можа істотна падоўжыць агульны час разгляду справы.

## Якія магчымыя вынікі судовага разгляду МКС?

Разбор у МКС можа прывесці да наступных вынікаў:

- Асуджэнне асоб, прызнаных вінаватымі ў злачынствах, што падпадаюць пад паўнамоцтвы МКС, якія могуць быць асуджаны на тэрмін пазбаўлення волі (максімум да 30 гадоў або, калі гэта апраўдана крайняй цяжкасцю злачынстваў, на тэрмін пажыццёвага зняволення) і падвергнутыя штрафу і канфіскацыі[107]; або
- Апраўданне, калі віна абвінавачванага не можа быць даказана па-за межамі разумнага сумневу.
- Судом могуць быць прызначаны рэпарацыі, якія будуць забяспечвацца праз Траставы фонд для пацярпелых.

100 Траставы фонд для пацярпелых: Мандат на рэпарацыі.
101 МКС,: Рымскі статут, арт. 81.
102 МКС: Рымскі статут, арт. 82(4) (толькі «законны прадстаўнік пацярпелых, асуджанага або добрасумленнага ўладальніка маёмасці, якая была негатыўна закранута» загадам аб рэпарацыях, можа абскардзіць загад аб рэпарацыях).
103 МКС: Правілы працэдуры і доказаў, правіла 89.
104 МКС: Палажэнні Суда, палажэнне 58(1).
105 МКС: Даведнік па практыцы Палат, 2024 г., пункт 91.
106 МКС: Даведнік па практыцы Палат, 2024 г., пункт 91.
107 МКС: Рымскі статут, арт. 77.

## У чым заключаецца дадатковая вартасць разбору ў МКС?

Нягледзячы на існаванне іншых механізмаў прыцягнення да адказнасці, МКС мае выразныя перавагі ў кантэксце Літвы і Беларусі, найперш таму, што такі разбор можа прывесці да ўстанаўлення асабістай адказнасці найбольш вінаватых у здзейсненых злачынствах[108]. Праца МКС можа істотна ўзмацніць механізмы прыцягнення да адказнасці дзякуючы шэрагу істотных складнікаў:

- **Ордары на арышт.** Калі МКС вызначае, што ёсць абгрунтаваныя падставы меркаваць, што пэўныя асобы нясуць адказнасць за сур'ёзныя міжнародныя злачынствы, ён можа выдаць ордары на арышт[109]. Такія ордары абавязваюць усе 124 дзяржавы – удзельніцы Рымскага статута выконваць запыты МКС на арышт і выдачу асоб, калі яны апынуцца ў іх юрысдыкцыі[110]. Гэта могуць быць высокапастаўленыя чыноўнікі, камандзіры і іншыя асобы, якія нясуць камандную або вышэйшую адказнасць. Ордары на арышт могуць таксама выступаць як сімвалічнае прызнанне цяжару здзейсненых злачынстваў і дэманстраваць патэнцыйную вінаватасць канкрэтных асоб.

- **Абмежаванні імунітэту.** Статут МКС, а менавіта артыкул 27, наўпрост сцвярджае, што імунітэты або спецыяльныя працэсуальныя правілы, прадугледжаныя нацыянальным або міжнародным правам, не з'яўляюцца перашкодай для ажыццяўлення Судом сваёй юрысдыкцыі ў дачыненні да фізічных асоб, у тым ліку тых, хто займае пасаду кіраўніка дзяржавы або ўрада.

- **Вызначэнне крымінальнай адказнасці.** У выпадку арышту і перадачы ў Гаагу меркаваных злачынцаў МКС правядзе судовыя працэсы для вызначэння віны або невінаватасці абвінавачванага. Такія судовыя разгляды даюць магчымасць прызнаць вінаватых адказнымі за здзейсненыя злачынствы і прызначыць ім пакаранне, што служыць аднаўленню правасуддзя для пацярпелых.

### Даклад «Вясны» і МК «Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне»

У дакладзе, прысвечаным успрыманню правасуддзя беларускімі пацярпелымі ад катаванняў, апублікаваным праваабарончым цэнтрам «Вясна» і Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі, крымінальнае расследаванне і судовы пераслед вінаватых называюцца адным з ключавых аспектаў дасягнення справядлівасці. Даклад акцэнтуе ўвагу на актуальнасці Міжнароднага крымінальнага суда як органа, што выносіць рашэнні аб крымінальнай адказнасці абвінавачваных, і разглядае яго як адзін з магчымых механізмаў забеспячэння справядлівасці, які адпавядае чаканням беларускіх пацярпелых[111].

108 МКС: Разуменне працы Міжнароднага крымінальнага суда, 2020 г., пункт 12.
109 МКС: Рымскі статут, арт. 58.
110 МКС: Рымскі статут, арт. 89.
111 «Вясна» і МК, Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, 2024 г.

- **Прававая правамоцнасць і міжнародная легітымнасць.** Як першы ў свеце пастаянны міжнародны суд, створаны для крымінальнага пераследу асоб за найцяжэйшыя міжнародныя злачынствы, МКС надае беспрэцэдэнтную прававую вагу намаганням у дасягненні правасуддзя. Зварот пацвярджае, што сітуацыя Літва/Беларусь выклікае міжнародную заклапочанасць і адкрывае магчымасць для афіцыйнага прызнання таго, што гэтыя дзеянні сапраўды з'яўляюцца злачынствамі супраць чалавечнасці[112].

- **Удзел пацярпелых.** Пацярпелыя займаюць значнае месца ў судаводстве МКС. У адпаведнасці з артыкулам 68 (3) Рымскага статута, яны могуць удзельнічаць у разборах, дзе закранаюцца іх асабістыя інтарэсы. Гэта ўключае магчымасць выказваць сваю пазіцыю на ключавых этапах працэсу (напрыклад, падчас слухання аб пацвярджэння абвінавачанняў або вынясення прысуду), падаваць свае меркаванні праз юрыдычных прадстаўнікоў, а таксама мець доступ да адпаведных дакументаў справы.

### Справа «Пракурор супраць Томаса Лубагі Дзыла» Томас

Лубанга Дзыла, лідар апалчэння з Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, стаў першым чалавекам, асуджаным МКС. У 2012 годзе ён быў прызнаны вінаватым у вярбоўцы і выкарыстанні дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў ва ўзброеным канфлікце. Падчас разбору права на ўдзел у працэсе было дадзена 146 пацярпелым, што дазволіла ім выказаць свае пазіцыі і занепакоенасці.

- **Рэпарацыі.** МКС з'яўляецца ўнікальным сярод міжнародных судоў тым, што мае мандат на прызначэнне рэпарацый. Артыкул 75 Рымскага статута дазваляе Суду прысуджаць рэпарацыі пацярпелым пасля асуджэння. Палата падкрэсліла, што рэпарацыі мусяць мець «трансфармацыйны» характар і быць скіраванымі на пакрыццё канкрэтнай шкоды, панесенай пацярпелымі, асабліва тымі, хто перажыў сексуальны і гендарны гвалт, што стаіць прыярытэтам у планах рэалізацыі[113].

112 Council on Foreign Relations: Роля МКС, 27 сакавіка 2025 г.
113 Судовая палата МКС IX: Пракурор супраць Дамініка Ангвэна, Загад аб рэпарацыях, справа ICC-02 / 04-01 / 15, 28 лютага 2024 г., пункты 605, 637.

**Справа «Пракурор супраць Дамініка Ангвэна»**

24 лютага 2024 года Судовая палата IX прысудзіла калектыўныя рэпарацыі тысячам ахвяр зверстваў, учыненых Ангвэнам на поўначы Уганды, устанавіўшы фінансавыя абавязацельствы Ангвэна ў памеры 52 429 000 еўра[114]. Сярод іх былі ахвяры сексуальнага і гендарнага гвалту, дзеці-салдаты і тыя, хто пацярпеў ад нападаў на лагеры ўнутрана перамешчаных асоб. Схема рэпарацый, якая фінансуецца праз Траставы фонд для пацярпелых, уключала калектыўныя рэпарацыі, заснаваныя на супольнасным падыходзе, у тым ліку:

- Рэабілітацыя псіхічнага здароўя і аднаўленне пасля траўматычнага досведу;
- Доступ да адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі;
- Сімвалічная выплата ў памеры 750 еўра для ўсіх пацярпелых, якія маюць права на кампенсацыю;
- Дзейнасць, якая прыносіць прыбытак;
- Падтрымка ў забеспячэнні жыллём і аднаўленні супольнасці.

- **Фарміраванне міжнародных прававых нормаў.** Юрыспрудэнцыя Міжнароднага крымінальнага суда спрыяе развіццю міжнароднага крымінальнага права, уплывае на нацыянальныя прававыя сістэмы і садзейнічае ўкараненню міжнародных стандартаў крымінальнага правасуддзя ў дзяржаўных механізмах. Рашэнне МКС адносна злачынстваў супраць чалавечнасці будзе спрыяць нацыянальным юрысдыкцыям у пацвярджэнні выканання крытэрыю такога злачынства. Ствараючы прававыя прэцэдэнты, Суд дапамагае ў гарманізацыі законаў у розных юрысдыкцыях, узмацняючы глабальную сістэму абароны асноўных правоў.

- **Садзейнічанне нацыянальнаму пераследу на падставе прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі.** Вядзенне справы ў МКС можа дапаўняць намаганні па забеспячэнні адказнасці, што ажыццяўляюцца ў межах нацыянальных юрысдыкцый на падставе прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі. У выпадках, калі нацыянальныя суды не хочуць або не могуць распачаць пераслед, працэсы ў МКС могуць служыць каталізатарам, які заахвочвае дзяржавы да выканання сваіх міжнародных абавязацельстваў шляхам правядзення нацыянальных расследаванняў і судовых разглядаў.

- **Стрымліванне будучых злачынстваў.** Пагроза пераследу з боку МКС можа дзейнічаць як стрымальны фактар для патэнцыйных здзяйсняльнікаў міжнародных злачынстваў[115]. Даючы зразумець, што міжнародная супольнасць гатовая рашуча дзейнічаць, каб не дапусціць беспакаранасці, Суд спрыяе прадухіленню наступных масавых парушэнняў правоў чалавека.

114 Судовая палата МКС IX: Пракурор супраць Дамініка Ангвэна, Загад аб рэпарацыях, справа ICC-02 / 04-01 / 15, 28 лютага 2024 г., пункты 605, 637.
115 Міжнародная крызісная група: Уплыў МКС на стрымліванне міжнародных злачынстваў кіраўніком урада, 6 кастрычніка 2012 г.

## Якім чынам пацярпелыя і грамадскія арганізацыі ўдзельнічаюць у працэсе?

Арыентаваны на пацярпелых падыход МКС дае магчымасць пацярпелым паўнавартасна ўдзельнічаць у працэсе міжнароднага правасуддзя[116]. У адрозненне ад многіх нацыянальных сістэм, якія зводзяць ролю ахвяр да ролі сведак, МКС дазваляе пацярпелым актыўна ўдзельнічаць у судовым разборы, дамагацца кампенсацый і рабіць значны ўнёсак у дасягненне справядлівасці.

Працэсы ў Міжнародным крымінальным судзе (МКС) забяспечваюць афіцыйную пляцоўку, дзе ахвяры могуць падаваць доказы ў межах следства, быць прызнанымі ўдзельнікамі ў якасці пацярпелых і мець магчымасць атрымаць кампенсацыі.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці і асобныя пацярпелыя могуць падаваць інфармацыю непасрэдна Канцылярыі Пракурора ў адпаведнасці з артыкулам 15 (1), што можа стымуляваць Пракурора распачаць следства або дапамагчы ўмацаваць доказную базу ў дзеючым звароце, у тым ліку на стадыі папярэдняй праверкі. Прадстаўленні ахопліваюць шырокі спектр абставін і могуць уключаць у сябе:

- Запыт да Пракурора на расследаванне сітуацыі, звязанай са злачынствамі, якія ўваходзяць у юрысдыкцыю Суда;
- Падаванне важнай дакументацыі для падтрымкі ацэнкі юрысдыкцыі і ступені цяжару злачынстваў;
- Падаванне сведчанняў пацярпелых, дакументальных, візуальных або лічбавых доказаў;
- Прыцягненне ўвагі Пракурора да тэндэнцый у здзяйсненні парушэнняў ці недаацэненых парушэнняў[117];
- Выяўленне тэндэнцый парушэнняў і высокапастаўленых злачынцаў для адбору спраў.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама адыгрываюць важную ролю ў забеспячэнні захавання цэласнасці доказаў у МКС. У гэты працэс можа ўваходзіць арганізацыя каардынацыі пратаколаў абмену інфармацыяй з Канцылярыяй Пракурора[118], а таксама забеспячэнне таго, што доказы, сабраныя грамадзянскай арганізацыяй, маюць інфармаваную згоду і належна абаронены.

Падчас стадыі судовага разбору пацярпелыя могуць падаваць свае меркаванні і занепакоенасці ў Суд праз сваіх юрыдычных прадстаўнікоў, калі закранаюцца іх асабістыя інтарэсы. Гэта можа ўключаць удзел у слуханнях, падаванне доказаў, звязаных з вінаватасцю або невінаватасцю абвінавачванага, а таксама аспрэчванне рэлевантнасці ці прымальнасці доказаў, хаця гэтыя правы пераважна належаць Пракурору і Абаронцы.

Пацярпелыя мусяць даказаць, што іх удзел у працэсе непасрэдна звязаны з нанесенай ім шкодай і адпавядае праву абвінавачванага на справядлівы судовы разгляд. Іх удзел падпарадкоўваецца строгім правілам, уключаючы абавязацельствы па раскрыцці інфармацыі і судовае ўхваленне на ўдзел. Пацярпелыя звычайна аб’ядноўваюцца ў групы для прадстаўлення агульным юрыдычным прадстаўніком, які або выбіраецца

116 Гл., напр.: REDRESS, Avocats Sans Frontières, Global Survivors Fund, FIDH, і The Institute of Peace and Strategic Studies, Gulu University, Рэпарацыі МКС, арыентаваныя на пацярпелых ад злачынстваў Домініка Ангвена, жнівень 2024 г.
117 МКС: Рымскі статут, арт. 15 (1)
118 Канцылярыя Пракурора; Палітыка камплементарнасці і супрацоўніцтва, красавік 2024 г.

пацярпелымі, або прызначаецца Судом, што забяспечвае як эфектыўнасць, так і ўключэнне розных пунктаў гледжання.[119]

На рэпарацыйнай стадыі прызначэння пакрыцця шкоды пацярпелых таксама прадстаўляе прадстаўнік, які можа данесці адпаведную інфармацыю да Палаты ад імя сваіх кліентаў. На стадыі апеляцыі пацярпелыя могуць удзельнічаць у працэсе пасля апеляцыйных скаргаў, пададзеных пракурорам або абаронай, а таксама непасрэдна абскарджваць рашэнні аб пакрыцці шкоды.

# B. Беларусь і расследаванне МКС сітуацыі ва Украіне

## У чым цэнтр увагі расследавання МКС ва Украіне і наколькі яно актуальнае для Беларусі?

Папярэдняе расследаванне сітуацыі ва Украіне, праведзенае ў перыяд з красавіка 2014 па снежань 2020 года, было ініцыявана дзвюма заявамі ўрада Украіны, які прыняў юрысдыкцыю Суда ў дачыненні да злачынстваў, меркавана здзейсненых на тэрыторыі Украіны з 21 лістапада 2013 года[120]. У снежні 2020 года Канцылярыя Пракурора МКС прыйшла да высновы, што існуюць дастатковыя падставы меркаваць, што ва Украіне былі здзейснены ваенныя злачынствы і злачынствы супраць чалавечнасці і ёсць дастатковыя падставы для пачатку расследавання, калі на тое будзе дазвол Суда[121].

2 сакавіка 2022 года, незадоўга пасля поўнамаштабнага ўварвання Расійскай Федэрацыі ва Украіну, Канцылярыя Пракурора МКС распачала расследаванне па Украіне на падставе сумеснага звароту групы з 39 дзяржаў (пазней да іх далучыліся яшчэ чатыры дзяржавы, а агульная колькасць дзяржаў, што зрабілі зварот, дасягнула 43)[122]. Зварот ахопліваў «любыя дзеянні, звязаныя з меркавана здзейсненымі ваеннымі злачынствамі, злачынствамі супраць чалавечнасці і генацыдам на тэрыторыі Украіны з 21 лістапада 2013 года і далей, у тым ліку любыя абвінавачанні ў бягучых і працяглых злачынствах на ўсёй тэрыторыі Украіны»[123]. 25 кастрычніка 2024 г. Украіна ратыфікавала Рымскі статут, стаўшы тым самым дзяржавай – удзельніцай МКС. Ратыфікацыя ўступіла ў сілу 1 студзеня 2025 г.[124]

У лютым 2023 года Канцылярыя Пракурора запытала выдачы ордараў на арышт дваіх асоб: Уладзіміра Пуціна, Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, і Марыі Львовай-Бяловай, Упаўнаважанай пры Прэзідэнце па правах дзіцяці, на падставе абвінавачанняў у ваенных злачынствах, звязаных з незаконным перамяшчэннем і дэпартацыяй

119 Адносна працэсу гл.: МКС, Правілы працэдуры і доказаў, Правіла 89; МКС, Даведнік па практыцы Палат, пункты 96–97.
120 МКС: Украіна прызнае юрысдыкцыю МКС у дачыненні да меркаваных злачынстваў, здзейсненых з 20 лютага 2014 г., 8 верасня 2025 г.
121 МКС: Заява пракурора Фату Бенсуда аб завяршэнні папярэдняй праверкі сітуацыі ва Украіне, 11 снежня 2020 г.
122 МКС: Заява Пракурора МКС, Карыма А. А. Хана, аб сітуацыі ва Украіне: дадатковыя звароты ад Японіі і Паўночнай Македоніі, 11 сакавіка 2022 г.; Адкрыты кантактны партал для падачы інфармацыі; Ліст, пададзены Амбасадай Чарнагорыі ў МКС адносна звароту групы дзяржаў-удзельніц аб сітуацыі ва Украіне, 21 сакавіка 2022 г.; Ліст, пададзены Амбасадай Чылі ў МКС адносна звароту групы дзяржаў-удзельніц аб сітуацыі ва Украіне, 1 красавіка 2022 г.
123 МКС: Заява Пракурора МКС Карыма Хана аб сітуацыі ва Украіне: атрыманне зваротаў ад 39 дзяржаў-удзельніц і адкрыццё расследавання; Зварот дзяржавы-ўдзельніцы ў адпаведнасці з артыкулам 14 Рымскага статута.
124 МКС: Старонка краіны: Украіна.

дзяцей з тэрыторыі Украіны ў Расійскую Федэрацыю[125]. Мяркуецца, што злачынствы былі здзейснены на акупаваных тэрыторыях Украіны як мінімум з 24 лютага 2022 года.

Паводле Пракурора, існуюць разумныя падставы меркаваць, што Пуцін нясе асабістую крымінальную адказнасць за гэтыя злачынствы, бо ажыццяўляў гэтыя дзеянні «непасрэдна, сумесна з іншымі і/або праз іншых», а таксама за «неналежнае ажыццяўленне кантролю над грамадзянскімі і вайсковымі падначаленымі, якія здзяйснялі гэтыя дзеянні або дазвалялі іх здзяйсненне, будучы пад яго фактычным кіраўніцтвам і кантролем»[126]. Ордары на арышт былі зацверджаны Дасудовай палатай ў сакавіку 2023 года[127].

У сакавіку 2024 года былі выдадзены яшчэ ордары, на арышт Сяргея Кобылаша, камандуючага далёкай авіяцыяй паветрана-касмічных сіл, і Віктара Сакалова, камандуючага Чарнаморскім флотам[128], а ў чэрвені таго ж года – на арышт Сяргея Шайгу, міністра абароны Расійскай Федэрацыі, і Валерыя Герасімава, начальніка Генеральнага штаба Узброеных сіл і першага намесніка міністра абароны Расійскай Федэрацыі[129]. Усе чацвёра знаходзяцца ў вышуку МКС па падазрэнні ў здзяйсненні ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавечнасці, «у тым ліку ў арганізацыі нападаў на грамадзянскія аб'екты, прычыненні празмернай пабочнай шкоды грамадзянскаму насельніцтву або грамадзянскім аб'ектам, а таксама ўчыненні іншых бесчалавечных дзеянняў»[130].

Дасудовая палата публічна раскрыла інфармацыю пра наяўнасць ордараў на арышт, імёны падазраваных, злачынствы, у сувязі з якімі былі выдадзены ордары, і віды адказнасці, бо гэта можа садзейнічаць прадухіленню далейшых злачынстваў. Аднак з мэтай абароны сведак і пацярпелых, а таксама дзеля забеспячэння расследавання, дакладны змест ордараў на арышт не раскрываецца.

Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) неаднаразова звяртала ўвагу на саўдзел кіраўніцтва Беларусі ў агрэсіўнай вайне супраць Украіны, адзначаючы, што «Беларусь дазволіла Расіі выкарыстоўваць сваю тэрыторыю для здзяйснення акту агрэсіі супраць Украіны»[131]. Хоць Міжнародны крымінальны суд не мае юрысдыкцыі для разгляду злачынства агрэсіі[132], гэта мае значэнне для расследавання, якое вядзе Канцылярыя Пракурора, напрыклад, у той ступені, у якой напады на мірнае насельніцтва Украіны ажыццяўляліся пры падтрымцы з тэрыторыі Беларусі або непасрэдна з яе. Паводле дадзеных Незалежнай міжнароднай камісіі ААН па расследаванні сітуацыі ва Украіне, Беларусь «дазволіла Расійскай Федэрацыі запускаць ракеты са сваёй тэрыторыі, дазволіла перавозку расійскіх вайскоўцаў, […] дазволіла расійскім вайсковым самалётам лётаць над сваёй паветранай прасторай ва Украіну, […] і дазволіла ёй выкарыстоўваць сваю інфраструктуру»[133].

---

125 МКС: Сітуацыя ва Украіне: суддзі МКС выдалі ордары на арышт Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна і Марыі Аляксееўны Львовай-Бяловай, 17 сакавіка 2023 г. Ордары на арышт спасылаюцца на артыкулы 8 (2) (a) (vii) і 8 (2) (b) (viii) Рымскага статута.

126 МКС: Сітуацыя ва Украіне: суддзі МКС выдалі ордары на арышт Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна і Марыі Аляксееўны Львовай-Бяловай. Ордары на арышт спасылаюцца на артыкулы 8(2)(a)(vii) і 8(2)(b)(viii) Рымскага статута, 17 сакавіка 2023 г.

127 МКС: Сітуацыя ва Украіне: суддзі МКС выдалі ордары на арышт Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна і Марыі Аляксееўны Львовай-Бяловай, 17 сакавіка 2023 г.

128 МКС: Сітуацыя ва Украіне: суддзі МКС выдалі ордары на арышт Сяргея Іванавіча Кобылаша і Віктара Мікалаевіча Сакалова, 5 сакавіка 2024 г.

129 МКС: Сітуацыя ва Украіне: Суддзі МКС выдалі ордары на арышт Сяргея Кужугетавіча Шайгу і Валерыя Васільевіча Герасімава, 25 чэрвеня 2024 г.

130 У адпаведнасці з артыкуламі 8 (2) (b) (ii), 8 (2) (b) (iv) і 7 (1) (k) Рымскага статута. Гл.: МКС, Сітуацыя ва Украіне: суддзі МКС выдаюць ордары на арышт Сяргея Кужугетавіча Шайгу і Валерыя Васільевіча Герасімава, 25 чэрвеня 2024 г.

131 ПАСЕ: Рэзалюцыя 2605 (2025), Прававыя і праваабарончыя аспекты ў агрэсіі Расійскай Федэрацыі супраць Украіны, пункт 4.2., 2025 г. Гл. таксама: ПАСЕ, Рэзалюцыя 2433 (2022), Наступствы працяглай агрэсіі Расійскай Федэрацыі супраць Украіны: роля і рэакцыя Савета Еўропы, пункт 7, 2022 г.

132 Юрысдыкцыя МКС у дачыненні да злачынства агрэсіі патрабуе, каб і дзяржава-ахвяра, і дзяржава-агрэсар з'яўляліся дзяржавамі – удзельніцамі Рымскага статута і ратыфікавалі Кампальскія папраўкі ў дачыненні да злачынства агрэсіі або каб зварот па сітуацыі зрабіў Савет бяспекі ААН.

133 УВКПЧ: Канферэнцыйны дакумент Незалежнай міжнароднай камісіі па расследаванні парушэнняў ва Украіне, A/HRC/52/CRP.4, пункт 88, 29 жніўня 2023 г.

Удзел Беларусі ў меркаваным перамяшчэнні і дэпартацыі дзяцей і іншых грамадзянскіх асоб з Украіны ў Расійскую Федэрацыю і, меркавана, у Беларусь[134], таксама быў задакументаваны праваабарончымі групамі[135], даследчыкамі[136], Маніторынгавай місіяй ААН ва Украіне[137] і адзначаны Еўрапарламентам[138]. Апошні ў траўні 2025 года прыняў рэзалюцыю, асудзіўшы «саўдзел Беларусі ў жорсткім абыходжанні з украінскімі дзецьмі, у тым ліку ў забойствах, прымусовым перамяшчэнні і дэпартацыі, незаконным усынаўленні, сексуальным гвалце і эксплуатацыі, прымусовай русіфікацыі і мілітарызацыі», падкрэсліўшы, што «гэтая практыка з'яўляецца часткай генацыднай стратэгіі па вынішчэнні ўкраінскай ідэнтычнасці»[139]. У кастрычніку 2024 года група праваабарончых арганізацый накіравала ў Канцылярыю Пракурора МКС прадстаўленне адносна саўдзелу Беларусі ў прымусовым перамяшчэнні ўкраінскіх дзяцей. У прадстаўленні перададзены доказы аб вывезеных з Украіны ў Беларусь дзецях, а Аляксандр Лукашэнка названы адным з адказных за гэта, бо, паводле паведамленняў, ён асабіста падпісаў указ, які дазваляў перамяшчэнне дзяцей у Беларусь[140].

У сувязі з расследаваннем сітуацыі ва Украіне Канцылярыя Пракурора мае магчымасць вывучыць адказнасць дзяржаўных асоб Беларусі – Лукашэнкі ці іншых – у гэтым кантэксце. У той жа час такія дзеянні не выключаюць магчымасці для Канцылярыі Пракурора расследаваць злачынствы, меркавана здзейсненыя ўладамі Беларусі супраць уласнага насельніцтва ў межах асобнага расследавання, прысвечанага сітуацыі ў Беларусі (падрабязна – у Раздзеле II. A «Міжнародны крымінальны суд»), паколькі гэтыя дзве сітуацыі ахопліваюць розныя тэмы.

## Якія магчымыя вынікі расследавання МКС сітуацыі ва Украіне для прыцягнення Беларусі да адказнасці?

Калі Канцылярыя Пракурора МКС пачала б расследаванне адказнасці беларускіх службовых асоб, яна магла б хадайнічаць аб выдачы ордараў на іх арышт, пры ўмове наяўнасці дастатковых і надзейных доказаў. Калі хадайніцтва аб выдачы ордараў на арышт будзе задаволена Дасудовай палатай, падазраваныя могуць быць рана ці позна арыштаваны або выдадзены, каб паўстаць перад МКС. Аднак злачынствы, што разглядаюцца ў бягучых працэсах, датычаць парушэнняў міжнароднага гуманітарнага і крымінальнага права ў дачыненні да ўкраінскага насельніцтва на тэрыторыі Украіны і таму не вядуць наўпрост да прыцягнення да адказнасці за міжнародныя злачынствы, здзейсненыя ў Беларусі супраць беларускіх ахвяр. Такім чынам, беларускія пацярпелыя ў большасці выпадкаў будуць выключаны з удзелу ў разборы (за выключэннем магчымасці выступаць сведкамі злачынстваў, здзейсненых ва Украіне) і не змогуць выказаць свае пазіцыі перад Судом як пацярпелыя ўдзельнікі разбору. Акрамя таго, яны не будуць мець права на рэпарацыі, якія могуць быць прызначаны пацярпелым у межах працэдуры МКС.

134 Yale School of Public Health, Conflict Observatory: Супрацоўніцтва Беларусі з Расіяй у сістэматычнай дэпартацыі дзяцей Украіны, 12 снежня 2023 г.

135 Гл.: Зміна, Украінскія праваабарончыя арганізацыі абвінавачваюць Беларусь у мілітарызацыі ўкраінскіх дзяцей у скарзе ў МКС; 25 верасня 2024 г.; Freedom House, «Скрадзенае дзяцінства: як рэжым Беларусі знішчае ўкраінскую ідэнтычнасць дзяцей праз перасяленне», кастрычнік 2024 г.

136 Yale School of Public Health, Conflict Observatory: Супрацоўніцтва Беларусі з Расіяй у сістэматычнай дэпартацыі дзяцей Украіны, 12 снежня 2023 г.

137 Маніторынгавая місія ААН ва Украіне, прэс-брыфінг па Украіне Матыльды Богнер: Цяжкае становішча грамадзянскага насельніцтва ва Украіне, 10 траўня 2022 г.

138 Еўрапарламент: Рэзалюцыя Еўрапарламента ад 8 траўня 2025 г. аб вяртанні ўкраінскіх дзяцей, прымусова перамешчаных і дэпартаваных Расіяй, 8 траўня 2025 г.

139 Еўрапарламент: Рэзалюцыя Еўрапарламента ад 8 траўня 2025 г. аб вяртанні ўкраінскіх дзяцей, прымусова перамешчаных і дэпартаваных Расіяй, 8 траўня 2025 г.

140 Freedom House, Рэгіянальны цэнтр па правах чалавека (RCHR), BelPol, Праваабарончы цэнтр «Вясна» і ZMINA: даклад «Скрадзенае дзяцінства: як рэжым Беларусі знішчае ідэнтычнасць украінскіх дзяцей шляхам перамяшчэння, перавыхавання і мілітарызацыі», кастрычнік 2024 г. Гл. таксама: JusticeInfo, Нечакана Беларусь прачнулася з дзвюма скаргамі ў МКС, 3 кастрычніка 2024 г.

Разбор у МКС можа прывесці да наступных вынікаў:

- Асуджэнне і прызначэнне пакарання беларускім дзяржаўным службоўцам, прызнаным адказнымі за злачынствы, што падпадаюць пад мандат МКС;
- Апраўданне, калі віна беларусаў, абвінавачваных у здзяйсненні злачынстваў, не можа быць даказаная па-за межамі разумнага сумневу;
- Судом могуць быць прызначаны рэпарацыі, якія будуць забяспечвацца праз Траставы фонд для пацярпелых. Як апісана вышэй, у гэтым выпадку прызначэнне пакрыцця шкоды малаімавернае для беларускіх ахвяр, якія пацярпелі ад злачынстваў у Беларусі.

# C. Універсальная юрысдыкцыя

## Што такое ўніверсальная юрысдыкцыя (УЮ)?

У прынцыпе, дзяржавы ажыццяўляюць юрысдыкцыю адносна злачынстваў, здзейсненых на іх тэрыторыі або з удзелам іх грамадзян – як у якасці злачынцаў, так і ў якасці пацярпелых. Аднак шэраг міжнародных злачынстваў лічыцца настолькі цяжкімі, што для іх пераследу не патрабуецца такой тэрытарыяльнай або асабістай сувязі. Згодна з прынцыпам універсальнай юрысдыкцыі (УЮ), крымінальны пераслед найбольш цяжкіх міжнародных злачынстваў у нацыянальных судах можа, пры пэўных абставінах, ажыццяўляцца незалежна ад таго, дзе гэтыя злачынствы былі здзейснены, і незалежна ад грамадзянства злачынцы (злачынцаў) і ахвяры (ахвяр).

Прынцып універсальнай юрысдыкцыі вынікае як са звычаёвага міжнароднага права, так і з дагаворнага права. Звычаёвае міжнароднае права прызнае прынцып універсальнай юрысдыкцыі ў дачыненні да шэрагу злачынстваў, вядомых як асноўныя міжнародныя злачынствы, у тым ліку такія кантэкстуальныя злачынствы, як катаванні, ваенныя злачынствы, злачынствы супраць чалавечнасці, генацыд, а таксама такія асобныя злачынствы, як катаванне і гвалтоўнае знікненне[141]. Напрыклад, міжнародныя трыбуналы і нацыянальныя суды паслядоўна пацвярджалі ў сваіх рашэннях, што дзяржавы могуць ажыццяўляць універсальную юрысдыкцыю ў дачыненні да злачынстваў супраць чалавечнасці, асабліва калі дзяржава, якая мае першасную юрысдыкцыю, не жадае або не здольная весці расследаванне або крымінальны пераслед[142]. Акрамя таго, розныя шматбаковыя дагаворы ўстанаўліваюць дагаворныя формы УЮ[143]. Напрыклад, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (КСК) абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы ажыццяўляць юрысдыкцыю ў дачыненні да асобы, якую падазраюць у здзяйсненні акту катавання, або, у якасці альтэрнатывы, выдаваць яе дзяржаве, здольнай і гатовай гэта зрабіць. Гэта патрабаванне вядомае як прынцып *aut dedere aut judicare* («або выдаць, або судзіць»)[144].

141 Катаванні таксама могуць з'яўляцца асноўным актам здзяйснення гэтых кантэкстуальных злачынстваў, напрыклад, такіх як ваеннае злачынства, злачынства супраць чалавечнасці або, калі яно адпавядае крытэрыю здзяйснення з асаблівым намерам, акт генацыду.

142 Пра рашэнні міжнародных трыбуналаў гл., напрыклад: Пракурор супраць Тадзіча, IT-94-1-T, Рашэнне па хадайніцтве абароны аб юрысдыкцыі, 10 жніўня 1995 г., п. 42; Пракурор супраць Руто і Санг, Рашэнне па запытах абароны на апраўдальныя прысуды, ICC-01/09-01/11-2027-Red-Corr, 5 красавіка 2016 г., п. 458. Пра рашэнні нацыянальных судоў гл., напрыклад: Справа Анвара Раслана, Вышэйшы рэгіянальны суд Кобленца, 13 студзеня 2022 г.

143 Сярод такіх дагавораў – Жэнеўскія канвенцыі 1949 года разам з дадатковымі пратаколамі да іх, Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго 1948 года, а таксама Канвенцыя аб барацьбе з незаконным захопам паветраных суднаў 1970 года.

144 УВКПЧ, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, арт. 7.

Шматлікія расследаванні і крымінальны пераслед на падставе прынцыпу УЮ праводзіліся ў розных юрысдыкцыях, ахопліваючы шырокі спектр кантэкстаў, злачынстваў і дзеянняў як шараговых выканаўцаў, так і высокапастаўленых чыноўнікаў. У 2024 годзе 14 краін ажыццяўлялі УЮ ў дачыненні да міжнародных злачынстваў, здзейсненых за межамі іх тэрыторый. Справы супраць пераважнай большасці падазраваных расследаваліся або разглядаліся ў шасці краінах: Аргенціне, Бельгіі, Францыі, Германіі, Швецыі і Вялікабрытаніі[145]. Паступовы рост колькасці такіх спраў за апошняе дзесяцігоддзе выразна сведчыць пра прызнанне УЮ як надзейнага і эфектыўнага механізма прыцягнення да адказнасці ў тых выпадках, калі ўнутраныя сродкі прававой абароны недастатковыя або недаступныя.

**Справа Юрыя Гараўскага**

Адным з нядаўніх прыкладаў універсальнай юрысдыкцыі з'яўляецца справа супраць **Юрыя Гараўскага**, якая расследавалася ў Швейцарыі ў 2023 годзе[146]. Былы ўдзельнік беларускай узброенай групоўкі паўстаў перад судом па абвінавачанні яго ў меркаванай датычнасці да гвалтоўнага знікнення трох лідараў апазіцыі ў Беларусі ў 1999 годзе. Швейцарскі суд змог разгледзець гэтую справу, нягледзячы на адсутнасць яе прамой сувязі са Швейцарыяй. Гараўскі прыбыў у Швейцарыю ў пошуку прытулку, заяўляючы, што яго жыццю ў Беларусі пагражае небяспека з-за яго гатоўнасці распавядаць пра сваю ранейшую службу ў элітным падраздзяленні войск МУС Беларусі[147].

## Пры якіх умовах магчымае ажыццяўленне ўніверсальнай юрысдыкцыі?

Каб ажыццяўляць юрысдыкцыю ў дачыненні да найбольш цяжкіх міжнародных злачынстваў, дзяржавам неабходна замацаваць прынцып універсальнай юрысдыкцыі ў сваіх нацыянальных прававых сістэмах: або праз унясенне змен у дзеючыя Крымінальныя кодэксы, або праз прыняцце новага закона. Напрыклад, у 2002 годзе Германія прыняла спецыяльны Кодэкс аб злачынствах супраць міжнароднага права (Völkerstrafgesetzbuch), які дазваляе пераследаваць за генацыд, злачынствы супраць чалавечнасці і ваенныя злачынствы незалежна ад грамадзянства ахвяры ці злачынцы або наяўнасці любых іншых сувязяў з Германіяй[148].

Дзяржавы прынялі розныя падыходы да ўстанаўлення юрысдыкцыі ў дачыненні да асноўных міжнародных злачынстваў. Некаторыя дзяржавы ўключылі поўны спектр асноўных міжнародных злачынстваў, у тым ліку злачынствы супраць чалавечнасці, ваенныя злачынствы, генацыд, катаванні і гвалтоўныя знікненні, у нацыянальнае заканадаўства, у той час як іншыя абмежавалі сваю прававую базу пэўнымі катэгорыямі злачынстваў. Напрыклад, некаторыя дзяржавы прызнаюць катаванні самастойным злачынствам у адпаведнасці са сваімі абавязацельствамі паводле Канвенцыі ААН супраць катаванняў, але не распаўсюджваюць сваю

145 TRIAL International, UJAR 2025.
146 Trial International: Беларусь: Апраўдальны прысуд прыспешніку рэжыму Лукашэнкі ў Швейцарыі, 28 верасня 2023 г.
147 Trial International: Юры Гараўскі, верасень 2025 г.
148 Федэральнае міністэрства юстыцыі: Кодэкс аб злачынствах супраць міжнароднага права (CCAIL) ад 26 чэрвеня 2002 г.

юрысдыкцыю на катаванні як на складнік злачынстваў супраць чалавечнасці[149]. Тым не менш, усё большая колькасць дзяржаў дэманструе прыхільнасць барацьбе з беспакаранасцю за міжнародныя злачынствы, распаўсюджваючы сваю юрысдыкцыю на ўсе асноўныя міжнародныя злачынствы. Напрыклад, Германія, Швецыя, Нарвегія і Швейцарыя стварылі шырокія прававыя рамкі юрысдыкцыі для разгляду асноўных міжнародных злачынстваў, уключаючы як злачынствы супраць чалавечнасці, так і катаванні як самастойнае злачынства, што мае асаблівую актуальнасць у беларускім кантэксце.

Акрамя стварэння прававой асновы для выкарыстання прынцыпу УЮ, шэраг дзяржаў увялі спецыяльныя патрабаванні, якія неабходна выканаць для завядзення справы. Да такіх патрабаванняў могуць адносіцца, напрыклад, знаходжанне падазраванага на тэрыторыі дзяржавы, як гэтага патрабуюць Нідэрланды[150], або ўмова падвойнай крымінальнай адказнасці, прадугледжаная ў Канадзе[151]. Падчас прыняцця рашэння пракурорам могуць з'явіцца дадатковыя меркаванні, што ўплываюць на рашэнне аб працягу вядзення справы, зыходзячы з такіх фактараў, як палітычны кантэкст, пытанні доказаў і абмежаванасць рэсурсаў.

Справы ў рамках УЮ часта вельмі складаныя і патрабуюць спецыялізаваных ведаў. Гэтая складанасць абумоўлена празнымі фактарамі, у тым ліку геаграфічнай і кантэкстуальнай аддаленасцю паміж дзяржавай, што разглядае справу, і месцам, дзе былі здзейснены злачынствы, цяжкасцямі ў ідэнтыфікацыі злачынцаў і выяўленні надзейных доказаў, якія звязваюць іх са злачынствам (злачынствамі), а таксама неабходнасцю прымяняць адпаведнае міжнароднае права. У адказ на гэтыя выклікі шэраг краін – у тым ліку Германія, Францыя, Нідэрланды і Швецыя – стварылі спецыялізаваныя падраздзяленні ў складзе сваіх нацыянальных паліцэйскіх і пракурорскіх службаў, якія займаюцца міжнароднымі злачынствамі. Гэтыя падраздзяленні садзейнічаюць фарміраванню спецыялізаваных інстытуцыйных ведаў і аперацыйнага патэнцыялу, тым самым павышаючы эфектыўнасць расследаванняў і крымінальнага пераследу, што ажыццяўляюцца паводле прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі[152].

## Якія крокі трэба зрабіць для завядзення справы ў рамках універсальнай юрысдыкцыі?

У большасці юрысдыкцый, якія прызнаюць прынцып УЮ, пракурор можа распачаць расследаванне з уласнай ініцыятывы (*proprio motu*) на падставе інфармацыі, атрыманай з розных крыніц, у тым ліку з афіцыйнай скаргі, пададзенай пацярпелым або ягоным прадстаўніком, звестак, прадстаўленых грамадскімі арганізацыямі або іншымі групамі, паведамленняў СМІ ці інфармацыі ад іншых дзяржаўных органаў[153]. У некаторых юрысдыкцыях,

149 Напрыклад, Вялікабрытанія можа ажыццяўляць універсальную юрысдыкцыю ў дачыненні да катаванняў як асобнага злачынства ў адпаведнасці з раздзелам 134 Закона аб крымінальным правасуддзі, які рэалізуе палажэнні Канвенцыі супраць катаванняў.
150 Open Society Justice Initiative: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, красавік 2019 г.
151 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, красавік 2020 г.
152 Eurojust: Праз 20 гадоў: 20 гадоў барацьбы з беспакаранасцю за асноўныя міжнародныя злачынствы ў ЕС, с. 10, травень 2022 г.
153 Сюды ўваходзяць органы па справах прытулку, якія прымяняюць артыкул 1F Жэнеўскай канвенцыі аб статусе ўцекачоў, згодна з якім асобу выключаюць з-пад абароны, прадугледжанай Канвенцыяй, калі лічыцца, што яна здзейсніла злачынствы супраць міру, ваенныя злачынствы або злачынствы супраць чалавечнасці ў азначэнні міжнародных дакументаў. Гл. Канвенцыю аб статусе ўцекачоў 1951 г. Той жа артыкул прадугледжвае, што асобы, якія здзейснілі сур'ёзныя непалітычныя злачынствы за межамі краіны прытулку да прыняцця іх у якасці ўцекачоў, таксама выключаюцца з-пад абароны. Тым не менш, працягваюць дзейнічаць іншыя меры абароны правоў чалавека, такія як адмова ад практыкі дэпартацыі.

такіх як Бельгія і Нідэрланды, з просьбай да пракурора пачаць расследаванне міжнародных злачынстваў можа звярнуцца Міністэрства юстыцыі[154]. Пацярпелыя, іх юрыдычныя прадстаўнікі або арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падаць скаргу або перадаць інфармацыю ў адпаведныя органы крымінальнага правасуддзя, да якіх, у залежнасці ад юрысдыкцыі, могуць адносіцца паліцыя, пракуратура або суддзя-следчы.

Далей кампетэнтны орган нясе адказнасць за ацэнку атрыманага матэрыялу і прыняцце рашэння аб тым, ці распачынаць афіцыйнае расследаванне.

**Прыклады краін Бельгіі, Францыі, Нідэрландаў і Германіі**

У Бельгіі пацярпелыя ад «звычайных або бытавых» злачынстваў маюць права распачаць крымінальны працэс, атрымаўшы статус грамадзянскага боку і падаўшы скаргу непасрэдна суддзі-следчаму. Аднак гэтае права было абмежавана ў дачыненні да ахвяр сур'ёзных міжнародных злачынстваў. Пры адсутнасці моцнай сувязі з Бельгіяй судовае расследаванне такіх злачынстваў можа быць распачата толькі на запыт Федэральнай пракуратуры[155].

У Францыі сітуацыя аналагічная адносна злачынстваў, замацаваных у Рымскім статуце: пракурор мае шырокія дыскрэцыйныя паўнамоцтвы адмовіць у крымінальным праследзе па такіх злачынствах. Аднак пацярпелыя могуць самастойна ініцыяваць справу ў выпадках асобных злачынстваў катаванняў або гвалтоўных знікненняў, што з'яўляецца выключэннем з гэтага правіла[156].

У Нідэрландах і Германіі расследаванне можа быць адкрыта з ініцыятывы пракурора, у тым ліку на падставе крымінальнай скаргі, пададзенай пацярпелымі, інфармацыі, прадстаўленай грамадскімі арганізацыямі, або з іншых крыніц. Варта адзначыць, што большасць бягучых расследаванняў у Германіі былі адкрыты на падставе інфармацыі, прадстаўленай міграцыйнымі ўладамі[157]. У Нідэрландах расследаванне часта адкрываецца на падставе інфармацыі, прадстаўленай ахвярамі або грамадскімі арганізацыямі, якія сведчаць пра прысутнасць меркаванага злачынцы на тэрыторыі краіны[158].

Пры адкрыцці афіцыйнага расследавання ўлады могуць пачаць расследаванне або ў дачыненні да канкрэтнага падазраванага, або так званае *структурнае расследаванне.* Структурнае расследаванне дазваляе следчым органам і пракуратуры пачаць распрацоўваць справу да выяўлення канкрэтных падазраваных.

Дзяржавы – члены ЕС маюць у сваім распараджэнні інструмент Сумеснай следчай групы пры правядзенні крымінальных расследаванняў у некалькіх краінах, што з'яўляецца звычайнай практыкай пры расследаваннях злачынстваў супраць чалавечнасці, ваенных злачынстваў і генацыду.

154 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, с. 13, красавік 2020 г.; Human Rights Watch, Універсальная юрысдыкцыя ў Еўропе, с. 8, чэрвень 2006 г.
155 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, с. 31, красавік 2020 г.
156 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, красавік 2020 г.
157 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Нідэрландах, с. 15, красавік 2020 г.
158 REDRESS: інтэрв'ю з нідэрландскай Камандай па міжнародных злачынствах (TIM), люты 2025 г.

### Сумесныя следчыя групы

Сумесная следчая група (ССГ, Joint Investigation Team, JIT) – гэта часовы інструмент супрацоўніцтва, створаны паміж кампетэнтнымі праваахоўнымі і судовымі органамі дзвюх і больш дзяржаў – членаў ЕС для правядзення трансгранічных крымінальных расследаванняў, часта пры падтрымцы Еўраюста і Еўрапола. ССГ складаецца са следчых, пракурораў і іншых службовых асоб сістэмы правасуддзя з дзяржаў-удзельніц і засяроджваецца на адным канкрэтным расследаванні або групе звязаных спраў, дзе патрабуецца збор доказаў у некалькіх краінах, у тым ліку па такіх асноўных міжнародных злачынствах, як злачынствы супраць чалавечнасці, ваенныя злачынствы і генацыд.

ССГ палягчае спалучэнне нацыянальных следчых працэсаў са скаардынаваным шматнацыянальным зборам доказаў. Кожная дзяржава можа весці паралельны крымінальны пераслед на падставе сваёй уласнай універсальнай або экстратэрытарыяльнай юрысдыкцыі, карыстаючыся пры гэтым перавагай шырэйшых практычных магчымасцяў расследавання, аб'яднаннем ведаў і магчымасцю выкарыстоўваць доказы, сабраныя іншымі дзяржавамі – членамі ЕС. Замест абмену фармальнымі запытамі аб узаемнай прававой дапамозе ССГ дазваляе дзяржавам з агульнымі следчымі мэтамі працаваць разам на працягу вызначанага перыяду (звычайна ад 12 да 24 месяцаў з магчымасцю падаўжэння пры неабходнасці).

Такі падыход дазваляе не губляць час на затрымкі, уласцівыя фармальным каналам сістэмы ўзаемнай прававой дапамогі, што можа цягнуцца тыдні ці нават месяцы, і дазваляе членам ССГ наўпрост абменьвацца доказамі. Дзяржавы-ўдзельніцы могуць скарыстацца дапамогай Еўраюста ў каардынацыі і падтрымкай Еўрапола, які забяспечвае інфармацыю разведкі і аналітыку, а таксама магчымасцю атрымаць фінансаванне ЕС для пакрыцця! часткі аперацыйных выдаткаў. Акрамя таго, супрацоўніцтва дапамагае пазбегнуць падвойнай працы, напрыклад, калі дзве краіны выпадкова двойчы апытваюць таго самага сведку. Гэта асабліва актуальна ў кантэксце Беларусі, у тым ліку пры апытаннях сведак-інсайдараў з ліку сілавікоў, а таксама пры ўстанаўленні парога «злачынстваў супраць чалавечнасці», які патрабуе даказаць, што парушэнні з'яўляюцца шырокамаштабным або сістэматычным нападам на грамадзянскае насельніцтва і што злачынцы ўсведамляюць сваю ролю ў гэтым нападзе. Адначасова такі сумесны падыход дазваляе зменшыць рызыку паўторных апытанняў і рэтраўматызацыі ахвяр.

У той час як узаемная прававая дапамога грунтуецца на запытах і мае паслядоўны характар (адна дзяржава просіць іншую выканаць пэўнае следчае дзеянне і чакае вынікаў), супрацоўніцтва ў фармаце ССГ з'яўляецца прамым і адначасовым. Яно аб'ядноўвае следчых з розных дзяржаў у адну аператыўную групу. У працэсах паводле ўзаемнай прававой дапамогі доказы збіраюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы, якая іх ажыццяўляе, што можа не адпавядаць працэсуальным стандартам дзяржавы, ад якой прыйшоў запыт. У выніку гэта можа прывесці да непрымальнасці матэрыялаў і неабходнасці іх паўторнага збору. І наадварот, у ССГ працэдуры ўзгадняюцца загадзя, што забяспечвае прызнанне доказаў, сабраных у адной дзяржаве, прымальнымі ў іншых дзяржавах-удзельніцах.

У выніку збор і захаванне доказаў для некалькіх юрысдыкцый праз ССГ эканоміць рэсурсы і павялічвае шанцы на крымінальны пераслед у адной з іх.

У якасці прыкладаў можна прывесці Сумесную следчую групу па расследаванні меркаваных асноўных міжнародных злачынстваў ва Украіне, створаную ў сакавіку 2022 года Літвой, Польшчай і Украінай, да якой пазней далучыліся Эстонія, Латвія, Славакія, Румынія і Міжнародны крымінальны суд (МКС) пры падтрымцы Еўраюста; а таксама больш нефармальную ССГ-ініцыятыву па Сірыі паміж еўрапейскімі дзяржавамі і механізмамі, такімі як Міжнародны, непрадузяты і незалежны механізм ААН (IIIM). Гэта дазволіла весці працэсы ў рамках універсальнай юрысдыкцыі ў Германіі, Францыі і Швецыі.

На нацыянальным узроўні кожная дзяржава – член ЕС прызначае да ўдзелу ў Сетцы ССГ аднаго або некалькіх нацыянальных спецыялістаў, якія прадстаўляюць судовы (пракуроры, суддзі, міністэрствы юстыцыі) і праваахоўны (паліцыя, міністэрствы ўнутраных спраў) кірункі ССГ. Яны выступаюць як «кантактныя асобы», да якіх могуць звяртацца практыкі, зацікаўленыя ў стварэнні ССГ[159].

Дадатковыя матэрыялы:

- Рамачнае рашэнне Савета 2002/465/JHA
- Сакратарыят Сеткі ССГ пры Еўраюсце, які падтрымлівае дзейнасць Сеткі ССГ
- Дапаможнік па Сетцы нацыянальных экспертаў у галіне сумесных следчых груп

Фармат структурнага расследавання забяспечвае гнуткую і неабмежаваную часам рамку, якая дазваляе следчым арганізоўваць і сістэматызаваць вялікі аб’ём доказаў, вызначаць кантэкстуальныя элементы, выяўляць схемы і катэгорыі злачынстваў, а таксама звязваць пэўную колькасць падазраваных з шырэйшым кантэкстам, у якім адбыліся злачынствы. Некалькі юрысдыкцый, у тым ліку Германія, Швецыя, Францыя, Канада і Літва, выкарыстоўвалі фармат структурных расследаванняў для працы са складанымі сітуацыямі, якія ахопліваюць шматлікія меркаваныя злачынствы.[160]

## Як расследуюцца і разглядаюцца справы паводле прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі?

Хаця крымінальная працэдура адрозніваецца ў розных юрысдыкцыях, большасць спраў паводле прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі мае падобную паслядоўнасць працэсуальных этапаў[161].

159 Еўраюст, JITs network.

160 Еўраюст, Высновы 31-й сустрэчы Сеткі па расследаванні і крымінальным пераследзе генацыду, злачынстваў супраць чалавечнасці і ваенных злачынстваў, 6–7 красавіка 2022 года.

161 Дадатковую інфармацыю пра нацыянальныя прававыя рамкі, звязаныя з універсальнай юрысдыкцыяй, можна знайсці ў аналітычных дакументах Universal Jurisdiction Law and Practice Briefing Papers, апублікаваных TRIAL International, а таксама ў картаграфічным даследаванні, зробленым Фондам Клуні за справядлівасць (CFJ). TRIAL International, Універсальная юрысдыкцыя: Права і практыка, інфармацыйныя дакументы; Clooney Foundation for Justice (CFJ), Правасуддзе без межаў: картаграфічнае даследванне.

Пасля адкрыцця расследавання следчыя органы збіраюць доказы, у тым ліку паказанні сведак, каб сфарміраваць справу супраць меркаванага злачынцы. Калі сабраных доказаў дастаткова і выкананы іншыя ўмовы, напрыклад, існуе рызыка ўцёкаў падазраванага або ўмяшання ў паказанні сведак, улады могуць выдаць ордар на арышт. Калі расследаванне праводзіцца ў дзяржаве – члене Еўрапейскага Саюза, улады таксама могуць звярнуцца па атрыманне Еўрапейскага ордара на арышт (European Arrest Warrant (EAW)[162]. Еўрапейскі ордар на арышт – гэта спрошчаная працэдура трансгранічнай судовай выдачы. Ён надаецца судовым органам першай дзяржавы (дзяржавы-ініцыятара) судоваму органу другой дзяржавы (дзяржавы-выканаўцы) у мэтах крымінальнага пераследу (або выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі)[163].

Калі падазраваны знаходзіцца ў краіне, якая заключыла дагавор аб экстрадыцыі з дзяржавай, што выдала ордар на арышт, то можа быць пададзены афіцыйны запыт аб экстрадыцыі. Хоць дзяржавы могуць быць абавязаны выдаваць або прыцягваць да крымінальнай адказнасці асоб, падазраваных у пэўных злачынствах паводле міжнароднага права, у тым ліку ў катаваннях і іншых сур'ёзных міжнародных злачынствах[164], на практыцы забеспячэнне экстрадыцыі можа быць складаным. Дзяржава, якая сама не жадае пераследаваць такія злачынствы, наўрад ці захоча пры гэтым выдасць падазраваных іншай дзяржаве, якая праводзіць расследаванне. Калі экстрадыцыя з гэтай дзяржавы немагчымая, ордар на арышт усё роўна можа быць выкананы, калі гэтая асоба паедзе ў трэцюю дзяржаву, якая мае дамову аб экстрадыцыі з дзяржавай, што выдала ордар.

Калі следчыя органы прыходзяць да высновы, што яны сабралі істотныя і паслядоўныя доказы, якія сведчаць аб удзеле падазраванага ў здзяйсненні міжнароднага злачынства, яны могуць прад'явіць яму абвінавачанне, пасля чаго суддзя вырашыць, ці будзе падазраваны афіцыйна прыцягнуты да судовага разбору. У кантэксце працэсу паводле УЮ гэты этап звычайна пачынаецца пасля таго, як падазраваны апынуўся пад вартай або інакш прысутнічае на тэрыторыі дзяржавы, якая вядзе пераслед, бо разгляд спраў *in absentia* дазволены толькі ў некалькіх юрысдыкцыях[165] і выклікае пытанні адносна права на справядлівы суд, а таксама таго, у якой ступені такія працэсы адпавядаюць мэтам карнага або аднаўленчага правасуддзя[166].

Падчас судовага працэсу суд слухае доказы як абвінавачання, так і абароны, у тым ліку паказанні сведак. Абвінавачваны атрымлівае магчымасць адказаць на прад'яўленыя абвінавачанні, а суд у выніку вызначае яго віну або невінаватасць і, пры наяўнасці падстаў, выносіць прысуд. Улічваючы комплекснасць міжнародных злачынстваў і цяжар прад'яўленых абвінавачанняў, такія судовыя працэсы часта цягнуцца доўга, каб забяспечыць усебаковы і справядлівы разгляд справы[167].

162 TRIAL International, красавік 2019 г. Права і практыка УЮ: Германія, с. 23.
163 Еўраюст, Еўрапейскі ордар на арышт.
164 Камісія міжнароднага права, Папярэдні даклад аб абавязацельстве выдаваць або прыцягваць да адказнасці (aut dedere aut judicare), A/CN.4/571.
165 У некалькіх нацыянальных юрысдыкцыях, напрыклад, у Бельгіі і Чэхіі, пры пэўных абставінах дапускаюцца завочныя суды.
166 Савет Еўропы (СЕ), Камітэт экспертаў па функцыянаванні еўрапейскіх канвенцый аб супрацоўніцтве па крымінальных справах, Анкета адносна завочных судовых рашэнняў і магчымасці перагляду справы, 28 красавіка 2014 г.
167 Судовы працэс у Германіі ў справе супраць Анвара Раслана (турма «Аль-Хатыб») пачаўся 23 красавіка 2020 г. і завяршыўся 13 студзеня 2022 г. Ён доўжыўся 108 судовых дзён на працягу амаль 21 месяца.

## Якія магчымыя вынікі разгляду справы паводле прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі?

Судовы пераслед паводле прынцыпу УЮ заканчваецца або прызнаннем абвінавачванага вінаватым, або яго апраўданнем. Асуджаны мае права абскардзіць прысуд, што азначае перагляд рашэння, прынятага суддзёй, вышэйшай судовай інстанцыяй. Пры разглядзе апеляцыі суд вышэйшай інстанцыі можа пакінуць прысуд без змен або адмяніць яго, змяніць меру пакарання або прызначыць новы разгляд справы. Калі асуджальны прысуд пакідаецца ў сіле, рашэнне становіцца канчатковым. У выпадку апраўдання судом ніжэйшай інстанцыі бок абвінавачання таксама можа мець права на абскарджанне, у залежнасці ад адпаведнай нацыянальнай прававой сістэмы.

Пацярпелыя могуць мець магчымасць патрабаваць пакрыцця шкоды пасля вынясення асуджальнага прысуду, звычайна праз падачу грамадзянскага іску аб спагнанні шкоды з абвінавачванага. Права на кампенсацыю замацавана ў артыкуле 14 Канвенцыі ААН супраць катаванняў, а таксама ў Дырэктыве ЕС аб правах пацярпелых 2012 года, якая прадугледжвае таксама, што пацярпелыя маюць права атрымліваць інфармацыю пра тое, як і на якіх умовах яны могуць атрымаць кампенсацыю[168]. Такія іскі разглядаюцца ў адпаведнасці з дзеючымі нормамі грамадзянскага заканадаўства.

У некаторых дзяржавах, такіх як Бельгія, Германія і Нідэрланды, іскі аб кампенсацыі дапушчальныя толькі ў тым выпадку, калі абвінавачваны прызнаны вінаватым. У іншых дзяржавах, такіх як Швецыя і Францыя, кампенсацыя можа быць прысуджана нават у выпадку апраўдальнага прысуду.

Аднак часта пацярпелыя, якія дамагаюцца кампенсацыі за злачынствы, ад якіх яны пацярпелі, сутыкаюцца з дзвюма асноўнымі праблемамі: абвінавачваны можа не мець магчымасці выплаціць кампенсацыю з-за адсутнасці фінансавых сродкаў, а таксама пацярпелыя могуць не мець права на атрыманне кампенсацыі праз дзяржаўныя праграмы (або такія праграмы могуць увогуле адсутнічаць).

Дырэктыва Савета ЕС 2004 года аб кампенсацыі ахвярам злачынстваў патрабуе ад усіх дзяржаў – членаў ЕС стварыць нацыянальную праграму кампенсацыі для ўсіх ахвяр злачынстваў[169]. Аднак паколькі Дырэктыва аб кампенсацыі распаўсюджваецца толькі на пацярпелых ад злачынстваў, здзейсненых на тэрыторыі ЕС, такія схемы кампенсацыі, як правіла, не даюць магчымасці звяртацца па кампенсацыю пацярпелым ад асноўных міжнародных злачынстваў, здзейсненых па-за межамі Еўрасаюза. У выніку кампенсацыю атрымлівае вельмі малая колькасць пацярпелых у справах на падставе УЮ, што разглядаюцца ў краінах ЕС. Звычайна гэта магчыма толькі тады, калі органы крымінальнага пераследу здольныя выявіць і канфіскаваць маёмасць асуджанага і накіраваць яе на пакрыццё патрабаванняў аб кампенсацыі.

Нават калі пераслед у рамках УЮ завяршаецца асуджальным прысудам, пацярпелыя могуць сутыкнуцца са значнымі затрымкамі ў атрыманні рашэння аб кампенсацыі і яшчэ большай няпэўнасцю адносна таго, калі такое рашэнне будзе або зможа быць выканана.

168 Артыкул 4 (e) Дырэктывы 2012/29/ЕС Еўрапейскага парламента і Савета ад 25 кастрычніка 2012 г. (Дырэктыва ЕС аб правах пацярпелых), які ўстанаўлівае мінімальныя стандарты ў галіне правоў, падтрымкі і абароны ахвяр злачынстваў.
169 ЕС, Дырэктыва Савета 2004/80/ЕС ад 29 красавіка 2004 г. аб кампенсацыі ахвярам злачынстваў, 29 красавіка 2024 г.

## Якую ролю могуць адыграць пацярпелыя ў разглядзе справы ў рамках універсальнай юрысдыкцыі?

Роля пацярпелых у справах паводле УЮ вызначаецца адпаведнай нацыянальнай прававой сістэмай і істотна адрозніваецца ў розных юрысдыкцыях. Удзел пацярпелых у крымінальным працэсе ў пэўнай юрысдыкцыі таксама залежыць ад той працэсуальнай ролі, якая ім надаецца, і ад паводзінаў адпаведных суб'ектаў, у тым ліку ўладаў і адвакатаў.

У Германіі і Швецыі, напрыклад, пацярпелыя могуць удзельнічаць у крымінальным працэсе ў якасці паўнапраўных працэсуальных бакоў (як сумесны грамадзянскіісцец у Германіі[170] і як пацярпелы бок (удзельнік) у Швецыі[171]). Далучэнне ў якасці ўдзельніка працэсу дае пацярпелым магчымасць карыстацца важнымі працэсуальнымі правамі, напрыклад, правам абскарджваць прысуд і меру пакарання. У Францыі і Бельгіі пацярпелыя могуць удзельнічаць у крымінальных працэсах у якасці грамадзянскага боку. Яны карыстаюцца шырокімі працэсуальнымі правамі, якія дазваляюць ім уплываць на ход расследавання або крымінальнага пераследу, у тым ліку, напрыклад, правам запытваць доступ да матэрыялаў крымінальнай справы або абскарджваць рашэнні, датычныя правядзення расследавання.

У Нідэрландах, наадварот, пацярпелыя не лічацца працэсуальнымі ўдзельнікамі судовага працэсу. Яны маюць пэўныя абмежаваныя правы, такія як права прадстаўляць дакументы для пацвярджэння шкоды, якую яны пацярпелі, і права задаваць пытанні сведкам і экспертам, але не могуць выклікаць сведак або абскарджваць рашэнне адносна віны ці меры пакарання[172].

**Швейцарыя: асуджэнне былога міністра ўнутраных спраў Гамбіі за злачынствы супраць чалавечнасці**

15 траўня 2024 г. Федэральны крымінальны суд Швейцарыі прызнаў вінаватым былога міністра ўнутраных спраў Гамбіі Усмана Сонка ў злачынствах супраць чалавечнасці, здзейсненых у перыяд з 2000 па 2016 год. Федэральны крымінальны суд прызнаў Сонка вінаватым у злачынствах, здзейсненых падчас кіравання былога прэзідэнта Гамбіі Ях'і Джамэ, у прыватнасці, у забойстве палітычнага апанента ў 2000 годзе, катаваннях і незаконным утрыманні пад вартай, пазбаўленні волі, актах катаванняў мірных дэманстрантаў і ў іншых злачынствах. Ён быў асуджаны на 20 гадоў пазбаўлення волі судом першай інстанцыі, апеляцыя ўсё яшчэ знаходзіцца на разглядзе[173].

Усман Сонка з'яўляецца самым высокапастаўленым чыноўнікам, калі-небудзь асуджаным у Еўропе за міжнародныя злачынствы ў адпаведнасці з прынцыпам універсальнай юрысдыкцыі. Ён быў арыштаваны ў студзені 2017 года пасля крымінальнай скаргі, пададзенай швейцарскім уладам арганізацыяй TRIAL International пасля атрымання інфармацыі аб прысутнасці Сонка ў Швейцарыі.

170 Open Society Justice Initiative, Trial International: Універсальная юрысдыкцыя: права і практыка ў Германіі, с. 25, красавік 2019 г.
171 Civil Rights Defenders: Паведамленне пра цяжкія міжнародныя злачынствы.
172 REDRESS: Ламаючы бар'еры: Доступ да правасуддзя ў Еўропе для ахвяр міжнародных злачынстваў, с. 82, красавік 2020 г.
173 Trial International: Усман Сонка, чэрвень 2025 г.

**Беларусь: Бягучае расследаванне ў Літве адносна меркаваных актаў катаванняў супраць мірных дэманстрантаў падчас пратэстаў у 2020 годзе**

9 снежня 2020 г. Генеральны пракурор Літвы распачаў расследаванне меркаваных актаў катаванняў на падставе скаргі грамадзяніна Беларусі Максіма Харошына, які быў затрыманы і, меркавана, падвергнуты катаванням з боку сілавых структур у Мінску 13 кастрычніка. Сярод падазраваных па справе – беларускія дзяржаўныя службоўцы, а таксама намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Мікалай Карпянкоў[174]. У 2021 годзе ўлады Літвы заслухалі некалькіх сведак[175]. Згодна з артыкулам у СМІ, апублікаваным у кастрычніку 2024 года, пракуратура, здаецца, «сабрала доказы 60 ахвяр і ідэнтыфікавала дзясяткі злачынцаў»[176].

# D. Юрысдыкцыя на падставе прынцыпу актыўнай або пасіўнай правасуб'ектнасці

## Што такое юрысдыкцыя на падставе прынцыпу актыўнай або пасіўнай правасуб'ектнасці?

У той час як прынцып УЮ не патрабуе тэрытарыяльнай або асабістай сувязі з дзяржавай, якая вядзе пераслед, экстратэрытарыяльная юрысдыкцыя дае магчымасць дзяржавам распаўсюджваць сваю юрысдыкцыю на злачынствы, здзейсненыя за мяжой іх грамадзянамі (прынцып актыўнай правасуб'ектнасці) або супраць іх грамадзян ці пастаянных жыхароў (прынцып пасіўнай правасуб'ектнасці), на падставе прынцыпаў актыўнай і пасіўнай правасуб'ектнасці.

Права прыцягваць да адказнасці сваіх грамадзян за асноўныя міжнародныя злачынствы, здзейсненыя за межамі краіны, маюць 98 дзяржаў, а ў 73 дзяржавах прадугледжана магчымасць ажыццяўлення юрысдыкцыі ў выпадку, калі ахвярай такіх злачынстваў з'яўляецца іх грамадзянін[177]. Аднак гэты шлях устанаўлення юрысдыкцыі забяспечвае доступ да правасуддзя толькі для абмежаванай групы пацярпелых – тых, хто мае грамадзянства дзяржавы, у якой могуць адбывацца судовыя працэсы, або калі меркаваны злачынца з'яўляецца грамадзянінам гэтай дзяржавы. У кантэксце масавых злачынстваў гэта вядзе да выбарачнай адказнасці, калі толькі абмежаваная колькасць пацярпелых можа дамагчыся правасуддзя і кампенсацыі.

Прымяненне гэтых прынцыпаў часта рэгулюецца ўмовамі і абмежаваннямі, вызначанымі нацыянальнай прававой сістэмай[178]. Напрыклад, у некаторых юрысдыкцыях, такіх як Францыя, для прыцягнення да адказнасці

174 TRIAL International: UJAR 2022, с. 70.
175 TRIAL International: UJAR 2022, с. 70.
176 LRT.lt: Што стаіць за ініцыятывай Літвы падаць на Лукашэнку ў суд, 2024 г.
177 Фонд Клуні за справядлівасць (CFJ), Правасуддзе без межаў: картаграфічнае даследаванне.
178 Фонд Клуні за справядлівасць (CFJ): Правасуддзе без межаў: картаграфічнае даследаванне, с. 8.

за злачынствы на падставе прынцыпаў актыўнай і пасіўнай правасуб’ектнасці ўведзена патрабаванне падвойнай крымінальнай адказнасці, што азначае, што дзеянне мусіць прызнавацца злачынствам як у дзяржаве грамадзянства, так і ў дзяржаве, дзе яно было здзейснена[179]. Аднак паколькі пэўныя злачынствы, напрыклад катаванні, падпадаюць пад універсальную забарону паводле міжнароднага права, юрысдыкцыя мусіць усё роўна ажыццяўляцца, нават калі такое дзеянне не замацавана ў крымінальным заканадаўстве дзяржавы.

Расследаванні і крымінальны пераслед, заснаваныя на прынцыпах актыўнай або пасіўнай правасуб’ектнасці, звычайна праходзяць праз працэсуальныя этапы, падобныя да апісаных у раздзеле пра ўніверсальную юрысдыкцыю (гл. вышэй Раздзел II. C «Універсальная юрысдыкцыя»), у адпаведнасці з дзеючай нацыянальнай крымінальна-працэсуальнай сістэмай. Аднак з самага пачатку яны часцей арыентаваны на канкрэтную асобу[180].

**Прыклад прынцыпу актыўнай правасуб’ектнасці:**
**Крымінальны пераслед за ваенныя злачынствы, здзейсненыя ў Сірыі грамадзянамі Нідэрландаў**

Нідэрландскія ўлады прыцягнулі да адказнасці грамадзян Нідэрландаў, якія вярнуліся з Сірыі і Ірака, на падставе прынцыпу актыўнай правасуб’ектнасці, напрыклад, у справе Хасны Аараб – грамадзянкі Нідэрландаў і меркаванай былой удзельніцы ІДІЛ.[181]

У 2015 годзе Хасна Аараб са сваім чатырохгадовым сынам прыехалі ў Сірыю з Нідэрландаў. У Сірыі яна ўзяла шлюб з мараканскім баевіком ІДІЛ і пражывала ў доме яго знаёмага ў горадзе Рака, дзе жанчыну-язідку прымушалі да хатняй працы. У лістападзе 2022 года Хасна Аараб была рэпатрыявана назад у Нідэрланды разам з 11 іншымі жанчынамі. Па вяртанні яна была арыштавана і абвінавачана ў злачынстве супраць чалавечнасці – зняволенні ў рабства – і ва ўдзеле ў замежнай тэрарыстычнай арганізацыі.

Нідэрландскія пракуроры абапіраліся на доказы, пададзеныя Следчай групай ААН па садзейнічанні прыцягненню да адказнасці за злачынствы, здзейсненыя «Даэш»/ІДІЛ (UNITAD), у тым ліку на сведчанні пацярпелай[182]. 11 снежня 2024 г. суд першай інстанцыі ў Гаазе прызнаў Хасну Аараб вінаватай у злачынстве супраць чалавечнасці – зняволенні ў рабства, удзеле ў замежнай тэрарыстычнай арганізацыі, садзейнічанні тэрарыстычным злачынствам і стварэнні пагрозы для дзіцяці, і прызначыў ёй пакаранне ў выглядзе 10 гадоў пазбаўлення волі. Гэтая справа стала першым прысудам у Нідэрландах за злачынствы супраць язідаў. Разгляд апеляцыі на прысуд яшчэ працягваецца[183].

179 Eurojust: Кароткі агляд: універсальная юрысдыкцыя ў дзяржавах – членах ЕС, 2023 г., с. 3.
180 Расследаванне супраць канкрэтнай асобы – гэта расследаванне, арыентаванае на патэнцыйную крымінальную адказнасць ідэнтыфікаванай асобы, у той час як структурнае расследаванне разглядае шырэйшую сітуацыю.
181 Overheid.nl: Пастанова Міністра замежных спраў ад 25 верасня 2024 г. № BZ2401394 Аб адмене рашэння ад 7 снежня 2016 г. № MinBuZa-2016.847749, якое пазначала спн. Хасну Аараб асобай, што падпадае пад дзеянне Палажэння аб санкцыях супраць тэрарызму 2007-II, 25 верасня 2024 г.
182 Journal of International Criminal Justice: Мандаты ААН па забеспячэнні адказнасці ў міжнародным правасуддзі, ліпень 2023 г.
183 Interlinkages Database, Case: Hasna A., 71/256885-24 – 1st Inst. Вердыкт – Апеляцыя на разглядзе.

**Прынцып пасіўнай правасуб'ектнасці:**

**Расследаванне Літвой забойства літоўскага рэжысёра ва Украіне**

Прыкладам прымянення прынцыпу пасіўнай правасуб'ектнасці ў справах аб міжнародных злачынствах з'яўляецца расследаванне Літвой забойства літоўскага рэжысёра Мантаса Кведаравічуса ў Марыупалі падчас вайны Расіі супраць Украіны.

У сакавіку 2022 г., калі Мантас Кведаравічус здымаў у Марыупалі свой дакументальны фільм і дапамагаў эвакуяваць мірных жыхароў з акружанага горада, ён, паводле паведамленняў, быў захоплены, імаверна, удзельнікамі ўзброеных фарміраванняў, што падтрымліваюцца Расіяй. Праз некалькі дзён яго знайшлі мёртвым. Улады Літвы пачалі расследаванне ў красавіку 2022 года, меркавана засяродзіўшы ўвагу на абвінавачаннях у ваенных злачынствах. Па стане на чэрвень 2025 года афіцыйнае абвінавачанне не было прад'яўлена ніводнаму падазраванаму. Расследаванне працягваецца[184].

**Прынцып пасіўнай правасуб'ектнасці: расследаванне інцыдэнту з самалётам Ryanair, прымусова пасаджаным у Мінску**

У траўні 2021 г. беларускія авіядыспетчары лжыва паведамілі пра быццам бы наяўную на борце рэйса Ryanair у Вільнюс бомбу і прымусілі самалёт прызямліцца ў аэрапорце Мінска. Пры пасадцы ўлады Беларусі арыштавалі беларускага апазіцыйнага актывіста Рамана Пратасевіча і яго партнёрку Сафію Сапегу, якія былі сярод пасажыраў.

Улады Польшчы і Літвы стварылі сумесную следчую групу (ССГ) для расследавання інцыдэнту[185]. Група апытала некалькіх сведак, у тым ліку членаў экіпажа самалёта і пасажыраў, і атрымала запісы і фатаграфіі, зробленыя падчас інцыдэнту. Eurojust арганізавала каардынацыйныя сустрэчы паміж членамі ССГ і садзейнічала выкананню Еўрапейскіх ордараў на расследаванне ў Балгарыі, Грэцыі і Румыніі для забеспячэння доказаў, а таксама запытаў аб прававой дапамозе ў Швейцарыю, Нарвегію і Злучаныя Штаты.

6 верасня 2024 г., па выніках трохгадовага расследавання, польскія ўлады абвінавацілі трох грамадзян Беларусі ў тым, што яны падманным шляхам захапілі польскі самалёт і незаконна пазбавілі волі 132 чалавек праз здзяйсненне тэрарыстычных актаў, маючы на мэце сур'ёзна запалохаць шырокае кола людзей, у тым ліку групы, якія выступаюць супраць рэжыму Беларусі. У вышуку, абвешчанаму Польшчай, знаходзяцца былы дырэктар беларускай авіяцыйнай навігацыйнай службы, дзяжурны начальнік мінскага цэнтра кіравання паветраным рухам і кіраўнік нацыянальнай разведкі і службы ўнутранай бяспекі Беларусі (КДБ).

184 TRIAL International: UJAR 2023, с. 71. Нявеста Кведаравічуса Ганна Білаброва і яе літоўскі адвакат працуюць пры падтрымцы Еўрапейскага цэнтра па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR).

185 Eurojust: Трое грамадзян Беларусі абвінавачаны ў прымусе польскага самалёта да пасадкі для арышту дысідэнта, 6 верасня 2024 г.

### Якую дадатковую вартасць мае крымінальны пераслед на падставе прынцыпаў актыўнай або пасіўнай правасуб'ектнасці?

Справы, у якіх злачынца або пацярпелы з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы, што вядзе расследаванне, могуць мець больш выразную сувязь з пункту гледжання юрысдыкцыі; аднак яны ўсё яшчэ сутыкаюцца з практычнымі праблемамі, падобнымі да тых, што ўзнікаюць у справах на падставе ўніверсальнай юрысдыкцыі, у тым ліку з цяжкасцямі ў зборы доказаў за мяжой і нежаданнем дзяржаў, на тэрыторыі якіх адбылося злачынства, супрацоўнічаць у рамках працэдур або выдаваць падазраваных.

### Якую ролю адыгрываюць пацярпелыя ў такіх крымінальных справах?

Роля пацярпелых у такіх працэдурах залежыць ад прававой сістэмы дзяржавы, якая ажыццяўляе пераслед, у тым ліку ад таго, ці надаецца пацярпелым працэсуальны статус, напрыклад, права ўдзельнічаць у працэсе ў якасці грамадзянскага боку, падаваць доказы або патрабаваць кампенсацыю (пра правы пацярпелых у асобных юрысдыкцыях гл. у Раздзеле II. C «Універсальная юрысдыкцыя»).

# E. Нацыянальныя суды Беларусі

Хаця пры дзеючым рэжыме няма абгрунтаваных падстаў чакаць, што ўлады Беларусі сапраўды распачнуць расследаванне і крымінальны пераслед за меркаваныя парушэнні правоў чалавека і міжнародныя злачынствы, нельга цалкам выключаць перспектыву будучых нацыянальных працэсаў па забеспячэнні адказнасці ў Беларусі, хай сабе і аддаленую ў часе. Многія з пацярпелых, апытаных беларускімі арганізацыямі, успрымаюць сапраўднае правасуддзе як непарыўна звязанае з палітычнымі зменамі – у тым ліку з пераходам да постаўтарытарнай сістэмы кіравання і аднаўленнем легітымнай і незалежнай судовай улады[186].

Магчымы дэмакратычны пераход у Беларусі можа закласці падмурак для таго, каб прыцягненне да адказнасці стала ключавым кампанентам комплекснага працэсу пераходнага правасуддзя. Гэта можа ўключаць у сябе:

- **Крымінальныя працэсы ў нацыянальных судах** для асоб, адказных за здзейсненыя злачынствы;
- **Працэсы ўстанаўлення ісціны** і гістарычныя расследаванні;
- **Механізмы заахвочвання да поўнага раскрыцця інфармацыі і супрацоўніцтва** ў высвятленні ўчыненых злачынстваў, напрыклад, праз амніставанне або змякчэнне прысудаў;
- **Рэабілітацыйнае правасуддзе** і адмена палітычна матываваных прысудаў.

Улічваючы маштаб і комплекснасць здзейсненых злачынстваў, будучы працэс пераходнага правасуддзя і аднаўлення судовай сістэмы можа запатрабаваць міжнароднай дапамогі.

186 «Вясна» і МК: Беларусь: Як успрымаюць справядлівасць людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, с. 31, 2024 г.

Канстытуцыйны пераход ад аўтарытарнага кіравання таксама будзе патрабаваць працэсу пераацэнкі і, магчыма, адхілення суддзяў і пракурораў, якія не жадаюць або не здольныя працаваць сумленна, бесстаронна і кампетэнтна ва ўмовах дэмакратычнай сістэмы. Працэсы скрынінгу судовай сістэмы, такія як праверка добранадзейнасці, люстрацыя, конкурсныя працэдуры на паўторнае прызначэнне і расследаванні камісій па ўстанаўленні ісціны, праводзіліся, напрыклад, у Аргенціне, Чылі, Чэшскай Рэспубліцы, Сальвадоры, Эстоніі, Гватэмале, Германіі, Венгрыі, Кеніі, Пакістане і Паўднёвай Афрыцы[187].

# F. Спецыяльны трыбунал Савета Еўропы па злачынстве агрэсіі супраць Украіны

## Што такое Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны?

Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны (Трыбунал) – гэта міжнародны судовы орган, створаны для разгляду наступстваў вайны агрэсіі Расіі супраць Украіны, з мандатам на расследаванне, крымінальны пераслед і судовы разгляд у дачыненні да палітычных і вайсковых лідараў, якія планавалі, рыхтавалі, ініцыявалі, здзейснілі або спрабавалі здзейсніць злачынства агрэсіі[188].

Па аналогіі з артыкулам 8*bis* Рымскага статута, артыкул 2 Статута Трыбунала вызначае злачынства агрэсіі як «планаванне, падрыхтоўку, ініцыяванне або ажыццяўленне асобай, якая займае становішча, што фактычна дазваляе ёй ажыццяўляць кантроль над палітычнымі або вайсковымі дзеяннямі дзяржавы ці кіраваць імі, акта агрэсіі, які сваім характарам, цяжкасцю і маштабам уяўляе сабой яўнае парушэнне Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый»[189].

Пасля працяглых і складаных перамоў Трыбунал быў створаны ў рамках Савета Еўропы з мэтай забеспячэння яго незалежнасці, непрадузятасці і легітымнасці. Ідэя, якая першапачаткова належала вядомаму міжнароднаму юрысту Філіпу Сэндсу, была падтрымана ўрадам Украіны[190]. Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) стала першым міжнародным органам, які заклікаў да стварэння такога трыбунала ў красавіку 2022 года, усяго праз два месяцы пасля поўнамаштабнага ўварвання Расіі[191].

25 чэрвеня 2025 года прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі падпісаў двухбаковае пагадненне аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала з генеральным сакратаром Савета Еўропы Аленам Берсэ[192]. Пасля гэтага зацікаўленыя бакі, у тым ліку дзяржавы –члены Савета Еўропы, а таксама дзяржавы з усяго свету, якія не з'яўляюцца членамі СЕ, і Еўрапейскі Саюз, разгледзяць пытанне аб далучэнні да Пашыранага частковага пагаднення (Enlarged Partial

187 Bingham Centre for the Rule of Law, Праекты: Спецыяльныя працэдуры для пераацэнкі і адхілення суддзяў у перыяд канстытуцыйных пераходных працэсаў.
188 Камітэт міністраў Савета Еўропы, Статут Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, арт. 2 (1), 24 чэрвеня 2025 г.
189 Камітэт міністраў Савета Еўропы, Статут Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, арт. 2 (2), 24 чэрвеня 2025 г.
190 Financial Times, Прымяненне Пуціным вайсковай сілы з'яўляецца злачынствам агрэсіі.
191 Еўрапейская служба знешніх дзеянняў, Рэзалюцыя 2436 (2022), Агрэсія Расійскай Федэрацыі супраць Украіны: забеспячэнне адказнасці за сур'ёзныя парушэнні міжнароднага гуманітарнага права і іншыя міжнародныя злачынствы, 28 красавіка 2022 г.
192 Еўрапейская служба знешніх дзеянняў, Пагадненне паміж Саветам Еўропы і Украінай аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, CM(2025)104-final, 24 чэрвеня 2025 г., арт. 9; Вярхоўная Рада Украіны ратыфікавала Пагадненне паміж Украінай і Саветам Еўропы аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны 15 ліпеня 2025 года.

Agreement) аб кіраванні Спецыяльным трыбуналам. Пасля таго, як зацікаўленыя дзяржавы выказалі жаданне прыняць удзел, Камітэт міністраў адновіць сваю працу ў стварэнні Пашыранага частковага пагаднення[193]. Чакаецца, што Трыбунал пачне сваю працу ў 2026 годзе.

Трыбунал будзе дапаўняць працу Міжнароднага крымінальнага суда (МКС) і іншых міжнародных і нацыянальных механізмаў прыцягнення да адказнасці. МКС будзе мець прыярытэт у выпадку, калі асоба, у дачыненні да якой выдадзены ордар на арышт МКС, будзе затрымана гэтым судом[194]. Трыбунал можа заключаць дамоўленасці або пагадненні з МКС, а таксама з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і іншымі міжнароднымі арганізацыямі і структурамі[195].

Юрысдыкцыя Спецыяльнага трыбунала будзе грунтавацца на тэрытарыяльнай юрысдыкцыі Украіны[196].

Асноватворныя прававыя дакументы Трыбунала ўключаюць у сябе:

- Статут, г. зн. асноўны прававы дакумент, які будзе рэгуляваць дзейнасць Трыбунала, вызначаць злачынства агрэсіі, юрысдыкцыю суда, прымяняльнае права, ключавыя параметры, звязаныя з расследаваннем, крымінальным пераследам і судовым разглядам, а таксама пытанні імунітэтаў[197];

- Двухбаковае пагадненне паміж урадам Украіны і Саветам Еўропы аб стварэнні Трыбунала, якое вызначае яго прававое становішча, паўнамоцтвы і супрацоўніцтва[198].

- Пашыранае частковае пагадненне – міжнародны дагавор, які ахоплівае розныя аспекты кіравання Трыбуналам[199].

Адметнай рысай, замацаванай у Статуце Трыбунала, з'яўляецца тое, што Пракурор Трыбунала будзе абапірацца на справы, перададзеныя Генеральным пракурорам Украіны пасля таго, як той ацэніць, ці ёсць падставы прад'явіць асобе абвінавачанне ў злачынстве агрэсіі[200].

Трыбунал будзе кіравацца сваімі статутнымі дакументамі, а таксама, у выпадку неабходнасці, іншымі дагаворамі, звычаёвым міжнародным правам і агульнымі прынцыпамі права, каб забяспечыць адпаведнасць міжнародна прызнаным стандартам міжнароднага крымінальнага права[201].

---

193 Савет Еўропы, прэс-рэліз «Украіна і Савет Еўропы падпісалі Пагадненне аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны», 25 чэрвеня 2025 г.
194 Статут, арт. 46 (2).
195 Статут, арт. 46 і 47.
196 Статут, арт. 1.
197 Савет Еўропы, Статут Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, 24 чэрвеня 2025 г.
198 Opinio Juris, Шлях, якім (яшчэ) не пайшлі: Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, 16 красавіка 2025 г.
199 Праект Рэзалюцыі CM/Res(2025) аб устанаўленні Пашыранага частковага пагаднення аб Камітэце па кіраванні Спецыяльным трыбуналам па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, 18 чэрвеня 2025 г.
200 Статут, арт. 23.
201 Статут, арт. 3.

Статут выразна выключае прымяненне «функцыйнага імунітэту», замацоўваючы, што кіраўнікі дзяржаў або ўрадаў, члены ўрадаў або парламентаў, выбраныя прадстаўнікі або дзяржаўныя службовыя асобы не карыстаюцца імунітэтам ад расследавання Спецыяльным трыбуналам[202]. Аднак з-за асабістага імунітэту, якім карыстаюцца лідары так званай «тройкі» (кіраўнікі дзяржаў, кіраўнікі ўрадаў і міністры замежных спраў), гэтыя асобы могуць быць прыцягнуты да адказнасці толькі тады, калі яны больш не займаюць свае пасады або іх імунітэт быў зняты[203]. Нягледзячы на гэта, расследаванне і збор доказаў могуць быць праведзены загадзя, а абвінавачанні мусяць быць гатовыя для пачатку пераследу і судовага разбору, калі дазволяць абставіны.

Калі імунітэт не перашкаджае Трыбуналу перайсці да стадыі судовага разгляду, ён можа правесці працэс *in absentia* ў выпадку, калі «абвінавачваны недвухсэнсоўна адмовіўся ад права прысутнічаць […] або калі былі прыняты ўсе разумныя меры, каб забяспечыць яго з'яўленне і паведаміць яму аб прад'яўленых абвінавачаннях», пры ўмове забеспячэння працэсуальных гарантый для такіх разглядаў, у тым ліку абавязковага паведамлення, права на абарону і права на паўторны разгляд справы ў выпадку вынясення асуджальнага прысуду[204].

Трыбунал будзе ўдзельнічаць у пагадненнях аб супрацоўніцтве з дзяржавамі, якія, адпаведна, будуць звязаны міжнародным правам для забеспячэння павагі да яго рашэнняў і ордараў[205].

Трыбунал будзе фінансавацца і кіравацца Членамі і Асацыяванымі членамі Пашыранага частковага пагаднення.

## Якую дадатковую вартасць мае Спецыяльны трыбунал у прыцягненні да адказнасці меркаваных беларускіх злачынцаў?

Трыбунал ліквідуе прабел у механізмах прыцягнення да адказнасці, пакінуты МКС, які не можа ажыццяўляць юрысдыкцыю адносна меркаванага злачынства агрэсіі, здзейсненага кіраўнікамі Расіі, Беларусі або Паўночнай Карэі, бо яны з'яўляюцца грамадзянамі дзяржаў, што не ратыфікавалі Рымскі статут. З улікам юрысдыкцыйных абмежаванняў МКС, Трыбунал з'яўляецца дадатковым міжнародным механізмам, накіраваным на ўмацаванне сусветнага парадку, заснаванага на міжнародным праве, і на стрымліванне будучых актаў агрэсіі з боку кіраўнікоў дзяржаў.

Дзейнасць Трыбунала можа зрабіць свой унёсак у стварэнне гістарычнага архіва, які падрабязна адлюструе здзяйсненне Расіяй злачынства агрэсіі і ўдзел яе кіраўнікоў разам з кіраўнікамі Беларусі і Паўночнай Карэі, служачы супрацьвагай расійскай дэзынфармацыі. Акрамя таго, яна можа спрыяць фарміраванню прававога прэцэдэнту, які ўмацуе міжнароднае крымінальнае права ў частцы пераследу за злачынства агрэсіі і палегчыць будучыя працэсы прыцягнення да адказнасці, а таксама стрымліваць кіраўнікоў дзяржаў у іншых рэгіёнах свету.

202 Статут, арт. 4(2), арт. 23(4).
203 Статут, арт. 23(5).
204 Статут, арт. 28 (працэсуальныя гарантыі для завочных судовых працэсаў адпавядаюць Еўрапейскаму суду па правах чалавека).
205 СЕ, Часта задаваныя пытанні – Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны.

У святле юрысдыкцыі Трыбунала ў дачыненні да кіраўнікоў дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў злачынстве агрэсіі супраць Украіны, Трыбунал можа таксама расследаваць дзеянні грамадзян Беларусі і Паўночнай Карэі, калі ёсць дастатковыя доказы таго, што яны адыгралі значную ролю ў злачынстве агрэсіі супраць Украіны[206].

Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) звяртала ўвагу на саўдзел кіраўніцтва Беларусі ў агрэсіўнай вайне супраць Украіны, адзначаючы, што «Беларусь дазволіла Расіі выкарыстоўваць сваю тэрыторыю для здзяйснення акту агрэсіі супраць Украіны, што само па сабе з'яўляецца актам агрэсіі». Далей сцвярджаецца, што «палітычнае і вайсковае кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, Беларусі і Паўночнай Карэі здзейсніла і здзяйсняе злачынства агрэсіі супраць Украіны, якое цягне за сабой індывідуальную крымінальную адказнасць для адпаведных лідараў, незалежна ад іх службовай пасады, у тым ліку для кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў» (пункт 4.5)[207]. Гл. таксама: Раздзел II. F «Спецыяльны трыбунал Савета Еўропы па злачынстве агрэсіі супраць Украіны».

Адна з крытычных заўваг у адрас Трыбунала заключаецца ў тым, што ён будзе засяроджаны на абмежаванай колькасці спраў супраць высокапастаўленых злачынцаў, пры нізкай імавернасці іх фактычнага затрымання[208]. Акрамя таго, асобы, якія ўяўляюць цікавасць для Трыбунала, могуць таксама знаходзіцца пад расследаваннем МКС[209], які будзе мець прыярытэт над Трыбуналам у выпадку іх арышту. У сувязі з папярэдняй праверкай МКС у дачыненні да меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых уладамі Беларусі, ёсць аналагічныя пытанні з нагоды частковага дублявання судовых працэсаў і ў дачыненні да кіраўнікоў Беларусі[210].

## Якія магчымыя вынікі працы Трыбунала?

Праца Трыбунала можа прывесці да шэрагу вынікаў:

- Асуджэнне і вынясенне прысуду палітычным і вайсковым дзеячам, прызнаным вінаватым у злачынстве агрэсіі супраць Украіны.
- Апраўданне, калі крымінальная адказнасць абвінавачванага не можа быць даказана па-за межамі разумнага сумневу.

У той час як Статут Трыбунала не прадугледжвае права пацярпелых патрабаваць кампенсацыі, ён прадугледжвае, што сродкі, сабраныя за кошт штрафаў або канфіскацыі пасля асуджэння асобы (асоб), будуць пераведзены ў механізм кампенсацыі, створаны ў адпаведнасці з рэзалюцыяй 11/15 Генеральнай Асамблеі ААН для пакрыцця шкоды, страты або траўмы, па выніку міжнародных супрацьпраўных дзеянняў Расійскай Федэрацыі ва Украіне або супраць яе[211]. У якасці першага кроку да стварэння Камісіі паísках Савет Еўропы стварыў Рэестр страт, нанесеных агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны, які ўпаўнаважаны

206 CE, Часта задаваныя пытанні – Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны.
207 Савет Еўропы, Прававыя і праваабарончыя аспекты ў агрэсіі Расійскай Федэрацыі супраць Украіны.
208 Andrew Forbe, Шлях, якім (яшчэ) не пайшлі: Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, 16 красавіка 2025 г.
209 МКС, Сітуацыя ва Украіне.
210 Міжнародны крымінальны суд, Папярэдняя праверка, Літоўская Рэспубліка / Рэспубліка Беларусь.
211 Статут, арт. 37. Гл. таксама: Рэкамендацыя аб прыняцці рашэння Савета, якая дазваляе Еўрапейскай камісіі ад імя Еўрапейскага Саюза ўдзельнічаць у перамовах па міжнародным інструменце, што стварае Міжнародную камісію па ісках для Украіны.

прымаць іскі аб шкодзе, стратах або траўмах, прычыненых 24 лютага 2022 г. або пазней на тэрыторыі Украіны міжнародна супрацьпраўнымі дзеяннямі Расійскай Федэрацыі ва Украіне або супраць яе (гл. Раздзел V. A «Стварэнне рэестра нанесеных страт»)[212]. Аднак грамадзяне Беларусі наўрад ці змогуць скарыстацца гэтай магчымасцю, калі толькі яны не пражывалі ва Украіне.

## Якім чынам пацярпелыя і грамадскія арганізацыі ўдзельнічаюць у працэсе?

Злачынства агрэсіі па сваёй прыродзе з’яўляецца злачынствам, накіраваным супраць дзяржавы, якая стала аб’ектам незаконнага прымянення сілы іншай дзяржавай (дзяржавамі). Хоць гэтае злачынства не накіравана на асобных канкрэтных ахвяр як такіх, яны могуць панесці сур’ёзную шкоду ў выніку такога злачынства. Статут Трыбунала прадугледжвае магчымасць удзелу пацярпелых пры ўмове, што яны «асабліва пацярпелі» ад дзеянняў, якія складаюць сутнасць злачынства і пазначаны ў абвінавачым акце[213]. Такі вузкі падыход да ўдзелу ахвяр выключае іх масавы ўдзел, бо ў адваротным выпадку прэтэндаваць на гэта магло б усё насельніцтва Украіны[214]. У выключных выпадках Трыбунал можа дазволіць пацярпелым удзельнічаць у працэсе пры ўмове, што яны будуць прадстаўлены калектыўна праз адваката, з забеспячэннем належных гарантый права абвінавачванага на справядлівы судовы разгляд.

У адрозненне ад палажэнняў Рымскага статута, у Статут Трыбуналу падае ўдзел ахвяры як магчымасць, а не як права. Такім чынам, рэалізацыя гэтага палажэння будзе залежаць ад судовай інтэрпрэтацыі абсягу і межаў механізма ўдзелу пацярпелых.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці часта адыгрываюць важную ролю ў працы міжнародных трыбуналаў праз падтрымку пацярпелых, збор дакументацыі і павышэнне інфармаванасці пра дзейнасць Трыбунала.

212 Савет Еўропы, Рэестр нанесеных Украіне страт.
213 Статут, арт. 22.
214 Asser Institute, Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, Прававая ацэнка і рэкамендацыі па палітыцы, с. 32, чэрвень 2025 г.

# IV. АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ

Згодна з міжнародным публічным правам, у тым ліку з правам правоў чалавека і міжнародным крымінальным правам, дзяржавы звязаны міжнароднымі дагаворамі, якія яны ратыфікавалі або іншым чынам далучыліся, а таксама імператыўнымі нормамі міжнароднага права (*jus cogens*). Беларусь узяла на сябе абавязацельствы па некалькіх міжнародных дагаворах у галіне правоў чалавека, у тым ліку па Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (ICCPR), Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (ICESCR), Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (ICERD), Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW), Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (CAT), Канвенцыі аб правах дзіцяці (CRC) і Канвенцыі аб правах людзей з інваліднасцю (CRPD)[215].

Беларусь першапачаткова прызнала працэдуру разгляду індывідуальных скаргаў як паводле МПГПП (ICCPR), так і паводле КЛДЖ (CEDAW), аднак у 2022 годзе адклікала прызнанне першай з іх (падрабязней гл. у Раздзеле пра Дагаворныя органы ААН і Міжнародны суд).

Што тычыцца нормаў *jus cogens* – вызначаных як нормы, прызнаныя і прынятыя міжнароднай супольнасцю дзяржаў у якасці нормаў, ад якіх не дапускаецца ніякіх адхіленняў, – адным з прыкладаў з’яўляецца абсалютная і ўсеагульная забарона катаванняў, якая таксама замацавана ў Канвенцыі ААН супраць катаванняў[216]. Забарона агрэсіі, генацыду і злачынстваў супраць чалавечнасці таксама з’яўляюцца нормамі *jus cogens* паводле міжнароднага права[217]. Хоць некаторыя нормы, што набылі статус *jus cogens*, замацаваны ў міжнародных дагаворах, напрыклад у Канвенцыі супраць катаванняў, МПГПП і Рымскім статуце, дзяржавы абавязаныя выконваць такія нормы нават у тым выпадку, калі яны не далучыліся да адпаведнага міжнароднага дагавора.

Больш за тое, як член ААН, Беларусь з’яўляецца ўдзельніцай Міжнароднага суда ААН (ICJ) і абавязана выконваць яго рашэнні[218].

215 УВКПЧ. Статус ратыфікацыі.
216 УВКПЧ, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, 10 снежня 1984 г.
217 Камісія міжнароднага права, Даклад Камісіі міжнароднага права аб працы яе сямідзесяці першай сесіі (29 красавіка – 7 чэрвеня і 8 ліпеня – 9 жніўня 2019 г.), UN Doc A/74/10 (2019) (ILC 2019 Report).
218 ААН, Статут ААН, артыкулы 93 і 94.

# А. Міжнародны суд ААН (ICJ)

## Якую ролю грае Міжнародны суд ААН (International Court of Justice)?

Міжнародны Суд (International Court of Justice) быў створаны Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у чэрвені 1945 года і з'яўляецца яе галоўным судовым органам, створаным для мірнага ўрэгулявання спрэчак паміж дзяржавамі.[219] Згодна са Статутам АНН, «Усе Члены ААН з'яўляюцца *ipso facto* ўдзельнікамі Статута Міжнароднага Суда»[220] і кожны «абавязваецца выканаць рашэнне Міжнароднага Суда па той справе, у якой ён з'яўляецца бокам»[221]. Статут Міжнароднага суда ААН, які развівае агульныя прынцыпы, замацаваныя ў Статуце ААН, быў далучаны да яго ў якасці дадатку і стаў неад'емнай часткай сістэмы ААН.

Міжнародны суд мае паўнамоцтвы ў вырашэнні спрэчак паміж дзяржавамі, гэта значыць, ён разглядае адказнасць дзяржаў, а не індывідуальную адказнасць (гл. Раздзел II), і толькі дзяржавы могуць быць бакамі ў юрыдычных спрэчках перад Судом (так званыя «спрэчныя справы»). Працэдуры ў Міжнародным судзе не могуць быць ініцыяваны фізічнымі асобамі, няўрадавымі арганізацыямі або іншымі прыватнымі бакамі.

Пэўныя абавязацельствы ў галіне правоў чалавека прызнаны як абавязацельствы *erga omnes*, што азначае: іх абарона належыць усёй міжнароднай супольнасці. Адпаведна, усе дзяржавы маюць прававы інтарэс у забеспячэнні выканання гэтых абавязацельстваў, нават калі яны самі наўпрост не пацярпелі ад парушэнняў[222], і могуць звяртацца да міжнародных механізмаў па ўрэгуляванні спрэчак, у тым ліку ў Міжнародны суд ААН.

## Пры якіх умовах справа можа быць перададзена ў Міжнародны суд?

Найбольш актуальны ў кантэксце Беларусі шлях звязаны з кампетэнцыяй Міжнароднага суда ААН вырашаць спрэчкі на падставе адпаведных палажэнняў міжнародных дагавораў, пры ўмове, што яны былі ратыфікаваны без агаворак адносна юрысдыкцыі Суда да ўзнікнення спрэчкі. Такая справа падаецца ў Суд праз пісьмовую заяву – дакумент, які вызначае прадмет спрэчкі і бакі, а таксама ўказвае палажэнне адпаведнага міжнароднага дагавора, якое надае Суду юрысдыкцыю[223].

### Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (CAT)

Катаванні і іншыя жорсткія, бесчалавечныя і прыніжальныя для годнасці абыходжанне і пакаранне беларускімі

219 Міжнародны суд, Статут Міжнароднага Суда, арт. 4.
220 ААН, Статут ААН, арт. 93 (1).
221 ААН, Статут ААН, арт. 94 (1).
222 Міжнародны суд, Пытанні, датычныя абавязацельства прыцягваць да адказнасці або экстрадаваць (Бельгія супраць Сенегала), Рашэнне, справаздачы 2012 (II), с. 449, пункт 68, 20 ліпеня 2012 г.
223 Міжнародны Суд, Статут Міжнароднага Суда, арт. 40, пункт 1; Правілы, арт. 38.

сілавікамі ў дачыненні да сапраўдных або меркаваных апанентаў[224]) адсочвае Камітэт супраць катаванняў, які з'яўляецца дагаворным органам, адказным за нагляд за выкананнем дзяржавамі – удзельніцамі Канвенцыі[225] (падрабязней аб гэтай працэдуры расследавання Камітэта гл. у Раздзеле IV. B «Дагаворныя органы ААН»).

Артыкул 30(1) Канвенцыі супраць катаванняў прадугледжвае, што спрэчка паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі адносна тлумачэння або прымянення Канвенцыі можа быць перададзена ў Міжнародны суд, калі толькі адпаведная дзяржава не зрабіла агаворку адносна гэтага артыкула. Пры ратыфікацыі Канвенцыі 13 сакавіка 1987 года Беларусь зрабіла агаворку да палажэння аб урэгуляванні спрэчак, аднак 19 красавіка 1989 года яна адклікала гэтую агаворку[226].

Для прыцягнення Беларусі як дзяржавы да адказнасці за катаванні і іншыя жорсткія, бесчалавечныя або прыніжальныя для годнасці віды абыходжання ці пакарання дзяржавы могуць ініцыяваць працэдуру ў Міжнародным судзе на падставе адпаведных палажэнняў Канвенцыі супраць катаванняў.

**Канвенцыя супраць катаванняў: Канада і Нідэрланды супраць Сірыі**

У верасні 2020 года Нідэрланды абвясцілі аб намеры прыцягнуць Сірыю да адказнасці за парушэнні Канвенцыі ААН супраць катаванняў. Урад Нідэрландаў паведаміў сірыйскаму боку пра гэтае рашэнне ў дыпламатычнай ноце, нагадаўшы Сірыі пра яе міжнародныя абавязацельствы паводле Канвенцыі супраць катаванняў, і заклікаў пачаць перамовы.[227] У 2021 годзе да гэтых намаганняў далучылася Канада. На працягу наступных двух гадоў абедзве дзяржавы зрабілі неабходныя крокі – перамовы і паспрабавалі дасягнуць пагаднення ў рамках арбітражу (гл. вышэй) – перш чым звярнуцца да Міжнароднага суда[228].

Калі бакі не змаглі дасягнуць дамоўленасці адносна арганізацыі арбітражу на працягу шасці месяцаў,[229] 8 чэрвеня 2023 года дзве дзяржавы падалі ў Міжнародны суд ААН пісьмовую заяву, дзе заявілі аб шэрагу парушэнняў Канвенцыі супраць катаванняў[230] і папрасілі Суд прадпісаць часовыя меры[231].

---

224 Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека, Сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх [Даклад], A/HRC/55/61, 15 сакавіка 2024 г.; Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека, Сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх [Даклад], A/HRC/55/61, 3 лютага 2023 г.; Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Даклад дакладчыка Маскоўскага механізма АБСЕ па меркаваных парушэннях правоў чалавека, звязаных з прэзідэнцкімі выбарамі 9 жніўня 2020 года ў Беларусі, прафесар д-р Вольфганг Бенедэк, 5 лістапада 2020 г.

225 Камітэт супраць катаванняў, Даклад Камітэта супраць катаванняў (79-ая сесія, 13 траўня 2023 г. – 10 траўня 2024 г.), UN Doc A/79/44, пункт 45, 2024 г.

226 Зборнік дагавораў ААН, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, статус па стане на 22 ліпеня 2025 г.

227 Урад Нідэрландаў, Нідэрланды лічаць Сірыю адказнай за грубыя парушэнні правоў чалавека, 18 верасня 2020 г.

228 УВКПЧ, Прыцягненне да адказнасці ў Сірыі згодна з Канвенцыяй супраць катаванняў: Сумесная ініцыятыва Канады і Нідэрландаў, снежань 2021 г.

229 Сумесная заява ў Міжнародны Суд аб завядзенні справы, пададзеная ў Рэестр Суда 8 чэрвеня 2023 г., згодна з Канвенцыяй супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі), пункт 13, 8 чэрвеня 2023 г.

230 У прыватнасці, артыкулы 2, 2(1), 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16 і 19 Канвенцыі. Гл.: Міжнародны суд. Заява аб завядзенні справы ў адпаведнасці з Канвенцыяй супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі).

231 Міжнародны суд, прэс-рэліз № 2023/28, Канада і Каралеўства Нідэрландаў сумесна ініцыююць справу супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі і просяць Суд прызначыць часовыя меры, 12 чэрвеня 2023 г.

У адказ Сірыя паведаміла Суду аб сваім рашэнні не ўдзельнічаць у вусным разглядзе[232], аднак 10 кастрычніка 2023 года прадставіла свае пісьмовыя заўвагі па часовых мерах[233]. Праз чатыры месяцы Міжнародны суд прыняў часовыя меры, загадаўшы Сірыі прыняць усе неабходныя меры для прадухілення актаў катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, забяспечыць, каб асобы пад яе кантролем не здзяйснялі такіх дзеянняў, і прыняць меры для захавання доказаў[234].

Інфармацыю і доказы аб палітыцы і практыцы катаванняў сірыйскага ўрада ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва для падтрымкі Нідэрландаў і Канады ў ініцыяванні справы на падставе паказанняў пацярпелых і сведак прадставіў Сірыйскі цэнтр правасуддзя і забеспячэння адказнасці (SJAC).

У снежні 2024 года, па просьбах дзяржаў-удзельніц, Суд падоўжыў тэрміны для падачы пісьмовых заяў бакоў: да чэрвеня 2025 года – для Канады і Нідэрландаў, да кастрычніка 2026 года – для Сірыі, улічваючы змену ўрада ў гэтай краіне[235].

### Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW)

Згодна са шматлікімі дакладамі, апублікаванымі УВКПЧ, спецыяльнымі дакладчыкамі і грамадзянскай супольнасцю, Беларусь паслядоўна не выконвае сваіх абавязацельстваў па Канвенцыі аб КЛДЖ (CEDAW), асабліва ў святле жорсткага абыходжання з жанчынамі-палітвязнямі [236], рэпрэсій у дачыненні да сваякоў палітвязняў[237], катаванняў і жорсткага абыходжання з жанчынамі, затрыманымі паводле палітычна матываваных падстаў, у тым ліку гендарна абумоўленымі формамі псіхалагічнага гвалту, такімі як пагрозы згвалтавання і сексуальна абразлівыя каментарыі[238]. У сваім дзявятым перыядычным аглядзе (люты 2025 года) Камітэт CEDAW выказаў сур'ёзную занепакоенасць невыкананнем Беларуссю абавязацельстваў па Канвенцыі CEDAW, адзначыўшы шэраг канкрэтных дыскрымінацыйных практык у дачыненні да жанчын[239].

---

232 Міжнародны суд, Рэзюмэ 2023/6 Загада ад 16 лістапада 2023 г. аб прымяненні Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі), 16 лістапада 2023 г.

233 Ліст часовага паверанага ў справах Пасольства Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў Бруселі, адрасаваны Рэгістратару Міжнароднага суда, Брусель, 10 кастрычніка 2023 г.

234 Міжнародны суд, Рэзюмэ 2023/6 Загада ад 16 лістапада 2023 г. аб прымяненні Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі), 16 лістапада 2023 г.

235 Міжнародны суд, Загад ад 17 снежня 2024 г., 17 снежня 2024 г.

236 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Беларусь: Трывожнае жорсткае абыходжанне з жанчынамі-зняволенымі і небяспечны для жыцця стан Вікторыі Кульшы, кажуць эксперты ААН [Прэс-рэліз], 3 сакавіка 2025 г. Гл. таксама: «Вясна», Нас вырашылі зусім звесці са свету, Сведчанні жанчын пра гендарную дыскрымінацыю ў месцах несвабоды Беларусі.

237 Згодна з апошнім дакладам Групы незалежных экспертаў па Беларусі, большасцю затрыманых у студзені 2024 года падчас рэпрэсій супраць сваякоў палітвязняў (паводле артыкула 24.15 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях – выкарыстанне замежных ахвяраванняў для ажыццяўлення экстрэмісцкай дзейнасці – за атрыманне прадуктаў, аплачаных замежнай некамерцыйнай арганізацыяй па падтрымцы палітвязняў і іх сем'яў) былі жанчыны. Гл.: Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека. (7 лютага, 2025 г.) Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (A/HRC/58/68 – адрэдагаваная версія), пункт 36.

238 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека. (7 лютага 2025 г.) Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (A/HRC/58/68 – адрэдагаваная версія), пункт 46, 7 лютага 2025 г.

239 ААН, Заключныя заўвагі па дзявятым перыядычным дакладзе Беларусі – Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, CEDAW/C/BLR/CO/9, 27 лютага 2025 г.

У той час як на момант ратыфікацыі Канвенцыі CEDAW 4 лютага 1981 года Беларусь зрабіла агаворку да пункта аб урэгуляванні спрэчак (артыкул 29) адносна перадачы спрэчак у Міжнародны суд[240], гэтая агаворка была знята ў 1989 годзе[241]. Гэта азначае, што дзяржавы – удзельніцы Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын могуць звярнуцца ў Міжнародны суд аб невыкананні яе абавязацельстваў па Канвенцыі пры ўмове, што будзе ўстаноўлены іх прававы інтарэс у такім звароце.

Нягледзячы на адсутнасць практыкі Міжнароднага суда ААН па гэтай Канвенцыі, нядаўняя ініцыятыва[242] Германіі, Аўстраліі, Канады і Нідэрландаў па прыцягненні Афганістана да адказнасці за парушэнні CEDAW сведчыць як пра актуальнасць выкарыстання міждзяржаўнага механізма ўрэгулявання спрэчак у выпадках парушэнняў гэтай Канвенцыі, так і пра фарміраванне кансэнсусу адносна таго, што пэўныя абавязацельствы паводле CEDAW з'яўляюцца абавязацельствамі *erga omnes partes*.

**Пратакол супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці**[243]

Паводле ўрада Літвы, рэжым Беларусі арганізаваў кантрабанду мігрантаў праз павелічэнне колькасці рэйсаў з Блізкага Усходу і іншых рэгіёнаў, выдачу віз і прадастаўленне жытла. Апынуўшыся ў Беларусі, многія мігранты, паводле паведамленняў, суправаджаліся беларускімі сілавымі структурамі да літоўскай мяжы і падвяргаліся ціску або прымусу незаконна перасякаць яе, часта ў рызыкоўных ці нават небяспечных для жыцця ўмовах[244].

У траўні 2025 года Літва ініцыявала справу супраць Беларусі[245] ў Міжнародным судзе на падставе Пратакола супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці, якую і Беларусь, і Літва ратыфікавалі ў 2003 годзе[246]. Згодна з пісьмовым зваротам Літвы, Беларусь парушыла свае абавязацельствы па Пратаколе, «спрыяючы, падтрымліваючы і дазваляючы незаконны ўвоз мігрантаў» праз Беларусь у Літву[247].

240 Генеральная Асамблея ААН, Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (Том 1249, с. 13), 18 снежня 1979 г.
241 Генеральная Асамблея ААН, Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (Том 1249, с. 13), 18 снежня 1979 г.
242 Федэральнае міністэрства замежных спраў Германіі. (13 студзеня 2025 г.) Ініцыятыва па прыцягненні да адказнасці за парушэнні Афганістанам Канвенцыі ААН аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, 13 студзеня 2025 г.
243 ААН, Пратакол супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці, 15 лістапада 2000 г.
244 Міністэрства замежных спраў Літоўскай Рэспублікі, Літва перадае Беларусь у Міжнародны суд ААН у Гаазе ў сувязі з міграцыйным крызісам, выкліканы рэжымам Лукашэнкі ў парушэнне міжнароднага права [Прэс-рэліз], 19 траўня 2025 г.
245 Міжнародны суд, Запыт Літвы аб указанні прамежкавых мер у Справе аб меркаваных парушэннях Канвенцыі аб прадухіленні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Літва супраць Беларусі, A 200–2025/05/19), 19 траўня 2025 г.
246 ААН, Пратакол супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці, 15 лістапада 2000 г.
247 Міжнародны суд, Заява аб завядзенні справы, пададзеная Літвой у адпаведнасці з Канвенцыяй аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Літва супраць Беларусі, A 200 – 2025/05/19), 19 траўня 2025 г.

## Якія працэдурныя крокі неабходныя для ініцыявання разгляду справы ў Міжнародным судзе?

Разгляд у межах юрысдыкцыі Суда можа быць ініцыяваны дзяржавай, якая з'яўляецца бокам міжнароднага дагавора, і можа датычыць выключна вырашэння пытанняў, наўпрост прадугледжаных адпаведным дагаворам. Працэдуры накіраваны на ліквідацыю парушэнняў дагавора і, адпаведна, абмяжоўваюцца канкрэтнымі аспектамі дагавора, якія выключаюць вынясенне рашэнняў суда на падставе шырэйшага палітычнага кантэксту спрэчкі[248].

Каб справа была прынята да разгляду Міжнародным судом ААН, у большасці адпаведных міжнародных дагавораў прадугледжана, што на момант падачы пісьмовай заявы мусяць быць выкананы дзве паслядоўныя ўмовы:

a. Няўдалая спроба перамоў;
b. Няўдалая спроба арбітражу або немагчымасць арганізаваць арбітраж бакоў на працягу шасці месяцаў.

Дзяржава, якая жадае ініцыяваць працэдуру, мусіць спачатку правесці добрасумленныя перамовы. Гэта было інтэрпрэтавана Судом як магчымасць прадэманстраваць, што дзяржава сапраўды спрабавала весці перамовы; што прадмет перамоў і спрэчкі былі звязаныя адно з адным; што перамовы праводзіліся з мэтай вырашэння спрэчкі; і што для вырашэння спрэчкі былі прыкладзены ўсе магчымыя намаганні. Але прыйсці да выніку не ўдалося[249]. Напрыклад, заявы на міжнародных форумах або на прэс-брыфінгу прэзідэнта звычайна не лічацца перамовамі[250]. Нарэшце, каб прадэманстраваць, што перамовы не ўдаліся, неабходна паказаць, што яны зайшлі ў стан правалу, тупіка або бессэнсоўнасці[251].

Дзяржава мусіць паслядоўна паспрабаваць урэгуляваць спрэчку шляхам арбітражу, калі гэтага патрабуе міжнародны дагавор, на які яна спасылаецца[252]. Аднак калі дзяржавы-ўдзельніцы не здольныя дасягнуць дамоўленасці аб арганізацыі арбітражу на працягу шасці месяцаў, яны могуць звярнуцца ў Міжнародны суд.

Пасля выканання гэтых умоў дзяржава можа падаць пісьмовую заяву ў Міжнародны суд з падрабязнай інфармацыяй аб адпаведных палажэннях дагавора, з якімі звязана гэтая спрэчка; сутнасці спрэчкі; намаганнях, прынятых дзяржавай – ініцыятарам разгляду, па ўрэгуляванні справы шляхам перамоў або арбітражу; а таксама сатысфакцыі, якой яна патрабуе.

---

248 Boston College International & Comparative Law Review, Захаванне добрасумленнасці ў дыпламатыі: перамовы і юрысдыкцыя ў практыцы МС у дачыненні да прымянення Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (CERD), 2012 г.

249 Міжнародны суд, Прымяненне Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (Грузія супраць Расійскай Федэрацыі), пункт 159–162, рашэнне ад 1 красавіка 2011 г., 1 красавіка 2011 г.

250 Міжнародны суд, Прымяненне Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (Грузія супраць Расійскай Федэрацыі), пункт 181, рашэнне ад 1 красавіка 2011 г., 1 красавіка 2011 г.

251 Міжнародны суд, Прымяненне Міжнароднай канвенцыі аб барацьбе з фінансаваннем тэрарызму і Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (Украіна супраць Расійскай Федэрацыі), пункты 119–120, 8 лістапада 2019 г.

252 Некаторыя канвенцыі, аднак, не патрабуюць рабіць спробы ані перамоў, ані арбітражу; напрыклад, Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (КЛРД), у адпаведнасці з артыкулам 22, патрабуе, што дзяржава мусіць прадэманстраваць, што спрэчка «не вырашаецца шляхам перамоў або працэдурамі, прама прадугледжанымі ў [КЛРД]». У дадзеным выпадку Суд прызнаў, што спроба Украіны ўрэгуляваць спрэчку шляхам перамоў была дастатковай.

**Грузія і Расійская Федэрацыя перад Міжнародным судом: праблемы, звязаныя з дэманстрацыяй спробы перамоў і арбітражу**

У 2008 г. Грузія заявіла, што Расійская Федэрацыя парушыла Канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (КЛРД, CERD) падчас сваіх ваенных дзеянняў у Паўднёвай Асеціі і Абхазіі з 1990 па 2008 год. Аднак Суд адхіліў заяву, паколькі Грузіі не ўдалося прадэманстраваць, што яна спачатку прыняла меры для перамоў аб спрэчцы з Расійскай Федэрацыяй[253].

**Украіна і Расійская Федэрацыя перад Міжнародным судом: «Шчырая спроба» перамоў**

У справе «*Украіна супраць Расійскай Федэрацыі*» Суд прызнаў, што Украіна неаднаразова запрашала Расію да перамоў, у выніку чаго ў Мінску адбыліся тры раўнды сустрэч. Гэтыя перамовы, якія цягнуліся каля двух гадоў, вяліся як праз дыпламатычную перапіску, так і праз асабістыя сустрэчы. Суд пастанавіў, што гэта было «шчырай спробай» перамоў. Улічваючы, што пазіцыі Украіны і Расіі ў дачыненні да спрэчкі не змяніліся, суд прыйшоў да высновы, што перамовы былі бессэнсоўнымі[254].

## Якую дадатковую вартасць мае Міжнародны Суд ААН у намаганнях міжнароднага правасуддзя?

Міжнародны суд з’яўляецца пляцоўкай, на якой дзяржавы могуць уздымаць міждзяржаўныя спрэчкі адносна тлумачэння і прымянення міжнароднага права, у тым ліку міжнароднага права ў галіне правоў чалавека. У межах сваёй юрысдыкцыі па так званых «спрэчных» справах Міжнародны суд разглядаў меркаваныя парушэнні міжнародных абавязацельстваў дзяржаў, што вынікаюць з дагавораў у галіне правоў чалавека або з іншых адпаведных прававых рамак.[255] Дзяржавы, якія з’яўляюцца ўдзельнікамі такога разбору, абавязаны выконваць рашэнні Міжнароднага суда, а таксама часовыя меры, прызначаныя Судом.

У «спрэчных справах» Суд таксама мае права выносіць часовыя меры па абароне правоў любога з бакоў для забеспячэння ад «непазбежнай і непапраўнай шкоды»[256], якія з’яўляюцца юрыдычна абавязковымі для дзяржаў-удзельніц. На практыцы Суд выносіў часовыя меры для абароны ахвяр парушэнняў у адпаведнасці з адпаведным дагаворам. Напрыклад, у справе «*Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі*» Суд прызначыў часовыя меры, якія ўключалі патрабаванне да Сірыі прадухіляць акты катаванняў, спасылаючыся на «павышаную рызыку для затрыманых быць падвергнутымі катаванням і іншым жорсткім,

253 Міжнародны суд, Грузія распачала працэдуру супраць Расіі за парушэнне Канвенцыі аб усіх формах расавай дыскрымінацыі, 12 жніўня 2008 г.
254 Міжнародны суд, Прымяненне Міжнароднай канвенцыі аб барацьбе з фінансаваннем тэрарызму і Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (Украіна супраць Расійскай Федэрацыі), пункты 119–120, 8 лістапада 2019 г.
255 Гл., напрыклад: Міжнародны суд. Прымяненне Канвенцыі аб прадухіленні і пакаранні злачынства генацыду (Харватыя супраць Сербіі) (Рашэнне) [2015] ICJ Rep 3. Узброеныя дзеянні на тэрыторыі Конга (Дэмакратычная Рэспубліка Конга супраць Уганды) (Рашэнне) [2005] ICJ Rep 168. Вайсковая і ваенізаваная дзейнасць у і супраць Нікарагуа (Нікарагуа супраць Злучаных Штатаў Амерыкі) (Рашэнне) [1986] ICJ Rep 14.
256 Арт. 41 Статута Міжнароднага суда.

бесчалавечным або прыніжальным для годнасці абыходжанню ці пакаранню»[257]. Іншыя прыклады часовых мер уключалі: забеспячэнне захавання доказаў, якія маюць дачыненне да справы (*«Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі»*[258]); садзейнічанне аказанню гуманітарнай дапамогі («*Паўднёвая Афрыка* супраць *Ізраіля*»[259]).

Акрамя таго, Суд можа выдаваць кансультацыйныя заключэнні па прававых пытаннях на просьбу органаў ААН і спецыялізаваных устаноў. Пры выкананні сваёй кансультацыйнай функцыі Суд таксама інтэрпрэтаваў абсяг і прымяненне міжнароднага права ў галіне правоў чалавека[260]. Нягледзячы на тое, што кансультацыйныя заключэнні не маюць абавязковай юрыдычнай сілы, яны служаць важным арыенцірам для органа, які робіць запыт, і часта адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні міжнароднага права. У кантэксце намаганняў па забеспячэнні адказнасці для Беларусі гэтая функцыя мае дадатковую вартасць, паколькі адпаведныя кансультацыйныя заключэнні могуць служыць арыенцірам для дзяржаў і іншых зацікаўленых бакоў у рэагаванні на парушэнні міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных міжнародным крымінальным правам.

## Якія магчымыя вынікі судовага разгляду ў Міжнародным судзе?

Дзяржавы-ўдзельніцы абавязаны выконваць рашэнні Суда ў выніку «спрэчных спраў». Невыкананне якім-небудзь з бакоў абавязацельстваў у адпаведнасці з рашэннем Суда можа прывесці да таго, што іншы бок падыме перад Саветам Бяспекі ААН пытанне аб невыкананні. Затым Савет Бяспекі можа «вынесці рэкамендацыі або прыняць рашэнне аб мерах, неабходных для выканання рашэння»[261]. Аднак да гэтага часу Міжнародны суд ні разу не выкарыстаў свае паўнамоцтвы для прыняцця мер па выкананні рашэнняў Міжнароднага суда.

У той час як фізічныя асобы не маюць права звяртацца ў Міжнародны суд па сваіх справах, яго дзеянні могуць паўплываць на паводзіны дзяржавы і спрыяць лепшаму выкананню міжнародных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, што мае карысць для ахвяр. Рашэнні Міжнароднага суда могуць прывесці да карысных для ахвяр змен у палітыцы дзяржавы, да тлумачэння міжнародных дагавораў, якія ўдакладняюць абавязацельствы, звязаныя з абаронай ахвяр, і спрыяць мерам па непаўтарэнні для прадухілення будучых парушэнняў. Рашэнні Міжнароднага суда ААН аб выплатах рэпарацый[262] дзяржаве таксама могуць апасродкавана прыносіць карысць пацярпелым, калі гэтыя выплаты ў далейшым будуць размеркаваны на іх карысць[263].

257 Міжнародны суд. Прымяненне Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (Канада і Нідэрланды супраць Сірыйскай Арабскай Рэспублікі), запыт аб указанні часовых мер, 16 лістапада 2023 г.

258 Міжнародны суд. Прымяненне Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, 16 лістапада 2023 г.

259 Міжнародны суд, Прымяненне Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго ў сектары Газа, 24 траўня 2024 г.

260 Гл., напрыклад: Міжнародны суд. Прававыя наступствы будаўніцтва сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі (Кансультацыйнае заключэнне). [2004] ICJ Rep 136, 9 ліпеня 2004 г.; Прававыя наступствы, якія вынікаюць з палітыкі і практыкі Ізраіля на акупаванай палесцінскай тэрыторыі, у тым ліку ва Усходнім Іерусаліме (Кансультацыйнае заключэнне). [2024] ICJ Rep 136, 19 ліпеня 2024 г.

261 Арт. 94 (b) Статута ААН.

262 Міжнародны суд, Узброеныя дзеянні на тэрыторыі Конга (Дэмакратычная Рэспубліка Конга супраць Уганды) (Рэпарацыі), 9 лютага 2022 г.

263 Avocats Sans Frontèiers, Прэс-рэліз: Пастанова Міжнароднага суда па справе DRC супраць Уганды: забеспячэнне арыентаванага на пацярпелых і эфектыўнага выканання Загада аб рэпарацыях, 29 сакавіка 2022 г.

## Якую ролю могуць адыграць пацярпелыя ў разглядзе справы ў Міжнародным судзе?

Улічваючы міждзяржаўны характар спрэчак Міжнароднага суда, пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці не маюць права выступаць бокам працэсу ў Судзе[264]. Гэта азначае, што пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці не могуць удзельнічаць у працэсе або прадстаўляць інфармацыю непасрэдна Суду[265].

Аднак яны могуць заклікаць дзяржаву або групу дзяржаў зрабіць гэта, а таксама падаваць змястоўную інфармацыю для адпаведнай заявы дзяржавы – як гэта было ў справе «*Канада і Нідэрланды супраць Сірыі*», апісанай вышэй. У шэрагу працэсаў у Судзе дзяржавы відавочна спасылаліся на даклады, падрыхтаваныя арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. Так было ў справе «*Узброеныя дзеянні на тэрыторыі Конга (Дэмакратычная Рэспубліка Конга супраць Уганды»),*31 «*Ваенная і ваенізаваная дзейнасць у і супраць Нікарагуа (Нікарагуа супраць Злучаных Штатаў Амерыкі»),*32 «*Паўднёвая Афрыка супраць Ізраіля*»33 і «*Прымяненне Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Гамбія супраць М'янмы»)*.34 Суд прыняў такія матэрыялы, калі было ўстаноўлена, што яны пацвярджаюцца іншымі крыніцамі і заснаваны на першасных доказах.35

Акрамя таго, дзяржава-заяўніца можа вырашыць прадставіць сведчанні пацярпелых або ў выглядзе пісьмовых заяў, або, у выпадку неабходнасці, як асабістыя паказанні падчас слуханняў.

# B. Міжнародная арганізацыя працы

## Што такое Міжнародная арганізацыя працы?

Міжнародная арганізацыя працы (МАП, ILO) – гэта спецыялізаваная ўстанова ААН, мандат якой заключаецца ў прасоўванні сацыяльнай і эканамічнай справядлівасці. МАП устанаўлівае міжнародныя працоўныя стандарты і кантралюе выкананне іх дзяржавамі-ўдзельніцамі праз рэгулярны наглядны механізм і спецыяльныя працэдуры[266].

Міжнародныя працоўныя стандарты, замацаваныя ў канвенцыях МАП, уключаюць індывідуальныя правы ў сферы працы, такія як бяспека, стандарты аплаты, сацыяльнае забеспячэнне, недыскрымінацыя і свабода ад прымусовай працы, а таксама калектыўныя працоўныя правы, у тым ліку права на ўступленне ў прафсаюз і на вядзенне калектыўных перамоў. Абавязковыя палажэнні канвенцый МАП дапаўняюцца *рэкамендацыямі* і *дэкларацыямі* МАП як катэгорыямі нарматыўных дакументаў, выдадзеных МАП[267].

---

264 Статут МС, артыкул 34(1): «Толькі дзяржавы могуць быць бакамі ў справах, якія разглядаюцца Судом».
265 Міжнародны суд, Рэгламент Суда, Правіла 69(4).
266 Міжнародная арганізацыя працы, Сістэма/механізм нагляду МАП.
267 Характэрна, што Дэкларацыя МАП аб асноўных прынцыпах і правах у сферы працы (1998 г.) з папраўкамі ў 2022 г. і Дэкларацыя аб мэтах і задачах Міжнароднай арганізацыі працы (Філадэльфійская дэкларацыя) (1944 г.) маюць асаблівы статус, паколькі кадыфікуюць асноўныя прынцыпы МАП як частку звычаёвага міжнароднага права ў галіне працы.

Міжнародная канферэнцыя працы, якая складаецца з прадстаўнікоў урадаў, працоўных і працадаўцаў дзяржаў – удзельніц МАП і праводзіцца штогод, з'яўляецца найвышэйшым органам прыняцця рашэнняў і адлюстроўвае ўнікальную трохбаковую структуру МАП.

МАП рэгулярна аналізуе, як дзяржавы-ўдзельніцы выконваюць яе стандарты, і вызначае напрамкі для іх удасканалення. З гэтай мэтай МАП стварыла дзве групы механізмаў, якія кантралююць выкананне дзяржавамі-ўдзельніцамі гэтых стандартаў: рэгулярную наглядную сістэму МАП і спецыяльныя працэдуры, якія ўключаюць механізм падачы скаргаў (арт. 26–34 Статута МАП), наглядны механізм свабоды асацыяцый (праз Камітэт МАП па свабодзе асацыяцый) і працэдуру прадстаўленняў (арт. 24 Статута МАП).

Рэгулярныя і спецыяльныя наглядныя працэдуры МАП цесна ўзаемазвязаныя: рэгулярныя працэсы часта становяцца штуршком для ініцыявання спецыяльных мер. Калі ў ходзе рэгулярных працэдур выяўляюцца сур'ёзныя або бягучыя працяглыя выпадкі невыканання стандартаў МАП, а дзяржавы не рэагуюць належным чынам, гэта можа прывесці да запуску спецыяльных працэдур. Вынікі рэгулярнага агляду часта служаць доказнай асновай для пачатку спецыяльных працэдур, якія затым кантралююцца праз рэгулярную сістэму, утвараючы замкнёнае кола, што павышае ўзровень выканання і падсправаздачнасці.

## Рэгулярная сістэма нагляду МАП

Рэгулярная наглядная сістэма МАП уключае (i) Камітэт Канферэнцыі па прымяненні стандартаў (CAS) і (ii) Камітэт экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый (CEACR)[268]. CAS, як пастаянны камітэт МАП, складаецца з прадстаўнікоў урадаў і працадаўцаў, а таксама дэлегатаў ад працоўных, у той час як CEACR з'яўляецца экспертным органам з 20 юрыстаў, прызначаных Кіраўнічым органам[269].

Разглядаючы перыядычныя даклады, прадстаўленыя дзяржавамі-ўдзельніцамі, і інфармацыю, пададзеную ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі працоўных і працадаўцаў, абодва органы аналізуюць меры, прынятыя дзяржавамі-ўдзельніцамі для рэалізацыі ратыфікаваных імі канвенцый МАП, і публікуюць свае высновы ў штогадовых дакладах.

Пры гэтым CEACR забяспечвае бесстароннюю ацэнку прымянення міжнародных працоўных стандартаў у дзяржавах – удзельніцах МАП. Ён накіроўвае ўрадам два тыпы каментарыяў: «заўвагі», якія датычаць фундаментальных праблем прымянення канвенцыі, і «непасрэдныя запыты», што маюць тэхнічны характар або патрабуюць дадатковай інфармацыі. CAS разглядае штогадовы даклад CEACR падчас Міжнароднай канферэнцыі працы ў трохбаковым фармаце, на аснове інфармацыі, прадстаўленай адпаведным урадам, і вылучае заўвагі для абмеркавання[270]. Ён публікуе абмеркаванні і высновы з рэкамендацыямі адносна канкрэтных крокаў па вырашэнні праблемы, у сваім штогадовым дакладзе[271].

268 МАП, сістэма нагляду МАП: Рэгулярны нагляд.
269 Гл.: МАП, Камітэт экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый (CEACR). Камітэт экспертаў складаецца з 20 выбітных юрыстаў, прызначаных Кіраўнічым органам на трохгадовы тэрмін з магчымасцю перапрызначэння. Эксперты паходзяць з розных геаграфічных рэгіёнаў, прававых сістэм і культур.
270 МАП, Камітэт канферэнцыі па прымяненні стандартаў.
271 МАП, Правілы гульні: Увядзенне ў працу Міжнароднай арганізацыі працы, звязаную са стандартамі, с. 106–107, 2019 г.

### Рэгулярны наглядны механізм МАП і Беларусь

У межах сваёй рэгулярнай нагляднай дзейнасці Камітэт экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый (CEACR) выказаў сур’ёзную заклапочанасць у сувязі з рэпрэсіямі супраць незалежных прафсаюзаў у Беларусі. Абапіраючыся на даклады Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) і Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў (ITUC), Камітэт адзначыў, што парушэнні свабоды асацыяцый і грамадзянскіх свабод не толькі працягваюцца, але і пагаршаюцца, паколькі ўрад сістэматычна пераследуе працоўны рух. Незалежныя прафсаюзы больш не могуць функцыянаваць, а асобам, якія ўдзельнічаюць у іх дзейнасці, пагражае крымінальны пераслед і пакаранне да 10 гадоў пазбаўлення волі[272].

У сваім дакладзе за 2025 год Камітэт адзначыў, што вызваленне шэрагу палітвязняў у сярэдзіне 2024 года не з’яўляецца сапраўдным аднаўленнем правоў, асабліва з улікам таго, што памілаванне патрабавала прызнання віны[273]. Камітэт Канферэнцыі па прымяненні стандартаў (CAS) у 2025 годзе падкрэсліў упартае ігнараванне ўрадам Беларусі інструкцыі, высноў і рэкамендацый, вынесеных Камісіяй па расследаванні, наглядными органамі і Кіраўнічым органам, а таксама яго адмову прызнаваць іх і выконваць.

Камітэт таксама выказаў глыбокую занепакоенасць і шкадаванне ў сувязі з ужываннем крымінальных санкцый супраць прафсаюзных актывістаў, якія займаліся легітымнай прафсаюзнай дзейнасцю, а таксама ў сувязі з судовым пераследам членаў прафсаюзаў, у тым ліку затрыманнямі, крымінальнымі справамі і пазбаўленнем волі. Ён «рашуча асудзіў рэпрэсіі супраць незалежных прафсаюзаў і зняволенне прафсаюзных дзеячаў» і «катэгарычна заклікаў урад неадкладна вызваліць усіх лідараў і членаў прафсаюзаў, затрыманых за ўдзел у мірных сходах або за ажыццяўленне сваіх грамадзянскіх свабод у межах легітымнай прафсаюзнай дзейнасці, і зняць усе звязаныя з гэтым абвінавачанні»[274].

## Механізм падачы скаргаў у МАП

Акрамя працэсу рэгулярнага разгляду, быў створаны механізм падачы скаргаў у адпаведнасці з артыкулам 26 Статута МАП, які дазваляе прымаць адпаведныя меры ў выпадках невыканання ратыфікаваных канвенцый. Такую скаргу можа падаць дзяржава – удзельніца МАП, якая ратыфікавала адпаведную Канвенцыю, дэлегат Міжнароднай канферэнцыі працы або Кіраўнічы орган МАП[275].

Калі скарга прызнаецца прымальнай, Кіраўнічы орган можа прыняць рашэнне аб стварэнні Камісіі па расследаванні, якая складаецца з трох незалежных экспертаў. Яны праводзяць расследаванне, збіраюць усе

272 МАП, Даклад Камітэта экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый, ILC.113 / III (A), пункт 119, 2025 г.
273 МАП, Даклад Камітэта экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый, ILC.113 / III (A), пункт 119, 2025 г.
274 МАП, Прымяненне Міжнародных працоўных стандартаў, с. 115, 2025 г.
275 Статут МАП, арт. 26 (4).

адпаведныя факты і фармулююць рэкамендацыі для вырашэння выяўленых праблем[276]. Каб стабілізаваць сітуацыю на месцы, заахвоціць добраахвотнае выкананне і прадухіліць эскалацыю падчас афіцыйнага расследавання, Кіраўнічы орган можа разгледзець магчымасць ужывання прамежкавых мер (працэдурных інструментаў і дыпламатычных дзеянняў, такіх як змены ў аказанні тэхнічнай дапамогі, тэрміновыя заявы Генеральнага дырэктара і інш.). Калі скарга датычыць свабоды асацыяцый, Кіраўнічы орган можа перадаць яе ў Камітэт па свабодзе асацыяцый (CFA).

Як найбольш значны інструмент расследавання ў МАП, Камісія па расследаванні звычайна ствараецца тады, калі дзяржава-ўдзельніца сутыкаецца з неаднакратнымі абвінавачаннямі ў сур'ёзных і працяглых парушэннях канвенцый МАП і не прыняла мер па выпраўленні сітуацыі[277]. На сёння ў гісторыі МАП было створана 14 такіх камісій[278], у тым ліку адна ў дачыненні да Беларусі ў 2003 годзе.[279]

Камісія можа рабіць запыт на пісьмовыя тлумачэнні, збіраць доказы, апытваць сведак, наведваць адпаведную краіну, калі гэта дазволіць урад, і праводзіць слуханні[280]. Паводле артыкула 27 Статута МАП усе дзяржавы-ўдзельніцы абавязаны супрацоўнічаць з Камісіяй, незалежна ад іх прамой датычнасці да справы.

Па выніках расследавання Камісія рыхтуе комплексны даклад з фармулёўкай сваіх высноў і рэкамендацый з абмежаваным тэрмінам выканання для дзяржавы адносна выяўленых парушэнняў, якія могуць уключаць заканадаўчыя або палітычныя рэформы.

Даклад перадаецца ў Кіраўнічы орган і накіроўваецца адпаведнаму ўраду, які мае тры месяцы, каб прыняць рэкамендацыі або перадаць пытанне ў Міжнародны суд ААН. На сёння ў Суд яшчэ не была перададзена ніводная справа.

**Артыкул 26 Статута МАП ужыты супраць Беларусі**

У 2003 годзе была створана Камісія па расследаванні МАП для вывучэння невыканання ўрадам Беларусі абавязацельстваў па Канвенцыі аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю[281], а таксама Канвенцыі аб праве на арганізацыю і калектыўныя перамовы[282]. Камісія прыйшла да высновы, што прафсаюзны рух у Беларусі падвяргаўся ўмяшанню з боку ўладаў: лідараў прафсаюзаў пераследавалі, запалохвалі і беспадстаўна затрымлівалі[283].

276 МАП, Працэдура абскарджання (арт. 26).
277 МАП, Працэдура абскарджання (арт. 26).
278 МАП, Скаргі / Камісіі па расследаванні (арт. 26). Гл. таксама: Сістэма нагляду МАП: дапаможнік для ўдзельнікаў. Спецыяльныя працэдуры, арт. 26.
279 МАП, Даклад Камісіі па расследаванні, прызначанай у адпаведнасці з арт. 26 Статута Міжнароднай арганізацыі працы для разгляду выканання Урадам Рэспублікі Беларусь Канвенцыі аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю 1948 года (№ 87) і Канвенцыі аб праве на арганізацыю і вядзенне калектыўных перамоў 1949 года (№ 98), 6 лістапада 2004 г.
280 Расследаванні, якія праводзіць Камісія, не падпарадкоўваюцца жорсткім працэсуальным правілам; замест гэтага камісіі самі вызначаюць працэдуру, кіруючыся Статутам МАП, агульнымі прынцыпамі і прэцэдэнтамі, устаноўленымі папярэднімі камісіямі.
281 МАП, C087 – Канвенцыя аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю (№ 87), 1948 г.
282 МАП, C098 – Канвенцыя аб праве на арганізацыю і калектыўныя перамовы, № 98, 1949 г.
283 МАП, У дакладзе Камісіі па расследаванні гаворыцца, што незалежнасць прафсаюзаў у Беларусі была падарвана, 8 кастрычніка 2024 г.

З таго часу выйшла 16 дакладаў адносна скаргі па мерах, прынятых урадам Беларусі ў адказ на рэкамендацыі Камісіі[284]. У апошнім дакладзе ад 20 сакавіка 2025 г. Камітэт па свабодзе асацыяцый (CFA) канстатаваў, што «парушэнні свабоды асацыяцый і грамадзянскіх свабод не толькі не былі вырашаны ўрадам, але і пагоршыліся з-за дзяржаўнай кампаніі праследу лідараў і актывістаў працоўнага руху», адзначыўшы, што «цяпер незалежныя прафсаюзы і іх сябры не маюць магчымасці весці сваю дзейнасць у Беларусі»[285]. Камітэт паўтарыў свой заклік «неадкладна вызваліць усіх лідараў і актывістаў прафсаюзаў, якія […] былі прыцягнуты да адказнасці за ажыццяўленне сваёй легітымнай прафсаюзнай дзейнасці, […] і зняць усе звязаныя абвінавачанні»[286]. У заключэнні ён адзначыў «поўную адсутнасць прагрэсу ў рэалізацыі рэкамендацый Камісіі па расследаванні 2004 года»[287].

Затым МАП назірае за выкананнем гэтых рэкамендацый[288]. Калі дзяржава-ўдзельніца не выконвае рэкамендацыі Камісіі па расследаванні, Кіраўнічы орган МАП можа прымяніць артыкул 33 Статута МАП і рэкамендаваць Міжнароднай канферэнцыі працы прыняць адпаведныя меры для забеспячэння выканання. Гэты інструмент быў упершыню выкарыстаны ў дачыненні да М'янмы ў 2000 годзе, калі Кіраўнічы орган заклікаў Канферэнцыю прыняць меры для аказання ціску на М'янму з мэтай спыніць выкарыстанне прымусовай працы, а Камісія па расследаванні пацвердзіла, што прымусовая праца ў краіне ўжываецца шырока і сістэматычна[289].

**Меры, рэкамендаваныя Кіраўнічым органам у дачыненні да Беларусі ў адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП**

Па выніках расследавання 2003 года паводле артыкула 26, Міжнародная канферэнцыя працы ў чэрвені 2023 года прыняла меры супраць Беларусі паводле артыкула 33 Статута МАП у сувязі з неаднакратным невыкананнем Беларуссю рэкамендацый Камісіі.

Быў прыняты шэраг рэкамендацый як для міжнароднай супольнасці (напрыклад, перагледзець адносіны з Беларуссю і прадухіліць злоўжыванне сувязямі, што прыводзяць да парушэння працоўных правоў, а таксама забяспечыць выкананне прынцыпу нявыдачы (*non-refoulement*), асабліва ў дачыненні да прафсаюзных дзеячаў і праваабаронцаў у выгнанні), так і для ўрада Беларусі. У якасці працэдурнага кроку было прынята рашэнне прызначыць у Беларусь спецыяльнага пасланніка – сп. Леліу Бентеса Карэа (Бразілія)[290] – з мандатам весці дыялог з урадам і грамадскімі партнёрамі для садзейнічання вызваленню зняволеных прафсаюзных актывістаў, аднаўленню прызнання Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў, супрацоўніцтва са структурамі ААН для каардынацыі дзеянняў і прадстаўлення справаздачы Кіраўнічаму органу МАП у 2025 годзе[291].

---

284 МАП, Беларусь.
285 МАП, 410-ы даклад Камітэта па свабодзе асацыяцый, пункт 50, 20 сакавіка 2025 г.
286 МАП, 410-ы даклад Камітэта па свабодзе асацыяцый, пункт 46, 20 сакавіка 2025 г.
287 МАП, 410-ы даклад Камітэта па свабодзе асацыяцый, пункт 55, 20 сакавіка 2025 г.
288 Oxford Public International Law, Працэдуры нагляду і агляду: Міжнародная арганізацыя працы (МАП), красавік 2020 г.
289 МАП, Практыка выкарыстання артыкула 33 Статута МАП.
290 МАП, Рашэнні, прынятыя Кіраўнічым органам на 354-й сесіі, GB.354 / Рашэнні, пункт 11(g), 14 чэрвеня 2025 г.
291 МАП, Рашэнне аб выкананні рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.353/INS/7(Rev.1) / Decision, 17 сакавіка 2025 г.

Урэшце Канферэнцыя заклікала ўрад Беларусі прыняць міжнародную гуманітарную місію, каб забяспечыць магчымасць незалежным лекарам наведаць усіх зняволеных прафсаюзных актывістаў для ацэнкі іх здароўя і аказання медыцынскай дапамогі, а таксама місію МАП у трохбаковым фармаце для збору інфармацыі аб выкананні рэкамендацый[292].

### Механізм нагляду за свабодай асацыяцый МАП

Яшчэ адной спецыяльнай працэдурай з’яўляецца механізм Камітэта МАП па свабодзе асацыяцый (CFA) – трохбаковага органа, які складаецца з прадстаўнікоў урадаў, працадаўцаў і працоўных і мае незалежнага старшыню. Камітэт можа разглядаць скаргі на парушэнні свабоды асацыяцый нават у тых краінах, якія не ратыфікавалі адпаведныя канвенцыі МАП[293].

Скаргі супраць дзяржавы-ўдзельніцы могуць падавацца арганізацыямі працадаўцаў і арганізацыямі працаўнікоў. Пасля абмеркавання з урадам Камітэт рыхтуе даклад, які зацвярджаецца Кіраўнічым органам. Даклад утрымлівае рэкамендацыі і перадаецца для адпаведнага далейшага разгляду, калі было выяўлена парушэнне свабоды асацыяцый.

Калі скарга прызнаецца неадкладнай, Камітэт можа прыняць канкрэтныя меры для паскарэння працэсу, уключаючы папярэднія кантакты з урадам і місіі ў краіну. Яны прымяняюцца ў выпадках, датычных жыцця або асабістай свабоды чалавека, калі з’яўляюцца новыя або змяняюцца ўмовы, якія ўплываюць на свабоду дзеянняў прафсаюзнага руху ў цэлым, у выпадках, звязаных з дзеяннем надзвычайнага становішча, а таксама пры роспуску арганізацыі працадаўцаў або працаўнікоў[294].

### d. Працэдура прадстаўленняў МАП

Працэдура прадстаўленняў, замацаваная ў артыкуле 24 Статута МАП, дазваляе аб’яднанням працадаўцаў або працаўнікоў падаваць у Кіраўнічы орган МАП прадстаўленне аб тым, што дзяржава-ўдзельніца не забяспечыла эфектыўнага выканання ратыфікаванай канвенцыі МАП. Для разгляду прадстаўлення і адказу ўрада можа быць створаны спецыяльны трохбаковы камітэт з членаў Кіраўнічага органа, які разглядае прадстаўленне і адказ урада і выдае рэкамендацыі.

292 МАП, Рэзалюцыя аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, ILC.111 / Resolution I, 12 чэрвеня 2023 г.

293 МАП, Камітэт па свабодзе асацыяцый (CFA). Гл. таксама: МАП, Спецыяльныя працэдуры разгляду ў Міжнароднай арганізацыі працы скаргаў на парушэнне свабоды асацыяцый. Гл. таксама: Сістэма нагляду МАП: дапаможнік для ўдзельнікаў. Спецыяльныя працэдуры, Скаргі ў CFA. Таксама: МАП, Правілы гульні: Увядзенне ў працу Міжнароднай арганізацыі працы, звязаную са стандартамі, с. 114–115, 2019 г.

294 МАП, Сістэма нагляду МАП: дапаможнік для ўдзельнікаў. Спецыяльныя працэдуры, Скаргі ў CFA.

Калі ўрад не выконвае неабходныя меры, справа можа быць перададзена ў Камітэт экспертаў па прымяненні канвенцый і рэкамендацый (CEACR) для далейшага разгляду. У больш сур'ёзных выпадках яна можа перарасці ў афіцыйную скаргу, што вымусіць Кіраўнічы орган стварыць Камісію па расследаванні[295].

## У чым заключаецца дадатковая вартасць механізмаў МАП?

Хоць мандат МАП абмежаваны парушэннямі працоўных правоў, яе працэдуры з'яўляюцца карысным інструментам для забеспячэння адказнасці за парушэнні правоў чалавека. У Беларусі, дзе з 1995 года працягваецца жорсткі пераслед незалежных прафсаюзаў, які часта сканчаецца затрыманнямі, крымінальнымі справамі і роспускам прафсаюзаў, механізмы МАП падаюцца спосабам прыцягнуць увагу да такіх пытанняў, як, напрыклад, свабода асацыяцый, права на аб'яднанне і калектыўныя перамовы[296].

Механізмы МАП маюць перавагу дзякуючы трохбаковай структуры, якая ўключае прадстаўнікоў урадаў, працадаўцаў і працаўнікоў. Інфармацыя, якая прадастаўляецца гэтымі трыма суб'ектамі, а таксама іх удзел у працэсе галасавання на Міжнароднай канферэнцыі працы і ў Кіраўнічым органе, узмацняюць аўтарытэт і вагу рашэнняў МАП.

Структура МАП ўключае ў сябе таксама актыўнае трохбаковае ўзаемадзеянне па-за межамі апісаных вышэй афіцыйных працэдур МАП. Напрыклад, у сувязі з прымяненнем артыкула 33 да Беларусі былі створаны трохбаковыя меры далейшага кантролю (напрыклад, правядзенне трохбаковых сустрэч на высокім узроўні па-за межамі Беларусі з удзелам урадаў дзяржаў – удзельніц МАП, распрацоўка рэкамендацый наконт мер, якія могуць быць прыняты дзяржавамі – удзельніцамі МАП, і г. д.)[297].

## Якую ролю ў працэсе адыгрываюць пацярпелыя і грамадскія арганізацыі?

Механізмы МАП не дазваляюць пацярпелым або грамадскім арганізацыям, за выключэннем прафсаюзаў, падаваць скаргі, непасрэдна ўдзельнічаць у працэсе ўстанаўлення фактаў або атрымліваць акрэдытацыю для ўдзелу. З улікам унікальнай трохбаковай структуры МАП, даклады і іншая інфармацыя могуць падавацца толькі трыма бакамі – урадамі, арганізацыямі працадаўцаў і арганізацыямі працаўнікоў як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўні. Пацярпелыя і грамадскія арганізацыі могуць адыгрываць дапаможную ролю, перадаючы інфармацыю і дакументацыю аб парушэннях працоўных правоў гэтым бакам, у рамках мандата МАП.

---

295 МАП, Працэдура прадстаўлення (арт. 24). Гл. таксама: Рэгламент працэдуры разгляду прадстаўленняў у адпаведнасці з артыкуламі 24 і 25 Статута Міжнароднай арганізацыі працы. Гл. таксама: МАП, Сістэма нагляду МАП: дапаможнік для ўдзельнікаў. Таксама: МАП, Правілы гульні: Увядзенне ў працу Міжнароднай арганізацыі працы, звязаную са стандартамі, с. 110–111, 2019 г.

296 Amnesty International, Беларусь: Улады пераследуюць незалежныя прафсаюзы, каб выкараніць іншадумства, 29 красавіка 2021 г.

297 МАП, Рашэнне аб выкананні рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.349/INS/13(Rev.1) / Decision, 8 лістапада 2023 г. Гл. таксама: МАП, Рашэнне аб выкананні рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.350/INS/10(Rev.1) / Decision, 11 сакавіка 2024 г. Таксама: МАП, У працяг рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.352/INS/10(Rev.1), 28 кастрычніка 2024 г. Таксама: МАП, Рашэнне наконт выканання рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.353/INS/7(Rev.1) / Decision, 17 сакавіка 2025 г.

Грамадскія арганізацыі могуць адвакатаваць неабходнасць дзеянняў дзяржавы на ўзроўні МАП і выкарыстоўваць даклады МАП для адвакацыі[298] ў межах мандата МАП, засяроджанага выключна на працоўных правах і стандартах, а не на шырэйшых грамадзянскіх і палітычных правах.

З улікам узаемадзеяння органаў МАП з іншымі міжнароднымі інстытуцыямі, пацярпелыя і грамадскія арганізацыі таксама могуць займацца адвакацыяй, звязанай з МАП, праз гэтыя структуры. У выпадку з Беларуссю ў выніку працэдуры паводле артыкула 33 была створана Працоўная група, якая складаецца з МАП і іншых структур ААН «для каардынацыі і ўмацавання сумесных дзеянняў па выкананні рэкамендацый Камісіі па расследаванні і наглядных органаў»[299].

298 Oxford Public International Law, Працэдуры нагляду і агляду: Міжнародная арганізацыя працы (МАП), красавік 2020 г.

299 МАП, Рашэнне аб выкананні рэзалюцыі аб мерах, рэкамендаваных Кіраўнічым органам у адпаведнасці з артыкулам 33 Статута МАП па пытанні Беларусі, GB.353/INS/7(Rev.1) / Decision, 17 сакавіка 2025 г.

# V. МЕХАНІЗМЫ ПАДТРЫМКІ НАМАГАННЯЎ ПА ПРЫЦЯГНЕННІ ДА АДКАЗНАСЦІ

## A. Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

### Якую ролю адыгрывае Група незалежных экспертаў ААН?

Для рэагавання на сур'ёзныя парушэнні міжнароднага права ў галіне правоў чалавека – як працяглыя, так і выкліканыя раптоўнымі падзеямі – усё часцей выкарыстоўваюцца следчыя органы, мандат якіх прадугледжаны ААН, дзеля прасоўвання механізмаў прыцягнення да адказнасці і барацьбы з беспакаранасцю[300]. Яны ствараюцца органамі ААН, такімі як Савет Бяспекі, Генеральная Асамблея, Генеральны сакратар або Савет ААН па правах чалавека. У большасці выпадкаў гэтыя механізмы датычаць канкрэтнай краіны[301]. Яны могуць існаваць у выглядзе місій па высвятленні фактаў, камісій па расследаванні ці іншых формаў следчых органаў. Іх узначальваюць незалежныя эксперты, якія працуюць на добраахвотнай аснове, прызначаныя асабіста, пры падтрымцы Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ)[302].

Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (ГНЭБ, GIEB) была створана ў красавіку 2024 года[303] на змену Экспертызе УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (OEB), якая распачала працу ў сакавіку 2021 г. і скончыла яе ў сакавіку 2024 г.[304] Пасля падаўжэння мандата 4 красавіка 2025 года трое экспертаў – Карынна Маскаленка (старшыня), Сьюзан Базілі і Моніка Платэк – упаўнаважаныя:[305]

- расследаваць і высвятляць факты, абставіны і карэнныя прычыны ўсіх меркаваных парушэнняў і злоўжыванняў у галіне правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі з 1 траўня 2020 года, у тым ліку іх гендарны і ўзроставы аспекты, а таксама іх наступствы для ахвяр і пацярпелых;
- збіраць, кансалідаваць, захоўваць і аналізаваць доказы такіх парушэнняў і злоўжыванняў і, калі магчыма, вызначаць асоб, адказных за іх здзяйсненне, у кантэксце магчымых адпаведных судовых або іншых працэдур, у тым ліку крымінальнага пераследу ў паўнамоцных юрысдыкцыях;

300 УВКПЧ, Міжнародныя камісіі па расследаванні, Камісіі па правах чалавека, місіі па ўстанаўленні фактаў і іншыя расследаванні.
301 УВКПЧ, Міжнародныя камісіі па расследаванні, Камісіі па правах чалавека, місіі па ўстанаўленні фактаў і іншыя расследаванні.
302 УВКПЧ, Міжнародныя камісіі па расследаванні, Камісіі па правах чалавека, місіі па ўстанаўленні фактаў і іншыя расследаванні. УВКПЧ дае экспертызу і падтрымку механізмам расследавання, у тым ліку кансультаванне па пытаннях абсягу мандата, метадалогіі расследавання і прыдатнага міжнароднага права, стварэнне сакратарыятаў са спецыялізаваным персаналам і аказанне адміністрацыйнай, лагістычнай падтрымкі і бяспекі.
303 Генеральная Асамблея ААН, Рэзалюцыя, прынятая Саветам па правах чалавека 4 красавіка 2024 г., UN-Doc. A/HRC/RES/55/27, пункт 8, 4 красавіка 2024 г.
304 УВКПЧ, Экспертыза УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.
305 Генеральная Асамблея ААН, Рэзалюцыя, прынятая Саветам па правах чалавека 4 красавіка 2024 г., UN-Doc. A/HRC/RES/55/27, пункт 9; Генеральная Асамблея ААН, Рэзалюцыя, прынятая Саветам па правах чалавека 3 красавіка 2025 г., UN-Doc. A/HRC/RES/58/19, 4 красавіка 2025 г.

- вынесці рэкамендацыі, у прыватнасці, па мерах прыцягнення да адказнасці, з мэтай спынення беспакаранасці і ліквідацыі яе першапрычын, забеспячэння прыцягнення да адказнасці і доступу да правасуддзя і эфектыўных сродкаў прававой абароны, уключаючы кампенсацыю ахвярам;

- узаемадзейнічаць з усімі зацікаўленымі бакамі, у тым ліку беларускімі, а таксама з рэгіянальнымі і міжнароднымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі, установамі ААН, АБСЕ, адпаведнымі кампаніямі і дзяржавамі з мэтай абмену інфармацыяй.

Асновай для ацэнкі, якую праводзіць Група незалежных экспертаў, з’яўляецца «міжнароднае права ў галіне правоў чалавека, у тым ліку звычаёвае права правоў чалавека і дагаворныя абавязацельствы ў галіне правоў чалавека, узятыя на сябе Рэспублікай Беларусь або іншымі дзяржавамі, якія могуць быць датычныя да парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі»[306].

Група даследуе парушэнні, што адбываюцца ў межах Рэспублікі Беларусь або пад яе юрысдыкцыяй. Акрамя таго, Група можа аналізаваць першасныя прычыны і абставіны экстратэрытарыяльнага характару, у тым ліку парушэнні па-за межамі краіны, якія непасрэдна ўплываюць на парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, маюць непарыўную сувязь з імі або непасрэдна з іх вынікаюць[307].

Працягваючы працу Экспертызы па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека (OEB), Група збірае паказанні ахвяр[308], у тым ліку тыя, што былі перададзены Міжнароднай платформай па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB). Любы знешні доступ да гэтых дадзеных або іх перадача іншым асобам магчымыя толькі пры наяўнасці інфармаванай згоды[309].

### Падтрымка Экспертызы УВКПЧ Платформай IAPB

IAPB аказала шырокую і індывідуальную падтрымку Экспертызе УВКПЧ (OEB). Гэта ўключала садзейнічанне ў доступе Экспертызы да пацярпелых і сведак, перадачу інфармацыі з адкрытых крыніц пра адпаведныя інцыдэнты, аддалены доступ да ўсёй сваёй калекцыі інфармацыі і доказаў, а таксама адказ на канкрэтныя запыты Экспертызы. Платформа IAPB перадала таксама інфармацыю пра пацярпелых і іншых патэнцыйных сведак і аказала значную лагістычную дапамогу, што дазволіла следчым Экспертызы правесці шматлікія інтэрв’ю[310].

306 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 5.
307 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 1.
308 УВКПЧ, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, с. 2–3, 7 лютага 2025 г.
309 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 3.
310 IAPB, Трэцяя справаздача аб ходзе працы, 2022 г.

## Якія магчымыя вынікі працы Групы?

**Даклады Савету ААН па правах чалавека**. Група штогод публікуе свае высновы ў падрабязным дакладзе, які прадстаўляецца на пасяджэнні Савета ААН па правах чалавека з наступным інтэрактыўным дыялогам[311]. Такі дыялог – гэта дыскусія, у якой бяруць удзел прадстаўнікі дзяржаў – членаў Савета, эксперты ААН і грамадзянская супольнасць. Падчас дыялогу адбываецца абмен думкамі наконт канкрэтных сітуацый з правамі чалавека або тэм. У сваім дакладзе Савету па правах чалавека Група фармулюе рэкамендацыі як для ўрада Беларусі, так і для іншых дзяржаў – членаў ААН.

### Даклад Групы незалежных экспертаў аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (GIEB)

У сваім першым дакладзе Савету ААН па правах чалавека, апублікаваным у лютым 2025 года, Група незалежных экспертаў разгледзела першасныя прычыны парушэнняў правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі з траўня 2020 года. Яна адзначыла, што гвалтоўны адказ на масавыя пратэсты пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года стаў чарговай праявай даўняй сістэмы рэпрэсіўнага кіравання.

Група ўстанавіла, што гэтыя парушэнні адбываліся на працягу 2023 і 2024 гадоў, ахопліваючы ўсё большую колькасць людзей. Было адзначана, што ўлады Беларусі працягвалі звужаць грамадзянскую і дэмакратычную прастору напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2025 года.

У дакладзе заяўлена, што ўрад Беларусі працягваў будаваць сваю палітыку задушэння іншадумства на адвольных затрыманнях і арыштах, якія часта суправаджаліся катаваннямі або жорсткім абыходжаннем. Таксама было задакументавана, што тысячы людзей, затрыманых і асуджаных паводле палітычна матываваных абвінавачанняў, сістэматычна падвяргаліся асобнаму і больш жорсткаму рэжыму ўтрымання, які меў на мэце пакаранне і прыніжэнне. Гэтыя практыкі разам з узмацненнем сачэння і абгрунтаваным страхам паўторных затрыманняў вымушалі многіх людзей пакінуць краіну. Павялічвалася колькасць выпадкаў, калі супраць людзей у выгнанні распачыналіся крымінальныя справы ў іх адсутнасць.

Працягваючы працу Экспертызы па Беларусі УВКПЧ (OEB), Група выявіла дадатковыя доказы злачынстваў супраць чалавечнасці. У прыватнасці, яна прыйшла да высновы, што злачынствы незаконнага пазбаўлення волі і пераследу здзяйсняліся супраць значнай часткі насельніцтва на падставе іх рэальных або ўяўных палітычных перакананняў[312].

311 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.
312 УВКПЧ, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, 7 лютага 2025 г.

**Дакументаванне і захоўванне доказаў**. Група незалежных экспертаў збірае, аналізуе і захоўвае доказы парушэнняў правоў чалавека, ствараючы каштоўны архіў, які можа быць выкарыстаны ў будучых працэсах прыцягнення да адказнасці – на нацыянальным, рэгіянальным або міжнародным узроўні[313]. Сабраная інфармацыя і доказы захоўваюцца ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, з выкарыстаннем прафесійных і бяспечных сістэм захоўвання дадзеных, што забяспечвае іх канфідэнцыйнасць, цэласнасць і доўгатэрміновую абарону.

**Прэс-рэлізы і публічныя заявы**. Група можа павышаць інфармаванасць грамадскасці праз прэс-рэлізы і публічныя заявы. Напрыклад, у студзені 2025 года Група выступіла з заявай, у якой выказала занепакоенасць пераабраннем прэзідэнта Лукашэнкі, звярнуўшы ўвагу на адсутнасць міжнародных назіральнікаў і магчымасць далейшага пагаршэння сітуацыі з правамі чалавека[314]. Такія заявы могуць уплываць на міжнародную рэакцыю, фарміраваць медыйнае асвятленне і адкрываць магчымасці для адвакацыі з боку грамадзянскай супольнасці. Прыцягваючы ўвагу да канкрэтных праблем, Група адыгрывае важную ролю ў фарміраванні глабальнага дыскурсу і прасоўванні прыцягнення да адказнасці.

**Канферэнцыйныя дакументы**. Акрамя таго, Група можа працаваць над вырашэннем розных пытанняў шляхам публікацыі канферэнцыйных дакументаў, якія развіваюць асобныя тэмы або фармулююць высновы па пытаннях, якія ўваходзяць у даклады Групы ў рамках яе паўнамоцтваў.

## Якую дадатковую вартасць мае Група незалежных экспертаў ААН?

Створаныя мандатам ААН органы расследавання складаюць гістарычныя дакументы пра парушэнні правоў чалавека, спрыяючы прыцягненню да адказнасці, папярэджанню новых злачынстваў, захаванню міжнароднага права і стварэнню механізмаў правасуддзя і кампенсацыі для ахвяр[315].

Група мае відавочныя перавагі ў параўнанні з папярэдняй Экспертызай па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі УВКПЧ (OEB). Як незалежны механізм ААН, яна дзейнічае аўтаномна, праводзіць уласныя расследаванні, а таксама фармулюе самастойныя фактычныя і прававыя высновы і рэкамендацыі[316].

Мандат Групы ахоплівае грамадзянскія і палітычныя, а таксама эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы[317]. Гэта важна, бо Беларусь, хоць і з’яўляецца дзяржавай – удзельніцай Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (ICESCR), не прызнала працэдуры індывідуальных скаргаў[318]. Таму праца Групы дае альтэрнатыўную магчымасць дакументаваць і расследаваць такія парушэнні.

313 УВКПЧ, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, 7 лютага 2025 г.
314 УВКПЧ, Беларусь: Вынікі прэзідэнцкіх выбараў, словы экспертаў.
315 УВКПЧ, Камісіі па расследаванні і місіі па ўстанаўленні фактаў па міжнародным праве правоў чалавека і гуманітарным праве: Даведнік і практыка, с. 7.
316 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 4.
317 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 2.
318 УВКПЧ, База дадзеных дагаворных органаў ААН.

Геаграфічны ахоп мандата ўключае экстратэрытарыяльны аспект, што дазваляе Групе дакументаваць парушэнні правоў чалавека, якія адбываюцца па-за межамі Беларусі, калі яны звязаны з парушэннямі ўнутры краіны або ўплываюць на асоб у Беларусі[319]. Гэта дае магчымасць, напрыклад, фіксаваць пераслед беларусаў у выгнанні.

Група мае таксама мандат на даследаванне абставін і першапрычын парушэнняў правоў чалавека, з улікам доўгатэрміновых палітычных, структурных, гістарычных, прававых, сацыяльных або эканамічных фактараў, у тым ліку ранейшых тэндэнцый[320].

Група мае мандат «расследаваць дзеянні як уладаў Беларусі, так і трэціх дзяржаў, а таксама іншых суб'ектаў, абавязаных выконваць правы чалавека, калі іх дзеянні могуць складаць або садзейнічаць парушэнням правоў чалавека ў Беларусі». Яе паўнамоцтвы ахопліваюць парушэнні правоў чалавека, здзейсненыя арганізацыямі, у тым ліку прыватнымі вайсковымі і ахоўнымі фірмамі, недзяржаўнымі ўзброенымі фарміраваннямі і іншымі недзяржаўнымі структурамі[321]. Гэта пашырае рамкі расследавання па-за беларускай дзяржавай і прызнае ролю знешняй падтрымкі або камерцыйных інтарэсаў у спрыянні парушэнням.

Прадметны аб'ём мандата Групы надае асаблівую ўвагу гендарным і ўзроставым аспектам парушэнняў правоў чалавека, у прыватнасці дзяцей, маладых і пажылых людзей, а таксама «фізічных, псіхалагічных, сацыяльных, эканамічных, прававых і іншых уздзеянняў на ахвяр і пацярпелых»[322].

Група мае задачу збіраць, захоўваць і аналізаваць доказы парушэнняў правоў чалавека, тым самым спрыяючы захаванню сведчанняў. У адпаведнасці са сваім характарам і мандатам, як камісія ААН Група не абавязана ўстанаўліваць віну такім жа чынам, як суды, і, адпаведна, не абавязана прымяняць крымінальныя стандарты даказвання, напрыклад, такія як доказы «па-за разумнымі сумненнямі». Замест гэтага Група выкарыстоўвае стандарт «разумных падстаў меркаваць», які з'яўляецца звычайнай практыкай для такіх камісій[323].

Дзейнасць Групы дапамагае ўтрымаць праблематыку правоў чалавека ў Беларусі ў міжнародным парадку дня і пад пастаяннай міжнароднай увагай. Вынікі яе працы, у тым ліку выяўленне тэндэнцый парушэнняў і магчымых адказных асоб, могуць спрыяць міжнароднаму ціску і забеспячэнню адказнасці.

## Якую ролю ў працэсе адыгрываюць пацярпелыя і грамадскія арганізацыі?

Прымаючы да ўвагі пытанні бяспекі, праца Групы незалежных экспертаў з пацярпелымі кіруецца прынцыпам «не нашкодзь» (не падвяргаць небяспецы жыццё, бяспеку, свабоду і дабрабыт пацярпелых, сведак і іншых асоб, якія аказваюць садзейнічанне Групе)[324].

---

319 ААН, Сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, 25 сакавіка 2024 г., пункты 47–48; Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, UN-Doc. A/HRC/58/68, 7 лютага 2025 г.

320 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 2.

321 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 1.

322 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 2.

323 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 5. Гл. таксама: УВКПЧ, Камісіі па расследаванні і місіі па ўстанаўленні фактаў па міжнародным праве правоў чалавека і гуманітарным праве: Даведнік і практыка, с. 62.

324 УВКПЧ, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі – Мандат, с. 3.

Хоць не існуе афіцыйных правіл працэдуры ўдзелу пацярпелых і грамадзянскай супольнасці ў механізмах расследавання ААН, іх праца кіруецца прынцыпамі і практыкай, выкладзенымі ў распрацаваным УВКПЧ даведніку «*Камісіі па расследаванні і місіі па ўстанаўленні фактаў па міжнародным праве правоў чалавека і гуманітарным праве: Даведнік і практыка»*[325].

Група размяшчае на сваім вэб-сайце аб'явы, у якіх запрашае фізічных асоб, групы і арганізацыі прадстаўляць інфармацыю і дакументацыю, якая мае дачыненне да яе мандата, праз абароненае воблачнае сховішча, адмыслова створанае ў гэтых мэтах, і з выкарыстаннем шаблона для ўпарадкавання прадстаўленай інфармацыі на англійскай і рускай мовах[326].

Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама маюць магчымасць узаемадзейнічаць з Групай падчас кансультацый. Пры падрыхтоўцы свайго апошняга даклада Група правяла інтэрв'ю з пацярпелымі і дала магчымасць розным зацікаўленым бакам, у тым ліку пацярпелым, абмяркоўваць і дзяліцца інфармацыяй[327].

**Група незалежных экспертаў і Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі**

У сваім дакладзе, апублікаваным у лютым 2025 года, Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі адзначыла ўнёсак Платформы IAPB у прадстаўленне матэрыялаў, якія маюць дачыненне да ацэнкі сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Гэта адзін са спосабаў, якім арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асабліва тыя, што займаюцца дакументаваннем і зборам доказаў, могуць супрацоўнічаць з Групай.

Супрацоўніцтва паміж Платформай IAPB і Групай незалежных экспертаў рэгулюецца Мемарандумам аб узаемаразуменні, які ахоплівае такія аспекты, як доступ да закрытых дадзеных Платформы IAPB, мінімізацыя рызыкі паўторнай траўматызацыі, канфідэнцыйнасць і бяспека, а таксама пераходныя механізмы для забеспячэння выканання гэтых прынцыпаў у выпадку спынення мандата Групы.

325 УВКПЧ, Камісіі па расследаванні і місіі па ўстанаўленні фактаў па міжнародным праве правоў чалавека і гуманітарным праве: Даведнік і практыка.
326 УВКПЧ. Заклік да прадстаўлення інфармацыі Групе незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.
327 УВКПЧ, Даклад Групы незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, с. 3, 7 лютага 2025 г.

# B. Дагаворныя органы ААН

## Якую ролю адыгрываюць дагаворныя органы ААН?

На цяперашні час існуе дзевяць міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека (часта іх называюць асноўнымі міжнароднымі дагаворамі), якія ўстанаўліваюць абавязацельствы дзяржаў у галіне правоў чалавека для тых, хто далучыўся або ратыфікаваў іх: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (ICCPR)[328], Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (ICESCR)[329], Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (ICERD)[330], Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW)[331], Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, нечалавечых або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання (CAT)[332], Канвенцыя аб правах дзіцяці (CRC)[333], Міжнародная канвенцыя аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў (ICMW)[334], Канвенцыя аб правах інвалідаў (CRPD)[335] і Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад прымусовага знікнення (CPED)[336].

Кожны асноўны міжнародны дагавор мае адпаведны дагаворны орган ААН, які нясе адказнасць за нагляд за выкананнем дзяржавамі абавязацельстваў па ім. Гэтыя камітэты складаюцца з незалежных экспертаў, упаўнаважаных сачыць за выкананнем адпаведных міжнародных дагавораў па правах чалавека. Факультатыўны пратакол да Канвенцыі супраць катаванняў (OPCAT)[337], створаны дзеля прадухілення катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання ці пакарання, уводзіць сістэму рэгулярных наведванняў месцаў пазбаўлення волі як нацыянальным механізмам, так і Падкамісіяй па прадухіленні катаванняў.

Мандат дагаворных органаў ААН уключае рэгулярны механізм разгляду выканання дзяржавамі-ўдзельніцамі адпаведных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, вядомы як перыядычны агляд. Ён праводзіцца на падставе даклада, прадстаўленага дзяржавай, і іншай інфармацыі, напрыклад паралельных («ценявых») дакладаў, якія прадстаўляюць арганізацыі грамадзянскай супольнасці, і завяршаецца прыняццем заключных заўваг з рэкамендацыямі адносна выканання адпаведных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека.

Прымаць і разглядаць індывідуальныя скаргі або паведамленні, пры пэўных умовах, могуць восем дагаворных органаў[338] (CCPR, CERD, CAT, CEDAW, CRPD, CED, CESCR і CRC). Гэты парадак дазваляе асобам, чые правы былі парушаны паводле аднаго з дагавораў, падаць скаргу ў адпаведны Камітэт, калі паўнамоцтвы гэтага Камітэта прызнаны дзяржавай – праз ратыфікацыю адпаведнага Факультатыўнага пратакола або дэкларацыю.

---

328 ААН, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, 16 снежня 1966 г.
329 ААН, Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, 16 снежня 1966 г.
330 ААН, Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, 21 снежня 1965 г.
331 ААН, Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, 18 снежня 1979 г.
332 ААН, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, 10 снежня 1984 г.
333 ААН, Канвенцыя аб правах дзіцяці, 20 лістапада 1989 г.
334 ААН. Міжнародная канвенцыя аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў, 18 снежня 1990 г.
335 ААН, Канвенцыя аб правах інвалідаў, 13 снежня 2006 г.
336 ААН, Міжнародная канвенцыя для абароны ўсіх асоб ад гвалтоўных зніkненняў, 20 снежня 2006 г.
337 УВКПЧ, Факультатыўны пратакол да Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, 18 снежня 2002 г.
338 Для Камітэта па справах працоўных-мігрантаў (CMW) механізм індывідуальнай скаргі яшчэ не ўступіў у сілу. Гл.: Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, Дагаворныя органы па правах чалавека: Індывідуальныя паведамленні.

**Беларусь і працэдуры індывідуальных зваротаў ААН**

Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай ICCPR (Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах), ICESCR (Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах), ICERD (Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі), CEDAW (Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын), CAT (Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, нечалавечых або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання), CRC (Канвенцыя аб правах дзіцяці), і CRPD (Канвенцыя аб правах асоб з інваліднасцю)[339]. У 1992 годзе Беларусь прызнала працэдуру індывідуальных скаргаў паводле МПГПП (ICCPR), а ў 2004 годзе – паводле КЛФДЖ (CEDAW)[340]. Аднак у 2022 годзе Беларусь дэнансавала Першы Факультатыўны пратакол да МПГПП, фактычна выйшаўшы з працэдуры індывідуальных скаргаў па гэтым дагаворы[341]. Гэта азначае, што ў цяперашні час да Беларусі прымяняецца толькі працэдура індывідуальных скаргаў паводле КЛФДЖ (CEDAW).

Акрамя таго, CESCR, CEDAW, CAT, CRPD, CRC і CED могуць праводзіць краінавыя расследаванні[342]. У выпадку з Беларуссю толькі CAT і CEDAW маюць паўнамоцтвы распачаць такое расследаванне. Гэта тлумачыцца тым, што Беларусь ратыфікавала адпаведныя дагаворы, не зрабіўшы агаворак да артыкула 20 CAT і артыкула 8 Факультатыўнага пратакола да CEDAW, якія б выключалі кампетэнцыю гэтых камітэтаў на правядзенне расследавання.

## Якія крокі неабходна зрабіць для запуску працэдур дагаворных органаў?

Кожны з інструментаў дагаворных органаў для маніторынгу выканання абавязацельстваў у галіне правоў чалавека і рэагавання на парушэнні правоў чалавека, звязаных з канкрэтнай краінай, мае свае этапы:

- **Перыядычныя агляды** прызначаюцца кожныя чатыры-пяць гадоў паводле доўгатэрміновага плана, вызначанага кожным дагаворным органам, хаця часам здараюцца затрымкі, якія часта падаўжаюць цыкл да васьмі і больш гадоў[343]. У 2022 годзе старшыні дагаворных органаў калектыўна дамовіліся прыняць прагназаваны графік аглядаў, устанавіўшы васьмігадовы цыкл для комплексных аглядаў з прамежкавымі ацэнкамі выканання рэкамендацый[344]. На працягу кожнага цыкла дзяржава прадстаўляе Камітэту даклад з апісаннем прагрэсу ў выкананні адпаведнага дагавора. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці і нацыянальныя ўстановы па правах чалавека могуць падаваць альтэрнатыўныя, або «ценявыя», даклады са сваім поглядам на сітуацыю з правамі чалавека ў краіне і ацэнкай выканання дзяржавай сваіх

339 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Статус ратыфікацыі.
340 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, База дадзеных дагаворных органаў ААН.
341 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Выхад Беларусі з працэдуры індывідуальных скаргаў з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай для абароны правоў чалавека, гаворыцца ў паведамленні Камітэта ААН па правах чалавека, 25 лістапада 2022 г.
342 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Дагаворныя органы: што робяць дагаворныя органы?
343 Гл., напрыклад: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Расклад сесій для Камітэта па грамадзянскіх і палітычных правах.
344 УВКПЧ, Высновы старшынь дагаворных органаў на 34-м пасяджэнні старшынь дагаворных органаў, 17 чэрвеня 2022 г.; гл. таксама: УВКПЧ, Камітэт па правах чалавека: Прадказальны цыкл агляду.

абавязацельстваў у гэтай сферы. Затым Камітэт праводзіць сесію для ацэнкі дзейнасці дзяржавы і выдае заключныя заўвагі з рэкамендацыямі.

- **Індывідуальныя скаргі (паведамленні)** могуць падаваць асобы, чые правы паводле пакта або канвенцыі былі парушаны дзяржавай-удзельніцай, якая прызнала паўнамоцтвы Камітэта разглядаць такія скаргі. Скаргі могуць таксама падавацца трэцімі асобамі ад імя пацярпелых, калі тыя далі пісьмовую згоду або не могуць зрабіць гэтага самастойна[345]. Заяўнікі мусяць паказаць, што яны вычарпалі ўсе ўнутраныя сродкі прававой абароны, калі толькі гэтыя сродкі не з’яўляюцца недаступнымі, неэфектыўнымі або звязанымі з неабгрунтаванымі затрымкамі. Акрамя таго, яны мусяць паказаць, што ніводзін іншы міжнародны орган або суд не разглядае гэтую ж справу[346].

  На дадзены момант CEDAW (Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын) з’яўляецца адзіным дагаворным органам, які мае паўнамоцтвы разглядаць індывідуальныя скаргі адносна Беларусі. Вызначаных тэрмінаў падачы скаргі няма. Аднак скаргі мусяць мець магчымасць ідэнтыфікацыі, а таксама быць неананімнымі і зробленымі ў пісьмовай форме. Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын мае права прымаць часовыя меры, каб прадухіліць непапраўную шкоду для аўтара скаргі[347].

- **Краінавыя расследаванні** распачынаюцца дагаворным органам, калі ёсць надзейныя звесткі пра сур’ёзныя або сістэматычныя парушэнні, і могуць уключаць візіт у краіну, узаемадзеянне з пацярпелымі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і прадстаўнікамі ўладаў. Па Беларусі ініцыяваць такія расследаванні могуць толькі Камітэт супраць катаванняў і Камітэт ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын. Працэдура для Камітэта супраць катаванняў падрабязна выкладзена ў артыкуле 20 Канвенцыі[348]. Нядаўна Камітэт супраць катаванняў правёў канфідэнцыйнае расследаванне ў дачыненні да Беларусі (гл. ніжэй). Для Камітэта па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын працэдура расследавання ўстаноўлена артыкулам 8 Факультатыўнага пратакола да Канвенцыі CEDAW. Асобы ці групы могуць ініцыяваць расследаванне, падаўшы «надзейную інфармацыю, якая сведчыць пра сур’ёзныя або сістэматычныя парушэнні дзяржавай-удзельніцай правоў, замацаваных у Канвенцыі»[349].

## Якія магчымыя вынікі працы дагаворных органаў ААН?

Дагаворныя органы ААН у галіне правоў чалавека могуць паведамляць аб выкананні дзяржавамі сваіх абавязацельстваў у гэтай сферы і фармуляваць рэкамендацыі для дзяржаў-удзельніц, разглядаць і вырашаць індывідуальныя скаргі (калі дзяржава прызнала такія паўнамоцтвы), а таксама праводзіць канфідэнцыйныя краінавыя расследаванні ў выпадку наяўнасці абгрунтаваных прыкмет сістэматычных парушэнняў правоў чалавека.

---

345 УВКПЧ, Дагаворныя органы: Працэдуры скаргаў у адпаведнасці з дагаворамі аб правах чалавека.
346 УВКПЧ, Даведнік па прадстаўленні індывідуальнага паведамлення дагаворным органам ААН.
347 ААН, Правілы працэдуры Камітэта па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, Правіла 63.
348 Артыкул 20 Канвенцыі супраць катаванняў, пункт 1, сцвярджае: «Калі Камітэт атрымлівае пэўную інфармацыю, якая, на яго думку, утрымлівае дастаткова абгрунтаваныя звесткі пра сістэматычнае прымяненне катаванняў на тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы-ўдзельніцы, ён прапануе гэтай дзяржаве супрацоўнічаць пры разглядзе гэтай інфармацыі і з гэтай мэтай прадставіць свае заўвагі адносна яе».
349 Артыкул 8 Факультатыўнага пратакола да Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын.

**Заключныя заўвагі**: Вынікам перыядычных аглядаў з'яўляецца публікацыя так званых заключных заўваг адпаведным дагаворным органам – пісьмовых дакладаў, якія ўтрымліваюць асноўныя высновы Камітэтаў і іх рэкамендацыі для дзяржаў-удзельніц.

16 верасня 2024 года Камітэт па ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі апублікаваў свае заключныя заўвагі па Беларусі, адзначыўшы, сярод іншага, «несправядлівыя звальненні ў такіх сферах, як ахова здароўя, адукацыя і культура, у якасці пакарання асоб, якія ўдзельнічалі ў мірных пратэстах і іншых дзеяннях, скіраваных на выказванне меркавання», а таксама рэпрэсіі супраць арганізацый грамадзянскай супольнасці і незалежных прафсаюзаў[350].

### CEDAW: Масавыя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, што могуць кваліфікавацца як злачынствы супраць чалавечнасці

У 2025 годзе Камітэт ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW) у сваіх Заключных заўвагах па выніках дзявятага перыядычнага даклада Беларусі адзначыў «актыўную ролю [урада Беларусі] у задушэнні праваабарончай дзейнасці, з паведамленнямі пра жорсткія рэпрэсіі супраць жанчын-праваабаронцаў, палітычных актывістак і журналістак». Камітэт вылучыў адвольныя затрыманні, пераслед, цэнзуру, вымушанае выгнанне і пазбаўленне бацькоўскіх правоў сярод шматлікіх формаў рэпрэсій, ахарактарызаваўшы гэтыя дзеянні як тыя, што могуць складаць злачынствы супраць чалавечнасці[351].

**Канфідэнцыйныя краінавыя расследаванні:** высновы перадаюцца толькі разгляданай дзяржаве-ўдзельніцы, калі яна не дасць згоду на публікацыю справаздачы. Аднак Камітэт, які праводзіць расследаванне, можа ўключыць кароткі агляд высноў у свой штогадовы даклад для Генеральнай Асамблеі ААН[352].

### Канфідэнцыйнае расследаванне Камітэта супраць катаванняў у дачыненні да Беларусі

У ліпені 2022 года, падчас сваёй 74-й сесіі, Камітэт супраць катаванняў прыняў рашэнне распачаць канфідэнцыйнае расследаванне паводле артыкула 20 (2) Канвенцыі, пасля атрымання паведамлення ад Праваабарончага цэнтра «Вясна» і Беларускага Хельсінкскага камітэта[353]. Інфармацыя была атрымана і сабрана двума дакладчыкамі, у тым ліку на падставе даклада Маскоўскага Механізма АБСЕ 2020 года (гл. Раздзел IV. D «Маскоўскі механізм АБСЕ»), а таксама матэрыялаў Фонду Дамоў правоў чалавека, Human Rights Watch, Міжнароднай платформы па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB), Міжнароднага савета па рэабілітацыі ахвяр катаванняў, Reporters without Borders і Сусветнай арганізацыі супраць катаванняў.

---

350 Камітэт па ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (CERD), Заключныя заўвагі па сёмым перыядычным дакладзе Беларусі, пункты 11, 23 і 27, 16 верасня 2024 г.

351 Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW), Заключныя заўвагі па выніках дзявятага перыядычнага даклада Беларусі, пункт 25 (a), 27 лютага 2025 г.

352 УВКПЧ, Органы па правах чалавека – Працэдуры скаргаў: Расследаванні.

353 Дакумент, прадстаўлены 4 верасня 2020 года і падпісаны 47 грамадзянамі Беларусі, меў дадатак са сведчаннямі 112 меркаваных ахвяр катаванняў. Гл: Генеральная Асамблея, 2024 г. Даклад Камітэта супраць катаванняў, Семдзесят сёмая сесія (10–28 ліпеня 2023 г.), Семдзесят восьмая сесія (30 кастрычніка – 24 лістапада 2023 г.), Семдзесят дзявятая сесія (15 красавіка – 10 траўня 2024 г.), пункт 36, 2024 г.

У сваім дакладзе для Генеральнай Асамблеі ААН на яе 77-й, 78-й і 79-й сесіях Камітэт прадставіў падсумаванне расследавання. Ён адзначыў, што сабраная інфармацыя вядзе «да непазбежнай высновы, што катаванні з'яўляюцца сістэмнай практыкай у Беларусі»[354]. Камітэт падкрэсліў, сярод іншага, што «з атрыманай або даступнай інфармацыі вынікае, што выпадкі катаванняў не мелі выпадковага характару ў пэўным месцы ці ў пэўны час, а з'яўляюцца звыклай, шырока распаўсюджанай і наўмыснай практыкай як мінімум на значнай частцы тэрыторыі краіны» і што катаванні «рэгулярна ажыццяўляюцца як мэтанакіраваная практыка дзеля запалохвання затрыманых, атрымання інкрымінацыйных паказанняў і пакарання палітычных апанентаў і мірных пратэстоўцаў»[355]. Сярод асноўных рэкамендацый Камітэта былі заклікі расследаваць усе выпадкі катаванняў і забяспечыць кампенсацыю пацярпелым.

У сваім адказе на высновы даклада ўрад Беларусі не пагадзіўся з заключэннямі Камітэта і адмаўляў усе абвінавачанні[356].

**Рашэнні па індывідуальных скаргах:** Калі гэтая працэдура можа прымяняцца, як у выпадку з Канвенцыяй аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын (CEDAW), адносна Беларусі, Камітэт можа прымаць рашэнні па індывідуальных справах, якія звычайна ўключаюць рэкамендацыі, як датычныя канкрэтна гэтай справы, так і агульнага характару. Яны могуць уключаць, напрыклад, правядзенне справядлівага і эфектыўнага расследавання парушэнняў, прыцягненне вінаватых да адказнасці, забеспячэнне рэпарацый пацярпелым або ўнясенне змен у нацыянальную заканадаўчую базу з мэтай недапушчэння такіх парушэнняў у будучыні[357].

### CEDAW: Беларуская журналістка звяртае ўвагу на дыскрымінацыйнае жорсткае абыходжанне падчас зняволення

У кастрычніку 2007 года беларуская журналістка Інга Абрамава была арыштавана за мірны актывізм і ўтрымлівалася ў прыніжальных, антысанітарных умовах, у тым ліку ў халоднай камеры з адкрытым туалетам, падвяргаючыся прыніжальнаму абыходжанню з боку выключна мужчынскага турэмнага персаналу. Пасля няўдалых спроб дамагчыся справядлівасці ўнутры краіны ў красавіку 2009 года яна падала скаргу ў Камітэт CEDAW. У верасні 2011 года Камітэт прызнаў, што перажытае ёю абыходжанне з'ўлялася формай дыскрымінацыі на падставе гендарнай прыналежнасці[358].

354 Генеральная Асамблея, 2024 г. Даклад Камітэта супраць катаванняў, Семдзесят сёмая сесія (10–28 ліпеня 2023 г.), Семдзесят восьмая сесія (30 кастрычніка – 24 лістапада 2023 г.), Семдзесят дзявятая сесія (15 красавіка – 10 траўня 2024 г.), пункт 46, 2024 г.

355 Генеральная Асамблея, 2024 г. Даклад Камітэта супраць катаванняў, Семдзесят сёмая сесія (10–28 ліпеня 2023 г.), Семдзесят восьмая сесія (30 кастрычніка – 24 лістапада 2023 г.), Семдзесят дзявятая сесія (15 красавіка – 10 траўня 2024 г.), пункты 43 і 45, 2024 г.

356 Генеральная Асамблея, 2024 г. Даклад Камітэта супраць катаванняў, Семдзесят сёмая сесія (10–28 ліпеня 2023 г.), Семдзесят восьмая сесія (30 кастрычніка – 24 лістапада 2023 г.), Семдзесят дзявятая сесія (15 красавіка – 10 траўня 2024 г.), пункт 48, 2024 г.

357 Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Дагаворныя органы: Працэдуры разгляду скаргаў у адпаведнасці з дагаворамі аб правах чалавека.

358 УВКПЧ, Абрамава супраць Беларусі, CEDAW/C/49/D/23/2009, 25 ліпеня 2011 г.

З 2020 года Камітэт па правах чалавека прыняў шэраг рашэнняў па індывідуальных скаргах, звязаных з Беларуссю, якія даступныя публічна[359]. У іх зафіксаваны парушэнні права на свабоду выказвання меркаванняў, мірныя сходы і палітычны ўдзел. У справе «*Бабарыка супраць Беларусі*» (2023 г.) Камітэт прыйшоў да высновы, што Беларусь незаконна стварала перашкоды кандыдату ў прэзідэнты праз палітычна матываваныя абвінавачанні[360]. У справе «*Катаржэўскі супраць Беларусі*» (2023 г.) Камітэт пастанавіў, што пакаранне грамадзяніна за распаўсюджванне спасылкі на навінавы матэрыял у інтэрнэце парушае свабоду выказвання меркаванняў[361]. Аналагічна, у справе «*Кулакоў і інш. супраць Беларусі*» (2023 г.) Камітэт прызнаў, што затрыманні і штрафы, накладзеныя на мірных пратэстоўцаў, парушылі іх правы паводле артыкулаў 19 і 21 МПГПП[362].

**Прэс-рэлізы і публічныя заявы** дазваляюць Камітэту па ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын і іншым дагаворным органам ААН публічна прыцягваць увагу да тэрміновых або сур’ёзных сітуацыі ў сферы правоў чалавека. Яны спрыяюць павышэнню грамадскіх ведаў, прыцягненню ўвагі СМІ і аказанню ціску на дзяржавы з мэтай вырашэння праблемы. Не будучы фармальнай працэдурай дагаворных органаў, прэс-рэлізы з’яўляюцца важным інструментам публічнасці, адвакацыі і прыцягнення да адказнасці. Напрыклад, у лістападзе 2022 года Камітэт па правах чалавека ААН апублікаваў прэс-рэліз у сувязі з выхадам Беларусі з Факультатыўнага пратакола да МПГПП, адзначыўшы, што гэты крок пазбавіў ахвяр важнай магчымасці шукаць справядлівасці і стаў «сур’ёзным і прыкрым адкатам у галіне абароны правоў чалавека згодна ў Пактам»[363].

## У чым заключаецца дадатковая вартасць дагаворных органаў ААН у галіне міжнароднага правасуддзя?

Даклады, заключэнні і рэкамендацыі дагаворных органаў ААН карыстаюцца высокім узроўнем даверу дзякуючы высокай кампетэнтнасці сваіх экспертаў, а таксама іх незалежнасці і непрадузятасці. Акрамя таго, дагаворныя органы ААН маюць магчымасць прамога ўзаемадзеяння з адпаведным урадам падчас перыядычнага агляду, а таксама з грамадзянскай супольнасцю.

Хоць эфектыўнасць гэтага інструмента залежыць ад узроўню супрацоўніцтва і добрасумленнасці адпаведнай дзяржавы, праца дагаворных органаў ААН мае ўнікальную вартасць, бо яна дазваляе:

- Стварыць аўтарытэтныя і публічныя справаздачы аб парушэннях. Вынікі працы дагаворных органаў, такія як заключныя заўвагі, заўвагі агульнага парадку і меркаванні або рашэнні па індывідуальных скаргах, даступныя для шырокай публікі. Яны фіксуюць парушэнні правоў чалавека, што забяспечвае пачуццё справядлівасці ахвярам і дае прызнанне іх досведу і шкодзе, якую яны панеслі. Таксама гэта можа заахвоціць да з’яўлення іншых намаганняў па забеспячэнні адказнасці.

359 База дадзеных дагаворных органаў ААН.
360 УВКПЧ, Віктар Бабарыка супраць Беларусі, 24 студзеня 2024 г.
361 УВКПЧ, Павел Катаржэўскі супраць Беларусі, 12 лютага 2024 г.
362 УВКПЧ, Леанід Кулакоў і інш. супраць Беларусі, 3 снежня 2024 г.
363 УВКПЧ, Прэс-рэліз, Выхад Беларусі з працэдуры індывідуальных скаргаў з’яўляецца сур’ёзнай перашкодай для абароны правоў чалавека, кажа Камітэт ААН па правах чалавека, 25 лістапада 2022 г.

- Прыцягнуць увагу да парушэнняў правоў чалавека**.** Высновы павышаюць узровень інфармаванасці аб выкананні або невыкананні нормаў, аказваючы ціск на ўрады з мэтай вырашэння гэтых пытанняў.

**Магчымы ўплыў высноў дагаворных органаў**

Магчымую вагу дакладаў дагаворных органаў дэманструе справа, якая тычылася прымусовага змяшчэння непаўналетняй асобы ў псіхіятрычную ўстанову і меркаванага жорсткага абыходжання з ёй у Малдове[364]. У сваім рашэнні ад 26 сакавіка 2024 г. Еўрапейскі суд па правах чалавека (ЕСПЧ) спаслаўся на Заключныя заўвагі Камітэта супраць катаванняў, Камітэта па правах дзіцяці і Камітэта па правах асоб з інваліднасцю, якія падкрэслівалі сістэмныя парушэнні правоў асоб з інваліднасцю ў такіх установах у Малдове. Абапіраючыся на гэтыя высновы, а таксама на высновы іншых праваабарончых органаў і ўласную папярэднюю практыку, ЕСПЧ пастанавіў, што былі парушаны правы заяўніка на свабоду ад катаванняў і на эфектыўны сродак прававой абароны.

## Якую ролю адыгрываюць пацярпелыя і грамадскія арганізацыі?

Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць узаемадзейнічаць з дагаворнымі органамі ААН рознымі спосабамі. У працэсе перыядычных аглядаў яны могуць прадстаўляць інфармацыю пра правы чалавека на розных этапах працэсу, напрыклад, падчас падрыхтоўкі і прыняцця спісаў пытанняў перад падачай даклада, падчас разгляду даклада дзяржавы-ўдзельніцы і ў працэдуры наступных мер. Іх прадстаўленні могуць падкрэсліваць прабелы ў рэалізацыі, падымаць пытанні, якія не былі закрануты дзяржавай, і прапаноўваць канкрэтныя рэкамендацыі. Звычайна Камітэты сустракаюцца з грамадскімі арганізацыямі падчас сесіі і перад разглядам даклада дзяржавы-ўдзельніцы, якога тычыцца іх інфармацыя.

Добра абгрунтаваныя прадстаўленні грамадскіх арганізацый могуць падштурхнуць дагаворныя органы да пачатку краінавых расследаванняў, як гэта паказана на прыкладзе Камітэта супраць катаванняў (гл. вышэй). Каб інфармацыя была прынята да разгляду, яна мусіць быць пэўнай і ўказваць на сур'ёзныя або сістэматычныя парушэнні дагавора.

Нарэшце, пацярпелыя могуць падаваць індывідуальныя скаргі ў сувязі з парушэннямі, ад якіх яны пацярпелі, самастойна або з дапамогай сваіх юрыдычных прадстаўнікоў. Скаргі таксама могуць быць пададзены трэцімі асобамі ад імя фізічных асоб пры ўмове, што яны далі пісьмовую згоду, або калі яны даць такую згоду не здольныя. Пры рэгістрацыі скаргі дагаворныя органы могуць прасіць пра дадатковыя ўдакладненні.

Паколькі механізм не прадугледжвае аказання прававой дапамогі, а пацярпелыя могуць быць не ў стане аплаціць паслугі прыватнага адваката, грамадскія арганізацыі часта дапамагаюць у падрыхтоўцы гэтых прадстаўленняў і аказваюць падтрымку на ўсіх этапах працэсу. Некаторыя грамадскія арганізацыі садзейнічаюць таксама і ў далейшай працы дзеля забеспячэння выканання прынятых рашэнняў.

364 Еўрапейскі суд па правах чалавека, Рашэнне па справе V.I. супраць Рэспублікі Малдова, № 38963/18, пункт 69–71, 26 чэрвеня 2024 г.

# C. Спецыяльныя працэдуры ААН

## Што такое спецыяльныя працэдуры ААН?

Спецыяльныя працэдуры Савета ААН па правах чалавека – гэта незалежныя эксперты ў сферы правоў чалавека, якія займаюцца расследаваннем, стварэннем дакладаў і кансультаваннем па пытаннях правоў чалавека. Яны дзейнічаюць у рамках тэматычных або краінавых мандатаў. Тэматычныя мандаты засяроджваюцца на асобных праблемах у галіне правоў чалавека па ўсім свеце, а краінавыя мандаты, як правіла, датычаць шырэйшага спектра праблем у межах адной канкрэтнай краіны. Да спецыяльных працэдур адносяцца Спецыяльныя дакладчыкі, Незалежныя эксперты і Працоўныя групы[365].

Мандаты спецыяльных працэдур ствараюцца праз рэзалюцыі, прынятыя Саветам ААН па правах чалавека, якія прымаюцца галасаваннем яго членаў[366]. Мандатарыі прызначаюцца Саветам па правах чалавека і дзейнічаюць у асабістай якасці.

Па стане на лістапад 2024 года існуе 46 тэматычных і 14 краінавых мандатаў, у тым ліку Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, пасаду якога цяпер займае Нілс Муйжніекс[367]. Гэты мандат быў заснаваны ў ліпені 2012 года, калі Генеральная Асамблея ААН выказала занепакоенасць сістэмнымі парушэннямі правоў чалавека, якія адбываюцца з 19 снежня 2010 года. Мандат прадугледжвае маніторынг сітуацыі з правамі чалавека ў краіне і распрацоўку рэкамендацый па яе паляпшэнні. Ён таксама ўключае садзейнічанне ў рэалізацыі рэкамендацый Вярхоўнага камісара, дапамогу ўраду ў выкананні яго абавязацельстваў у галіне правоў чалавека і падтрымку грамадзянскай супольнасці. У красавіку 2025 года Генеральная Асамблея ААН падоўжыла мандат яшчэ на адзін год[368].

Іншыя тэматычныя мандаты, актуальныя для сітуацыі ў Беларусі, уключаюць **Працоўную групу па адвольных затрыманнях (WGAD)**, **Працоўную групу па прымусовых або мімавольных знікненнях (WGEID)**, **Спецыяльнага дакладчыка па катаваннях** і **Спецыяльнага дакладчыка па пазасудовых, без належнага судовага разбору або адвольных пакараннях смерцю**. Ніжэй прыведзены некалькі прыкладаў таго, як гэтыя мандаты ўзаемадзейнічалі з Беларуссю або разглядалі яе сітуацыю:

- Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года Працоўная група па адвольных затрыманнях (**WGAD**) вынесла 10 прававых заключэнняў адносна затрымання беларускіх грамадзян[369]. WGAD прызнала гэтыя затрыманні адвольнымі паводле некалькіх катэгорыяў, у тым ліку парушэнні права на справядлівы суд, дыскрымінацыю паводле палітычнай прыналежнасці і пераслед за ажыццяўленне асноўных свабод[370].

365 УВКПЧ, Дапаможнік па працы Спецыяльных працэдур Савета па правах чалавека.
366 International Justice Resource Center. Спецыяльныя працэдуры Савета ААН па правах чалавека.
367 УВКПЧ, Спецыяльны дакладчык па Беларусі.
368 Рэзалюцыя ААН, прынятая Саветам па правах чалавека 3 красавіка 2025 г., 4 красавіка 2025 г.
369 Працоўная група па адвольных затрыманнях (WGAD) робіць публічныя прававыя заключэнні па справах, прадстаўленых асобамі, сем'ямі, грамадскімі арганізацыямі або дзяржавамі, ацэньвае адвольнасць утрымання пад вартай па пяці катэгорыях і рэкамендуе такія сродкі прававой абароны, як вызваленне з-пад варты, кампенсацыі і гарантыі непаўтарэння, з наступнымі мерамі па ацэнцы, якія праводзяцца на працягу шасці месяцаў.
370 Напрыклад, WGAD зрабіла заключэнні па справах Сяргея Ціханоўскага (№ 23/2021), Максіма Знака (№ 24/2022), Аляксандра Бяляцкага (№ 3/2024), Марыі Рабковай (№ 54/2024) і іншых.

- На сваёй 134-й сесіі ў верасні 2024 года Працоўная група па прымусовых або мімавольных знікненнях (**WGEID**) разгледзела і перадала Ураду Беларусі агульнае паведамленне[371] адносна так званых кароткатэрміновых прымусовых знікненняў дэманстрантаў у 2020 годзе, а таксама знікненняў вядомых палітвязняў у месцах пазбаўлення волі пасля гэтага. WGEID адзначыла, што такія сцверджанні адлюстроўваюць высновы даклада Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека ад сакавіка 2024 года аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. Сюды ўваходзіць практыка ўтрымання без доступу да адваката ці без інфармавання сем'яў аб месцы знаходжання затрыманых, а таксама працяглае ўтрыманне ў поўнай ізаляцыі[372].

- **Спецыяльны дакладчык па пытанні катаванняў** працаваў з Беларуссю, узнімаючы пытанні аб абыходжанні з жанчынамі, затрыманымі ў сувязі з пратэстамі 2020 года. У сакавіку 2025 года Дакладчык разам з іншымі экспертамі заклікаў улады Беларусі разабрацца пытаннем, апісаным у шматлікіх паведамленнях, пра жорсткае абыходжанне ў папраўчых калоніях[373].

- **Спецыяльны дакладчык па пазасудовых, без належнага судовага разбору або адвольных пакараннях смерцю** звяртаўся да Беларусі ў сувязі з працягам ужывання смяротнага пакарання. Дакладчык асудзіў пакаранне трох асоб, скаргі якіх усё яшчэ знаходзіліся на разглядзе ў Камітэце па правах чалавека ААН[374].

## Якімі могуць быць вынікі працы спецыяльных працэдур ААН?

**Даклады**. Спецыяльныя працэдуры штогод прадстаўляюць даклады Савету ААН па правах чалавека, а большасць мандатаў падае таксама гадавыя даклады Генеральнай Асамблеі. Гэтыя даклады афіцыйна прадстаўляюцца падчас сесій Савета па правах чалавека і, калі гэта адпавядае правілам, Генеральнай Асамблеі. Пасля кожнага прадстаўлення праводзіцца інтэрактыўны дыялог, які дазваляе дзяржавам і іншым зацікаўленым бакам непасрэдна ўзаемадзейнічаць з мандатарыям наконт высноў і рэкамендацый[375].

**Паведамленні**. Спецыяльныя працэдуры могуць накіроўваць паведамленні ў форме лістоў-абвінавачанняў або тэрміновых зваротаў у адказ на канкрэтныя парушэнні. Тэрміновыя звароты накіраваны на прадухіленне непазбежнай шкоды або спыненне працяглых парушэнняў, у той час як лісты-абвінавачанні датычаць мінулых злоўжыванняў і накіраваны на ўдакладненне або забеспячэнне кампенсацыі. Камунікацыі накіроўваюцца дзяржавам або недзяржаўным суб'ектам і маюць на мэце падштурхнуць да дзеянняў, напрыклад, да вызвалення асоб, змены палітык ці правядзення афіцыйных расследаванняў.[376]

371 WGEID рэгулярна перадае дзяржавам зводку абвінавачанняў, атрыманых або сабраных ад саміх дзяржаў, пэўных крыніц, такіх як сваякі зніклых асоб або аўтарытэтныя грамадскія арганізацыі, адносна перашкод пры рэалізацыі Дэкларацыі аб абароне ўсіх асоб ад прымусовых знікненняў.
372 УВКПЧ, 134-ая сесія WGEID, агульнае абвінавачанне, перададзенае Беларусі, 16–25 верасня 2024 г.
373 УВКПЧ, Беларусь: Трывожнае жорсткае абыходжанне з жанчынамі-зняволенымі і небяспечны для жыцця стан Вікторыі Кульшы, кажуць эксперты ААН, 26 сакавіка 2025 года.
374 УВКПЧ, Эксперты ААН па правах чалавека асуджаюць пакаранні смерцю ў Беларусі, 12 снежня 2018 г.
375 УВКПЧ, Дапаможнік па працы Спецыяльных працэдур Савета па правах чалавека.
376 УВКПЧ, Што такое паведамленні?

**Amicus curiae.** Мандатарыі спецыяльных працэдур могуць рыхтаваць заключэнні *amicus curiae*[377] для нацыянальных і міжнародных судовых працэсаў. Іх экспертныя меркаванні і прававыя высновы афіцыйна прадстаўляліся ў рэзанансных справах, такіх як рашэнні федэральных судоў ЗША адносна зняволеных у Гуантанама, а таксама ў розных працэсах у Еўрапейскім судзе па правах чалавека, дзе яны ўдакладнялі міжнародныя нормы адносна адвольных затрыманняў, катаванняў, прынцыпу нявыдачы і інш. У справах, датычных Беларусі, іх практыка і экспертыза могуць адыграць ключавую ролю ў падтрымцы працэсаў па ўніверсальнай юрысдыкцыі і іншых механізмаў прыцягнення да адказнасці[378].

**Перанакіраванне спраў.** Калі практыка прымусовых знікненняў можа кваліфікавацца як злачынствы супраць чалавечнасці, WGEID упаўнаважана ацаніць доказы і, калі гэта неабходна, перадаць справу ў кампетэнтныя органы для далейшых дзеянняў.[379] Гэта могуць быць міжнародныя органы, такія як Міжнародны крымінальны суд, рэгіянальныя або субрэгіянальныя механізмы, а таксама нацыянальныя юрысдыкцыі з заканадаўствам аб універсальнай юрысдыкцыі.

**Краінавыя візіты**. Мандатарыі спецыяльных працэдур могуць, пры згодзе краіны, здзяйсняць візіты для ацэнкі сітуацыі з правамі чалавека. Такія візіты даюць магчымасць непасрэднага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі ўрада, грамадзянскай супольнасці і пацярпелымі[380].

**Спецыяльныя працэдуры ААН і Беларусь**

З 2010 года розныя мандатарыі накіравалі ў Беларусь не менш за 86 паведамленняў адносна шматлікіх парушэнняў правоў чалавека, у тым ліку жорсткага абыходжання з затрыманымі, прызнання арганізацый грамадзянскай супольнасці экстрэмісцкімі і сур’ёзных абмежаванняў свабоды выказвання меркаванняў і мірных сходаў. З іх Беларусь адказала толькі на 53, прычым апошнія адказы складаліся ў асноўным з адмаўлення абвінавачанняў, аспрэчвання прымальнасці скаргі і адсутнасці супрацоўніцтва ў дачыненні да запрошаных часовых мер[381].

Што да візітаў у краіну, апошні візіт у Беларусь адбыўся ў ліпені 2022 года – яго здзейсніў Спецыяльны дакладчык па правах чалавека мігрантаў[382]. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і Працоўная група па дыскрымінацыі жанчын і дзяўчат зрабілі запыт на візіт у студзені 2021 года і ў верасні 2024 года, адпаведна, аднак адказу ад ураду Беларусі пакуль не было. Акрамя таго, Спецыяльны дакладчык па пытанні катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных відаў абыходжання ці пакарання яшчэ ў 2005 годзе зрабіў запыт на візіт, які быў афіцыйна адхілены ў лютым 2021 года[383].

377 Amicus curiae (па-лацінску «сябар суда») адносіцца да прадстаўлення, якое робіць асоба або арганізацыя, якая мае інтарэс або погляды на прадмет судовага разбору, у якім прапануецца дадатковая інфармацыя, экспертная думка або падыход, якія могуць дапамагчы суду ў прыняцці рашэння.

378 Напрыклад, Amicus curiae Спецыяльнага дакладчыка па пытаннях катаванняў у Апеляцыйным судзе ЗША; Сумеснае прадстаўленне 5 мандатарыяў у Еўрапейскі суд па правах чалавека ў справе C.O.C.G. і іншыя супраць Літвы.

379 ААН, WGEID перагледзела метады працы, A/HRC/WGEID/1, пункт 43, 28 верасня 2023 г.

380 УВКПЧ. Краінавыя і іншыя візіты.

381 УВКПЧ. Пошук паведамленняў і дакладаў.

382 УВКПЧ, A/HRC/53/26/ADD.1: Візіт у Польшчу – даклад Спецыяльнага дакладчыка па правах чалавека мігрантаў Феліпэ Гансалеса Маралеса, 21 красавіка 2023 г.

383 УВКПЧ. Краінавыя візіты Спецыяльных працэдур Савета па правах чалавека з 1998 года.

Раней Працоўная група па адвольных затрыманнях правяла візіт у Беларусь у жніўні 2004 года. У сваім дакладзе яна выказала занепакоенасць выкарыстаннем адміністрацыйнага затрымання для пакарання асоб, якія мірна ажыццяўлялі свае правы на сходы, выказванне і атрыманне інфармацыі. Група таксама падкрэсліла, што Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях выкарыстоўваецца для рэпрэсій супраць палітычных апанентаў і што затрыманне часам ужывалася з мэтай атрымаць інфармацыю ад сведак або патэнцыйных будучых абвінавачваных[384].

**Рэкамендацыі**. Па выніках візіту ў краіну мандатарый падае падрабязны даклад у Савет ААН па правах чалавека. Гэты даклад утрымлівае высновы візіту і рэкамендацыі, адрасаваныя адпаведнаму ўраду і іншым зацікаўленым бакам. Такія рэкамендацыі часта датычаць заканадаўчых рэформаў, інстытуцыйных змен і абароны ўразлівых груп. Хоць яны і не маюць юрыдычнай сілы, яны маюць значную вагу і могуць спрыяць нацыянальнай і міжнароднай адвакацыі. Рэкамендацыі таксама могуць рабіць мандатарыі ў дакладах і без правядзення папярэдняга візіту ў краіну.

**Рэкамендацыі мандатарыяў наконт прыцягнення да адказнасці**

У дакладзе 2015 года па сітуацыі з правамі чалавека ў Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы (КНДР) Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў КНДР заклікаў дзяржавы-ўдзельніцы прымяняць прынцып універсальнай юрысдыкцыі, каб дапамагчы прадухіліць далейшыя злачынствы супраць чалавечнасці ў краіне[385]. У дакладзе 2024 года гэты ж мандат заклікаў дзяржавы-ўдзельніцы прыняць дадатковыя меры для накіравання сітуацыі ў КНДР у Міжнародны крымінальны суд праз Савет Бяспекі[386].

У дакладзе 2024 года Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Эрытрэі падкрэсліў неабходнасць каардынаваных міжнародных дзеянняў, заклікаўшы дзяржавы-ўдзельніцы ажыццяўляць універсальную юрысдыкцыю ў дачыненні да меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці і сур’ёзных парушэнняў правоў чалавека, калі меркаваны злачынца знаходзіцца на іх тэрыторыі[387].

У дакладзе 2024 года па Беларусі Спецыяльны дакладчык заклікаў міжнародную супольнасць шырэй выкарыстоўваць універсальную юрысдыкцыю для завядзення крымінальных спраў і выдачы міжнародных ордараў на арышт асоб, падазраваных у здзяйсненні сур’ёзных парушэнняў правоў чалавека ў краіне[388].

384 ААН, Даклад Працоўнай групы па адвольных затрыманнях – Місія ў Беларусь, 25 лістапада 2004 г.
385 УВКПЧ, Даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы Марзукі Дарусмана, 18 сакавіка 2015 г.
386 УВКПЧ, Даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы Марзукі Дарусмана, 18 сакавіка 2015 г.
387 УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Эрытрэі: Даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Эрытрэі, 6 траўня 2022 г.
388 УВКПЧ, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Анаіс Марын, 9 траўня 2024 г.

**Прэс-рэлізы**. Спецыяльныя працэдуры выкарыстоўваюць прэс-рэлізы як сродак для публічнага асвятлення тэрміновых або сур'ёзных сітуацый у сферы правоў чалавека, якія патрабуюць шырэйшай увагі. Прэс-рэлізы спрыяюць павышэнню грамадскай веды, выклікаюць цікавасць СМІ і ствараюць ціск на ўлады, каб яны адрэагавалі або прынялі меры. Не будучы фармальнай працэдурай, прэс-рэлізы з'яўляюцца важным інструментам публічнасці, адвакацыі і прыцягнення да адказнасці[389].

**Высновы спецыяльных працэдур уключаюцца ў УПА**[390]. Экспертныя высновы часам знаходзяць адлюстраванне або робяць унёсак у працэс Універсальнага перыядычнага агляду (УПА). УПА заснаваны на трох крыніцах інфармацыі, адной з якіх з'яўляецца агляд, падрыхтаваны Упраўленнем Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека. Гэты агляд уключае інфармацыю ад механізмаў ААН у галіне правоў чалавека, у тым ліку даклады спецыяльных працэдур, дагаворных органаў і іншых структур ААН. Такім чынам, назіранні і рэкамендацыі экспертаў могуць уплываць на ацэнку сітуацыі з правамі чалавека ў дзяржаве і складаць рэкамендацыі, зробленыя падчас УПА[391].

## Якая дадатковая вартасць спецыяльных працэдур ААН?

Тэматычныя спецыяльныя працэдуры ААН могуць расследаваць, рыхтаваць даклады і ўзаемадзейнічаць па пытаннях правоў чалавека ў любой дзяржаве – удзельніцы ААН, незалежна ад дагаворных абавязацельстваў гэтай дзяржавы або ўзроўню яе супрацоўніцтва.

Краінавыя мандаты маюць доступ да нацыянальных суб'ектаў і могуць узаемадзейнічаць з нацыянальнымі ўладамі непасрэдна, рэгулярна і без затрымак, што з'яўляецца больш высокім узроўнем узаемадзеяння, чым той, які звычайна могуць забяспечыць больш шырокія тэматычныя механізмы[392].

За выключэннем візітаў у краіны, дзейнасць спецыяльных працэдур не залежыць ад згоды дзяржавы, ратыфікацыі або прызнання, што дазваляе ім больш гнутка і аператыўна рэагаваць на новыя або працяглыя праблемы ў сферы правоў чалавека ва ўсіх краінах. Што да краінавых візітаў, па стане на 31 снежня 2023 г. запрашэнне тэматычным спецыяльным працэдурам, якое дзейнічае на пастаяннай аснове, надалі 128 дзяржаў-удзельніц і адна дзяржава-назіральнік. Аднак Беларусь сярод іх адсутнічае[393].

Яшчэ адной перавагай спецыяльных працэдур з'яўляецца іх здольнасць і гнуткасць хутка рэагаваць пры ўзнікненні парушэнняў правоў чалавека. Дзякуючы працэдуры паведамленняў яны могуць аператыўна атрымліваць інфармацыю і ў тэрміновых сітуацыях рэагаваць на яе на працягу 24–48 гадзін. Гэта асабліва важна ў сітуацыях, калі існуе прамая пагроза жыццю або бяспецы заяўнікаў[394].

---

389 Напрыклад, у сумесным прэс-рэлізе эксперты ААН выказалі занепакоенасць у сувязі з рэпрэсіямі ў дачыненні да прафсаюзных актывістаў у Беларусі, 5 чэрвеня 2025 г.

390 УПА быў заснаваны пры стварэнні Савета па правах чалавека 15 сакавіка 2006 года Генеральнай Асамблеяй ААН у рэзалюцыі 60/251. Механізм быў дадаткова ўдасканалены ў працэсе разгляду рэзалюцыяй 16/21 і рашэннем 17/119. Гэтыя два дакументы прадугледжвалі неабходныя змены ў парадку правядзення агляду ў другім і наступных цыклах.

391 УВКПЧ, Асноўнае пра УПА.

392 Journal of Human Rights Practice, том 15, выпуск 3, Дагаворныя органы і спецыяльныя працэдуры: ці могуць яны лепш працаваць разам?, с. 784–793, лістапад 2023 г.

393 УВКПЧ, Сталыя запрашэнні.

394 ISHR Academy, У чым розніца паміж органамі ААН, якія ажыццяўляюць маніторынг правоў чалавека?

Напрыклад, Працоўная група па адвольных затрыманнях (WGAD) адыграла значную ролю ў асвятленні шырокамаштабнай практыкі адвольных затрыманняў у Беларусі, асабліва пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Сваімі прававымі заключэннямі Група пацвердзіла, што затрыманне прадстаўнікоў апазіцыі, мірных дэманстрантаў, журналістаў і праваабаронцаў парушае фундаментальныя правы і свабоды, такія як свабода выказвання, свабода сходаў і гарантыі справядлівага суда. Хоць заключэнні і развагі Групы не маюць юрыдычнай сілы, іх моцны маральны і прававы аўтарытэт часта карысны ў кампаніях па адвакацыі і міжнародных намаганнях па прыцягненні да адказнасці[395].

Асноўная дадатковая вартасць спецыяльных працэдур заключаецца ў іх ролі па афіцыйным інфармаванні ўладаў аб канкрэтных выпадках, што дазваляе афіцыйна зафіксаваць факт, што ўрад ведаў пра меркаваныя парушэнні. Гэта асабліва важна для Працоўнай групы па прымусовых або мімавольных знікненнях (WGEID), бо істотным элементам прымусовага знікнення з'яўляецца адмаўленне дзяржавай факту пазбаўлення волі або непаведамленне пра лёс ці месцазнаходжанне ахвяры, нягледзячы на тое, што дзяржаве вядома пра гэты выпадак. Паведамленні WGEID адпавядаюць гэтаму крытэрыю, паколькі ставяць дзяржаву перад фактам; любое далейшае невыкананне абавязацельстваў па правядзенні расследавання або даванні празрыстага адказу можа азначаць працяглае парушэнне і патэнцыйна служыць падставай для высновы аб адказнасці або саўдзеле дзяржавы[396].

## Якая роля пацярпелых і арганізацый грамадзянскай супольнасці ва ўзаемадзеянні са спецыяльнымі працэдурамі ААН?

Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці адыгрываюць ключавую ролю ва ўзаемадзеянні са Спецыяльнымі працэдурамі. Яны могуць падаваць інфармацыю аб меркаваных парушэннях праз анлайн-форму. Для бяспечнай і эфектыўнай камунікацыі прадугледжаны формы для запаўнення і магчымасці канфідэнцыйнай падачы[397]. На падставе такіх прадстаўленняў эксперты Спецыяльных працэдур могуць накіроўваць паведамленні ўрадам і недзяржаўным суб'ектам[398]. Паведамленні могуць датычыцца мінулых злоўжыванняў, працяглых або патэнцыйных парушэнняў, а таксама заканадаўства і рашэнняў, якія падаюцца неадпаведнымі міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека. Іх мэта – прыцягнуць увагу да меркаваных парушэнняў, заклікаць да поўнага, бесстаронняга і незалежнага расследавання, а таксама запатрабаваць належнай кампенсацыі і гарантый непаўтарэння.

Акрамя камунікацыі праз паведамленні, WGAD і WGEID маюць асобныя працэдуры ў адпаведнасці са сваімі метадамі працы[399]. На падставе інфармацыі, атрыманай ад заяўнікаў, WGAD выдае публічныя прававыя меркаванні аб тым, ці з'яўляецца пазбаўленне волі ў канкрэтным выпадку адвольным, у той час як WGEID

395 Напрыклад, у справе Аль Хасана (ICC–01/12–01/18) Пракурор МКС прызнала Развагу № 9 WGAD і яе тлумачэнне ўтрымання incommunicado як адвольнага і жорсткага, адзначыўшы, што «працяглае ўтрыманне ў поўнай ізаляцыі ў сакрэтным месцы можа прыраўноўвацца да катавання».

396 Заўвага агульнага парадку WGEID па вызначэнні гвалтоўнага знікнення, A/HRC/7/2 (пункт 26) і заўвага агульнага парадку аб гвалтоўным знікненні як бесперапынным злачынстве, A/HRC/16/48 (пункт 39)

397 УВКПЧ, Што такое паведамленні?

398 УВКПЧ, База дадзеных камунікацый Спецыяльных працэдур.

399 УВКПЧ, Індывідуальныя скаргі ў WGAD: Паведамленне аб знікненні ў WGEID.

запытвае інфармацыю ў дзяржаў і, пры патрэбе, у недзяржаўных суб'ектаў адносна лёсу і месцазнаходжання асоб, якія прымусова зніклі.

На пачатковым этапе працэсу заявы могуць накіроўвацца мандатарыям ад асобных людзей, груп, арганізацый грамадзянскай супольнасці або нацыянальных і міжурадавых структур. Мандатарыі вырашаюць, ці варта пускаць справу ў ход, зыходзячы з пэўнасці, падрабязнасці і аб'ектыўнасці інфармацыі, пры ўмове, што яна не мае палітычнай матывацыі, не мае абразлівага тону і не заснавана выключна на паведамленнях СМІ.

У адрозненне ад працэдуры падачы скаргаў у Дагаворныя органы, гэтыя механізмы не патрабуюць вычарпання ўнутраных сродкаў прававой абароны або ратыфікацыі адпаведнага дагавора дзяржавай. Паведамленні звычайна ўтрымліваюць імёны пацярпелых, за выключэннем выпадкаў, калі была запытана канфідэнцыйнасць з меркаванняў бяспекі.

Усе паведамленні і адказы на іх пазней абагульняюцца ў дакладах, якія прадстаўляюцца Савету па правах чалавека, без індэнтыфікацыйнай інфармацыі ў адчувальных выпадках. Хоць тэрміновыя выпадкі могуць разглядацца аператыўна, адказы заяўнікам у асобных справах не прадугледжаны, ім рэкамендуецца самастойна сачыць за абнаўленнямі ў адкрытай базе паведамленняў.

Пацярпелыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць таксама ўзаемадзейнічаць з адпаведнымі мандатарыямі для адвакацыі краінавых візітаў. Калі такія візіты адбываюцца, гэта магчымасць падаваць эксперту агульную інфармацыю, асабістыя сведчанні і далей выкарыстоўваць высновы і фінальны даклад місіі як інструмент нацыянальнай і міжнароднай адвакацыі[400].

# D. Маскоўскі механізм АБСЕ

## Што такое Маскоўскі механізм АБСЕ?

Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) распрацавала некалькі інструментаў для маніторынгу выканання абавязацельстваў, прынятых дзяржавамі-ўдзельніцамі ў сферы правоў чалавека, вяршэнства права і дэмакратычных інстытутаў, якія ў сукупнасці называюцца «чалавечае вымярэнне»[401]. Два з гэтых інструментаў, якія могуць быць задзейнічаны асобнай дзяржавай-удзельніцай або групай дзяржаў, – гэта Венскі і Маскоўскі механізмы.

**Венскі механізм** дазваляе дзяржавам-удзельніцам падымаць пытанні, звязаныя з сітуацыяй у сферы чалавечага вымярэння ў іншых дзяржавах АБСЕ[402]. Ён быў узгоднены ў Венскім заключным дакуменце 1989 года і ўстанаўлівае абавязак даваць пісьмовы адказ на запыты інфармацыі з боку іншых дзяржаў-удзельніц.

400 Акадэмія ISHR. Разуменне спецыяльных працэдур.
401 Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ), Што такое чалавечае вымярэнне?
402 АБСЕ, Венскі механізм, прыняты на Венскай наступнай сустрэчы ў 1989 г.

**Маскоўскі механізм** дазваляе дзяржавам – удзельніцам АБСЕ ствараць спецыяльныя *ad hoc* місіі незалежных экспертаў для садзейнічання ў вырашэнні канкрэтнай праблемы ў сферы чалавечага вымярэння як на іх уласнай тэрыторыі, так і на тэрыторыі іншых дзяржаў – удзельніц АБСЕ[403].

Венскі механізм можа ўжывацца самастойна або папярэднічаць Маскоўскаму механізму, але таксама выкарыстоўваўся для кантролю за выкананнем рэкамендацый.

Дакладчыкі, прызначаныя ў рамках Маскоўскага механізма, абіраюцца са спісу рэсурсаў (рэестру экспертаў), які вядзе Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ)[404]. Кожная дзяржава – удзельніца АБСЕ можа вылучыць да трох экспертаў у гэты спіс, які мусіць уключаць не менш за 45 экспертаў, каб быць працаздольным[405]. Грамадзяне і рэзідэнты дзяржавы пад разглядам, а таксама дзяржавы, што задзейнічалі механізм, не могуць прызначацца ў адпаведныя місіі.

Хоць структуры АБСЕ непасрэдна не ўдзельнічаюць у місіях і расследаваннях, Маскоўскі механізм ажыццяўляецца пры падтрымцы БДІПЧ, якая аказвае лагістычную дапамогу, прапануе спіс кантактаў грамадскіх арганізацый прызначаным дакладчыкам, перакладае іх даклады на мясцовыя мовы і стварае спецыяльную паштовую скрыню для місіі, куды можна накіроўваць інфармацыю і доказы.

Дакладчыкі мусяць устанаўліваць факты, паведамляць пра іх і даваць рэкамендацыі адносна магчымых рашэнняў пастаўленых пытанняў (Маскоўскі механізм, п. 11). Таму яны паслядоўна ўключаюць рэкамендацыі ў свае даклады, адрасаваныя не толькі дзяржаве, адносна якой задзейнічаны механізм, але таксама іншым дзяржавам – удзельніцам АБСЕ і міжнароднай супольнасці.

Перад канчатковым афармленнем даклады перадаюцца дзяржаве, якая задзейнічала механізм з уласнай ініцыятывы, або – у выпадку задзейнічання іншымі дзяржавамі – дзяржаве, справа якой разглядаецца (requested State), што дае ёй магчымасць на працягу двух тыдняў прадставіць каментары, якія будуць прыкладзены да адпаведнага даклада. Звычайнай практыкай з’яўляецца пераклад даклада з англійскай мовы на мясцовую мову адпаведнай дзяржавы, што павышае яго даступнасць і карыснасць для мясцовай аўдыторыі, у тым ліку для арганізацый грамадзянскай супольнасці.

Паводле ўстаноўленых строгіх тэрмінаў місій Маскоўскага механізма, даклад мусіць быць уключаны ў парадак дня наступнага пасяджэння Пастаяннага савета АБСЕ (п. 11). Паколькі ён збіраецца штотыдзень, гэта дазваляе прадстаўляць і публікаваць даклады без затрымкі. Даклады не патрабуюць зацвярджэння[406] і становяцца даступнымі для публікі адразу пасля іх разгляду ў Пастаянным савеце.

---

403 АБСЕ, Маскоўскі механізм, прыняты на трэцім этапе Канферэнцыі АБСЕ па чалавечым вымярэнні ў 1991 г.
404 АБСЕ, Спіс экспертаў Механізма чалавечага вымярэння, прызначаных дзяржавамі – удзельніцамі АБСЕ па стане на 15 студзеня 2025 г.
405 АБСЕ, Маскоўскі механізм, пункт 3, 1 снежня 1991 г.
406 Wolfgang Benedek, «Маскоўскі механізм АБСЕ: правілы, практыка і магчымыя ўдасканаленні», у OSCE Insights, рэд. Cornelius Friesendorf і Argyro Kartsonaki (Baden-Baden: Nomos, 2025), с. 5.

Пасля публікацыі даклады рэгулярна прадстаўляліся і абмяркоўваліся на пасяджэннях АБСЕ, у тым ліку на паралельных мерапрыемствах Варшаўскай канферэнцыі па чалавечым вымярэнні.

Выдаткі на місію мусяць пакрывацца дзяржавамі-заяўнікамі (п. 14), якія звычайна размяркоўваюць іх паміж сабой. Гэта ўключае аднаразовую выплату дакладчыку (дакладчыкам), а таксама выдаткі на паездкі і пераклад.

## Якія крокі неабходна зрабіць, каб задзейнічаць Маскоўскі механізм?

Маскоўскі механізм можа быць задзейнічаны з уласнай ініцыятывы дзяржавы або з ініцыятывы групы дзяржаў-удзельніц. Ён можа насіць характар супрацоўніцтва або спрэчкі, у залежнасці ад гатоўнасці разгляданай дзяржавы супрацоўнічаць з місіяй.

Па-першае, дзяржавы – удзельніцы АБСЕ могуць задзейнічаць механізм у дачыненні да саміх сябе (з уласнай ініцыятывы) з мэтай «вырашэння або садзейнічання ў вырашэнні пытанняў, якія датычацца чалавечага вымярэння, на сваёй [уласнай] тэрыторыі» (Маскоўскі механізм, п. 4). У такім выпадку дзяржава, што ініцыюе працэс, можа абраць да трох незалежных экспертаў са спісу рэсурсаў для фарміравання місіі, аднак гэта не могуць быць яе ўласныя грамадзяне або рэзідэнты.

Другі варыянт заключаецца ў тым, што адна або некалькі дзяржаў-удзельніц могуць звярнуцца з запытам да іншай дзяржавы-ўдзельніцы запрасіць місію экспертаў «для разгляду пэўнага, выразна вызначанага пытання на яе тэрыторыі, звязанага з чалавечым вымярэннем» (п. 8). Калі гэтая дзяржава дае згоду, місія складаецца паводле той жа працэдуры, што і ў выпадку задзейнічання механізма з уласнай ініцыятывы. У такім выпадку дзяржава, што прымае місію, вызначае трох незалежных экспертаў, якія мусяць на працягу трох тыдняў падрыхтаваць даклад, прычым у склад місіі не могуць уваходзіць грамадзяне або рэзідэнты гэтай дзяржавы.

Трэці варыянт – механізм можа быць задзейнічаны дзяржавай-заяўніцай пры падтрымцы як мінімум пяці іншых дзяржаў-удзельніц для расследавання фактаў і распрацоўкі рэкамендацый па магчымых рашэннях (п. 12). У такім выпадку дзяржавы-заяўніцы прызначаюць аднаго эксперта ў якасці дакладчыка. Дзяржава, якая падлягае разгляду, можа намінаваць другога эксперта, і разам гэтыя два эксперты абіраюць трэцяга дакладчыка з рэестру БДІПЧ. У гэтым выпадку даклад мусіць быць падрыхтаваны на працягу двух тыдняў пасля прызначэння апошняга дакладчыка. У выпадку адмовы ад супрацоўніцтва з боку разгляданай дзяржавы місія можа складацца толькі з аднаго першапачаткова прызначанага дакладчыка.

Нарэшце, паводле пункта 13, пры запыце любой дзяржавы-ўдзельніцы Маскоўскі механізм можа задзейнічаць Пастаянны савет АБСЕ[407]. Гэты варыянт патрабуе кансэнсусу ўсіх 57 дзяржаў – удзельніц АБСЕ і пакуль ні разу не ўжываўся.

Аб'ём мандата місіі дакладчыка (дакладчыкаў) вызначаецца дзяржавай (дзяржавамі), што прымяняе механізм.

407 Пастаянны савет (у дакуменце Маскоўскага механізма – Пастаянны камітэт НБСЕ) з'яўляецца галоўным кіраўнічым органам для рэгулярных палітычных кансультацый і кіравання паўсядзённай аператыўнай працай АБСЕ паміж пасяджэннямі Савета міністраў замежных спраў. Ён рэалізуе ў межах сваёй кампетэнцыі задачы, вызначаныя і прынятыя самітамі АБСЕ і Саветам міністраў замежных спраў.

## Вынікі прымянення Маскоўскага механізма ў дачыненні да Беларусі

На сёння Маскоўскі механізм быў ужыты пятнаццаць разоў[408], тры з якіх датычыліся сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі[409].

У красавіку 2011 года чатырнаццаць дзяржаў-удзельніц ініцыявалі Маскоўскі механізм паводле пункта 12. Дакладчык, прафесар Эмануэль Дэко, адзначыў сур'ёзнасць, працягласць і маштаб грубых і сістэматычных парушэнняў правоў чалавека пасля падзей 19 снежня 2010 года[410], указваючы на «доўгі спіс асобных выпадкаў "палітычных затрыманых", якія выклікаюць вялікую заклапочанасць, але [таксама] і на сістэму сацыяльнага кантролю праз страх і пераслед, катаванні і шантаж, праслухоўванне тэлефонаў, фальшывыя паказанні і вымушаныя прызнанні, адвольныя і дыскрымінацыйныя меры і санкцыі супраць асоб і іх сем'яў». Прафесар Дэко таксама прыйшоў да высновы, што «няма ні незалежнага правасуддзя, ні вяршэнства права»[411].

17 верасня 2020 года сямнаццаць дзяржаў – удзельніц АБСЕ прымянілі Маскоўскі механізм паводле пункта 12 у адказ на пэўныя паведамленні аб парушэннях правоў чалавека ў Беларусі да, падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 г. Прафесар Вольфганг Бенедэк, сярод іншага, прыйшоў да высновы, што «прэзідэнцкія выбары мелі відавочныя недахопы і не адпавядалі базавым патрабаванням, вызначаным на падставе папярэдніх назіранняў за выбарамі». Акрамя таго, ён адзначыў, што абвінавачанні ў маштабных парушэннях правоў чалавека «з'яўляюцца масавымі і сістэматычнымі і даказаны па-за ўсялякім сумневам», асабліва ў дачыненні да добра задакументаваных выпадкаў катаванняў і жорсткага абыходжання падчас задушэння мірнага палітычнага пратэсту сілавікамі. Прафесар Бенедэк таксама прыйшоў да высновы, што свабода СМІ, бяспека журналістаў, свабода сходаў і аб'яднанняў, а таксама права на свабоду і асабістую недатыкальнасць знаходзяцца «пад масіраванай атакай»[412].

У сакавіку 2023 года 38 дзяржаў – удзельніц АБСЕ ініцыявалі Маскоўскі механізм у дачыненні да Беларусі трэці раз. Дакладчык, прафесар Эрве Асенсіа, задакументаваў рэпрэсіі, назваўшы іх «скаардынаванымі дзеяннямі дзяржаўных уладаў супраць дэманстрантаў, палітычных апанентаў, праваабаронцаў, журналістаў, прафсаюзных дзеячаў і адвакатаў», а таксама адзначыў хвалю ліквідацый грамадскіх арганізацый. Ён прыйшоў да высновы, што існуе «шырокая палітыка адвольных затрыманняў і арыштаў, несумяшчальная з міжнароднымі стандартамі, у тым ліку масавыя затрыманні па месцы жыхарства, ужыванне гвалту для атрымання доступу да асабістых дадзеных, якія пасля выкарыстоўваюцца супраць асоб, шырокае прымяненне крымінальнага заканадаўства, без дакладнасці і прадказальнасці, і відавочная непрапарцыйнасць паміж пакараннем і меркаваным правапарушэннем». Ён таксама адзначыў, што катаванні і бесчалавечнае або

---

408 АБСЕ, Механізмы чалавечага вымярэння.

409 АБСЕ, Механізмы чалавечага вымярэння.

410 Пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 19 снежня 2010 года, на якіх Аляксандр Лукашэнка абвясціў сваю пераканаўчую перамогу з амаль 80 працэнтамі галасоў, шматлікія абвінавачанні ў фальсіфікацыі выбараў прывялі да масавых пратэстаў у Мінску. У тую ноч тысячы людзей сабраліся ў сталіцы, каб асудзіць вынікі выбараў. Улады адказалі гвалтоўнай сілай, збіццём дэманстрантаў, траўмамі дзясяткаў пратэстоўцаў і масавымі затрыманнямі. Апазіцыйны кандыдат Уладзімір Някляеў быў выкрадзены з бальніцы пасля жорсткага збіцця падчас мітынгу, а сем з дзевяці кандыдатаў у прэзідэнты былі затрыманы. Гл.: «Пратэстоўцы спрабуюць штурмаваць штаб-кватэру ўрада ў Беларусі», BBC News, 20 снежня 2010 г.

411 Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, Даклад дакладчыка АБСЕ па Беларусі, 28 траўня 2011 г.

412 Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, Даклад дакладчыка АБСЕ ў рамках Маскоўскага механізма па меркаваных парушэннях правоў чалавека, звязаных з прэзідэнцкімі выбарамі 9 жніўня 2020 года ў Беларусі, 5 лістапада 2020 г.

прыніжальнае абыходжанне «мелі месца на рэгулярнай і арганізаванай аснове ў месцах зняволення і асабліва былі накіраваны супраць тых, у кім бачылі палітычных апанентаў»[413].

> **“У якасці прыкладу найлепшай практыкі, стварэнне Міжнароднай платформы па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа ІАРВ) стала працягам даклада аб парушэннях правоў чалавека, звязаных з прэзідэнцкімі выбарамі 2020 года. Яна заснавана на сумеснай дэкларацыі дзевятнаццаці дзяржаў, сямнаццаць з якіх ужо ініцыявалі Маскоўскі механізм у дачыненні да Беларусі, а таксама была падтрымана Еўрапейскім Саюзам.34 Платформа ІАРВ была створана ў адказ на рэкамендацыю даклада па Беларусі забяспечыць прыцягненне да адказнасці за парушэнні правоў чалавека і прадухіліць культуру беспакаранасці.”**
>
> – Вольфганг Бенедэк. Маскоўскі механізм АБСЕ: правілы, практыка і магчымыя ўдасканаленні[414]

У лістападзе 2021 года 35 дзяржавамі-ўдзельніцамі быў ініцыяваны Венскі механізм для ацэнкі выканання Беларуссю рэкамендацый, зробленых дакладчыкам Маскоўскага механізма ў 2020 годзе. Пытанні датычылі свабоды мірных сходаў, свабоды СМІ, працягу адвольных і несправядлівых затрыманняў і арыштаў, прымусовага развароту і пасадкі самалёта Ryanair FR4978 23 траўня 2021 г. з мэтай арышту журналіста Рамана Пратасевіча і яго партнёркі, пераследу дзеячаў апазіцыі, катаванняў, а таксама палітычнай інструменталізацыі мігрантаў і ўцекачоў уладамі Беларусі. Спасылаючыся на абавязацельствы Беларусі ў рамках АБСЕ, дзяржавы пацікавіліся, ці зрабілі ўлады Беларусі нейкія крокі для расследавання гэтых абвінавачанняў, і запатрабавалі прадставіць падрабязную інфармацыю аб выкананых дзеяннях[415].

## Якая дадатковая вартасць выкарыстання Маскоўскага механізма яшчэ раз?

Было адзначана, што Маскоўскі механізм «забяспечвае хуткую працэдуру з аператыўнымі вынікамі, не можа быць заблакаваны і вельмі гнуткі ў сваёй рэалізацыі», а таксама – што справаздача «аператыўна абмяркоўваецца ў Пастаянным савеце і публікуецца на сайце АБСЕ», а гэта з’яўляецца сігналам «для пацярпелых і праваабаронцаў, што іх сітуацыі будзе нададзена неабходная ўвага»[416]. Больш за тое, справаздачы ўключаюць рэкамендацыі дакладчыкаў, якія дазваляюць праваабарончым арганізацыям далей працаваць з сітуацыяй.

Нягледзячы на тое, што Маскоўскі механізм ужо прымяняўся ў дачыненні да Беларусі, у тым ліку ў 2023 годзе, сур’ёзныя парушэнні правоў чалавека ў краіне працягваюцца. Новы зварот да механізма даў бы важную магчымасць абнавіць факты і даць ацэнку становішчу з правамі чалавека, а таксама пашырыць даступную інфармацыю адносна працягу парушэнняў міжнароднага права.

---

413 Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, Даклад аб сур’ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 г., 11 траўня 2023 г.

414 Nomos E. Бібліятэка, Разуменне АБСЕ, Бяспека дзяржаў і людзей.

415 Wolfgang Benedek, «Маскоўскі механізм АБСЕ: правілы, практыка і магчымыя ўдасканаленні», у OSCE Insights, с. 6, са спасылкай на сумесны ліст 35 дзяржаў-удзельніц да Беларусі.

416 Wolfgang Benedek, «Маскоўскі механізм АБСЕ: правілы, практыка і магчымыя ўдасканаленні», у OSCE Insights, рэд. Cornelius Friesendorf і Argyro Kartsonaki (Baden-Baden: Nomos, 2025).

У якасці альтэрнатывы дакладчыку можна было б даручыць даследаванне парушэнняў правоў чалавека, якія раней не разглядаліся, напрыклад, транснацыянальных формаў рэпрэсій супраць беларускай дыяспары, у тым ліку пераслед праз завочныя судовыя працэсы і прысуды, пагрозы і запалохванне тых, хто знаходзіцца ў выгнанні, а таксама іх сваякоў, якія засталіся ў Беларусі, і незаконныя арышт і канфіскацыя маёмасці. Задачай стала б ацэнка гэтых практык у святле міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і міжнароднага крымінальнага права з мэтай распрацоўкі рэкамендацый.

Пры гэтым, у той час як папярэднія механізмы актываваліся паводле пункта 12 Маскоўскага дакумента, такі мандат мог бы быць ініцыяваны, напрыклад, суседнімі з Беларуссю дзяржавамі паводле пункта 8, з даручэннем дакладчыку даследаваць парушэнні супраць беларускай супольнасці ў выгнанні на іх тэрыторыі. Працэдурныя рамкі ў дадзеным выпадку маюць свае перавагі: калі ў папярэдніх місіях Беларусь адмаўлялася прызначаць другога дакладчыка, у выніку чаго адзін эксперт рыхтаваў даклад на працягу двух тыдняў, то расследаванне паводле пункта 8 дазволіла б дзяржаве, якая прымае місію, прызначыць трох экспертаў. Яны мелі б тры тыдні на правядзенне расследавання, што забяспечыла б больш поўную і ўсебаковую ацэнку. Місія зможа збіраць доказы і праводзіць інтэрв’ю на месцы, а таксама непасрэдна ўзаемадзейнічаць з пацярпелымі, беларускімі праваабаронцамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці.

Новы зварот да Маскоўскага механізма таксама быў бы карысным, калі б ён уключаў або падкрэсліваў ацэнку ў кантэксце міжнароднага крымінальнага права, тым самым дапаўняючы папярэднія даклады, падрыхтаваныя ў межах механізмаў АБСЕ, якія пераважна засяроджваліся на міжнародным праве правоў чалавека.

## Якую ролю ў працэсе адыгрываюць пацярпелыя?

Пры тым што пацярпелыя не маюць афіцыйнай ролі ў межах Маскоўскага механізма, пацярпелыя і праваабарончыя арганізацыі ўсё ж маюць некалькі спосабаў удзелу ў ім.

Для кожнага выпадку прымянення Маскоўскага механізма БДІПЧ стварае спецыяльную электронную паштовую скрыню, куды пацярпелыя, арганізацыі грамадзянскай супольнасці і іншыя суб’екты могуць дасылаць сведчанні, дакументы і даклады. Таксама БДІПЧ складае спіс адпаведных грамадскіх арганізацый з кантактнымі дадзенымі, каб палегчыць узаемадзеянне дакладчыка з грамадзянскай супольнасцю.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падтрымаць выкарыстанне Маскоўскага механізма, заахвочваючы дзяржавы яго прымяняць ці падтрымліваць яго прымяненне. Акрамя таго, арганізацыі грамадзянскай супольнасці і пацярпелыя ад парушэнняў правоў чалавека могуць прадстаўляць свае сведчанні і доказы місіі праз вышэйзгаданую паштовую скрыню або падчас інтэрв’ю, якія праводзяць дакладчыкі падчас місій.

У мінулых дакладах пацярпелыя прадстаўлялі сведчанні непасрэдна дакладчыку або праз праваабарончыя арганізацыі, а дакладчыкі рэгулярна сустракаліся з прадстаўнікамі арганізацый, якія збіраюць такія сведчанні.

Напрыклад, прафесар Эрве Асенсіа адзначыў Міжнародную платформу па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB) за тое, што яна перадала «вельмі надзейную» інфармацыю для правядзення экспертызы.

**Даклад аб сур'ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 г., 11 траўня 2023 г., прафесар Эрве Асенсіа**

28. У гэтым кантэксце неабходна адзначыць працу Міжнароднай платформы па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB), створанай у 2021 годзе ў адказ на апошні даклад Маскоўскага механізма АБСЕ [19]. Дакладчык атрымаў дакладную інфармацыю пра працоўныя працэсы Платформы і меў асабісты доступ да істотнай часткі дадзеных, якія з'яўляюцца вынікам працы Платформы з інфармацыяй з адкрытых крыніц, а таксама да выбаркі канфідэнцыйных крыніц па індывідуальных справах, у тым ліку да сведчанняў пацярпелых і рашэнняў судоў Беларусі. Ён перакананы, што сабраная інфармацыя з'яўляецца вельмі надзейнай. […]

Рэкамендацыі да міжнароднай супольнасці:

- Падтрымліваць ініцыятывы, накіраваныя на справаздачнасць і дакументаванне парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, і асабліва працу Міжнароднай платформы па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (Платформа IAPB).

Нарэшце, хоць сам Маскоўскі механізм не прадугледжвае прамых магчымасцяў для атрымання кампенсацый або прававой абароны, пацярпелыя могуць карыстацца вынікамі дакладаў Маскоўскага механізма і змешчанымі ў іх рэкамендацыямі, у тым ліку для адвакацыі механізмаў прыцягнення да адказнасці і рэпарацыйных мер.

# VI. НОВЫЯ МЕХАНІЗМЫ, ЯКІЯ МОЖНА БЫЛО Б РАЗГЛЕДЗЕЦЬ

## A. Стварэнне Рэестра страт

### Што ўяўляюць сабой рэестры страт?

Рэестр страт у гэтым кантэксце выступае як дакументаванне шкоды, нанесенай парушэннямі правоў чалавека, міжнароднага крымінальнага ці гуманітарнага права, якая закранае як асобных людзей, так і арганізацыі, і нават дзяржавы. Прыкладам з’яўляецца Рэестр страт для Украіны. Яго мэта – збор заявак і пацвярджальных доказаў для далейшага разгляду праз магчымы механізм кампенсацый, які забяспечыў бы правы пацярпелых на эфектыўныя сродкі прававой абароны і рэпарацыі.

Паводле міжнароднага права, кампенсацыя з’яўляецца адной з форм эфектыўнай рэпарацыі нароўні з рэстытуцыяй, рэабілітацыяй, сатысфакцыяй і гарантыямі непаўтарэння. Яна мусіць пакрываць любыя эканамічна вымяральныя страты, у тым ліку фізічную ці псіхалагічную шкоду, страчаныя магчымасці, матэрыяльную шкоду, страты прыбыткаў, а таксама выдаткі на неабходную юрыдычную, медыцынскую і псіхалагічную дапамогу[417].

У цяперашні час існуюць толькі два такія рэестры ў сферы міжнароднага крымінальнага і гуманітарнага права: Рэестр страт, нанесеных будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі (UNRoD), і Рэестр страт для Украіны Савета Еўропы (RD4U)[418]. Ранейшыя такія ініцыятывы ўключалі, напрыклад, працу Камісіі прымірэння ААН па Палесціне (UNCCP) у 1952–1964 гг., якая займалася ідэнтыфікацыяй і ацэнкай уласнасці, якая належала палесцінскім уцекачам на тэрыторыі, што цяпер з’яўляецца тэрыторыяй Ізраіля[419].

Рэестр страт, нанесеных будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі (UNRoD) быў створаны як субсідыярны орган Генеральнай Асамблеі ААН і дзейнічае пад адміністрацыйнай уладай Генеральнага сакратара ААН[420]. Ён быў заснаваны пасля кансультацыйнага заключэння Міжнароднага суда ў 2004 годзе адносна будаўніцтва Ізраілем сцяны на Заходнім беразе, у якім прызнавалася абавязацельства дзяржаў ажыццявіць рэпарацыі за міжнародна супрацьпраўны акт не толькі перад іншай дзяржавай, але і перад індывідуальнымі

417 Рэзалюцыя 60/147 Генеральнай Асамблеі ААН, Асноўныя прынцыпы і кіраўнічыя палажэнні ААН адносна права на сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды для ахвяр грубых парушэнняў міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і сур’ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права, 16 снежня 2005 г.

418 Гл. Рэестр страт, нанесеных будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі (UNRoD); Савет Еўропы, Рэестр страт для Украіны. Гл. таксама: Вярхоўная Рада, Закон Украіны № 2923-IX.

419 Tamari, Salim, і Elia T. Zureik. Аб’яднанне чатырох крыніц інфармацыі аб палесцінскіх уцекачах (паўторная публікацыя). Jerusalem Quarterly, выпуск 93 (вясна 2023 г.). Institute for Palestine Studies, Digital Section: Remembrances.

420 Рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ES-10/17 «Стварэнне рэестра шкоды, нанесенай будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі», 24 студзеня 2007 г.

ахвярамі (фізічнымі асобамі)[421]. UNRoD працуе пры адміністрацыйнай падтрымцы аддзялення ААН у Вене (UNOV) і мае паўнамоцтвы «весці дакументальны ўлік шкоды, нанесенай усім фізічным і юрыдычным асобам у выніку будаўніцтва Ізраілем Сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі, у тым ліку ў і вакол Усходняга Іерусаліма»[422].

RD4U быў створаны праз рэзалюцыю Савета Еўропы, прынятую ў траўні 2023 года, якая надала Рэестру паўнамоцтвы «весці дакументаваны ўлік доказаў і інфармацыі па прэтэнзіях адносна шкоды, страт або пашкоджанняў, нанесеных з 24 лютага 2022 года на тэрыторыі Украіны […] у выніку міжнародна-супрацьпраўных дзеянняў Расійскай Федэрацыі ва Украіне або супраць яе»[423]. Ён фіксуе шкоду, нанесеную як фізічным і юрыдычным асобам, так і Украіне як дзяржаве. «Пашыранае частковае пагадненне аб Рэестры старт, нанесеных агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны» дазваляе любой дзяржаве-члену ці назіральніку пры Савеце Еўропы далучыцца да Рэестра ў якасці ўдзельніка або асацыяванага члена[424], разам з іншымі дзяржавамі, якія падтрымалі рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі ААН адносна сродкаў прававой абароны і рэпарацый для Украіны[425].

## Якія магчымыя вынікі дзейнасці рэестраў страт?

Абодва створаныя на дадзены момант рэестры страт могуць прымаць іскі і дакументаваць доказы. Хоць яны і не маюць паўнамоцтваў разглядаць прэтэнзіі па сутнасці або прызначаць выплаты кампенсацыі, іх дзейнасць можа прывесці да наступных вынікаў:

- Стварэнне надзейнага і доўгатэрміновага ўліку шкоды, нанесенай парушэннямі правоў чалавека або міжнароднага права ахвярам, якія, у залежнасці ад паўнамоцтваў рэестра, могуць быць фізічнымі або юрыдычнымі асобамі.

- Захаванне доказаў, якія падтрымліваюць індывідуальныя іскі аб кампенсацыі, з мэтай іх будучага разгляду кампетэнтным механізмам.

421 Міжнародны суд ААН (ICJ), кансультацыйнае заключэнне ад 9 ліпеня 2004 года «Прававыя наступствы будаўніцтва сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі», 9 ліпеня 2004 г. Суд прыйшоў таксама да высновы, што Ізраіль мае юрыдычнае абавязацельства забяспечыць рэпарацыю за шкоду, нанесеную яго незаконнымі дзеяннямі, у тым ліку належную кампенсацыю для асоб, чые дамы або сельскагаспадарчыя ўладанні былі знішчаны.

422 ААН, Генеральная Асамблея, Рэзалюцыя ES-10/17 «Стварэнне рэестра шкоды, нанесенай будаўніцтвам сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі», 24 студзеня 2007 г.

423 Савет Еўропы, Рэзалюцыя CM/Res(2023) 3 («Рэзалюцыя аб устанаўленні пашыранага частковага пагаднення аб рэестры страт, прычыненых агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны»), 12 траўня 2023 г.

424 Кіруе рэестрам, прызначае яго савет і прымае гадавы бюджэт Канферэнцыя ўдзельнікаў (Conference of Participants, COP), якая на дадзены момант складаецца з 41 удзельніка і трох асацыяваных членаў.

425 ААН, Рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ES-11/5 («Рэзалюцыя, прынятая Генеральнай Асамблеяй 14 лістапада 2022 г.»), 15 лістапада 2022 г.

**Рэестр страт для Украіны: RD4U**

Мэта RD4U – збіраць іскі і доказы ў іх падтрымку ад асоб, арганізацый і дзяржавы Украіна, якія патрабуюць кампенсацыі за шкоду, страты і пашкоджанні, выкліканыя поўнамаштабнай агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны.

Паколькі рэестр – гэта не суд, трыбунал, камісія паісках ці кампенсацыйны фонд, RD4U можа прымаць іскі, але не можа разглядаць і ацэньваць іх па сутнасці, вызначаць іх вартасць і прызначаць выплаты. Гэтыя функцыі мусяць выконвацца будучым міжнародным кампенсацыйным механізмам , які будзе створаны ў будучыні. Тым часам RD4U апрацоўвае і сістэматызуе іскі, а таксама вызначае іх адпаведнасць крытэрыям для разгляду будучым кампенсацыйным механізмам.

## У чым дадатковая вартасць рэестраў шкоды?

Большасць механізмаў дакументавання засяроджана на тыпе і дэталях парушэнняў, а таксама на ідэнтыфікацыі меркаваных вінаватых, а рэестры страт ліквідуюць прабел, звязаны з дакументаваннем канкрэтнай шкоды, нанесенай ахвярам парушэнняў, і рыхтуюць дакументацыю для адпаведных іскаў аб рэпарацыях.

## Якую ролю адыгрываюць пацярпелыя і грамадскія арганізацыі?

Пацярпелыя могуць выстаўляць патрабаванні, падмацаваныя доказамі, у межах працы рэестраў і вызначэння таго, хто можа падаваць такія заявы. Напрыклад, у выпадку RD4U заявы могуць падавацца як фізічнымі, так і юрыдычнымі асобамі, а таксама дзяржавай Украіна, і мусяць датычыць шкоды, страт або пашкоджанняў, што адбыліся 24 лютага 2022 года або пазней на тэрыторыі Украіны (у межах яе міжнародна прызнаных межаў, уключаючы тэрытарыяльныя воды). У некаторых катэгорыях падаваць патрабаванні могуць і ўскосныя пацярпелыя, напрыклад, такія як «смерць члена сям'і» ці «знікненне члена сям'і»[426].

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць аказваць дапамогу ў падачы заяў і выступаць пасярэднікамі паміж пацярпелымі і адпаведным рэестрам страт.

426 Рэестр страт, выкліканых агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны, Правілы падачы, апрацоўкі і ўліку іскаў.

# В. Міжнародны (спецыяльны) трыбунал для Беларусі

## Што такое міжнародныя (спецыяльныя) трыбуналы?

Міжнародныя трыбуналы з'явіліся пасля Другой сусветнай вайны і масавых злачынстваў, здзейсненых падчас яе, як інструмент прыцягнення да адказнасці высокапастаўленых асоб, вінаватых у міжнародных злачынствах. У 1990-ыя гады такія трыбуналы былі створаны Саветам Бяспекі ААН у адказ на зверствы ў былой Югаславіі і Руандзе, паклаўшы пачатак шэрагу іншых трыбуналаў у сітуацыях масавых злачынстваў. За апошнія 25 гадоў было створана каля дзясятка спецыяльных міжнародных і гібрыдных (або інтэрнацыяналізаваных) трыбуналаў, напрыклад: Спецыяльны суд па Сьера-Леонэ, Надзвычайныя палаты ў судах Камбоджы, Спецыяльныя калегіі па цяжкіх злачынствах ва Усходнім Тыморы, Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве, Палаты па ваенных злачынствах у Босніі і Сербіі, Спецыяльны трыбунал па Ліване і Іракскі вышэйшы трыбунал.

*Міжнародныя* спецыяльныя трыбуналы звычайна ствараліся рэзалюцыяй Савета Бяспекі ААН. Сярод прыкладаў – Міжнародны крымінальны трыбунал па былой Югаславіі (МТБЮ, ICTY)[427] і Міжнародны крымінальны трыбунал па Руандзе (МТР, ICTR)[428]. Стварэнне цалкам міжнародных трыбуналаў нярэдка сутыкалася з перашкодамі, у тым ліку з блакаваннем рашэнняў у Савеце Бяспекі праз права вета яго пастаянных членаў.

*Гібрыдныя* (або інтэрнацыяналізаваныя) *трыбуналы* могуць быць створаны на аснове пагаднення паміж ААН і дзяржавай-гаспадаром або пагаднення паміж дзяржавай-гаспадаром і рэгіянальнай арганізацыяй, напрыклад Саветам Еўропы або Афрыканскім Саюзам. У большасці выпадкаў дзяржавай-гаспадаром, якая падпісвае пагадненне з міжнароднай або рэгіянальнай арганізацыяй, з'яўляецца краіна, на тэрыторыі якой былі здзейснены злачынствы.

**Гібрыдныя трыбуналы** (вядомыя таксама як «інтэрнацыяналізаваныя» або змяшаныя крымінальныя трыбуналы) – гэта судовыя інстытуты, што спалучаюць міжнародныя і нацыянальныя элементы, будучы альтэрнатывай цалкам нацыянальным або цалкам міжнародным судовым працэсам у прыцягненні вінаватых да адказнасці за масавыя злачынствы[429]. Гэта можа вынікаць з формы іх стварэння (напрыклад, праз пагадненне паміж дзяржавай-гаспадаром і ААН або паміж дзяржавай-гаспадаром і рэгіянальнай арганізацыяй, такой як Афрыканскі Саюз або Савет Еўропы), з іх прадметнай юрысдыкцыі (яны могуць разглядаць як міжнародныя, так і нацыянальныя злачынствы) і/або з іх кадравага складу (яны могуць складацца як з нацыянальных, так і з міжнародных адвакатаў, суддзяў і пракурораў).

427 Рэзалюцыя 827 Савета Бяспекі ААН, 1993 г.
428 Рэзалюцыя 955 Савета Бяспекі ААН, 1994 г.
429 Міжнародны цэнтр правасуддзя пераходнага перыяду, Абавязацельствы па забеспячэнні правасуддзя за сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека: урокі гібрыдных трыбуналаў, 2010 г.

Універсальнай мадэлі гібрыднага трыбунала не існуе, хоць іх агульнымі рысамі з’яўляюцца юрысдыкцыя ў дачыненні да міжнародных злачынстваў, змяшаны склад нацыянальных і міжнародных супрацоўнікаў, а таксама прымяненне міжнароднага працэсуальнага і матэрыяльнага права. Кожны такі трыбунал з’яўляецца кампрамісам паміж бакамі, найчасцей паміж ААН і дзяржавай-гаспадаром, улічвае ўнікальныя патрэбы канкрэтнай сітуацыі і можа набываць міжнародны характар рознымі спосабамі[430].

Прыклады гібрыдных трыбуналаў:

- *Спецыяльны суд для Сьера-Леонэ* (SCSL) быў заснаваны міжнародным пагадненнем паміж Урадам Сьера-Леонэ і Генеральным сакратаром ААН. У гэтым выпадку Генеральны сакратар дзейнічаў на падставе рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН, аднак без спасылкі на Раздзел VII Статута[431].
- *Спецыяльны трыбунал па Ліване* (STL) быў створаны на падставе пагаднення паміж ААН і Ліванам[432].
- *Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве* (KSC) былі створаны на аснове абмену лістамі паміж Прэзідэнтам Косава і Вярхоўным прадстаўніком Еўрапейскага Саюза па замежных справах і палітыцы бяспекі[433].
- *Спецыяльны крымінальны суд у Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы* (SCC) быў створаны на падставе Мемарандума аб намерах, падпісанага паміж Міністэрствам юстыцыі ЦАР і Генеральным сакратаром ААН[434].
- *Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны* – міжнародны трыбунал, заснаваны ў чэрвені 2025 года ў межах Савета Еўропы на падставе тэрытарыяльнай юрысдыкцыі Украіны для разгляду наступстваў расійскай агрэсіі супраць Украіны[435] (гл. Раздзел II. F «Спецыяльны трыбунал Савета Еўропы па злачынстве агрэсіі супраць Украіны»).

У іншых кантэкстах таксама разглядаліся альтэрнатыўныя метады стварэння трыбуналаў. У выпадку з Сірыяй вывучалася ідэя стварэння міжнароднага трыбунала на аснове дагавора паміж групай дзяржаў[436]. Гэты трыбунал, вядомы як «трыбунал з аб’яднанай юрысдыкцыяй», мог бы аб’яднаць існуючыя юрысдыкцыі дзяржаў, якія ўжо расследуюць гэтыя злачынствы на падставе прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі[437]. У кантэксце расійскай агрэсіі супраць Украіны быў створаны спецыяльны трыбунал, адказны за расследаванне і пераслед злачынства агрэсіі[438], з ключавым адрозненнем у тым, што дзяржава, адказная за адпаведнае злачынства, не з’яўляецца ўдзельніцай устаноўчага пагаднення.

430 Міжнародны цэнтр правасуддзя пераходнага перыяду, Абавязацельствы па забеспячэнні правасуддзя за сур’ёзныя парушэнні правоў чалавека: урокі гібрыдных трыбуналаў, 2010 г.
431 John Cerone, Спецыяльны суд для Сьера-Леонэ: Стварэнне новага падыходу да міжнароднага крымінальнага правасуддзя, у ILSA Journal of International & Comparative Law, том 8, с. 379–381, 2002 г.
432 ААН, Пагадненне паміж ААН і Ліванскай Рэспублікай аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала па Ліване, 2007 г.
433 Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве і спецыялізаваная пракуратура, Коратка пра Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве, с. 10, 2022 г.
434 ААН, Ліст Генеральнага сакратара ад 19 снежня 2014 г. на імя Старшыні Савета Бяспекі, 22 снежня 2014 г.
435 Камітэт міністраў Савета Еўропы, Статут Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, артыкул 2 (1), 2025 г.
436 Яўгенія Андраюк і неназваны аўтар, Міжнародныя механізмы прыцягнення да адказнасці за парушэнні правоў чалавека ў Беларусі 18 студзеня 2022 г.
437 Сірыйскі цэнтр правасуддзя і забеспячэння адказнасці, Разгляд трыбунала «аб’яднанай юрысдыкцыі» для Сірыі, 25 лістапада 2020 г.
438 Савет Еўропы: Украіна і Савет Еўропы падпісалі Пагадненне аб стварэнні Спецыяльнага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны, 25 чэрвеня 2025 г.

## Якія могуць быць вынікі працы Міжнародных (спецыяльных) трыбуналаў?

Міжнародныя і гібрыдныя трыбуналы звычайна прыводзяць да наступных вынікаў:

- **Устанаўленне фактаў**: Трыбуналы могуць устанаўліваць факты, звязаныя са злачынствамі ў межах свайго мандата. Яны могуць вывучаць сведчанні, аналізаваць дадзеныя судовай экспертызы і ацэньваць іншыя тыпы доказаў. Гэтыя намаганні спрыяюць стварэнню гістарычнай дакументальнай базы і закладаюць аснову для будучых ініцыятыў пераходнага правасуддзя.

- **Прыцягненне злачынцаў да адказнасці**: Трыбуналы маюць паўнамоцтвы прыцягваць да адказнасці фізічных асоб, звычайна незалежна ад іх пасады. Папярэднія трыбуналы выносілі абвінавачанні кіраўнікам дзяржаў, прэм’ер-міністрам, міністрам урадаў і іншым высокапастаўленым чыноўнікам і вайскоўцам.

- **Магчымасць для пацярпелых быць пачутымі**: Трыбуналы могуць даць пацярпелым магчымасць быць пачутымі, захаваць іх сведчанні і закласці аснову для пераходнага правасуддзя.

- **Прызначэнне рэпарацый**: Міжнародныя трыбуналы звычайна могуць прызначаць рэпарацыі ў сваіх прысудах, каб кампенсаваць шкоду, нанесеную пацярпелым. Рэпарацыі могуць мець розныя формы – кампенсацыю, рэстытуцыю, рэабілітацыю, сатысфакцыю і гарантыі непаўтарэння.

## Якой будзе дадатковая вартасць міжнароднага (спецыяльнага) трыбунала для Беларусі?

З часу прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і наступнага крызісу ў галіне правоў чалавека ў Беларусі арганізацыі грамадзянскай супольнасці рэгулярна заклікаюць да стварэння міжнароднага трыбунала, які мог бы пераследаваць злачынствы, здзейсненыя ў Беларусі[439], дапамагаючы пераадолець абмежаванні прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі, праблемы, звязаныя з імунітэтамі, і інш.

Іншыя прапаноўвалі, каб нядаўна створаны Спецыяльны трыбунал Савета Еўропы па злачынстве агрэсіі супраць Украіны займаўся і крымінальнай адказнасцю кіраўніцтва Беларусі[440]. Сапраўды, Статут гэтага Спецыяльнага трыбунала дазваляе яму разглядаць удзел кіраўніцтва Беларусі ў планаванні і здзяйсненні злачынства агрэсіі супраць Украіны. Аднак яго мандат абмяжоўваецца злачынствам агрэсіі ў межах тэрытарыяльнай юрысдыкцыі Украіны і патрабуе накіравання ад Генеральнага пракурора Украіны. Адпаведна, ён не ахоплівае міжнародныя злачынствы супраць беларускага народа ў Беларусі ці ў выгнанні (па-за межамі Украіны), што стварае прабел у прыцягненні да адказнасці за злачынствы супраць беларускіх ахвяр і пацярпелых. Акрамя таго, удзел пацярпелых у працы Спецыяльнага трыбунала абмежаваны асобамі, «асабліва закранутымі» дзеяннямі,

439 Сяргей Галубок, Isans: Спецыяльны трыбунал па Беларусі: прававыя і палітычныя наступствы, 26 ліпеня 2023 г.
440 Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ): ПАСЕ аднагалосна патрабуе стварэння міжнароднага трыбунала для прыцягнення да адказнасці кіраўнікоў Расіі і Беларусі за злачынства агрэсіі супраць Украіны, 26 студзеня 2023 г.

апісанымі ў абвінавачанні, што выключае беларускіх пацярпелых, калі толькі яны не былі закрануты як жыхары Украіны. Больш за тое, беларускія грамадзяне наўрад ці атрымаюць кампенсацыю ад будучага меркаванага механізма, заснаванага на патрабаваннях, сабраных Рэестрам страт, выкліканых агрэсіяй Расійскай Федэрацыі супраць Украіны, калі толькі яны не пражывалі на тэрыторыі Украіны.

## Які ўдзел будуць прымаць пацярпелыя?

Міжнародны крымінальны трыбунал па былой Югаславіі і Міжнародны крымінальны трыбунал па Руандзе дазвалялі пацярпелым выступаць у судах толькі ў ролі сведак. Упершыню ўдзел пацярпелых быў замацаваны ў статуце міжнароднага трыбунала ў Міжнародным крымінальным судзе[441]. Прыняцце Рымскага статута з яго моцнай сістэмай удзелу пацярпелых стала паваротным момантам для міжнародных і гібрыдных трыбуналаў, створаных пазней[442]. (Гл. Раздзел II. А «Міжнародны крымінальны суд»).

Формы ўдзелу пацярпелых у міжнародных і гібрыдных трыбуналах могуць быць розныя. У большасці выпадкаў пацярпелыя могуць выступаць як удзельнікі, прадстаўляючы свае погляды і інтарэсы, або быць грамадзянскімі бакамі ў працэсе, што дазваляе ім карыстацца многімі тымі ж правамі, што маюць абвінавачанне ці абарона. Паказальным прыкладам *спецыяльнага* трыбунала з надзейнай сістэмай удзелу пацярпелых могуць служыць Надзвычайныя палаты ў судах Камбоджы (ECCC). Палажэнні аб удзеле пацярпелых маюць таксама статуты наступных трыбуналаў: Спецыяльны трыбунал па Ліване, Спецыяльныя калегіі ва Усходнім Тыморы, Місія ААН па часовай адміністрацыі ў Косава, а таксама Спецыяльныя судовыя палаты па Косаве[443].

441 МКС, Рымскі статут, арт. 68.

442 Надзвычайныя палаты ў судах Камбоджы (ECCC), Даведнік па практыцы 02/2007/Rev.1, Удзел пацярпелых. Напрыклад, Надзвычайныя палаты ў судах Камбоджы (ECCC), створаныя ў 2003 годзе паводле пагаднення паміж урадам Камбоджы і ААН, дазваляюць пацярпелым удзельнічаць у якасці паўнапраўных бакоў ў судовым працэсе.

443 Mariana Peña, «Удзел пацярпелых у міжнародным крымінальным працэсе», у Max Planck Encyclopedia of International Procedural Law, 2024 г.

International
Accountability
Platform

for Belarus

**Ілюстрацыя вокладкі – Сяргей Раманаў**
*Сяргей Раманаў – беларускі мастак і палітвязень, актывіст анархісцкага руху. У 2021 годзе быў асуджаны Мінскім абласным судом на 20 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі строгага рэжыму. На момант публікацыі гэтага даклада яму больш не дазваляюць маляваць у турме.*

## Пра Платформу IAPB

Платформа IAPB – кааліцыя незалежных беларускіх і міжнародных няўрадавых арганізацый, якія аб’ядналі намаганні для збору, кансалідацыі, верыфікацыі, захавання і аналізу доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, што складаюць злачынствы паводле міжнароднага права, меркавана, здзейсненыя ўладамі Беларусі і іншымі суб’ектамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх.presidential election and its aftermath.

**iapbelarus.org**

iapbelarus
iapbelarus.org
iapb@dignity.dk